82-93
Д 39

ДАНІЭЛЬ ДЭФО

РАБІНЗОН КРУЗО

ДВБ • МЕНСК • 1937

82-93
Д39

ДАНІЭЛЬ ДЭФО

ЖЫЦЦЁ І ДЗІЎНЫЯ НЕБЫВАЛЫЯ ПРЫГОДЫ РАБІНЗОНА КРУЗО

Президентская библиотека
Республики Беларусь
8 800000 673387

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
МЕНСК — ЮНДЗЕТСЕКТАР — 1927

Раздзел першы

Сям'я Рабінзона.—Яго пабег з бацькоўскага дому.

Мой бацька хацеў, каб я зрабіўся багатым чыноўнікам, але я марыў аб морскіх вандраваннях. Мне здавалася велізарнейшым шчасцем бадзяцца па марах ды акіянах.

Бацька здагадаўся, што ў мяне на розуме. Аднаго разу раніцой ён паклікаў мяне ў свой пакой і злосна сказаў:

— Я ведаю, што ты хочаш уцячы з роднага дому. Гэта вар'яцтва. Ты павінен застацца. Калі ты паслухаеш мяне і застанешся дома, я буду табе добрым бацькам, але гора табе, калі ты ўцячэш.

Тут голас ў яго задрыжэў і ён ціха дадаў:

— Ды ты-ж у нас адзін... Падумай пра бедную маці... Яна не вынесе разлукі з табой.

Я бачыў як горкія слёзы струменілі па ягоным твары. Ён пяшчотна любіў мяне і хацеў мне дабра.

Мне стала шкада старога, і я цвёрда рашыў не думаць больш аб вандраванні па моры.

Але дармо!—прайшло некалькі дзён, і ад маіх добрых намераў нічога не засталося: праз два-тры тыдні пасля маёй размовы з бацькам я рашыў бегчы з дому. Выбраў час, калі маці была ў добрым настроі, я папрасіў яе ў куток і сказаў:

— Мне восемнаццаць год, а ў гэтыя гады позна вучыцца судзейскай справе. Каб нават паступіў куды-небудзь на службу, я ўсёроўна праз некалькі дзён уцёк-бы ў дальнія краіны. Мне гэтак хочацца бачыць свет, што калі я і прыстроюся да якой-небудзь справы, у мяне не хопіць цярплівасці давесці яе да канца. Прашу вас, угаварыце бацьку адпусціць мяне на мора для спробы: калі мора мне не будзе падабацца, я вярнуся дамоў і больш нікуды не паеду. Няхай лепш бацька адпусціць мяне добраахвотна, бо інакш буду вымушан адысці без яго дазволу.

Мая маці вельмі раззлавалася на мяне і сказала:

— Дзіўлюся, як ты яшчэ можаш думаць пра гэткія рэчы пасля тваёй размовы з бацькам. Ды бацька-ж патрабаваў, каб ты забыў пра морскія вандраванні. Вядома, калі ты хочаш сябе загубіць, дык едзь хоць гэтую-ж хвіліну, але можаш быць упэўнен, што мы з бацькам ніколі не дамо згоды на твае вандраванні.

Урэшце я даведаўся, што маці перадала бацьку нашу размову ад слова да слова.

Бацька быў засмучан і сказаў ёй з уздыхам:

— Хлопчык мог-бы быць шчаслівым на радзіме, але, калі ён пусціцца ў вандроўе, ён будзе самай няшчаснай істотай, якая калі-небудзь толькі нараджалася на свеце. Не, я не магу на гэта згадзіцца.

Хутка я даведаўся, што адзін мой таварыш едзе ў Лондан на караблі свайго бацькі. Ён пачаў угаварваць мяне ехаць разам з ім, спакушаючы мяне, што праезд на караблі будзе дармовы. І вось, не спытаўшыся ні ў бацькі, ні ў маці,—у нядобры час!—я сеў на карабль майго сябра, які накіроўваўся ў Лондан.

Раздзел другі

Першыя прыгоды на моры. — Падарожжа ў Гвінею.

Не паспеў наш карабль выйсці з Гамбера, як з поўначы падзьмуў моцны вецер. Я ніколі яшчэ не быў на моры, і мне зрабілася вельмі дрэнна.

Са спалохам глядзеў я на высокія хвалі, якія хадзілі па моры; і кожны раз, калі на наш карабль налятала вялікая хваля, мне здавалася, што мы зараз патонем.

Тысячу разоў я кляўся, што, калі застануся жывы, я вярнуся дамоў да бацькі і ніколі за ўсё жыццё не ўзыйду больш на палубу карабля. Гэтых разважлівых думак хапіла ў мяне на ўвесь час, пакуль працягвалася бура. Але вецер пачаў сціхацца, хваляванне ўляглося,

і мне зрабілася куды лягчэй. Пакрысе я пачаў прызвычайвацца да мора. Праўда, яшчэ не зусім прайшла мая морская хвароба, але да канца дня надвор'е прасвятлілася, вецер супыніўся, і надышоў ціхі, цудоўны вечар: сонца зайшло без адзінай хмаркі і ўстала на другі дзень такое-ж яснае. Ціхае мора, без ніякага ветру, усё аблітае ззяннем сонца, стварала такую дзіўную карціну, якой я ніколі не бачыў.

Усю ноч я праспаў моцным сном. Ад маёй морскай хваробы не засталося і сляда. Я быў вясёлы і са здзіўленнем глядзеў на мора, якое яшчэ ўчора здавалася такім жорсткім і грозным і ў такі кароткі час прыняло вельмі прывабны выгляд. А тут, як знарок, падыходзіць да мяне мой таварыш, што зацягнуў мяне ехаць разам з ім, пляскае мяне па плячу ды кажа:

— Ну, што, Боб, як ты сябе адчуваеш пасля ўчарашняга? Я ўпэўнен, што ты перапалохаўся. Прызнайся: ты-ж вельмі спалохаўся ўчора, калі задзьмуў ветрык.

— Ветрык? Добры ветрык! Я і ўявіць сабе не мог гэткай жахлівай буры.

— Буры? Ах, ты, дзівак! Дык па-твойму гэта бура? Гэта што! Глупства! Дай нам добрае судна і больш прастору, дык мы такога шквала і не заўважым. Ну, табе мора яшчэ гэта навіна: не дзіва, што ты перапалохаўся... Пойдзем-жа лепш выпʼем па шклянцы віна і забудзем пра буру. Зірні, які цудоўны дзень.

Я напіўся пʼяным і забыў пра ўсё. Як толькі надышоў штыль, я перастаў баяцца, што

хвалі паглынуць мяне, і ўсе мае клятвы, усе абяцанні, якія я даваў сабе ў хвіліны спалоху, выскачылі ў мяне з галавы.

На шосты дзень пасля выхаду ў мора, мы прышлі ў Ярмуцкую гавань. Надвор'е было ціхае, вецер пасля буры быў сустрэчны, таму мы пасоўваліся няхутка. У Ярмуце мы былі вымушаны кінуць якар і прастаялі, чакаючы папутнага ветру, восем дзён. На працягу гэтага часу ў гавань прышло шмат караблёў. Мы, відаць, не прастаялі-б так доўга і ўвайшлі-б у раку з прылівам, але вецер быў вельмі свежы, а дзён праз пяць задзьмуў яшчэ мацней. Але якары і якарныя канаты ў нас былі моцныя і нашы матросы не трывожыліся і не чакалі бяды. Аднак на дзевяты дзень к ранню вецер яшчэ пахаладзеў, і хутка разгуляўся страшэнны шторм. Нават матросы былі вельмі ўстрывожаны. Я некалькі разоў чуў, як сам капітан, бесперастанку ходзячы па караблі, мармытаў напоўголас: «Мы прапалі! Мы прапалі!», што не перашкаджала яму аднак пільна назіраць за ходам работ, на караблі.

Нехта з нашых матросаў крыкнуў зверху, што карабль, які стаяў непадалёк ад нас наперадзе, пайшоў на дно. Яшчэ двое суднаў сарвалася з якараў і іх вынесла ў адкрытае мора. Што іх там чакала? Усе мачты былі збіты на іх гураганам.

Раптам сярод ночы адзін з матросаў, які спускаўся ў трум паглядзець ці ўсё там у парадку, закрычаў, што судна пачало цячы.

Другі пасланы паведаміў, што вада ўзнялася на чатыры футы. Тады капітан даў каманду:

— Выкачвай ваду! Да помпаў! [1])

Калі я пачуў гэтую каманду, у мяне замерла сэрца: мне здалося, што я паміраю, і я ўпаў ніцма на ложак. Але матросы расштурхалі мяне і патрабавалі, каб я не цураўся работы. Нічога не зробіш, я падышоў да помпы і пачаў старанна выкачваць ваду. У гэты час некалькі дробных грузавых суднаў, не маючы мажлівасці выстаяць супроць ветру, былі вымушаны падняць якары і выйсці ў адкрытае мора. Убачыўшы іх, як яны праходзілі міма нас, капітан загадаў стрэльнуць з гарматы, каб паведаміць іх аб нашым катастрафічным становішчы.

Пачуўшы гэты гарматны стрэл, я падумаў, што наша судна разбілася, і так спалохаўся, што страціў прытомнасць. На мяне не звярнулі ўвагі, і ніхто не пацікавіўся даведацца, што здарылася са мной. Другі стаў да помпы на маё месца, адсунуўшы мяне нагой. Усе былі ўпэўнены, што я памёр.

Ачуняўшы я зноў узяўся за работу, але вада падымалася ўсё вышэй. Было відаць, што судна павінна патануць, і хоць шторм пачынаў патрохі суцішацца, для нас не прадбачылася ніякай магчымасці пратрымацца на вадзе, пакуль мы ўжо ўвойдзем у гавань, і таму капітан усё страляў, просячы дапамогі.

Нарэшце бліжэйшае да нас судна рызыкнула спусціць шлюпку, каб падаць нам дапа-

[1]) Помпай называюць карабельны насос для выкачвання вады з судна.

могу. Шлюпку кожную хвіліну магло перакуліць, але яна ўсё-ж набліжалася да нас; дармо,—мы не маглі трапіць у яе, бо не было аніякай мажлівасці прычаліць да нашага карабля, хоць людзі граблі з усіх сіл, рызыкуючы жыццём. Нашы матросы кінулі ім канат. Пасля доўгіх дарэмных спроб ім удалося злавіць канец каната; мы прыцягнулі іх пад карму і ўсе да аднаго спусціліся ў шлюпку.

Мы сышлі з карабля. Не прайшло і чвэрці гадзіны, як ён пачаў апускацца ў ваду.

Пакуль людзі ўзмоцнена працавалі вёсламі, каб накіраваць лодку да берагу, мы маглі бачыць, што на беразе сабраўся вялікі натоўп; усе мітусіліся і бегалі, рыхтуючыся падаць нам дапамогу, калі мы падыдзем бліжэй. Але мы пасоўваліся да зямлі вельмі марудна. З вялікай цяжкасцю выбраўшыся на сушу, мы пайшлі пешшу ў Ярмут. Там нас чакала добрая сустрэча. Жыхары горада далі нам грошай, каб мы здолелі дабрацца да Лондана.

Раздзел трэці

Рабінзон у палоне. — Уцёкі. — Падарожжа ў Бразілію.

У Лондане я меў шчасце пазнаёміцца з адным карабельнікам, які незадоўга перад тым ездзіў на сваім караблі да берагоў Афрыкі і збіраўся зноў ехаць туды. Я падабаўся яму, і калі ён даведаўся, што я мару пабачыць свет, то прапанаваў мне ехаць з ім.

— Вам гэта нічога не будзе каштаваць,— сказаў ён,—вы будзеце абедаць са мной у якасці майго сябра. Калі-ж у вас ёсць магчывасць набраць з сабой тавараў, то вы атрымаеце цалкам увесь прыбытак, які толькі дапускае гандлёвая справа. Паспрабуйце; можа вам і пашанцуе.

І таму, што гэты карабельнік быў добрасуменны і просты чалавек, я прыняў яго прапанову. Накіроўваючыся ў плаванне, я захапіў з сабой невялікі груз для гандлю: закупіў на сорак фунтаў стэрлінгаў [1]) розных бразготак, якія мелі добры збыт у дзікуноў. Гэтыя сорак фунтаў я здабыў пры дапамозе маіх сваякоў, з якімі я меў перапіску; трэба думаць, яны пераканалі майго бацьку, а вярней маці, што трэба дапамагчы мне хоць невялікай сумай у гэтым першым маім прадпрыемстве.

Плаванне гэта было, можна сказаць, адзіным удалым з усіх маіх прыгод, і гэтай удачай я зноў-жа абавязан майму другу-капітану, які ў час нашага плавання навучаў мяне карабельнай справе.

Яму было прыемна дзяліцца са мной сваім вопытам, а мне—слухаць яго. Адным словам, падарожжа зрабіла мяне не толькі мараком, але і купцом: я выменяў на свой тавар пяць фунтаў залатога пяску, за які, калі мы вярнуліся ў Лондан, атрымаў без малога трыста фунтаў стэрлінгаў.

Такім чынам, я мог сябе з гэтага часу лі-

[1]) Фунт стэрлінгаў = 9½ залатым рублям.

чыць купцом, але, на маё няшчасце, капітан хутка памёр, і мне давялося рабіць другое падарожжа на сваю рызыку.

Я адплыў з Англіі на тым-жа самым караблі. Гэта было самае няшчаснае падарожжа, якое толькі калі рабіў чалавек.

Пачалося з таго, што адной раніцой, на досвітку, наша судна, якое трымала курс на Канарскія астравы, напаткала маўрытанскі разбойніцкі карабль, які пагнаўся за намі на ўсіх ветразях. Спадзяючыся ўцячы ад яго, мы таксама паднялі ўсе ветразі, але ўбачылі, што пірат набліжаецца і немінуча дагоніць нас праз некалькі гадзін, і тады мы падрыхтаваліся да бою. У нас было дванаццаць гармат, а ў ворага—восемнаццаць. Каля трох гадзін папалудні ён нас дагнаў, але, па памылцы, замест таго, каб падыйсці да нас з кармы, падышоў з левага барта. Выкарыстаўшы гэтую памылку, мы нацэлілі на яго восем гармат і далі залп, пасля якога ён адышоў крыху далей, адказаўшы на наш агонь не толькі гарматным, але і стрэльбавым залпам з двух соцень стрэльбаў, бо на ім была каманда да двухсот чалавек. Аднак, нашых нікога не закранула: усе нашыя людзі прыселі за бортам.

Затым пірат падрыхтаваўся да новага нападу, а мы да новай абароны. Але ў наступнай сутычцы, зачапіўшыся за наш борт баграмі, шэсцьдзесят чалавек прыскочылі да нас на палубу і перш за ўсё пачалі сячы нашы снасці. Мы сустрэлі іх стрэльбавым агнём, коп'ямі і ручнымі гранатамі і два разы ачышчалі ад іх нашу палубу. Тым не менш мы

прымушаны былі здацца, бо наш карабль нікуды ужо не быў варты. Трое з нашых людзей былі забіты, а сямёра ранены. Нас адвязлі ў якасці палонных у морскі порт, які належаў маўрам.

У палоне мне жылося нядрэнна. Куды лепей, як я чакаў. Астатніх нашых людзей павезлі ў глыб краіны, да двара жорсткага цара, а мяне капітан разбойніцкага судна пакінуў пры сабе сваім рабом, бо я быў дужы, малады і спрытны. Я горка заплакаў: мне прыгадаліся прароцкія словы майго бацькі аб тым, што прыдзе час, калі не будзе каму выратаваць мяне з бяды і ўсцешыць. Цяпер гэтыя словы збыліся літаральна. Але, дармо, гэта быў толькі бледны цень тых мучэнняў, праз якія мне яшчэ трэ' было прайсці.

Калі мой новы гаспадар, капітан разбойніцкага судна, пакінуў мяне пры сабе, я пачаў спадзявацца, што ў наступнае плаванне ён возьме мяне з сабой. Я быў упэўнен, што рана ці позна яго зловіць які-небудзь іспанскі ці партугальскі вайсковы карабль і што тады мяне адпусцяць на волю. Але надзея мая хутка рассеялася, бо ў першы-ж раз, як мой гаспадар вышаў у мора, ён пакінуў мяне дома выконваць чорную работу па гаспадарцы, а вярнуўшыся, загадаў мне перасяліцца на карабль, каб пільнаваць яго.

З гэтага дня я толькі і думаў, каб уцячы. Але ўцякаць было цяжка. У ліку маіх таварышоў-нявольнікаў не было аніводнага англічаніна, якому я мог-бы даверыцца і які згадзіўся-б уцякаць разам са мной; такім чынам

цэлых два гады ў мяне не было і праблеску надзеі.

Але на трэці год у мяне з'явілася магчымасць уцячы. Здарылася гэта так. Мой гаспадар заўсёды, раз ці два на тыдзень, браў карабельную шлюпку і выходзіў на ўзмор'е лавіць рыбу. У кожную такую паездку ён браў мяне і аднаго хлопчыка, якога звалі Ксуры. Мы веславалі і забаўлялі яго, як толькі маглі. І таму, што я акрамя таго быў яшчэ і добрым рыбаловам, ён часамі пасылаў нас адных па рыбу пад наглядам старога маўра, свайго родзіча.

Аднойчы мой гаспадар запрасіў двух гасцей пакатацца на лодцы. Для гэтай паездкі ён нарыхтаваў вялікія запасы харчоў, якія яшчэ з вечара адаслаў да сябе ў лодку.

Я зрабіў усё, як мне было загадана, і на другі дзень зранку сядзеў на баркасе, начыста вымытым, і чакаў гасцей. Раптам гаспадар прыходзіць адзін і кажа, што яго госці не прыедуць сёння, бо іх затрымалі справы. Затым ён загадаў нам траім—мне, хлопчыку Ксуры і маўру—выехаць у мора па рыбу.

— Мае сябры,—сказаў ён,—застануцца ў мяне вячэраць, і таму, як толькі наловіце рыбы, прыносце яе мне дадому.

Вось тут у мяне і мільганулі зноў мае даўнейшыя мары пра волю. Цяпер у мяне было сапраўднае судна, і, як толькі гаспадар пайшоў, я пачаў рыхтавацца,—не да рыбнай лоўлі, а ў далейшае плаванне. Праўда, я не ведаў, куды я накірую свой шлях, але кож-

ная дарога добрая, абы толькі выйсці з-пад няволі.

Раней за ўсё я намякнуў маўру, што нам неабходна дастаць ежу.

— Не можам-жа мы есці без дазволу гаспадарскі хлеб,—сказаў я яму.

— Так, гэта праўда,—адказваў ён і прыцягнуў на баркас вялікі кош з сухарамі і тры збаны прэснай вады.

Я ведаў, дзе стаіць у гаспадара скрыня з вінамі, і, пакуль маўр хадзіў за харчамі, я пераправіў усе бутэлькі ў лодку і паставіў у шуфлядку, як быццам яны былі яшчэ раней падрыхтаваныя для гаспадара. Акрамя таго, я прынёс вялікі кавалак воску (фунтаў пяцьдзесят вагой) ды захапіў маток пражы, сякеру, пілу і малаток. Усё гэта нам вельмі спатрэбілася ў далейшым, асабліва воск, з якога мы зрабілі свечы.

Я прыдумаў яшчэ адну хітрасць, на якую маўр таксама папаўся ў прастаце душы. Яго імя было Ізмаіл, але ўсе называлі яго Молі. Вось я і сказаў яму:

— Молі, у нас на баркасе ёсць гаспадарскія стрэльбы. Што, каб ты прыдбаў пораху і некалькі зарадаў. Можа нам удалося-б падстрэліць сабе на обед пару птушак. Гаспадар трымае порах і шрот на караблі, я ведаю.

— Добра, я прынясу,—сказаў ён і прынёс вялікую скураную торбачку (фунта паўтара вагой, калі не больш) ды другую са шротам—фунтаў пяць або шэсць. Ён захапіў таксама і куляў. Усё гэта мы склалі на баркасе.

Акрамя таго, у гаспадарскай каюце знай-

шлося яшчэ крыху пораху, які я перасыпаў у адну з быўшых у скрыні вялікіх бутэлек, выліўшы з яе рэшткі віна.

Падрыхтаваўшы такім чынам ўсё патрэбнае для дарогі, мы вышлі з гавані, нібыта на рыбную лоўлю.

Павудзіўшы некаторы час і нічога не злавіўшы (я знарок не выцягваў вудачкі, калі ў мяне рыба клявала), я сказаў маўру:

— Дрэнная наша справа. Гаспадар не падзякуе нас за такі дрэнны ўлоў. Трэба адысці далей у мора.

Нічога не падазраваючы, маўр згадзіўся і паставіў ветразі. Я сеў ля стырна і, калі баркас адышоў на мілю ў адкрытае мора, я лёг на борт, як быццам для таго, каб пачаць рыбную лоўлю. Затым, перадаўшы хлопчыку стырно, я шагнуў на нос, падышоў да маўра ззаду, нагнуўся над ім, нібыта разглядаючы нешта наперадзе, і раптам, абхапіўшы яго адной рукой за паясніцу, прыўзняў і кінуў ў мора.

Ён зараз-жа вынырнуў і пачаў крычаць мне, каб я ўзяў яго на баркас, абяцаючы, што паедзе са мной хоць на край свету. Ён так хутка плыў за баркасам, што адлегласць паміж намі прыкметна памяншалася (ветру амаль не было, і баркас ледзь рухаўся). Бачачы, што ён хутка дагоніць нас, я пабег у каюту, узяў там стрэльбу і паказаў яму.

— Я не жадаю табе дрэннага,—крыкнуў я,—але пакінь і ты мяне ў спакоі. Ты добра плаваеш, на моры ціха, табе нічога не варта даплыць да берагу. Паварочвай-жа лепш на-

зад, тады я не крану цябе; але паспрабуй толькі падплыць блізка да баркаса, і я прастрэлю табе галаву, таму што цвёрда парашыў здабыць сабе волю.

Ён павярнуў да берагу і даплыў да яго без асаблівых цяжкасцей, бо ён быў выдатным плаўцом.

Вядома, я мог узяць з сабой старога маўра, а хлопчыка кінуць у мора, але на старога нельга было спадзявацца. Ён быў вельмі адданым свайму гаспадару. Калі ён адплыў даволі далёка, я павярнуўся да хлопчыка і сказаў:

— Ксуры! Калі ты будзеш верным, я зраблю цябе вялікім чалавекам, але, калі ты не паклянешся барадой Магамета, я і цябе кіну ў мора.

Хлопчык ухмыльнуўся, пазіраючы мне проста ў вочы, і пакляўся, што будзе мне верным і паедзе са мной, куды я захачу.

Пакуль маўр не знік з вачэй я трымаў курс у адкрытае мора, лавіруючы супроць ветру.

Але як толькі пачало змяркацца, я пачаў кіраваць на поўдзень, прытрымліваючыся трохі ўсхода, каб не надта адсоўвацца ад берагу. Дзьмуў свежы вецер, але хвалявання не было. Мы ішлі такім добрым ходам, што на другі дзень к тром гадзінам, калі наперадзе ў першы раз паказалася зямля, мы апынуліся ўжо на паўтараста міль ад уладанняў марокскага імператара, ды і кожнага іншага з афрыканскіх уладароў: ва ўсякім разе бераг, да якога мы набліжаліся, быў зусім бяз-

людным. Але ў маўраў я набраўся такога страху і так баяўся зноў трапіць ім у лапы, што, карыстаючыся спрыяльным ветрам, пяць дзён плыў, не спыняючыся, не становячыся на якар і не сходзячы на бераг.

Праз пяць дзён вецер змяніўся: падзьмула з поўдня, пагоні ўжо не было чаго баяцца, і я рашыў падыйсці да берагу і кінуць якар у вусці нейкай маленькай рэчкі.

98903.

Якая гэта была рэчка і дзе яна працякае, у якой краіне, у якога народу,—я зусім невядаю. Я не бачыў на беразе людзей, ды і не жадаў іх бачыць; адзінае, што мне было патрэбна,—прэсная вада. Мы ўвайшлі ў гэтую рэчку пад вечар і рашылі, калі сцямнее, наўплаў дабрацца да берагу і агледзець мясцовасць; але, як толькі сцямнела, мы пачулі з берагу такія жахлівыя гукі, такі дзікі рэў, такое завыванне дзікіх звяроў, што бедны хлопчык ледзь не памёр ад страху і пачаў прасіць мяне не сыходзіць на бераг, пакуль не настане дзень.

— Добра, Ксуры,—сказаў я яму,—пачакаем! Але можа быць, што пры дзённым святле мы там убачым людзей, ад якіх нам будзе яшчэ горш, чымся ад тыграў і львоў.

— А мы пальнём у іх са стрэльб,—сказаў ён са смехам,—яны і ўцякуць.

Я быў рады, што хлопчык такі вясёлы, і, каб падтрымаць у ім гэтую бадзёрасць духу, даў яму келішак віна з гаспадарскіх запасаў. Парада яго па сутнасці была цяпрэннай, і я зрабіў так, як ён сказаў. Усю ноч мы прастаялі на якары і ніводнай хвілі-

ны не спалі. Гадзіны праз дзве-тры пасля таго, як мы кінулі якар, мы пабачылі на беразе вялізных звяроў вельмі дзіўнай пароды (якой—мы і самі не ведалі): яны падыходзілі да самага берагу, уваходзілі ў рэчку, плёхаліся і ваўтузіліся ў вадзе, жадаючы, мусіць асвяжыцца, і пры гэтым вельмі брыдка пішчэлі, чмыхалі, раўлі і вылі; нічога падобнага я да той пары ніколі не чуў.

Ксуры быў страшэнна напалоханы, ды, праўду сказаць, і я таксама. Але мы абодва яшчэ больш перапалохаліся, калі пачулі, што адзін з гэтых страшыдлаў плыве да нашага баркаса; мы не змаглі яго бачыць, але па тым, як ён соп і порскаў, здагадаліся, што гэта павінен быць незвычайных памераў драпежны звер. Бядак Ксуры падумаў, што гэта леў (можа так яно і было) і крыкнуў мне:

— Падымем якар і пойдзем адсюль!

— Не, Ксуры,—адказваў я,—нам няма патрэбы здымацца з якара; мы толькі адпусцім канат падаўжэй, і адыдзем к мору: яны не пагоняцца за намі туды.

Але як толькі сказаў гэтыя словы, я ўбачыў невядомага звера на адлегласці ўсяго якіх двух вёслаў ад баркаса. Прызнаюся, я крыху спалохаўся, аднак зараз-жа ўзяў з каюты стрэльбу і стрэльнуў. Жывёла павярнула назад і паплыла да берагу.

Немагчыма апісаць, які пякельны рэў узняўся на беразе, калі пачуўся мой стрэл: мусіць, тутэйшыя зверы ніколі не чулі гэткага гуку. Тут я канчаткова ўпэўніўся, што нам няма чаго і думаць пра высадку ў гэтых мес-

цах на працягу ночы; але ці можна будзе рызыкнуць высадзіцца ўдзень—гэтага мы таксама не ведалі; зрабіцца здабычай нейкага дзікуна не лепш, чымся трапіць у кіпці льву або тыгру!

Але так ці інакш, тут ці ў іншым месцы, нам неабходна было сысці на бераг, бо ў нас не засталася ані кроплі вады. Ксуры абвясціў, што, калі я пушчу яго, ён дабярэцца да берагу ўброд і пастараецца здабыць прэснай вады. А калі я запытаў яго, чаму-ж ісці яму, а не мне, у адказе хлопчыка прагучэла такая любоў да мяне, што ён навекі падкупіў мяне сваёй адданасцю. Ён адказаў:

— Калі прыдзе дзікі чалавек, ён з'есць мяне, а вы застанецеся цэлы.

— Дык вось што, Ксуры,—сказаў я:—накіруемся разам, а калі дзікі чалавек прыдзе, мы яго заб'ем, і ён не з'есць ні цябе, ні мяне.

Я даў хлопчыку сухароў і глыток віна; затым мы падцягнуліся да зямлі так блізка, на колькі лічылі гэта бяспечным, і скакануўшы ў ваду, накіраваліся да берагу ўброд, не ўзяўшы з сабою нічога, акрамя зброі ды двух збаноў для вады.

Я не хацеў аддаляцца ад берагу, каб не згубіць з віду наш баркас, баючыся, каб уніз па рацэ да нас не спусціліся дзікуны ў пірогах. Але Ксуры, убачыўшы нізінку за мілю ад берагу, пайшоў туды са збаном. Раптам я ўбачыў, што ён бяжыць назад да мяне. Ці не пагналіся за ім дзікуны? Ці не спалохаўся ён якога драпежнага звера? Я кінуўся да яго на ратунак, але, падбегшы бліжэй, убачыў, што

за спіной у яго вісіць нешта вялікае. Высветлілася, што ён забіў нейкага звярка накшталт нашага зайца, але іншага колеру ды з больш даўгімі нагамі. Мы абодва былі рады гэтай удачы, мяса забітай жывёлы здалося нам вельмі смачным; але галоўная радасць, з якою бег да мяне Ксуры, была вестка пра знаходку прэснай вады.

Напоўніўшы нашыя збаны, мы пад'елі забітага зайца і паехалі далей, не знайшоўшы у гэтай мясцовасці аніякіх слядоў чалавека.

Пасля таго, як мы вышлі з вусця рэчкі, нам яшчэ некалькі разоў даводзілася прычальваць да берагу за прэснай вадой.

Аднойчы з самага ранку мы сталі на якар пад.аховай даволі высокага мыска і чакалі прыліву. Раптам Ксуры, у якога зрок быў вастрэй за мой, прашаптаў:

— Зірніце, які страшэнны звер ляжыць вунь там, на прыгорку. Цяпер ён моцна спіць. Пойдзем, пакуль ён не прачнуўся.

Я зірнуў, куды ён паказваў, і сапраўды ўбачыў страшыдлу. Гэта быў вялізны леў. Ён ляжаў пад выступам узгорка, які хаваў яго ад сонца.

— Паслухай, Ксуры,—сказаў я:—ідзі на бераг ды забі гэтага звера.

Хлопчык перапалохаўся.

— Мне забіць яго?!—казаў ён.—Ды ён-жа мяне праглыне ўсяго!

Я не супярэчыў і загадаў толькі не варушыцца; потым прынёс усе нашы стрэльбы (у нас іх было тры). Адну, самую вялікую, я

зарадзіў двума жарабейкамі[1]), усыпаўшы спачатку добры зарад пораху; у другую засунуў дзве вялікія кулі, а ў трэцюю—пяць куляў меншых. Узяўшы першую стрэльбу і добранька прыцэліўшыся, я стрэліў у звера; я цаляў яму ў галаву, але ён ляжаў у такой позе (прыкрыўшы морду лапай), што зарад трапіў яму ў нагу і раструшчыў косць вышэй калена. Ён адразу-ж ускочыў, але адчуўшы боль у перабітай назе, зараз-жа зваліўся; потым зноў стаў на трох лапах і, кульгаючы, пайшоў прэч ад берагу, выпусціўшы такі жахлівы роў, якога я ў жыцці сваім не чуў. Я быў крыху збянтэжаны тым, што не трапіў яму ў галаву; аднак, не чакаючы ніводнай хвіліны, узяў другую стрэльбу і, стрэліўшы зверху наўздагон, на гэты раз трапіў удала. Леў упаў, не выдаўшы ані гука. Тут Ксуры набраўся смеласці і пачаў прасіцца на бераг.

— Добра, ідзі!—сказаў я.

Хлопчык ускочыў у ваду і паплыў да берагу, працуючы адной рукой, бо ў другой трымаў стрэльбу. Падышоўшы шчыльна да раскінутага звера, ён прылажыў дула стрэльбы да яго вуха і забіў яго канчаткова.

Было, вядома, прыемна перамагчы такога звера, але мяса яго не ўжывалася ў страву, і я вельмі шкадаваў, што мы папсавалі тры зарады на гэтую бескарысную дзічыну. Але Ксуры абвясціў, што ён пажывіцца нечым ад забітага льва, і калі мы вярнуліся на баркас, папрасіў у мяне сякеру.

---

[1]) Жарабейка—кавалак волава, які замяняе кулю.

— Навошта?—запытаўся я.

— Адсекчы яму галаву,—адказаў ён.

Аднак галавы адсячы яму ён не здолеў, а адсек толькі лапу, якую і прынёс на баркас. Гэта была страшэнных памераў львіная лапа. Тут мне прышло ў галаву, што можа нам магла-б спатрэбіцца на што-небудзь скура льва і я рашыў паспрабаваць зняць яе. Мы абодва вярнуліся да льва, але я не ведаў, як узяцца за справу. Ксуры быў больш спрытнейшым, як я; я дапамагаў яму, як умеў. Гэтая работа заняла ў нас цэлы дзень. Нарэшце скура была знята; мы расцягнулі яе на страсе нашай каюткі; дні праз два яна зусім прасохла на сонцы і потым служыла мне подсцілкай нанач.

Пасля гэтай астаноўкі мы яшчэ дзён дзесяць-дванаццаць ехалі на поўдзень, імкнучыся як мага больш эканоміць нашы харчовыя запасы, якіх у нас засталося вельмі мала, і выходзячы на бераг толькі па прэсную ваду. Я хацеў дайсці да вусцяў Гамбіі ці Сенегала або наогул да якой-небудзь зручнай стаянкі недалёка ад Зялёнага мыса, бо спадзяваўся сустрэць тут якое-небудзь еўрапейскае судна. Я ведаў, што, калі я яго не сустрэну, мне застанецца ці пусціцца ў мора на пошукі астравоў, ці загінуць сярод чорна-скурых,—іншага выбару ў мяне не было. Мне было вядома, што ўсе еўрапейскія судны, куды-б яны ні накіроўваліся—ці да берагоў Гвенеі, ці ў Бразілію або ў Ост-Індыю,—праходзяць міма Зялёнага мыса: словам, я ска-

заў сабе, што павінен або сустрэць еўрапейскае судна, або загінуць.

Яшчэ дзён дзесяць, як ужо сказана, я трымаўся бліжэй да берагу. Потым я заўважыў, што бязлюдныя прасторы берагавой паласы пачынаюць змяняцца пасёлкамі: у двух-трох месцах мы бачылі на беразе людзей, якія глядзелі на нас. Усе яны былі голыя, чорныя. Аднаго разу я хацеў быў выйсці на бераг і падысці да іх, але Ксуры, мой мудры парадчык, сказаў:

— Не трэба!

Тым не менш я пачаў трымацца бліжэй да берагу, каб мець магчымасць перагаварыць з дзікунамі. Яны зразумелі мой намер і доўга беглі ўдоўж берагу за нашым баркасам. Я заўважыў, што яны былі няўзброеныя, толькі адзін з іх трымаў у руцэ даўгі тонкі кій. Ксуры сказаў мне, што гэта кап'ё і што дзікуны кідаюць коп'і вельмі далёка і вельмі трапна. Таму я трымаўся ад іх здалёк і гутарыў з імі знакамі, імкнучыся галоўным чынам даць ім зразумець, што нам неабходна ежа. Яны зразумелі і пачалі ў сваю чаргу рабіць нам знакі, каб я спыніў сваю лодку, і што яны прынясуць нам харч. Як толькі я спусціў ветразі, два дзікуны пабеглі кудысці і праз поўгадзіны вярнуліся з двума вялікімі кавалкамі сушанага мяса і двума мяшкамі з зернем нейкай збожжавай расліны, якая расце на іхняй зямлі. Мы не ведалі, якое гэта было мяса і якое зерне, аднак выказалі сваю поўную гатоўнасць прыняць тое і другое. Але як атрымаць прапануемы дар?

Мы не адважыліся выйсці за імі на бераг, баючыся дзікуноў, а яны, у сваю чаргу, баяліся нас ніколькі не менш. Нарэшце яны прыдумалі, як выйсці з гэтага становішча без ніякай небяспекі для абодвух бакоў: склаўшы на беразе мяшкі з зернем і мяса, яны адышлі падалей, далі нам час пераправіць усё гэта на баркас і затым вярнуліся на ранейшае месца. Мы падзяквалі іх знакамі. Хутка трапіўся нам выпадак зрабіць ім вялікую паслугу.

Мы не паспелі адыйсці яшчэ ад берагу, як раптам з-за гор выбеглі два велізарныя звяры і кінуліся бегчы прама да мора. Адзін з іх гнаўся за другім; людзі на беразе, асабліва жанчыны, страшна перапалохаліся. Толькі чалавек, які трымаў капьё застаўся на месцы; астатнія пусціліся наўцёкі. Але звяры беглі прама да мора і не рабілі ніякіх намераў напасці на людзей. Яны зразмаху кінуліся ў ваду і пачалі плаваць, як быццам купанне было адзінай мэтай іхняй экскурсіі. Раптам адзін з іх падплыў даволі блізка да баркаса. Я гэтага не чакаў; тым не менш, зарадзіўшы хутка стрэльбу і загадаўшы Ксуры зарадзіць абедзве іншыя, я падрыхтаваўся сустрэць ворага. Як толькі ён наблізіўся да нас на адлегласць стрэлу са стрэльбы, я спусціў курок, і куля трапіла яму ў галаву; ён адразу-ж апусціўся ў ваду, потым вынырнуў і паплыў назад да берагу то знікаючы пад вадой, то зноў выплываючы на паверхню. Ён, відаць, змагаўся са смерцю,

захлынаючыся вадой і сцякаючы крывёю, і, не даплыўшы да берагу, акалеў.

Немагчыма перадаць здзіўленне дзікуноў, калі яны пачулі трэск і ўбачылі агонь са стрэльбы: яны літаральна ледзь не памерлі ад страху і пападалі на зямлю, быццам мёртвыя. Але ўбачыўшы, што звер патануў і што я раблю ім знак падысці бліжэй, яны пасмялелі і ўвайшлі ў ваду, каб выцягнуць забітага звера. Я лёгка вызначыў дзе ён патануў, бо вада ў гэтым месцы афарбавалася крывёй. Зачапіўшы труп вяроўкай, я перакінуў канец яе дзікунам, і яны прыцягнулі забітага звера да берагу. Гэта быў вялікі леапард рэдкай пароды, з плямістай скурай незвычайнай прыгажосці. Дзікуны, стоячы над ім, уздымалі рукі ўгору ў знак здзіўлення: яны не маглі зразумець, чым я забіў яго.

Другі звер, спалохаўшыся майго стрэлу, выскачыў на бераг і пабег назад у горы. Між тым я заўважыў, што неграм вельмі хочацца паесці мяса забітага леапарда, і падумаў, што будзе добра зрабіць такім чынам, каб яны атрымалі яго як падарунак ад мяне. Я паказаў ім знакамі, што яны могуць узяць яго сабе. Яны вельмі дзякавалі мяне і, не трацячы часу, узяліся за работу. Нажоў у іх не было, але завостранымі аскабэлкамі дрэва яны знялі скуру з мёртвага звера так хутка і лоўка, як мы не зрабілі-б гэтага нажом. Яны давалі і мне мяса, але я адмовіўся, зрабіўшы ім знак, што аддаю яго ім, а папрасіў толькі скуру, якую мне і аддалі вельмі ахвотна. Акрамя таго, яны прынеслі для мяне новы запас хар-

чоў, куды большы за ранейшы, і я яго ўзяў, хоць і не ведаў, якія гэта былі прадукты. Затым я папрасіў у іх ваду; паказаўшы ім адзін з нашых збаноў, я перакуліў яго ўверх дном, каб паказаць, што ён пусты і што яго трэба напоўніць. Тады яны пракрычалі нешта на сваёй мове, з натоўпу адлучыліся дзве жанчыны і хутка прынеслі і паставілі на беразе вялікую пасудзіну з апаленай гліны (яны пэўне абпальваюць гліну на сонцы). Я паслаў Ксуры на бераг з усімі нашымі збанамі, і ён напоўніў іх вадой.

Назапасіўшыся такім чынам вадой і харчамі, якія складаліся з нейкага невядомага нам зерня і каранёў,—я развітаўся з гасцінными неграмі і на працягу адзінаццаці дзён плыў у ранейшым кірунку, не зварочваючы к берагу. Нарэшце мілях у пятнаццаці наперадзе я ўбачыў вузкую паласу зямлі, далёка выступаючую ў мора. Надвор'е было ціхае, і я павярнуў у адкрытае мора, каб абагнуць гэтую касу. У той момант, калі мы параўналіся з яе канцом, я выразна ўбачыў мілях у шасці ад берагу з боку акіяна другую паласу зямлі і зразумеў, што вузкая каса—Зялёны мыс, а паласа зямлі, якая была відна здалёк,—астравы той-жа назвы. Але астравы былі вельмі далёка, і я не ведаў, што мне рабіць, не адважваючыся накіравацца да іх. Раптам я пачуў крык хлопчыка:

— Гаспадар! Гаспадар! Ветразі! Карабль!

Дурны хлопчык спалохаўся да поўсмерці, уявіўшы, што гэта павінен быць абавязкова адзін з караблёў яго гаспадара, пасланы за

намі ў дагон; але я ведаў, як далёка адышлі мы ад маўраў, і быў упэўнен, што нам не можа пагражаць небяспека з гэтага боку.

Я выскачыў з каюты і адразу-ж не толькі ўбачыў карабль, але нават заўважыў, што ён быў партугальскі. «Мусіць, нявольнічы,— падумаў я,—і пэўне накіроўваецца да берагоў Гвінеі за неграмі». Але прыгледзеўшыся больш уважліва, я ўпэўніўся, што судна ідзе ў іншым кірунку і не думае паварочваць да берагу. Тады я падняў усе ветразі і павярнуў у адкрытае мора, парашыўшы зрабіць усё магчымае, каб звярнуць на сябе ўвагу яго экіпажа.

Я, аднак, хутка пераканаўся, што нават ідучы поўным ходам, мы не паспеем падысці так блізка, каб людзі маглі заўважыць нашыя сігналы; але якраз у тую хвіліну, калі я пачаў траціць надзею, нас убачылі з палубы ў падзорную трубу. Яны падумалі, як гаварылі мне потым, што гэта лодка з нейкага загінуўшага еўрапейскага судна. Карабль зменшыў ветразі, каб даць нам магчывасць наблізіцца, і праз тры гадзіны мы прычалілі да яго. Мяне засыпалі пытаннямі на партугальскай, іспанскай і французскай мовах, але ніводнай з гэтых моў я не ведаў. Нарэшце адзін матрос, шатландзец, загаварыў са мной па-англійску, і я растлумачыў яму, што я англічанін і збег ад маўраў, дзе мяне трымалі ў няволі. Тады мяне і майго спадарожніка вельмі добра прынялі на карабль, разам з баркасам і ўсім нашым дабром.

Лёгка сабе ўявіць, якою радасцю напоў-

ніла мяне пачуццё волі пасля такога ганебнага і жахлівага становішча, у якім я знаходзіўся. Я зараз-жа прапанаваў усю маю маёмасць капітану, як узнагароду за маё збавенне, але ён велікадушна адмовіўся, кажучы, што нічога ад мяне не возьме і што ўсе мае рэчы будуць звернуты мне ў непарушнасці, як толькі мы прыедзем у Бразілію.

— Бразілія вельмі далёка ад вашай радзімы, і вы памрэце там з голаду, калі я адбяру ў вас вашу маёмасць. Навошта-ж было мне вас ратаваць? Не, не, сін'ёр, я давязу вас да Бразіліі дарма, а вашы рэчы дадуць вам мажлівасць пражыць там, колькі спатрэбіцца, і аплаціць ваш праезд на радзіму.

Раздзел чацверты

Рабінзон пасяляецца ў Бразіліі.—Ён зноў адпраўляецца ў мора і церпіць крушэнне.

Капітан быў велікадушны не толькі на словах, але і на справе. Ён распарадзіўся, каб ніхто з матросаў не пасмеў дакранацца да маёй маёмасці, перапісаў усе мае рэчы і склаў іх у асобным памяшканні, а опіс перадаў мне, каб я, прыехаўшы ў Бразілію, мог атрымаць у непарушнасці кожную рэч.

Яму вельмі падабаўся баркас, які меў вялікую каштоўнасць. Ён сказаў, што ахвотна купіць яго ў мяне, і спытаў, у колькі я яго цаню. На гэта я адказаў:

— Вы абышліся са мной так велікадушна ва ўсіх адносінах, што, уступаючы з вамі ў гандлёвую здзелку, я ні ў якім разе не пачну

вызначаць цаны за мой тавар, а дам гэтае права вам.

Тады ён сказаў, што выдасць мне пісьмовае абавязацельства заплаціць за мой баркас восемдзесят піястраў,[1]) але калі ў Бразіліі ў мяне знойдзецца іншы пакупнік, які дасць мне больш, то ён выплаціць мне розніцу ў цане.

Наш пераезд да Бразіліі быў зусім спакойным, і пасля дваццацідвухдзённага плавання мы ўвайшлі ў бухту Ўсіх Святых.

Такім чынам, я яшчэ раз выратаваўся ад бяды, вышаўшы з самага жахлівага становішча, у якое толькі можа трапіць чалавек, і цяпер мне засталося рашыць, што рабіць з сабой.

Я ніколі не забуду велікадушных адносін да мяне капітана партугальскага карабля. Ён нічога не ўзяў ад мяне за праезд, добрасумленна вярнуў мне ўсе мае рэчы, даў мне сорак піястраў за львіную скуру і дваццаць за скуру леапарда, ды наогул купіў усё, што ў мяне было лішняга і што неспадручна было прадаць, у тым ліку скрынку з вінамі, дзве стрэльбы і рэшту воску (частка якога ў нас пайшла на свечы). Адным словам, калі я распрадаў большую частку сваёй маёмасці, і вышаў на бераг у Бразіліі, у мяне ў кішэні было дзвесце дваццаць піястраў.

Калі мы прыехалі ў Бразілію, мой другкапітан завёў мяне ў дом аднаго свайго знаёмага, такога-ж добрага і сумленнага чалаве-

---

[1]) Піястр – іспанская манета.

ка, як ён сам. Гэта быў арандатар цукровай плантацыі і цукровага завода. Я пражыў у яго даволі доўгі час і дзякуючы гэтаму пазнаёміўся з цукровай вытворчасцю. Бачачы, як добра жывецца тутэйшым людзям і як яны хутка багацеюць, я парашыў і сам заняцца гэтай справай, застаўшыся назаўсёды ў Бразіліі. На ўсе мае наяўныя грошы я ўзяў у арэнду ўчастак зямлі і пачаў працаваць над планам маёй будучай плантацыі і фальварка, выходзячы з памераў той сумы, якую я разлічваў атрымаць з Лондана.

Быў у мяне сусед, партугалец з Лісабона, родам англічанін, па прозвішчу Уэльс. Ён знаходзіўся прыблізна ў такіх-жа ўмовах, як і я. Мы былі з ім ў самых сяброўскіх адносінах. У мяне, як і ў яго, зваротны капітал быў досыць невялікі, і першыя два гады мы абодва ледзь-ледзь маглі пракарміцца. Але па меры таго, як зямля распрацоўвалася, мы багацелі, так што на трэці год частка зямлі была ў нас засеяна тутуном, і мы падрыхтавалі па вялікаму ўчастку пад цукровы трасцік к будучаму году.

Пражыўшы у Бразіліі амаль чатыры гады і паступова пашыраючы сваю справу, я, зразумела, не толькі вывучыў мясцовую мову, але завязаў вялікія знаёмствы з маімі суседзямі, а таксама з купцамі з Сан-Сальвадора, бліжэйшага да нас прыморскага порта.

Сустракаючыся з тымі ці іншымі, я часта расказваў пра мае дзве паездкі да берагоў Гвінеі, аб тым, як вядзецца гандаль з гвінейскімі неграмі і як лёгка там за забаўку—за

якія-небудзь каралы, нажы, нажніцы, сякеры, шкелцы і іншую дрэнь—атрымаць залаты пясок і слановую косць. Мае расказы яны слухалі вельмі ўважліва. Неяк аднаго разу нас сабралася вялікая кампанія—я і некалькі маіх знаёмых. Мы жвава гутарылі на гэтую тэму. На другі дзень зранку трое з маіх гасцей з'віліся да мяне і абвясцілі, што, паразду маўшы добранька над тым, што я ім расказваў напярэдадні, яны прышлі да мяне з сакрэтнай прапановай. Затым, узяўшы з мяне слова, што ўсё, што я ад іх пачую, застанецца паміж нас, яны сказалі мне:

— Усе мы маем плантацыі, але работа наша ідзе вельмі цяжка,бо ў нас няма грошай, каб наняць рабочых. Вы кажаце, што там, дзе вы былі, можна лёгка набыць цэлыя грудыы залатога пяску і іншых каштоўнасцей. Мы хочам адправіць карабль у Гвінею па золата. Ці згодны вы паехаць туды? Мы дамо вам ўсё, што трэба для абмену. За вашу працу вы атрымаеце сваю долю здабычы, такую самую, як і кожны з нас.

Паўтараю, мне было на вяку напісана зрабіцца вінавайцам уласнай пагібелі.

Як раней я не здолеў перамагчы сваёй любові да бадзяжніцтва і не паслухаўся добрых парад бацькі, так і цяпер я не здолеў устаяць супроць спакуслівай прапановы.

Я адказаў маім сябрам, што з радасцю паеду ў Гвінею, з той аднак умовай, каб яны ўзяліся прыгледзець у маю адсутнасць за маёй маёмасцю і распарадзіліся ёю па маіх указаннях у тым выпадку, калі я не вярнуся.

Усё гэта яны мне ўрачыста абяцалі, замацаваўшы нашу ўмову пісьмовым абавязацельствам; я-ж, з свайго боку, зрабіў фармальны тэстамэнт на выпадак маёй смерці: усю сваю рухомую і нерухомую маёмасць я адпісаў партугальскаму капітану, які выратаваў мне жыццё.

Карабль у свой час быў падрыхтаван, нагружан адпаведным таварам і ўсё зроблена па ўзаемнай згодзе з маімі хаўруснікамі. І яшчэ раз, у нядобрую гадзіну, 1 верасня 1659 года, я ўзышоў на палубу карабля. Гэта быў той самы дзень, у які восем гадоў назад я ўцёк ад бацькі ды маткі ў Гуль,—той дзень, калі я паўстаў супроць бацькоўскай улады і так бязглузда накіраваў свой лёс.

Пасля дванаццацідзённага плавання мы перасеклі экватар і знаходзіліся, па апошніх назіраннях, пад 7°22' паўночнай шыраты, калі на нас нечакана наляцеў грозны шквал. Гэта быў сапраўдны ўраган. Ён пачаўся з паўднёвага ўсхода, потым пачаў дзьмуць у адваротны бок і нарэшце завярнуў з паўночнага ўсхода з такой жахлівай сілай, што на працягу дванаццаці дзён мы маглі толькі, аддаючыся на волю лёсу, плысці, куды нас гнала лютасць стыхіі. Няма чаго і казаць, што ўсе гэтыя дванаццаць дзён я кожную гадзіну чакаў смерці, ды і ніхто з нас не думаў застацца ў жывых.

Аднаго разу, з самага ранку (вецер усё яшчэ не здаваў, і мы амаль згубілі надзею на выратаванне), адзін з матросаў крыкнуў:

— Зямля!



Але не паспелі мы выскачыць з каюты, каб даведацца, дзе мы знаходзімся, як судна села на пясчаную мель. У той-жа момант ад раптоўнай астаноўкі вада хлынула на палубу з жахлівай сілай.

Карабль так глыбока засеў у пяску, што не было чаго і думаць сцягнуць яго з зямлі, і нам заставалася толькі паклапаціцца аб уласным ратунку, калі ён быў магчымым. У нас былі дзве шлюпкі. Адна вісела за кармой, але ў час шторму яна разбілася аб стырно, а потым яе сарвала ды панесла ў мора. Засталася другая, але як спусціць яе ў ваду? Гэта была цяжкая задача. А між тым нельга было марудзіць: карабль мог кожную хвіліну расшчапіцца надвое, і некаторыя нават гаварылі, што ён ужо даў шчыліну.

Памочнік капітана кінуўся да шлюпкі, якая вісела ля барта на блоках, і з дапамогай астатніх людзей экіпажа падрыхтаваў яе да спуску на ваду. Мы ўсе, адзінаццаць чалавек, увайшлі ў шлюпку, і аддаліся на волю бушуючых хваляў, бо хоць шторм значна сцішыўся, але ўсё-ткі на бераг набягалі страшэнныя валы, і мора магло быць сапраўды названа шалёным.

Наша становішча па сутнасці было вельмі дрэннае: мы ясна бачылі, што нам няма ратунку. Ветразей у нас не было, ды і ўсёроўна яны былі-б нам бескарысныя. Мы веславалі да берагу з каменем на сэрцы, як людзі, якіх вядуць на смерць: мы вельмі добра ведалі, што, як толькі шлюпка падыдзе бліжэй да зямлі, яе разнясе прыбоем на тысячу

кавалкаў. Нас гналі вецер і плынь. Мы налягалі на вёслы, уласнай рукой набліжаючы сваю пагібель.

Нас аднесла міль на чатыры ад таго месца, дзе засеў наш карабль, і раптам велізарны вал набег з кармы на нашую шлюпку. Гэта быў апошні смяротны ўдар. Вал-гігант накінуўся на нас так шпарка, што ў адно імгненне перакуліў нашу шлюпку. Мы не паспелі ахнуць, як апынуліся пад вадой, далёка ад шлюпкі і адзін ад аднаго.

Ніякім пяром нельга апісаць той трывогі, якая авалодала мною, калі я пагрузіўся ў ваду. Я вельмі добра плаваю, але я не мог адразу вынырнуць на паверхню і ледзь не задыхнуўся. Хваля падхапіла мяне, працягала на досыць значную адлегласць у кірунку да зямлі, распалася і адхлынула назад, пакінуўшы мяне напалову мёртвым, бо я нахлёбаўся вады. Я крыху перадыхнуў і ачуняў. Убачыўшы, што зямля так блізка (куды бліжэй, як я чакаў), я паспяшаўся да берагу. Я спадзяваўся даплысці да яго раней, як набяжыць і падхопіць мяне другая хваля, але хутка зразумеў, што яе мне не мінуць: мора даганяла мяне, як раз'юшаны звер. Змагацца з ім у мяне не было сілы.

Наступная хваля пахавала мяне футаў на дваццаць, на трыццаць пад вадой. Затым мяне падхапіла і з незвычайнай хуткасцю панесла да берагу. Я затрымаў дыханне і паплыў па плыні, з усіх сіл дапамагаючы ёй. Раптам я адчуў, што ўздымаюся ўверх. Хутка, на вялікую маю радасць, мае рукі і галава

апынуліся над вадой, і хоць прайшло не больш двух секунд да новай хвалі, але я паспеў перадыхнуць, і гэта дадало сілы. Новая хваля зноў накрыла мяне з галавой, але на гэты раз я прабыў пад вадой не так доўга. Як толькі галоўная маса вады адхлынула назад, я, не марудзячы, паплыў да берагу і хутка адчуў пад нагамі дно. Я пастаяў крыху, уздыхнуў поўнымі грудзьмі і пусціўся бегчы да берагу.

Але і цяпер я не мінуў морскага гневу: яшчэ два разы яно мяне даганяла, два разы падхоплівала мяне хваляй і выносіла ўсё бліжэй ды бліжэй да берагу, які ў гэтым месцы быў, на шчасце, плоскім і вельмі пахілым.

Апошні вал ледзь не загубіў мяне: захапіўшы мяне ў сваім няўтрымным імкненні, ён вынес мяне на скалу ды з такой сілай ударыў аб яе бокам ды грудзьмі, што ў мяне аж заняло дыханне, і я страціў прытомнасць.

Некаторы час я быў зусім бездапаможным і заставаўся ў поўнай уладзе мора, і, каб яно паспела зноў схапіць мяне ў свае абдымкі, перш чым свядомасць вярнулася да мяне, я немінуча захлынуўся-б.

Але я апрытомнеў якраз своечасова: убачыўшы, што зараз мяне зноў накрые хваля, я моцна зачапіўся за выступ майго ўцёса і стрымліваючы дыханне, перачакаў гэтую хвалю.

Тут, бліжэй да зямлі, хвалі былі ўжо не такія высокія і наляталі з меншай сілай. Калі вада адхлынула, я пабег уперад і апынуўся так блізка ля берагу, што наступная хваля

хоць і перакацілася праз мяне, але ўжо не здолела аднесці мяне назад у мора. Яшчэ некалькі крокаў, і я, на вялікую маю радасць, адчуў сябе на сушы. Знямогшыся, успоўз я на прыберажныя скалы ды ўпаў на траву. Тут я быў у бяспецы: мора не магло дастаць мяне.

Няма, я думаю, такіх слоў, якімі можна было-б паказаць з дастатковай яскравасцю радасць чалавека, устаўшага, можна сказаць, з дамавіны: я хадзіў па беразе вялікімі крокамі, размахваючы рукамі, і ўжо сам не памятаю добра, што рабіў. Уся мая істота была, калі можна так сказаць, паглынута адчуваннем майго збавення. Я думаў, што жывы я адзін, а ўсе мае таварышы патанулі. Ва ўсякім разе, нікога з іх я больш не бачыў; ад іх і слядоў не засталося, акрамя трох, належачых ім капелюшоў, аднаго каўпака ды двух няпарных чаравікаў, выкінутых морам.

Я ўспомніў, што мне трэба агледзець мясцовасць, каб даведацца, куды я трапіў, і вырашыць, што мне рабіць.

І, як толькі я аб гэтым успомніў, мая радасць адразу-ж астыла: я зразумеў, што маё збавенне, па сутнасці, не было збавеннем. На мне не засталося сухой ніткі, а пераапрануцца не было ў што. У мяне не было ежы. У мяне не было нават вады, каб падмацаваць сілы; мяне чакала або галодная смерць, або смерць ад драпежных звяроў. Але што жахлівей за ўсё—у мяне не было зброі, і я не мог ні паляваць на дробную дзічыну, каб пракарміцца, ні абараняцца ад буйных звяроў, якія

былі дужэйшыя за мяне. У мяне не было нічога, акрамя нажа, люлькі ды каробкі з тытуном. Гэта была ўся мая маёмасць. І, падумаўшы пра сваю горкую долю, я прышоў у такі адчай, што пачаў бегаць па берагу і крычаць, як вар'ят. Калі надышла ноч, я са сціснутым сэрцам пытаў сябе: «Што мяне чакае, калі ў гэтай краіне водзяцца драпежныя звяры? Яны-ж заўсёды выходзяць на здабычу па начах».

Адзінае, што я мог прыдумаць, гэта ўлезці на стаяўшае недалёка тоўстае сукаватае дрэва, падобнае на ёлку, але з больш калючымі іголкамі, і прасядзець на ім усю ноч да раніцы, а калі надыйдзе раніца, вырашыць, якою смерцю лепш памерці, бо я не бачыў аніякай мажлівасці жыць у гэтым месцы. Мяне вельмі мучыла смага. Я прайшоў з поўвярсты ў глыб краіны, спадзяючыся знайсці прэсную ваду, і, на вялікую маю радасць, сапраўды знайшоў ручаінку.

Напіўшыся і ўзяўшы ў рот крыху тытуну, каб не так моцна адчуваць голад, я вярнуўся да дрэва, узлез на яго і прыладзіўся такім чынам, каб не скінуцца, калі засну. Затым я зрэзаў тоўсты сук, выстругаў з яго дубінку на выпадак нападу, палажыў яе сабе на калены, усеўся ямчэй і, будучы вельмі стомленым, моцна заснуў.

Я спаў так салодка, як, мне здаецца, нявшмат каму спалася-б на маім месцы, і ніколі, ні да гэтай начы, ні пасля, я не прачынаўся такім свежым і бадзёрым.

Раздзел пяты

Рабінзон на нежылым востраве. — Ён здабывае рэчы з карабля і будуе сабе жыллё

Калі я прачнуўся, быў ужо дзень; надвор'е прасвятлілася, вецер сціх, мора супакоілася. Я быў вельмі здзіўлены, зірнуўшы на пакінуты намі карабль: ён апынуўся ў іншым месцы—куды бліжэй да берагу, амаль ля самай скалы, аб якую мяне так моцна стукнула напярэдадні. Мусіць, за ноч яго зняў з мелі прыліў ды прыгнаў сюды. Цяпер ён стаяў не далей мілі ад таго месца, дзе я правёў ноч, і таму, што ён стаяў амаль прама, я вырашыў пабыць на ім, каб дастаць ежы і ўзяць іншыя неабходныя рэчы.

Слусціўшыся з дрэва, я яшчэ раз азірнуўся навокал, і першае, што я ўбачыў, была наша шлюпка, якая ляжала мілі за дзве направа, на сухім беразе. Я пайшоў быў да яе, але высветлілася, што туды нельга прайсці простай дарогай: у бераг глыбока ўрэзвалася бухтачка шырынёю з поўмілі і загароджвала шлях. Я павярнуў назад, адклаўшы пакуль свой намер дабрацца да лодкі, бо мне больш важна было трапіць хутчэй на карабль.

Пасля поўдня хваляванне на моры зусім уляглося, і адліў быў такі вялікі, што тры чвэрткі дарогі да карабля я прайшоў па сухім месцы. Цяпер да яго заставалася толькі чвэртка мілі. Тут я зноў адчуў прыступ глыбокага гора: мне зрабілася ясна, што калі-б мы засталіся на караблі, мы ўсе былі-б жы-

выя; перачакаўшы шторм, мы ў добрым здароўі перабраліся-б на бераг, і я не быў-бы, як цяпер, няшчаснай істотай, адрэзанай ад свету. Гэтая думка зноў выклікала слёзы на вачах маіх, але ўспомніўшы, што слёзы гору не дапамогуць, я пайшоў далей. Распрануўшыся (дзень быў надта гарачы), я ўвайшоў у ваду і паплыў.

Але, калі я падплыў да карабля, з'явіліся новыя цяжкасці: як на яго ўзлезці. Ён стаяў на мелкім месцы, таму ўвесь яго кузаў выступаў з вады, а зачапіцца не было за што. Раптам я ўбачыў вяроўку (здзіўляюся, як яна адразу не кінулася мне ў вочы). Яна звешвалася з бака, і канец яе быў так нізка над вадой, што мне ўдалося злавіць яго, хоць і з вялікай цяжкасцю, і я ўзлез на палубу па вяроўцы. Падводная частка карабля была, відаць, прабітая, бо ў труме стаяла вада. Але ён засеў кілем у пясчанай або, вярней, глеістай мяліне, вельмі нахіленай, і таму ён сам быў нахілены: карма была прыўзнята, а нос амаль датыкаўся вады. Такім чынам уся кармавая частка была без вады, і ўсё, што там было складзена, не падмокла. Я паспяшаўся ў гэтым упэўніцца, бо мне перш за ўсё хацелася даведацца, што з рэчаў было папсавана, і што засталося цэлым.

Выявілася, па-першае, што ўвесь запас харчу быў сухі, а як мяне мучыў голад, то я першым чынам накіраваўся ў кладоўку, набіў кішэні сухарамі і, працягваючы агляд карабля, еў нахаду, каб не траціць часу. У кают-кампаніі я знайшоў бутэльку рому і сер-

бануў з яе некалькі добрых глыткоў, бо мне вельмі неабходна было падмацаваць сілы для далейшай работы.

Перш за ўсё мне патрэбна была лодка, каб перавесці на бераг тыя рэчы, якія маглі мне спатрэбіцца. Але лодкі не было адкуль узяць, а жадаць немагчымага бескарысна. Пільная патрэба выклікае вынаходлівасць, і я жвава прыняўся за работу. На караблі былі запасныя мачты, сценьгі і рэі. З гэтага матэрыялу я рашыў пабудаваць плыт.

Выбраўшы некалькі бярвенняў лягчэйшых, я перакінуў іх за борт, абвязаўшы загадзя кожнае бервяно вяроўкай, каб іх нікуды не знесла. Затым я спусціўся з карабля, прыцягнуў да сябе чатыры бервяны, моцна звязаў іх між сабой па абодвух канцах, замацаваў яшчэ зверху двума паложанымі накрыж кароценькімі дошкамі, і ў мяне вышла нешта накшталт плыта.

Мой плыт вельмі добра вытрымліваў мой цяжар, але для вялікага грузу быў вельмі малы. Тады зноў узлез я на карабль, адшукаў пілу нашага карабельнага цесляра і распілаваў запасную мачту на тры бервяны, якімі і павялічыў мой плыт. Гэтая работа каштавала мне велізарных сіл, але жаданне назапасіць усё неабходнае для жыцця падтрымлівала мяне, і я зрабіў тое, на што пры звычайных абставінах у мяне нехапіла-б сілы.

Цяпер мой плыт мог вытрымаць даволі вялікі груз. Наступнай маёй справай было пагрузіць яго і паклапаціцца аб тым, каб зберагчы мой груз ад морскага прыбою.

Я не траціў часу. Перш за ўсё я палажыў на плыт усе дошкі, якія знайшліся на караблі; на гэтыя дошкі я паставіў тры скрыні, належачыя нашым матросам, узламаўшы спачатку замкі і вынуўшы ўсё, што было ў скрынях. Затым, памеркаваўшы, што з рэчаў магло спатрэбіцца перш за ўсё, я падабраў гэтыя рэчы і напхаў імі ўсе тры скрыні. У адну я палажыў харчы: рыс, сухары, тры кругі галандскага сыру, пяць вялікіх кавалкаў сушанай казляціны, якая служыла нам галоўнай мясной стравай і рэшткі ячменю, які мы везлі з Еўропы для курэй, што былі на караблі; частка зерня засталася, бо курэй мы ўжо даўно з'елі. Гэты ячмень быў перамешан з пшаніцай і вельмі мне спатрэбіўся-б, але, як потым высветлілася, ён быў папсаваны пацукамі. Акрамя таго, я знайшоў некалькі скрынак з віном і шэсць балонаў рысавай гарэлкі, якія належалі капітану. Усе гэтыя скрынкі я паставіў проста на плыт, бо ў скрынях яны не змясціліся-б.

Між тым, пакуль я быў заняты пагрузкай, пачаўся прыліў і, на вялікі мой жаль, я ўбачыў, што мой камзол, сарочку і жылетку, якія я пакінуў на беразе, знесла ў мора. Цяпер у мяне засталіся толькі панчохі ды штаны (палатняныя, кароткія, да кален), якіх я не здымаў. Гэта прымусіла мяне падумаць аб тым, каб набраць вопраткі. На караблі было даволі ўсякага адзення, але я ўзяў пакуль толькі адну пару, бо мяне куды больш цікавіла іншае і, перш за ўсё, рабочыя інструменты. Пасля доўгіх пошукаў я знайшоў скрын-

ку нашага цесляра, і гэта была для мяне сапраўды каштоўная знаходка, якую я не аддаў-бы ў той час за цэлы транспарт залатога пяску. Я паставіў на плыт гэтую скрынку і нават не зазірнуў у яе, бо мне было прыблізна вядома, якія ў ёй інструменты.

Цяпер мне заставалася набраць зброі ды зарадаў. У кающе я знайшоў дзве добрыя стрэльбы і два пісталеты, якія я перапраўіў на плыт разам з парахоўніцай, мяшэчкам шроту і двума старымі, заіржавелымі шпагамі. Я ведаў, што ў нас былі тры кадушачкі пораху, але не ведаў, дзе яны схаваны; аднак, пашукаўшы добра, я знайшоў іх. Адна з іх падмокла, а дзве былі зусім сухія, і я перацягнуў іх на плыт. Цяпер мой плыт быў дастаткова нагружан, і трэ' было адпраўляцца ў дарогу. Дабрацца да берагу на плыце без ветразяў, без стырна—нялёгкая задача: досыць было самага слабага парыва ветру, каб перакуліць усю маю пабудову.

Я выгледзеў маленечкую бухту, да якой і накіраваў свой плыт. З вялікай цяжкасцю правёў я яго поперак плыні і ўрэшце ўвайшоў у маленькую затоку, упёршыся ў дно вяслом, бо тут было мелка; як толькі пачаўся адліў, мой плыт з усім грузам апынуўся на сухім беразе.

Цяпер мне трэ' было агледзець мясцовасць і выбраць сабе зручнае месца для жылля, такое, дзе-б я мог скласці сваю маёмасць і дзе-б яна была абаронена ад усялякіх выпадковасцей. Я ўсё яшчэ не ведаў, куды я трапіў: на матэрык ці на востраў, у заселе-

ную ці нежылую краіну; не ведаў, ці пагражае мне небяспека з боку драпежных звяроў. За поўмілі ці крыху больш відаць быў узгорак круты і высокі. Я рашыў узысці на яго. Узяўшы стрэльбу, пісталет і парахоўніцу, я пайшоў на разведку. Калі я ўзлез на вяршыню ўзгорка (гэта каштавала мне нямалых сіл), я зразумеў, які горкі лёс выпаў мне на долю: я быў на востраве!

Навакол з усіх бакоў было мора, за якім нідзе не было відаць зямлі, калі не лічыць тырчэўшых здалёк некалькіх рыфаў ды двух маленькіх, менш за мой, астравоў, што ляжалі міль за дзевяць к захаду.

Я заўважыў яшчэ, што мой востраў быў даволі бедны на расліннасць і, відаць па ўсіх адзнаках, нежылы. Можа на ім і былі драпежныя зверы, але пакуль я ніводнага не бачыў. Затое птушак вадзілася шмат, але усе невядомых мне пародаў, і таму ў далейшым, калі мне даводзілася падстрэліць птушку, я ніколі не мог вызначыць па яе выгляду, ці можна есці яе мяса ці не. Спускаючыся з узгорка, я падстрэліў адну, вельмі вялікую, якая сядзела на дрэве на ўскраіне лесу. Я думаю, гэта быў першы стрэл, які раздаўся тут ад стварэння свету. Не паспеў я стрэліць, як над лесам узнялася хмара птушак і ўзняўся нястройны канцэрт птушыных галасоў; кожная крычала па-свойму, але ніводзін з гэтых крыкаў не быў падобны на крыкі знаёмых мне птушак. Што тычыцца той птушкі, якую я забіў, то, по-мойму, гэта была разнавіднасць нашага ястраба: яна вельмі нагад-

вала яструба афарбоўкай пер'яў ды формай дзюбы, толькі кіпці ў яе былі куды карацей. Яе мяса пахла падлай, і я не мог яго есці.

Здаволіўшыся на першы выпадак гэтымі вынаходніцтвамі, я вярнуўся да плыта і ўзяўся перацягваць рэчы на бераг. Гэта заняло ў мяне ўвесь астатні дзень. Я не ведаў, як і дзе мне прытуліцца нанач. Класціся проста на зямлі я баяўся. Што, калі мне будзе пагражаць напад якога-небудзь драпежніка? Таму, выбраўшы на беразе зручнае месца для начлегу, я загарадзіў яго з усіх бакоў скрынямі, а ў сярэдзіне гэтай агарожы зрабіў з дошак нешта накшталт шалаша.

Непакоіла мяне таксама пытанне, як я буду здабываць сабе ежу, калі ў мяне выйдуць запасы: акрамя птушак ды двух нейкіх звяркоў накшталт нашага зайца, якія выскачылі з лесу, пачуўшы гук майго стрэлу, ніякай жыўнасці я тут не бачыў.

Але цяпер я больш думаў аб іншым. Я прывёз з карабля далёка яшчэ не ўсё, што можна было ўзяць; там засталося шмат рэчаў, якія маглі-б мне спатрэбіцца, і перш за ўсё ветразі ды канаты. Таму я рашыў, калі нішто не перашкодзіць, зноў пабываць на караблі. Я ведаў, што пры першай-жа буры яго разаб'е ў трэскі, таму і рашыў адкласці ўсе іншыя справы, пакуль не вывезу на бераг усяго да апошняга цвічка.

Прышоўшы да такога рашэння, я пачаў думаць, ці ехаць мне на плыце, ці паплысці, як у першы раз. Я рашыў, што лепш плысці. Толькі на гэты раз я распрануўся ў шалашы,

застаўшыся ў адной ніжняй сарочцы, у палатняных штанах ды ў адкрытых чаравіках на босую нагу.

Як і ў першы раз, я ўзлез на карабль па вяроўцы; затым пабудаваў новы плыт і перавёз на ім шмат карысных рэчаў. Па-першае, усё, што знайшлося ў каморцы нашага цесляра, а менавіта: два ці тры мяшкі з цвікамі (вялікімі і дробнымі), адвёртку, дзесяткі са два сякер, а галоўнае, такую карысную рэч, як тачыла.

Акрамя пералічаных рэчаў, я ўзяў на караблі ўсё адзенне, якое знайшоў, ды захапіў яшчэ запасныя ветразі, гамак і некалькі сеннікоў ды падушак. Усё гэта я пагрузіў на плыт і, к вялікаму майму задаваленню, шчасліва даставіў на бераг.

Пасля таго я ўзяўся за пабудову палаткі. Я зрабіў яе з ветразя і жэрдак, якіх я нарэзаў у лесе. У палатку я перанёс усё тое, што магло папсавацца ад сонца і дажджу, а навокал панастаўляў пустых скрыняў на выпадак нечаканага нападу людзей ці жывёл.

Уваход у палатку я ўмацаваў вялікай скрыняй, паставіўшы яе бокам, а з сярэдзіны загарадзіўся дошкамі. Затым, разаслаўшы на зямлі пасцель, пад галаву палажыў два пісталеты, побач—стрэльбу і лёг. Пасля караблекрушэння гэта была першая ноч, якую я правёў у пасцелі. Я спакойна праспаў да раніцы, і нядзіва, бо ў папярэднюю ноч спаў вельмі мала ды ўвесь той дзень працаваў,— спачатку грузіў рэчы з карабля на плыт, а потым перапраўляў іх на бераг.

Ні ў каго, я думаю, не было такога вялізнага склада рэчаў для асабістых патрэб, які быў цяпер у мяне. Але мне ўсё здавалася мала: пакуль карабль быў цэлы і стаяў на ранейшым месцы і пакуль на ім заставалася хоць адна рэч, якую я мог скарыстаць, я лічыў неабходным папаўняць свае запасы.

Трэцяя мая экскурсія была асабліва паспяховай. Я разабраў усе снасці і ўзяў з сабой ўсе вяроўкі. У гэты-ж раз я прывёз вялікі кавалак запасной парусіны, якая служыла ў нас для пачынкі ветразяў, і бочачку з падмоклым порахам, які я было пакінуў на караблі. Нарэшце я пераправіў на бераг усе ветразі да апошняга; толькі мне прышлося разрэзаць іх на кавалкі і перавозіць па частках, але гэта было няважна, бо ветразі былі мне не патрэбныя, і ўся іхняя каштоўнасць для мяне была ў матэрыяле.

Цяпер з карабля было ўзята выключна ўсё, што пад сілу падняць аднаму чалавеку. Засталіся толькі цяжкія рэчы, за якія я ўзяўся ў наступны рэйс. Я пачаў з канатаў. Кожны канат я разрэзаў на кавалкі такой велічыні, каб мне не было занадта цяжка справіцца з імі, і такім чынам, па частках, перавёз тры канаты; акрамя таго, я ўзяў з карабля ўсе жалезныя часткі, якія мог садраць пры дапамозе сякеры. Затым абсек рэі, пабудаваў з іх плыт большы, нагрузіў на яго ўсе гэтыя цяжкія рэчы і паехаў назад.

Але на гэты раз шчасце мне здрадзіла: мой плыт быў такім важкім, што кіраваць ім было вельмі нязручна. Калі, увайшоўшы ў

бухтачку, я падыходзіў да берагу, дзе была выгружана мая астатняя маёмасць, плыт перакінуўся, і я ўпаў у ваду з усім маім грузам. Мне асабіста гэта не пагражала бядой, бо здарылася яно амаль ля самага берагу; але груз мой прапаў, прынамсі значная частка яго, галоўнае—жалеза, якое вельмі мне спатрэбілася-б і аб якім я асабліва шкадаваў. Праўда, калі пачаўся адліў, я выцягнуў на бераг амаль усе кавалкі каната і некалькі кавалкаў жалеза, але мне прыходзілася ныраць за кожным кавалкам, і гэта мяне вельмі змарыла.

Мае паездкі на карабль былі штодзённымі, і кожны раз я прывозіў новыя запасы.

Ужо трынаццаць дзён я жыў на востраве і за гэты час пабываў на караблі адзінаццаць разоў, перацягнуўшы на бераг абсалютна ўсё, што можа перацягнуць пара чалавечых рук. Каб ціхае надвор'е пратрымалася далей, я ўпэўнены, што прывёз-бы па частках увесь карабль: але робячы падрыхтоўку да дванаццатага рэйса, я заўважыў, што пачынаецца вецер. Тым не менш, дачакаўшыся адліву, я ўсё-ж такі адправіўся на карабль. У першыя разы я так добра абшукаў нашу каюту, што мне здавалася, там ужо нічога нельга знайсці, але тут мне кінулася ў вочы шыфан'ерка з двума шуфлядамі; у адной я знайшоў тры брытвы, вялікія нажніцы і каля дзесятка добрых відэльцаў і нажоў у другой былі грошы часткова еўрапейскай, часткова бразільскай сярэбранай і залатой манетай, усяго да трыццаці шасці фунтаў стэрлінгаў.

Я ўсміхнуўся, калі ўбачыў гэтыя грошы. «Непатрэбнае смецце,—прамовіў я,—навошта ты мне цяпер? Ты таго не варты, каб я нагнуўся ды падняў цябе з падлогі. Усю гэтую кучу золата я аддаў-бы за маленькі ножык. Мне няма куды цябе дзяваць: дык застань-ся-ж, дзе ляжыш, ды ідзі на дно морскае, цябе не варта ратаваць». Але, памеркаваўшы, я загарнуў усе грошы ў кавалак парусіны і палажыў у кішэню.

Усю ноч раўла бура, і, калі раніцой я выглянуў з палаткі, ад карабля ні засталося і следу.

Усе мае думкі былі цяпер паглынуты пытаннем, як абараніць сябе ад дзікуноў, калі яны з'явяцца на беразе, і ад драпежных звяроў, калі яны водзяцца на востраве. Я доўга думаў, якое мне лепш пабудаваць жыллё. Ці выкапаць пячору, ці паставіць палатку і добра яе замацаваць. Нарэшце я вырашыў зрабіць і тое, і другое.

Я думаю, будзе не лішнім расказаць, як я працаваў, і апісаць маё жыллё ў канчатковым яго выглядзе.

Я хутка ўпэўніўся, што выбранае мною месца на беразе было нязручным, каб на ім пасяляцца; гэта было нізкае месца, ля самага мора, з балоцістай глебай і, як мне здавалася, нездаровае. Галоўнае, блізка не было прэснай вады. Выходзячы з усяго гэтага, я рашыў пашукаць іншае месца, больш здаровае і больш падыходзячае для жылля.

Я павінен быў пры гэтым прыняць пад увагу многія ўмовы, якія лічыў неабходнымі



для чалавека майго становішча. Па-першае, як ужо сказана, мне былі патрэбны здаровае месцазнаходжанне і блізкасць прэснай вады; затым, маё жыллё павінна быць захавана як ад сонечнай спякоты, так і ад драпежнікаў— жывёл і людзей; і ўрэшце я абавязкова хацеў, каб з майго дома было відаць мора. «Можа лёс пашле карабль для майго збавення,—казаў я сабе,—а калі я не буду бачыць мора, я магу прапусціць гэты выпадак выратавацца». Як бачыце, мне яшчэ не хацелася развітацца з надзеяй.

Пасля даволі доўгіх пошукаў, я знайшоў нарэшце добры куток для жылля. Гэта была невялікая роўная палянка на схіле высокага ўзгорка, які спускаўся да яе стромкім, як сцяна, абрывам, і таму я мог не баяцца нападу зверху. Ля самай палянкі было невялікае паглыбленне, нібы ўваход у пячору, але пячоры ніякай далей не было. Вось тут, супроць гэтага паглыблення, я і вырашыў пабудаваць сваю палатку.

Перш чым ставіць палатку, я ўзяў завостраны кій ды апісаў перад паглыбленнем у гары поўкруг ярдаў дзесяць у дыяметры, гэта значыць, па простай лініі ад аднаго канца да другога. Затым па ўсяму поўкругу я паўбіваў два рады моцных колляў, завостраных на верхніх канцах. Паміж двума радамі коляў я пакінуў прамежак не больш за шэсць дзюймаў. Увесь гэты прамежак я запоўніў да самага верху адрэзкамі канатаў, узятых з карабля, склаўшы іх радамі адзін на другі, а ў сярэдзіне замацаваў агарожу падпоркамі,

для якіх я нарыхтаваў колле таўсцейшае і карацейшае (каля двух з паловай футаў даўжыні). Агарожа вышла ў мяне вельмі добрая: ні пралезці скрозь яе, ні пралезці цераз яе не мог ні чалавек, ні звер. Гэтая справа патрабавала вялікай працы, і прайшло шмат часу, пакуль я насек у лесе жэрдак, перанёс іх на месца пабудовы, абцясаў і ўбіў у зямлю колле.

Раздзел шосты

Рабінзон перацягвае ўсю сваю маёмасць да сябе ў дом.— Каза і казлянё.

З вялікай цяжкасцю перацягнуў я ў сваю крэпасць усё маё багацце—харчы, зброю і ўсё астатняе. Затым я паставіў у ёй вялікую палатку. Каб захаваць сябе ад дажджоў, якія ў трапічных краінах у пэўны час года бываюць вельмі вялікімі, я зрабіў палатку падвойную, гэта значыць, спачатку зрабіў адну палатку меншую, а над ёй паставіў большую. Знадворную палатку я пакрыў яшчэ зверху брэзентам, што захапіў з карабля разам з ветразямі.

Цяпер я спаў ужо не на сенніку, кінутым проста на зямлю, а ў вельмі ўтульным гамаку, які належаў памочніку нашага капітана.

Я перанёс у палатку ўсе харчы, наогул усё тое, што магло папсавацца ад дажджу. Калі такім чынам усе рэчы былі ўнесены ў сярэдзіну агарожы, я наглуха забіў уваход і пачаў уваходзіць і выходзіць па прыстаўной лесніцы, якую кожны раз падымаў за сабой.

Такім чынам я жыў, як у замку, абаронены ад усялякіх небяспек, і мог спаць спакойна.

Прывёўшы ў парадак агарожу, я ўзяўся капаць пячору, паглыбляючы прыродную западзіну ў гары. Выкапаныя каменні і зямлю я выцягнуў праз палатку ў дворык і складваў ля агарожы з унутранага боку. У выніку ўдоўж усёй агарожы ўтварылася нешта накшталт тэрасы фута паўтара вышынёй. Пячора знаходзілася якраз за палаткай і служыла мне склепам.

Патрабавалася шмат дзён і шмат энергіі, каб давесці да канца ўсе гэтыя работы. За гэты час многае іншае займала мае думкі і было некалькі здарэнняў, аб якіх я хачу расказаць. Неяк аднаго разу, пасля таго як я ўжо паставіў палатку і пачаў капаць пячору, набегла раптам чорная хмара, і лінуў праліўны дождж. Потым бліснула бліскавіца і грымнуў страшэнны гром. У гэтым, вядома, не было нічога незвычайнага, і мяне спалохала не столькі самая бліскавіца, колькі думка, шпарчэйшая за бліскавіцу, якая прамільгнула ў маім мазгу: «Мой порах!» У мяне замерла сэрца, калі я падумаў: «Адзін удар, і ўвесь мой порах загінуў! Прапаў не толькі сродак абароны, але і магчымасць здабываць сабе страву». Мне нават у галаву не прышло, пад якой небяспекай у выпадку ўзрыву знаходзіўся я сам.

Гэты выпадак зрабіў на мяне такое моцнае ўражанне, што, як толькі навальніца спынілася, я адклаў часова ўсе работы па абсталяванню і замацаванню майго жылля і

ўзяўся за сталярную работу ды шыццё: я шыў мяшэчкі і рабіў скрынкі для пораху. Я надумаў падзяліць мой порах на часткі і хаваць яго ў розных месцах, каб ён ні ў якім выпадку не мог загарэцца ўвесь адразу. На гэтую работу ў мяне пайшло амаль два тыдні. Усяго пораху ў мяне было да ста сарака фунтаў. Я расклаў яго ўвесь па мяшэчках і па скрынках, падзяліўшы прынамсі на сто частак. Мяшэчкі і скрыначкі я схаваў у шчылінах гары. У такіх месцах, куды ніякім чынам не магла трапіць вільгаць, і добра адзначыў кожнае месца. За кадушку з падмоклым порахам я не баяўся, таму паставіў яе, як яна была, у сваю «кухню», як я ў думках называў пячору.

У той-жа час я раз у дзень (а было і часцей) выходзіў з дому са стрэльбай, каб прабавіць час, а таксама для таго, каб азнаёміцца з мясцовай фаунай[1]), і, калі ўдасца, падстрэліць якую дзічыну. У першы-ж раз, калі я пайшоў у такую экскурсію, я зрабіў адкрыццё, што на востраве водзяцца козы. Першым-жа стрэлам я забіў маладую казу, пры якой быў сасунок. Мне вельмі было шкода казлёнка. Калі матка ўпала, ён не пабег. Мала гэтага: калі я падышоў да забітай казы, ускінуў яе на плечы і панёс дамоў, казлянё пабегла за мной. Гэтак мы дайшлі да самага дома. Ля агарожы я палажыў казу на зямлю, узяў на рукі казлянё і перасадзіў яго цераз колле на двор. Я ха-

---

[1]) Жывёлы данай мясцовасці.

цеў вырасціць яго і прыручыць, але яно яшчэ не ўмела есці, і я быў вымушан яго зарэзаць. Мне надоўга хапіла мяса ад гэтых двух жывёл. Еў я наогул эканомна, імкнучыся па магчымасці зберагчы свае запасы, асабліва хлеб.

Пасля таго, як я канчаткова абсталяваўся ў сваім новым жыллі, самым неадкладным, што трэ' было зрабіць, гэта пабудаваць печку ці наогул які-небудзь камінок; дзе можна было-б раскласці агонь. Неабходна было таксама назапасіць дроў. Аб тым, як я справіўся з гэтай задачай, а таксама як павялічыў свой склеп і як паступова зрабіў сабе некаторы камфорт, я падрабязна раскажу далей, але перш мне хацелася-б пагаварыць аб сабе, расказаць, якія думкі ў той час наведвалі мяне. А іх было нямала, і гэта зразумее кожны, хто прыме пад увагу тагочасныя ўмовы майго жыцця.

Раздзел сёмы

Каляндар Рабінзона.—Рабінзон усталёўвае сваё жыллё.

Прайшло дзён дзесяць—дванаццаць майго жыцця на востраве, калі мне раптам прышло ў галаву, што я заблытаюся ў часе, калі не буду адзначаць яго нейкім чынам.

Дзеля гэтага я зрабіў вось што. Я выцесаў з дрэва два таўстыя чатырохкутныя брусы, злучыў іх у выглядзе крыжа, убіў гэты крыж у зямлю, на тым месцы берагу, куды мяне выкінула мора, і выразаў на ім буйнымі літарамі наступныя словы: «Тут я ўпершы-

нюс ўступіў на гэты востраў 30 верасня 1659 года».

З таго часу я кожны дзень рабіў на крыжы насечку ў выглядзе рыскі: праз шэсць рысачак я рабіў адну даўжэйшую—гэта азначала нядзелю; насечкі, якія азначалі першы дзень кожнага месяца, я рабіў яшчэ даўжэйшымі. Такім чынам я вёў мой каляндар, адзначаючы дні, тыдні, месяцы і гады.

Пералічваючы рэчы, перавезеныя мною з карабля, як ужо было сказана, у адзінаццаць прыёмаў, я не назваў шмат якіх дробных рэчаў, хаця і не надта каштоўных, але даўшых мне значную карысць. Так, напрыклад, у памяшканнях капітана і капітанскага памочніка я знайшоў чарніла, пер'і і паперу, тры ці чатыры компасы, некаторыя астранамічныя прылады, падзорныя трубы, геаграфічныя карты і карабельны журнал. Усё гэта я склаў у адну скрыню на кожны выпадак, не ведаючы нават, ці спатрэбіцца мне што-небудзь з гэтых рэчаў. Затым мне трапілася некалькі кніжак на партугальскай мове. Я ўзяў і іх. Я павінен яшчэ пам чуць, што ў нас на караблі былі две кошкі і сабака (я раскажу ў свой час цікавую гісторыю жыцця гэтых жывёл на востраве). Кошак я перавёз на бераг на плыце, сабака-ж, яшчэ ў час маёй першай паездкі на карабль, сам скакануў у ваду і паплыў за мной. Шмат гадоў ён быў мне верным слугой. Па меры свайго разумення ён служыў мне верай і праўдай. Ён амаль замяняў мне чалавечую грамаду, толькі не мог га-

варыць. О, як дарага я даў-бы, каб ён загаварыў.

Як ужо сказана, я ўзяў з карабля ўсе пісьмовыя прылады. Я эканоміў іх да апошняй мажлівасці, але, пакуль у мяне было чарніла, я акуратнейшым чынам запісваў усё, што здаралася са мной; калі-ж яно вышла, мне прышлося спыніць мае запісы, бо я не ўмеў рабіць чарніла і не мог прыдумаць, чым яго замяніць.

Наогул, не гледзячы на тое, што ў мяне быў такі велізарны склад усякіх рэчаў, мне, акрамя чарніла, нехапала яшчэ шмат чаго; у мяне не было ні лапаты, ні рыдлёўкі, ні кіркі,—аніводнага інструмента для земляных работ; не было ні іголак, ні нітак. Не было ў мяне і бялізны, але я хутка навучыўся абходзіцца без бялізны, не адчуваючы вялікай бяды.

З прычыны таго, што нехапала інструментаў, работа ішла ў мяне вельмі марудна і давалася мне з вялікай цяжкасцю. Бадай не цэлы год спатрэбіўся, каб давесці да канца агарожу, якою я парашыў абнесці сваё жыллё. Насычы ў лесе тоўстых жардзей, выцесаць з іх колле, перацягнуць гэтае колле да маёй палаткі—на ўсё гэта патрэбен быў час. Колле было вельмі цяжкое, таму я мог падняць не больш аднаго кала за адзін раз, і часамі ў мяне ішло два дні толькі на тое, каб выцесаць кол і прынесці яго дамоў, а трэці дзень—на тое, каб убіць яго ў зямлю. Для гэтай апошняй работы я ўжываў спачатку важкую драўляную дубіну, а потым успом-

ніў аб жалезных вагарах, прывезеных мною з карабля, і замяніў дубіну імі, хаця не скажу, каб гэта мне дапамагло. Наогул убіваць калы было для мяне адной з самых цяжкіх работ. Але ці мне было зважаць на гэта? Мне-ж не было куды дзяваць майго часу, ды і іншай справы ў мяне ўсёроўна не знайшлося-б, акрамя бадзяння па востраву ў пошуках дзічыны—работа якую я больш ці менш акуратна выконваў кожны дзень.

Я ўжо апісаў сваё жыллё. Гэта была палатка, пабудаваная на схіле гары і абнесеная моцнай двайной загарадкай. Але цяпер маю агарожу можна было назваць сцяной, бо знадворку шчыльна да яе я зрабіў земляны насып у сажань таўшчынёй. А праз некаторы час (як мне памятаецца, гады праз паўтары) я пралажыў ад насыпа кроквы, якія ўпіраліся у схіл гары, а зверху зрабіў насціл з вецяў і вялікіх лісцяў. Такім чынам мой дворык апынуўся пад страхой, і я мог не баяцца дажджоў, якія, як я ўжо казаў, у пэўны час года няспынна палівалі мой востраў.

Чытач ужо ведае, што ўсю сваю маёмасць я перанёс у крэпасць,—спачатку толькі ў агарожу, а потым і ў пячору, якую выкапаў ва ўзгорку за палаткай. Але я павінен зазначыць, што спачатку ў маёй гаспадарцы быў поўны хаос: рэчы былі звалены ў кучу, абы-як, і заграмаджалі ўвесь склеп. Тады я рашыў пашырыць маё падзямелле. На шчасце, гара мела пухкую пескавую глебу. Пасля таго як я наглуха забіў уваход у агарожу і, значыцца, мог не баяцца нападу драпежных,



звяроў, я ўзяўся зноў капаць пячору. Пракапаўшы ўбок, а менавіта ўправа, колькі па майму разліку было патрэбна, я павярнуў яшчэ ўправа і зрабіў ход знадворку за агарожу, гэта значыць, па другі бок майго ўмацавання.

Гэты скразны падзямельны ход—чорны ход маёй кватэры—не толькі даваў мне мажлівасць вольна ўваходзіць з двара і вяртацца дамоў, але і значна павялічыў плошчу маёй кладоўкі.

Скончыўшы гэтую работу, я ўзяўся майстраваць сабе мэблю. Усяго больш патрэбны былі мне стол і крэсла: без стала і без крэсла я не мог скарыстаць нават тых маленькіх прыемнасцей, якія былі мне адпушчаны на зямлі,—нязручна было ні есці, ні чытаць, ні пісаць.

І вось я пачаў сталярыць. Ані разу ў жыцці дагэтуль я не браў у рукі сталярнага інструмента, і тым не менш, дзякуючы прыроднай кемлівасці і настойлівасці ў працы, я пакрысе так напрактыкаваўся, што мог рабіць усякую мэблю для маіх хатніх патрэб,—зразумела, каб у мяне былі патрэбныя інструменты.

Але нават і без інструментаў ці амаль без інструментаў, з адной толькі сякерай ды гэблікам, я зрабіў шмат рэчаў, хаця, мусіць, ніхто яшчэ не рабіў іх такім першабытным спосабам і не траціў пры гэтым столькі працы. Так, напрыклад, калі мне патрэбна была дошка, я павінен быў сячы дрэва, ачысціць ствол ад суччаў і, паставіўшы яго перад са-

бой, абцёсваць з абодвух бакоў да таго часу, пакуль ён не ператворыцца ў дошку. А потым дошку трэба было яшчэ выгабляваць. Спосаб быў не надта выгодным, бо з цэлага дрэва выходзіла толькі адна дошка, і, каб атрымаць гэтую дошку, прыходзілася траціць непамерную колькасць часу і працы. Але супроць гэтага ў мяне быў толькі адзін сродак—цярплівасць. Ды, акрамя таго, мой час і мая праца не дорага каштавалі; ці не ўсёроўна тады, куды і на што яны ішлі.

З мэблі я перш за ўсё зрабіў сабе стол і крэсла. Я ўжыў для гэтага кароткія дошкі, якія ўзяў з карабля. Калі-ж я потым начасаў даўгіх дошак сваім першабытным спосабам, то прымайстраваў у маім склепе, да адной з яго сцен, некалькі палічак адну над другой фута па паўтара шырынёй і склаў на іх свае інструменты, цвікі, жалеза і іншыя дробныя рэчы,—словам, расклаў усе рэчы на свае месцы, каб лёгка знайсці, калі трэба будзе, кожную рэч. Я панабіваў таксама колікаў па сценах склепа і развесіў на іх свае стрэльбы і наогул усё тое, што можна было павесіць.

Хто ўбачыў-бы пасля гэтага маю пячору, пэўна прыняў-бы яе за аптовы склад усялякіх патрэбных ў гаспадарцы рэчаў. І для мяне было вялікай пацехай заглядваць у гэты склад,—так многа было там усялякага дабра, у такім парадку былі рэчы, і кожная дробязь была ў мяне пад рукой.

Толькі з гэтага часу я пачаў весці свой дзённік, запісваючы ўсё, што я рабіў на працягу дня. Спачатку мне было не да запісаў:

я быў вельмі заняты работай; акрамя таго, мяне тады хвалявалі такія пахмурныя думкі, што я баяўся, каб яны не адлюстраваліся ў маім дзённіку.

Але калі ўрэшце я ўзяў сябе ў рукі, калі пакінуў сябе цешыць бясплоднымі марамі і ўзяўся за наладжванне свайго жылля, прывёў у парадак маю хатнюю гаспадарку, змайстраваў сабе стол і крэсла, наогул абсталяваўся зручна ды ўтульна,—тады я ўзяўся за дзённік. Прывожу яго тут цалкам, хаця вялікая частка апісаных у ім фактаў ужо вядома чытачу з папярэдніх раздзелаў.

Паўтараю—я вёў яго акуратна, пакуль у мяне было чарніла.

Раздзел восьмы

Дзённік. — Землетрасенне.

30 верасня 1659 года.—Наш карабль, захоплены ў адкрытым моры страшэнным штормам, пацярпеў крушэнне. Увесь экіпаж, акрамя мяне, патануў; я-ж, няшчасны, Рабінзон Крузо, быў выкінуты напалову мёртвым на бераг гэтага праклятага востраў, які я назваў «Востравам адчаю».

Калі надышла ноч, я ўзлез на дрэва, таму што баяўся драпежных звяроў. Усю ноч я праспаў моцным сном, не гледзячы на тое, што ішоў дождж.

1 кастрычніка.—Прачнуўшыся раніцой, я ўбачыў, што наш карабль зняло з мелі прылівам і прыгнала куды бліжэй да берагу.

Гэта дало мне надзею, калі вецер сціхне, дабрацца да карабля і набраць ежы і іншых неабходных рэчаў. Як толькі пачаўся адліў, я адправіўся на карабль. Спачатку я ішоў па сухім дне мора, а потым пусціўся плысці. Увесь гэты дзень дождж не спыняўся, але вецер зусім сціхаў.

З 1 па 24 кастрычніка.—Усе гэтыя дні я быў заняты перавозкай рэчаў з карабля. Я адпраўляўся на яго, калі пачынаўся адліў, а калі пачынаўся прыліў,—вяртаўся. Рэчы перавозіў на плытах. Увесь гэты час ідуць дажджы з вялікімі прамежкамі яснага надвор'я: мусіць у тутэйшых шыротах, цяпер пара дажджоў.

25 кастрычніка.—Усю ноч і ўвесь дзень ішоў дождж і дзьмуў моцны парыўчасты вецер. Карабль за ноч разнесла ў трэскі; на тым месцы, дзе ён стаяў, тырчаць нейкія нікчэмныя рэшткі, ды і тыя можна бачыць толькі ў часе адліву. Увесь гэты дзень я клапаціўся каля рэчаў: пакрываў і агортваў іх брэзентам, каб не псаваліся ад дажджу.

З 26 да 30 кастрычніка.—Шмат працаваў: перацягваў сваю маёмасць у новае жыллё, не гледзячы на тое, што амаль увесь час ішоў дождж.

31 кастрычніка.—Раніцой хадзіў па востраву са стрэльбай, спадзяючыся падстрэліць якую-небудзь дзічыну, і, дарэчы агледзець мясцовасць. Забіў казу. Яе казлянё пабегла за мной і праводзіла мяне да самага дома, але я вымушаны быў яго зарэзаць, бо яно не ўмела яшчэ есці.

1 лістапада.—Пабудаваў на новым месцы, ля самай гары, вялікую палатку і павесіў у ёй на коллях гамак.

4 лістапада.—Размеркаваў свой час, вызначыў спецыяльныя гадзіны для паляванння, для работы, для сну і для забавы. Зранку, калі няма дажджу, гадзіны дзве-тры хаджу па востраву са стрэльбай, затым да адзінаццаці працую, у адзінаццаць палудную чым давядзецца, з дванаццаці да двух адпачываю (бо гэта самая спякотная пара дня), з двух зноў за работу. Усе рабочыя гадзіны ў апошнія два дні майстраваў стол. Я быў тады яшчэ вельмі слабым работнікам. Але неабходнасць усяму навучыць. Праз некаторы час я зрабіўся майстрам на ўсе рукі (чаго дасягнуў-бы, безумоўна, і кожны іншы на маім месцы).

13 лістапада.—Сёння ішоў дождж; зямля і паветра прыкметна асвяжыліся, і стала лягчэй дыхаць, але дождж суправаджаўся страшэннай навальніцай, і я спалохаўся за свой порах. Калі навальніца спынілася, я рашыў увесь мой запас пораху падзяліць на самыя дробныя часткі і хаваць у розных месцах, каб ён не быў пад небяспекай узарвацца ўвесь разам.

14, 15 і 16 лістапада.—Усе гэтыя дні рабіў скрынкі для пораху з такім разлікам, каб у кожную скрынку ўвайшло ад аднаго да двух фунтаў. Сёння расклаў увесь порах па скрынках і схаваў іх у расколіны скалы як мага далей адзін ад аднаго. Учора забіў вялікую птушку. Як называецца—не ведаю. Мяса яе вельмі смачнае.

17 лістапада.—Сёння пачаў было капаць пячору ў гары за палаткай, каб было куды скласці маю маёмасць. Але для гэтай работы неабходны тры рэчы: кірка, рыдлёўка і тачка або кошык, каб выносіць накапаную зямлю, а ў мяне іх няма. Прышлося адкласці работу. Доўга меркаваў, чым-бы замяніць гэтыя інструменты або як іх зрабіць. Замест кіркі паспрабаваў жалезны вагар, ён падыходзіць, толькі вельмі цяжкі. Затым застаюцца рыдлёўка і тачка. Без рыдлёўкі аніяк нельга абысціся, але я ніяк не прыдумаю, як яе зрабіць, або чым яе замяніць.

18 лістапада.—Знайшоў у лесе тое самае дрэва (або падобнай яму пароды), якое ў Бразіліі называюць «жалезным», таму што яно надзвычайна моцнае. Ссек адно дрэва з вялікай цяжкасцю; ад гэтага мая сякера зусім затупілася; адсек ад ствала вялікі чурбак і ледзь дацягнуў яго да майго жылля, бо ён быў вельмі цяжкім. Я надумаўся зрабіць з яго рыдлёўку. Дрэва было такое цвёрдае, што я вельмі доўга прамарудзіў над гэтай работай. Прышлося адсякаць па маленькіх кавалачках. Але рыдлёўку я ўсё-ж такі зрабіў. Рукаятка атрымалася не горшай, як яе робяць у нас у Англіі, але самая рыдлёўка вышла не зусім добрай: трэ' было яе абабіць жалезам, а ліставога жалеза ў мяне не было; таму яна праслужыла ў мяне нядоўга. Аднак, я ўсё-такі заўсёды карыстаўся ёю для земляных работ, і яна вельмі мне спатрэбілася, хаця, я думаю, ніводная рыдлёўка ў свеце не выраблялася такім спосабам і так доўга. Ка-

рытца лягчэй было зрабіць, чымся рыдлёўку. Але ўсё разам—карытца, рыдлёўка і тачка—аднялі ў мяне па меншай меры чатыры дні (не лічачы, вядома, ранішніх экскурсій са стрэльбай). Наогул я рэдкі дзень не выходзіў на паляванне, і амаль не было выпадку, каб я не прынёс сабе на абед якой-небудзь дзічыны.

23 л і с т а п а д а.—Адклаў усе іншыя справы, пакуль не дарабіў рыдлёўкі і карытца. Як толькі яны былі гатовы, узяўся зноў капаць пячору. Капаў увесь дзень, як толькі мне дазвалялі час і сілы, і працаваў роўна восемнаццаць дзён. Мне патрэбна было вельмі прасторнае памяшканне, якое ў адзін і той-жа час магло-б служыць склепам, складам для рэчаў, кладоўкай, кухняй і сталовай.

10 с н е ж н я.—Я думаў, што пакончыў з пячорай, калі раптам сёння (мабыць, я вельмі многа пракапаў у шырыню) там з аднаго боку абвалілася зямля. Абвал быў такі вялікі, што я спалохаўся, і не без падставы: быў-бы я ў пячоры ў гэтую хвіліну, мне ўжо не патрэбна была-б магіла. Гэты сумны выпадак нарабіў мне шмат клопату і задаў новую работу: трэба было выцягнуць зямлю, якая абвалілася, а галоўнае прыдзецца цяпер падпіраць столь, іначай ніколі нельга быць упэўненым, што абвал не паўтарыцца.

11 с н е ж н я.—Ад сёнешняга дня ўзяўся за работу. Пакуль паставіў два слупы. На кожным замацаваў зверху па шырокай дошцы, такім чынам у столь упіраюцца дошкі, а слупы іх падпіраюць.

17 снежня.—Канчаткова замацаваў першыя два слупы і паставіў яшчэ некалькі слупоў, таксама з дошкамі наверсе, як і першыя два. Цяпер будзе моцна. Гэтая работа заняла ў мяне амаль тыдзень. Слупы я паставіў радамі, так што яны будуць заадно выконваць у маім склепе ролю загарадак.

20 снежня.—Перанёс усе рэчы і расклаў па месцах. Цяпер гаспадарка ў мяне ўпарадку. Зрабіў яшчэ адно крэсла і прыбіў некалькі маленькіх палічак для харчоў: вышла накшталт буфета. Вось толькі дошак застаецца мала.

20 снежня.—Падстрэліў двух казлянят адпаго забіў, а другога раніў у нагу, і ён не мог уцячы; я злавіў яго і прывёў дамоў на вяроўцы. Дома агледзеў яго нагу: яна была перабіта, і я забінтаваў яе. Казлянё паздарав ела: зламаная нага зраслася, і яно вельмі добра бегала. Але я так доўга з ім важдаўся што яно да мяне прывыкла і не хацела ўходзіць. Яно пасвілася ў мяне на маленькай сенажаці перад палаткай. Тады мне ўпершыню прышла думка завесці хатніх жывёл, каб забяспечыць сябе прадуктамі к таму часу, калі ў мяне выйдуць зарады і порах.

28, 29, 30 і 31 снежня. Моцная спякота без вятроў. Выходзіў з дому толькі па вечарах, на паляванне. Прысвяціў гэтыя дні канчатковаму прывядзенню ў парадак сваёй гаспадаркі.

1 студзеня 1660 года.—Спякота не спадае; тым не менш сёння хадзіў на паляванне два разы: з самага ранку і ўвечары

У палудзень адпачываў. Увечары прайшоў па даліне падалей, у глыб вострава, і бачыў многа коз; але яны вельмі дзікія і не дапускаюць блізка. Хачу паспрабаваць папаляваць на іх з сабакам.

2 студзеня.—Сёння ўзяў з сабой сабаку і нацкаваў на коз; але вопыт не ўдаўся: увесь статак павярнуўся насустрач сабаку, наставіўшы рогі, і ён, мусіць, добра зразумеў небяспеку, бо нізавошта не хацеў да іх падыходзіць.

3 студзеня.—Пачаў рабіць агарожу. Я ўсё яшчэ баюся нападу якіх-небудзь ворагаў і хачу як можна лепш умацаваць сваё жыллё.

Мая агарожа апісана ўжо на папярэдніх старонках, і таму я прапускаю ўсё, што гаворыцца аб ёй у маім дзённіку. Даволі будзе сказаць, што я працаваў над ёй (лічачы нарыхтоўку матэрыялу і ўтварэнне земляной сцяны) ад 3 студзеня да 14 красавіка, хаця ўвесь яе поўкруг меў не больш дванаццаці сажняў у даўжыню.

Разам з тым я сярод работы працягваў мае штодзённыя абходы лесу ў пошуках дзічыны,—зразумела, калі дазваляла надвор'е,—і ў час гэтых экскурсій зрабіў шмат карысных адкрыццяў. Так, напрыклад, я выгледзеў асаблівую пароду галубоў, якія в'юць гнёзды не на дрэвах, як нашы дзікія голубы, а ў цяснінах скал, і гэта робіць іхнія гнёзды даступнымі для чалавека. Неяк раз я выняў з гнязда птушанят, каб выгадаваць іх ды прыручыць. Мне ўдалося іх выгадаваць, але як толькі ў

іх падраслі крыллі, яны паляцелі ўсе да аднаго. Мабыць, гэта здарылася адтаго, што ў мяне не было для іх падыходзячага корму. Але, ва ўсякім разе, гэтыя птушкі былі для мяне карысныя як смачная страва: я часта знаходзіў іхнія гнёзды і браў птушанят на абед.

Калі я пачаў набываць гаспадарку, я ўбачыў, што мне нестае вельмі многа неабходных рэчаў. Зрабіць іх я спачатку лічыў немагчымым, ды і сапраўды шмат чаго—бачонка, напрыклад,—так і не здолеў зрабіць, нават потым, калі напрактыкаваўся ў сталярным майстэрстве. У мяне былі, як я ўжо казаў, два ці тры бачонкі з карабля, якія маглі служыць мне ўзорам але колькі я ні намагаўся, бачонка мне не ўдалося змайстраваць, хаця я патраціў на гэтую спробу некалькі тыдняў. Я не здолеў ні зрабіць дна, ні зрабіць дошчачкі так шчыльна, каб яны не прапускалі вады; так я і кінуў гэтую спробу.

Затым мне патрэбны былі свечы. Бывала, як толькі сцямнее (а змяркалася каля сямі гадзін), мне трэба было ісці спаць. Я часта ўспамінаў пра мой кавалак воску, з якога мы з Ксуры рабілі свечы пасля майго ўцёку ад маўраў, але воску ў мяне не было. Адзінае, што я здолеў прыдумаць, гэта выкарыстаць, як асвятляльны матэрыял, тлушч коз, якіх я забіваў на паляванні. І я сапраўды зрабіў сабе лямпачку з казінага тлушчу: плошку ўласнай рукой вылепіў з гліны, а потым абпаліў на сонцы, на свяцільню-ж узяў пянькі

ад старой вяроўкі. Лямпачка асвятляла, але гэта не было роўнае і яркае святло свечкі.

Неяк раз, у той час, калі я быў заняты ўсімі гэтымі справамі па наладжванню сваёй гаспадаркі і шукаў у сваім складзе нейкую патрэбную рэч, мне трапіўся невялікі мяшэчак з ячмянём, які мы везлі для кур на караблі. Усё зерне, якое яшчэ засталося ў мяшку, было з'едзена пацукамі (ва ўсякім разе, калі я зазірнуў у мяшок, мне здалося, што там адна труха), і таму, што мяшок быў мне вельмі патрэбен для нечага іншага, я вынес яго на дворык і вытрахнуў на зямлю пад гарой.

Гэта было незадоўга да пачатку праліўных дажджоў, аб якіх я ўжо казаў. Я даўно забыў пра гэтае здарэнне, не запамятаваў нават, на якім месцы я вытрахнуў мяшок. Але вось прайшло каля месяца, і я ўбачыў пад гарой, ля самай пячоры, некалькі зялёных парасткаў, якія нядаўна толькі вышлі з зямлі. Спачатку я думаў, што гэта тутэйшая расліна, якую я раней не бачыў. Але як я здзівіўся, калі яшчэ праз некалькі тыдняў зялёныя парасткі (іх было штук дзесяць-дванаццаць) закаласіліся, як калоссе звычайнага ячменю, што расце ў нас у Англіі. Немагчыма перадаць, як я быў здзіўлены пасля такога адкрыцця. Я казаў сабе: «Гэта цуд: ячмень вырас сам без насення, каб падтрымаць маё жыццё ў гэтай страшнай пустыні».

Гэтая думка расчуліла мяне і выклікала нават слёзы. Я быў шчаслівы, што такі незвычайны цуд адбыўся дзеля мяне. І цуд на

гэтым не скончыўся: хутка між парасткамі ячменю паказаліся парасткі іншай расліны, а іменна—рысу; я іх лёгка спазнаў, бо, жывучы ў Афрыцы, часта бачыў рыс на карані.

Я не толькі быў упэўнены, што гэты рыс і гэты ячмень пасланы мне самім богам, які клапаціўся пра мяне, але не сумняваўся, што на востраве для мяне захавана шмат таго і гэтага. Я абышоў усю тую частку острава, дзе ўжо бываў раней, абшукаў усе куткі, зазіраў пад кожную горку, але нідзе не знайшоў ні рысу, ні ячменю. Тады толькі ўрэшце я ўспомніў пра мяшок з зернем, які вытрахнуў на зямлю каля сваёй пячоры. Цуд вытлумачыўся вельмі проста.

Вы можаце сабе ўявіць, як дбайна я збіраў калоссе, калі яно паспела (гэта было ў канцы чэрвеня). Я падабраў кожнае зернетка і ўсё схаваў. Увесь ураджай першага года я рашыў пакінуць на сяўбу, з надзеяй, што з цягам часу ў мяне набярэцца такі запас зерня, якога будзе хапаць і на насенне, і на хлеб. Але толькі на чацверты год я мог дазволіць сабе аддзяліць частку зерня на яду, ды і то самую нязначную. Справа ў тым, што ў мяне загінуў амаль увесь збор ад першай сяўбы: я дрэнна разлічыў час, пасеяў перад самай засухай і насенне не ўзышло. Але аб гэтым я раскажу у свой час.

Акрамя ячменю ў мяне, як ужо сказана, выросла дваццаць ці трыццаць калоў рысу, які я прыбраў таксама старанна, пакінуўшы ўвесь збор на сяўбу. Потым, калі рысу назбіралася досыць, я рабіў з яго не то каб хлеб

(бо мне не было ў чым пячы), а хутчэй коржыкі, якія замянялі хлеб. Аднак, яшчэ праз некаторы час я прыдумаў спосаб пячы сапраўдны хлеб.

- Але вяртаюся да майго дзённіка.

Усе гэтыя чатыры або тры з паловай месяцы, што я быў заняты пабудовай агарожы, я працаваў не пакладаючы рук. 14 красавіка агарожа была зусім скончана, закідана знадворку зямлёй, і я наглуха забіў уваход, парашыўшы ўваходзіць і выходзіць праз сцяну па прыстаўной лесніцы, каб па знадворнаму выгляду агарожы нельга было здагадацца, што за ёю схавана чалавечае жыллё.

16 красавіка.—Закончыў лесніцу, уваходжу і выходжу цераз сцяну і кожны раз падымаю лесніцу за сабой. Цяпер я загароджаны з усіх бакоў. У маёй крэпасці даволі прасторна, і трапіць у яе нельга іначай, як цераз сцяну.

На другі дзень пасля таго, як я канчаткова замацаваў агарожу, здарыўся выпадак, які страшэнна мяне напалохаў і дзякуючы якому ўся мая праца ледзьве не пайшла прахам, ды і сам я ледзь не загінуў. Вось як была справа.

Я нешта такое майстраваў у агарожы, за палаткай, ля ўваходу ў пячору, як раптам ад столі пячоры, ля самага краю, акурат над маёй галавой, пасыпалася зямля, і пярэднія слупы, пастаўленыя мною для замацавання столі, падламаліся з жахлівым трэскам. Я вельмі спалохаўся, але не зразумеў, што адбылося, а проста падумаў, што столь абвалілася ад пухкасці глебы, як гэта было ра-

ней. Баючыся, каб мяне не засыпала новым абвалам, і не лічачы сябе ў бяспецы ў сярэдзіне агарожы, у тым выпадку, калі абвалілася-б гара, я схапіў лесніцу і пералез цераз сцяну. Але не паспеў я сысці на зямлю, як ужо зразумеў, што на гэты раз прычынай абвалу ў пячоры было землетрасенне. Зямля пада мной вагалася, і на працягу нейкіх васьмі мінут былі тры такія штуршкі, што ад іх рассыпаўся-б самы моцны будынак. Я бачыў, як ад скалы, што была ля мора, адарвалася верхавіна і пакацілася ўніз з такім грукатам, якога я ў жыцці сваім не чуў. Усё мора калыхалася і бурапеніла: мне нават здаецца, што ў моры падземныя штуршкі былі мацнейшымі, чымся на востраве.

Нічога падобнага я не чуў раней, а цяпер быў вельмі здзіўлены, аглушаны, перапалоханы. Ад ваганняў зямлі са мной зрабілася морская хвароба, як ад карабельнага гойдання. Мне здавалася, што я памёр. Грукат падаючага ўцёса вывеў мяне з аслупянення: я апрытомнеў і замёр пры той думцы, што на маю палатку можа абваліцца гара і назаўсёды пахаваць мае рэчы, мае харчы,—усё, што я меў. З гэтай хвіліны я ні аб чым іншым не мог думаць.

Калі, пасля трэцяга штуршка, прайшло некалькі мінут, я пачаў патрохі ачуньваць, але ўсё-такі ў мяне нехапала храбрасці вяртацца дамоў: доўга яшчэ я сядзеў на зямлі ў поўным смутку, не ведаючы, што мне рабіць.

Між тым збіраліся хмары; сцямнела, як перад дажджом. Падзьмуў ветрык—спачатку

слабы, потым мацней ды мацней, і праз поўгадзіны забушаваў страшэнны гураган. Мора бурапеніла і з рэвам білася аб берагі. Дрэвы вырываліся з карэннямі. Так працягвалася гадзіны тры; потым бура пачала сціхаць; яшчэ гадзіны праз дзве надышла поўная ціша, і лінуў дождж.

Увесь наступны дзень, гэта значыць 18 красавіка, я праседзеў дома з-за дажджу. Цяпер, заспакоіўшыся, я разважаў так: «Таму што гэты востраў падлягае землетрасенням, мне нельга жыць у пячоры, бо рана ці позна абавязкова гара абваліцца і я буду зажыва пахаваным. Значыцца, трэба перанесці палатку ці пабудаваць шалаш дзе-небудзь на адкрытам месцы, а каб забяспечыць сябе ад нападу жывёл і людзей, давядзецца абгарадзіцца сцяной, як я гэта рабіў тут».

Сапраўды, мая палатка стаяла на небяспечным месцы—пад выступам гары, якая ў выпадку новага землетрасення лёгка магла скінуцца на яе. Я канчаткова вырашыў перасяліцца на іншае месца разам з палаткай і з усёй маёй гаспадаркай.

Два наступныя дні—19 і 20—я правёў у пошуках новага месца для жылля і ў абмеркаванні пытання, як прывесці ў выкананне мой план.

Паступова мне стала ясна, што для пераходу на новае месца спатрэбіцца вельмі многа часу, і што пакуль усёроўна прыдзецца мірыцца з небяспекай абвалу, бо жыць у неабгароджаным месцы яшчэ страшней. Прышоўшы да такога вываду, я заспакоіўся, але

ўсё-такі рашыў узяцца, не трацячы часу, за пабудову агарожы на новым месцы і, як толькі яна будзе гатова, перанесці ў яе палатку.

21 красавіка прыступлю да работы.

Ад 22 да 27 красавіка.—Усю раніцу 22 я думаў аб тым, як здзейсніць мой план. Галоўная перашкода была ў нястачы інструментаў. У мяне былі тры вялікія сякеры і шмат маленькіх (мы іх везлі для менавога гандлю з чорнаскурымі); але ад частага карыстання і ад таго, што даводзілася сячы вельмі цвёрдае сукаватае дрэва, усе яны зазубрыліся і затупіліся. Праўда, у мяне было тачыла, але камень прыводзіўся ў рух рукой, значыцца адзін чалавек не мог на ім тачыць. Неабходна было прыстасаваць да яго ножны прывод. Я думаю, ніводзін дзяржаўны дзеяч, ламаючы галаву над важным палітычным пытаннем, і ніводзін суддзя, рашаючы ці жыць ці паміраць падсуднаму, не траціў-бы столькі разумовай энергіі на сваё рашэнне, колькі патраціў я, вынаходзячы гэты прывод. Але нарэшце я змайстраваў кола, якое пры дапамозе рамня прыводзілася ў рух нагой і круціла тачыльны камень, пакідаючы вольнымі абедзве рукі. З гэтым прыстасаваннем я валаводзіўся цэлы тыдзень. Дагэтуль я ніколі не бачыў тачыла з ножным прыводам, а калі і бачыў, то не заўважыў, як яно пабудавана: але пасля я ўпэўніўся, што ў Англіі гэткія тачылы вельмі распаўсюджаны, толькі звычайны тачыльны камень бывае меншым, чымсь ён быў у мяне: мой быў вельмі вялікі і цяжкі.

28 і 29 красавіка.—Абодва апошнія дні тачыў інструменты; маё прыстасаванне дзейнічае вельмі добра.

30 красавіка.—Сёння заўважыў, што мой запас сухароў пачынае выходзіць. Пералічыў усе мяшкі і, як гэта ні сумна, пастанавіў з'ядаць не больш аднаго сухара на дзень.

Раздзел дзевяты

Рабінзон дастае рэчы з карабля, пацярпеўшага крушэнне. — Хвароба і туга.

1 мая.—Сёння раніцой у часе адліву ўбачыў здалёк на беразе нейкі вялікі прадмет, здалёк падобны на бочку. Пайшоў паглядзець, і высветлілася, што гэта сапраўды бочачка. Тут-жа было параскідана шмат драўляных абломкаў. Я зірнуў у той бок, дзе тырчэў корпус карабля, і мне здалося, што ён высоўваецца з вады больш звычайнага. У бачонку быў порах, папсаваны ад вады: ён увесь быў падмоклы і зацвярдзелы. Тым не менш я выкаціў бачонак вышэй, каб яго не знесла ў мора, а сам па аголеным морскім дне накіраваўся да карабля паглядзець, ці не знойдзецца яшчэ чаго карыснага для мяне.

Прайшоўшы некаторую адлегласць, я заўважыў, што палажэнне карабля неяк дзіўна змянілася. Насавая частка, якая раней амаль закопвалася ў пясок, паднялася цяпер прынамсі на шэсць футаў, а карма, зусім адлучаная (гэта здарылася даўно, хутка пасля маёй экскурсіі на карабль), цяпер расселася ў некалькіх месцах і перакулілася на бок. Акрамя таго, з боку палубы яна была занесена

пяском, і адсюль-жа ў бок берагу стварылася пясковая водмель, і таму цяпер я мог падысці да самага карабля, тады як раней яшчэ за чвэртку мілі да яго я вышуманы быў плысці. Такая перамена ў палажэнні карабля спачатку мяне здзівіла, але потым я здагадаўся, што гэта зрабіла землетрасенне.

З гэтай прычыны, мусіць, расселася карма. З таго дня да берагу штодзённа прыбівалiся ветрам і цячэннем розныя рэчы, якія вымывала вадой з адчыненага трума.

Здарэнне з караблём заняло ўсе мае думкі. Я і думаць забыўся пра сваё перасяленне на новае месца. Увесь наступны дзень я меркаваў, як мне трапіць ва ўнутранае памяшканне карабля. Задача была нялёгкая, бо ўся яго сярэдзіна была набіта пяском. Але на гэта я не звяртаў увагі: я ўжо навучыўся ніколі не апускаць рук. Я пачаў расцягваць карабль па частках, ведаючы, што мне ў маім становішчы ўсё можа спатрэбіцца.

4 м а я.—Вудзіў рыбу, але ніводнай спажыўнай не злавіў. Знудзіўшыся, хацеў быў пайсці, але, закінуўшы вудачку ў апошні раз, злавіў маленькага дэльфіна. Вудачка ў мяне самаробная: валаснік я змайстраваў з пянькі ад старой вяроўкі, а кручкі зрабіў з дроту. Тым не менш мая вудачка часамі лавіла столькі рыбы, што я мог есці яе ўдосыць, прасушваючы на сонцы.

5 м а я.—Працаваў на караблі. Падпіліў брус, аддзёр ад палубы тры вялікія сасновыя дошкі, звязаў іх разам, і, дачакаўшыся прыліву, паехаў да берагу.

24 м а я.—Усе гэтыя дні працаваў на караблі. Выламаў з палубы апошнія дошкі, пасля таго рэчы, якія былі ў труме—некалькі бачонкаў і дзве матроскія скрыні—усплылі наверх ад першага-ж прыліву. Але вецер дзьмуў з берагу, і іх загнала ўмора. Затое сёння выкінулася на бераг некалькі абломкаў і вялікі бачонак з рэшткамі бразільскай свініны, якая аднак нікуды не варта, бо ў бачонак трапіла шмат вады і пяску.

16 ч э р в е н я.—Знайшоў на беразе вялікую чарапаху. Раней я ніколі іх тут не бачыў

17 ч э р в е н я.—Спёк чарапаху на вуголлі. Знайшоў у ёй да шасцідзесяці яек. Ніколі ў жыцці, здаецца, не еў гэткага смачнага мяса. Нічога дзіўнага: да таго дня маю мясную ежу на востраве складалі выключна козы ды птушкі.

18 ч э р в е н я.—Зранку да вечара ішоў дождж, я не выходзіў. Увесь дзень мяне нешта трасе, хаця, як гэта мне вядома, у тутэйшых шыротах не бывае халодных дажджоў.

19 ч э р в е н я.—Я, відаць, хворы: мне так холадна, нібы на дварэ зіма.

20 ч э р в е н я.—Усю ноч не сплюшчыў вачэй: вельмі баліць галава і холадна.

21 ч э р в е н я.—Зусім дрэнна. Страшэнна баюся расхварэцца і страціць сілы: якое будзе тады маё становішча!

22 ч э р в е н я.—Сёння мне лепей, але страх хваробы не пакідае мяне.

24 ч э р в е н я.—Значна лепей.

25 ч э р в е н я.—Моцная трасца: сем гадзін падрад мяне кідала то ў холад, то ў жар. Скончылася выпарынай і млосцю.

26 ч э р в е н я.—Лепей. У мяне вышаў увесь запас мяса, і я хадзіў на паляванне, хаця адчуваў страшэнную слабасць. Забіў казу, цэраз сілу дацягнуў дадому, спёк кавалак на вуголлях і паеў. Мне вельмі хацелася згатаваць сабе супу, але ў мяне няма ні каструлі, ні гаршка.

27 ч э р в е н я.—Зноў трасца, такая моцная, што я ўвесь дзень праляжаў без яды і піцця. Я памірaў ад смагі, але ад слабасці не мог стаяць на нагах і не мог схадзіць па ваду.

28 ч э р в е н я,.—Ноччу мучыўся ад смагі, але ні ў палатцы, ні ў склепе не было ні кроплі вады, і давялося перамучыцца да раніцы. Пад раніцу зноў заснуў і бачыў страшны сон.

30 ч э р в е н я.—Я адчуваў сябе здаровым увесь дзень. Не трасло. Выходзіў са стрэльбай, але не надоўга; доўгую экскурсію рабіць баяўся. Папалуднаваў чарапашымі яйкамі, якія еў са смакам. Увечары паўтарыў прыём лякарства, якое так дапамагло мне напярэдадні (я кажу аб рому з тытуном).

Тытуновых лісцяў не жаваў і не ўдыхаў тытуннага дыму. Затое на другі дзень—1 ліпеня—мне, насупроць маім чаканням, было зноў не зусім добра: мяне трасло, хаця і нямоцна.

Ад 3 ліпеня мая трасца больш не паўтаралася, хаця і прайшло некалькі тыдняў, покуль я канчаткова паправіўся і набраўся сілы. Прайшло дзесяць з лішкам месяцаў майго

жыцця на заклятым востраве. Я быў цвёрда ўпэўнены, што ніколі да мяне не было чалавечай нагі на гэтых пустынных берагах, таму прыходзілася, відаць, адмовіцца ад усякай надзеі на збавенне. Цяпер, калі маё жыллё было абнесена моцнай агарожай і я мог быць спакойным за яго бяспечнасць, я рашыў добра даследваць востраў, спадзяючыся знайсці якія-небудзь новыя жывёлы і расліны, якія маглі-б быць мне карыснымі.

З 15 ліпеня пачаў свой агляд. Перш за ўсё я накіраваўся да той бухтачцы, дзе прычальваў з плытамі. У бухтачку сцякаў невялікі раўчачок. Прайшоўшыся мілі дзве ўверх па плыні гэтага раўчака, я ўпэўніўся што прыліў туды не даходзіць, бо з гэтага месца і ўверх вада ў раўчаку была чыстай і празрыстай, але толькі месцамі раўчак перасох (у гэты час быў сезон, калі не было дажджоў), і цячэнне перапынілася.

Па нізкіх яго берагах цягнуліся роўнай гладдзю сенажаці з густой, мяккай травой, а далей—там, дзе нізіна паступова пераходзіла ва ўзвышша і куды, як відаць, не дасягаў разліў, расло шмат тытуну, раскошнага, з высокімі і таўстымі сцябламі. Там былі і іншыя расліны, якіх я раней ніколі не бачыў; зусім магчыма, што, ведаючы іхнія ўласцівасці, я здолеў-бы атрымаць ад іх карысць для сябе. Я шукаў касавы [1]), з кораня якой індзейцы гарачага клімата робяць хлеб, але не

[1]) Касава—тонкае дрэўца, якое разводзіцца ў трапічнай Амерыцы у каранях касавы шмат спажыўнага крухмалу.

знайшоў. Затое я бачыў цудоўныя экземпляры алоэ[1]) і цукровага трасніку. Але я не ведаў, ці можна зрабіць што-небудзь спажыўнае з алоэ. Цукровы траснік рос у дзікім выглядзе і таму для вырабу цукру не падыходзіў.

На другі дзень, 16-га, я пайшоў той-жа дарогай і знайшоў шмат розных пладоў, у ліку іх дыні (у вялікай колькасці) і вінаград. Вінаградныя лозы віліся па ствалах дрэў і з іх віселі раскошныя спелыя гронкі ягад. Гэтая знаходка вельмі здзівіла мяне і ўзрадавала. Але я своечасова ўспомніў, што калі жыў у Гвінеі, там памерла ад дызентэрыі некалькі англічан-нявольнікаў, якія аб'еліся вінаградам, таму я еў яго цяпер з асцярожнасцю.

Аднак, я надумаўся скарыстаць вінаград іншым спосабам: прасушыць яго на сонцы і ўжываць у выглядзе ізюму, які добры ўжо тым, што яго можна нарыхтаваць узапас; ён вельмі смачны, а галоўнае—бяскшодны.

У гэты дзень я не вярнуўся нанач дамоў. Баючыся начных нападаў драпежнікаў, я скарыстаў той-жа спосаб самаабароны, як і ў першы дзень майго знаходжання на востраве—пераначаваў на дрэве. Спаў я добра, а зранку працягваў свой абыход. Я прайшоў яшчэ мілі чатыры ў ранейшым кірунку, на поўнач. Увесь час ішоў па нізіне між двума радамі ўзгоркаў.

---

[1]) Алоэ—трапічная расліна з сямейства лілейных.

Тут было шмат какосавых пальмаў, апельсінных і лімонных дрэў, але яны былі дзікія і толькі на нямногіх з іх у той час былі плады. Я нарваў зялёных лімонаў і потым піў ваду з лімонным сокам. Гэта піццё добра дзейнічала на мой страўнік і вельмі асвяжала мяне. Я дабраўся да дома (так я буду цяпер называць маю палатку і пячору) праз тры дні і са здавальненнем успамінаў новую плоданосную і прыгожую даліну, яе лясы, думаў аб тым, як добра яна абаронена ад вятроў, і прышоў да заключэння, што маё цяперашняе месца для жылля—адно з горшых месц на ўсім востраве. А прышоўшы да гэткага вываду, я, зразумела, пачаў падумваць аб тым, каб перасяліцца ў квітнеючую зялёную даліну, дзе было такое мноства пладоў зямных. Заставалася толькі знайсці там падыходзячае месца ды ўмацаваць яго на выпадак нападу ворагаў.

Гэтая думка не пакідала мяне: свежая зеляніна даліны вабіла, і некаторы час я цешыўся марамі аб перасяленні. Але, калі я добра абмеркаваў гэты план, калі прыняў у разлік, што цяпер жыву на віду мора і, значыцца, маю хоць маленькую надзею на шчаслівую перамену ў сваім лёсе, я сказаў сабе, што мне ні ў якім выпадку не варта мяняць свайго месца жыхарства. Той самы суровы лёс, які занёс мяне на мой востраў, мог занесці і іншага небараку накшталт мяне. Безумоўна, мала было надзеі на такі выпадак, але замкнуцца сярод узгоркаў і лясоў у глыбіні вострава, здалёк ад мора, азначала ўжо на-

векі закаваць сябе ў ланцугі і зрабіць вызваленне для сябе не толькі маланадзейным, але і немагчымым.

Аднак, насуперак усім гэтым довадам, я так палюбіў маю даліну, што праседзеў там, амаль не выходзячы, увесь канец ліпеня і збудаваў сабе там другое жыллё. Я паставіў у даліне шалаш, абгарадзіў наглуха высокім і моцным двайным частаколам, а прамежак між колляў залажыў ламаччам; уваходзіў-жа і выходзіў па прыстаўной лесніцы, як і ў старым жыллі. Такім чынам я і тут быў у бяспечнасці. Здаралася, што я начаваў у маім шалашы па дзве, па тры начы падрад. «Цяпер у мяне ёсць дом на беразе мора і дача ў лесе», казаў я сабе. Работы па пабудове гэтай дачы занялі ў мяне ўвесь час да пачатку жніўня.

3-га жніўня я заўважыў, што развешаны мною вінаград ператварыўся ў цудоўны ізюм. З таго-ж дня я пачаў здымаць яго з дрэў, і добра зрабіў, бо іначай ён папсаваўся-б ад дажджу, і я страціў-бы большую частку сваіх зімовых запасаў. (У мяне сушылася на сонцы больш двухсот вялікіх гронак). Як толькі ўсё было сабрана і амаль усё перанесена ў пячору, пачаліся дажджы і з 14 жніўня да паловы кастрычніка ішлі амаль няспынна штодзень. Часамі траплялісь такія палосы суцэльных ліўняў, што я па некалькі дзён не высоўваў носа з пячоры.

За гэты час лёс прынёс мне прыемны сюрпрыз: у мяне павялічылася сямейства. Адна з маіх кошак даўно ўжо недзе падзелася; я

не ведаў, ці збегла яна куды, ці акалела, і вельмі аб ёй сумаваў; і вось раптам у канцы жніўня яна вярнулася з трыма кацянятамі.

З 14 да 26 жніўня дажджы не спыняліся, і я амаль не выходзіў з дому, бо з часу маёй хваробы асцерагаўся трапіць пад дождж. Між тым, пакуль я адседжваўся ў пячоры, чакаючы яснага надвор'я, мае запасы харчоў пачалі падыходзіць да канца, і таму два разы я нават рызыкнуў выйсці на паляванне. У першы раз я забіў казу, а ў другі, 26-га (гэта быў апошні дзень майго зняволення), злавіў вялізную чарапаху, з якой згатаваў сабе цэлы абед. Увогуле ў гэты час мая яда падзялялася так: на снеданне галінка ізюму, на абед кавалак казляціны або чарапашага мяса (печанага на вуголлях, бо, на вялікі жаль, не было ў чым смажыць і варыць), на вячэру два ці тры чарапашыя яйкі.

На працягу дванаццаці дзён, якія я праседзеў у пячоры, хаваючыся ад дажджу, я штодзённа па дзве, па тры гадзіны прысвячаў земляной рабоце, бо даўно ўжо збіраўся павялічыць склеп. Я пракопваў яго ўсё далей у адзін бок да таго часу, пакуль не вывеў ход на знадворак, за агарожу. Цяпер у мяне быў скразны ход, і я мог вольна выходзіць і ўваходзіць без прыстаўной лесніцы. Гэта, вядома, было зручна, але затое не так спакойна, як раней: раней маё жыллё было з усіх бакоў загароджана, і я мог спаць, не баючыся нападаў; цяпер нічога не варта было пралезці да мяне. Не разумею, як я тады не дадумаўся, што мне няма каго баяцца на во-

страве, дзе я не бачыў ніводнай жывёлы буйнейшай за казу.

30 верасня.—Я дажыў да гадавіны прыбыцця майго на няшчасны востраў. Падлічыў зарубкі на крыжы, і высветлілася, што я жыву тут ужо трыста шэсцьдзесят пяць дзён.

Каля гэтага часу я заўважыў, што мой запас чарніла падыходзіць да канца. Трэба было эканоміць яго; таму я спыніў штодзённыя запісы і пачаў запісваць толькі выдатныя падзеі з майго жыцця.

У першы-ж год я заўважыў, што даждлівая пара зусім правільна чаргуецца з парой без ніякіх дажджоў, і такім чынам заўсёды меў магчымасць загадзя назапасіць усё неабходнае перад надыходам дажджоў. Але наогул свой вопыт я купляў дарагой цаной.

Пакуль расло і паспявала маё збожжа, я зрабіў маленькае адкрыцце, якое пасля мне вельмі спатрэбілася.

Як толькі спыніліся дажджы і надвор'е ўсталявалася, гэта значыць, у канцы красавіка ці ў пачатку мая, я зрабіў экскурсію на сваю лясную дачу. Я не быў там некалькі месяцаў, але тым не менш знайшоў усё ў тым-жа выглядзе, як і пакінуў, за выключэннем агарожы, якая абкружала мой шалаш і складалася, як было сказана, з двайнога частакола. Агарожа была цэлай, але ўсё яе колле, для якіх я браў маладыя дрэўцы, што раслі поблізу і пароды якіх я не ведаў, пусцілі даўгія парасткі зусім так, як пускае іх вярба, калі ў яе зрэзаць верхавінку. Я вельмі здзі-

віўся, але разам з тым быў задаволены, што мая агарожа зазелянела. Я падстрыг усе дрэўцы, каб па магчымасці прыдаць ім аднолькавы выгляд, і яны разрасліся проста на дзіва.

Цяжка паверыць, якой прыгожай зрабілася мая дача праз тры гады. Не гледзячы на тое, што загарадка мела да дванаццаці сажняў у дыяметры, дрэвы (з колляў) пакрывалі ўсю плошчу ў сярэдзіне сваім вещцем і давалі такі густы цень, што ў ім можна было схавацца ад сонца ў кожны час дня. Гэта прывяло мяне да думкі нарэзаць яшчэ некалькі дзесяткаў дрэў той-жа пароды ды пасадзіць іх поўкругам удоўж усёй агарожы майго старога жылля. Так я і зрабіў. Я псадзіў дрэвы ў два рады, сажняў на чатыры ад ранейшай агарожы. Яны прыжыліся, і хутка ў мяне стварылася жывая агарожа, якая спачатку ахоўвала мяне ад спякоты, а пасля адслужыла мне і іншую службу.

Раздзел дзесяты

Рабінзон даследуе свой востраў.

Шмат разоў прабаваў я сплесці сабе кошык, але ўсе пруты, якімі я карыстаўся, былі такімі крохкімі, што ў мяне нічога не выходзіла.

Калі я быў дзіцем, я вельмі любіў хадзіць да аднаго майстра кошыкаў у нашым горадзе, і глядзеў як ён працуе. І цяпер гэта вельмі мне спатрэбілася. Як усе наогул дзеці, я быў назіральным і заўжды гатоў быў услужыць. Я часта дапамагаў майму прыяцелю,

майстру кошыкаў, у рабоце і так добра заўважыў тады, як плятуцца кошыкі, што і потым не забыў гэтага майстэрства. Для пляцення кошыкаў мне нехапала толькі матэрыялу. Нарэшце мне прышло ў галаву: ці не падыдуць для кошыкаў галінкі тых дрэў, якія я браў на частакол для сваёй дачы? Па маіх меркаваннях, у гэтых дрэў павінны былі быць пругкія, гнуткія галінкі, як у вярбы. І я рашыў паспрабаваць.

На другі-ж дзень я пайшоў на дачу, зрэзаў там некалькі галінак таго дрэва, выбіраючы самыя тонкія, і ўпэўніўся, што яны як нельга лепш падыходзяць для кошыкаў. У наступны раз я прышоў з сякерай, каб адразу насячы, колькі патрэбна. Мне не трэба было шукаць, бо дрэў той пароды расло тут многа. Насечаныя галінкі я перацягаў у агарожу, а калі яны падсохлі, перанёс іх у пячору. У бліжэйшую дажджлівую пару я ўзяўся за работу і наплёў вельмі многа кошыкаў. Яны служылі мне для розных патрэб: я насіў у іх зямлю, складваў усялякія рэчы і г. д. Праўда, мае кошыкі не вызначаліся пекнатой вырабу, але, у кожным разе, выконвалі сваё назначэнне, а мне толькі гэта і трэ' было. З таго часу я ніколі не забываў папаўняць свой запас кошыкаў: як толькі старыя ламаліся ці знашваліся, я між работай плёў новыя. Я рабіў іх рознай формы і велічыні, але галоўным чынам запасаўся глыбокімі і моцнымі кошыкамі цыліндрычнай формы, якімі меркаваў замяніць мяшкі для хавання збожжа, калі ў мяне яго набярэцца шмат.

Я ўжо казаў, што мне вельмі хацелася абысці ўвесь востраў і што я некалькі разоў хадзіў да раўчака і да таго месца даліны, дзе пабудаваў свой шалаш і адкуль адкрываўся від на мора з другога боку острава. І вось я нарэшце адважыўся прайсці ўвесь востраў упоперак і дабрацца да супроцьлеглага берагу. Я ўзяў стрэльбу, сякеру, вялікі запас пораху, шроту і куляў, прыхапіў на́ кожны выпадак два сухары і вялікую галінку ізюму і пусціўся ў дарогу. Я ўзяў з сабой на гэты раз сабаку. Прайшоўшы тое месца даліны, дзе стаяў мой шалаш, я ўбачыў наперадзе, на захадзе, мора, а далей відаць была паласа зямлі. Быў яркі сонечны дзень, і я добра бачыў зямлю, але не мог вызначыць, ці гэта матэрык ці востраў. Гэта было высокае плоскаўзвышша, якое цягнулася ад захада на поўдзень і было вельмі далёка (па майму разліку, міль на сорак, калі не больш) ад майго острава.

Я не ведаў, што гэта за зямля, і мог сказаць толькі адно, што гэта пэўна якая-небудзь частка Амерыкі, якая ляжыць, мусіць, недалёка ад іспанскіх уладанняў. Магчыма, што зямля гэтая была населена людаедамі і што, каб я трапіў туды, маё становішча было-б яшчэ горшым.

Разважаючы гэткім чынам, я, не спяшаючыся, пасоўваўся наперад. Я заўважыў, што тут шмат вадзілася папугаяў, і мне хацелася злавіць аднаго: я думаў зрабіць яго ручным і навучыць гаварыць. Пасля многіх бясплодных намаганняў мне ўдалося злавіць мала-

дога папугая: я падбіў яму кіем крыло, так што ён не мог паляцець. Я ўзяў яго і прынёс да сябе ў палатку. Хутка я дамогся, што ён пачаў клікаць мяне па імені.

Дайшоўшы да берагу мора, я канчаткова ўпэўніўся, што выбраў для пасялення самую горшую частку вострава. На маім баку я за паўтары гады злавіў толькі трох чарапах: тут-жа ўвесь бераг быў усеяны імі. Акрамя таго, тут было нязмернае мноства птушак розных пародаў, у ліку якіх пінгвіны. Былі такія, якіх я ніколі не бачыў, і шмат такіх, назвы якіх былі мне невядомыя. Мяса некаторых было вельмі смачнае.

Бясспрэчна, гэты бераг быў ва ўсіх адносінах прывабней майго, і тым не менш я не меў ніякага жадання перасяляцца. Пражыўшы ў сваім гняздзе больш за паўтары гады, я да яго прывык; тут-жа я адчуваў сябе госцем, мне было ніякавата і цягнула дамоў.

Прайшоўшы ўдоўж берагу к усходу, мусіць, міль дванаццаць ці каля таго, я рашыў, што час вяртацца. Я ўтыркнуў у зямлю высокі шост, каб зазначыць месца, бо думаў у наступны раз прысці сюды з другога боку.

Я хацеў вярнуцца іншай дарогай. «Востраў такі невялікі,—думаў я,—што на ім нельга зблудзіць. У крайнім выпадку я ўзлезу на горку, азірнуся і ўбачу, куды мне ісці». Аднак, я памыліўся. Адышоўшы ад берагу не больш двух-трох міль, я непрыкметна спусціўся ў шырокую лагчыну, якую так шчыльна абступалі лясістыя ўзгоркі, што не было ніякай магчымасці вырашыць, дзе я знаходзіўся.

Я мог-бы ісці па сонцу, але для гэтага трэ' было дасканальна ведаць, у якім пункце знаходзіцца сонца ў кожны час дня.

А тут яшчэ на бяду было пахмурнае надвор'е, і на працягу трох ці чатырох дзён сонца зусім не паказвалася. Увесь гэты час я блытаўся ў лагчыне, шукаючы дарогу. Нарэшце я вымушан быў выйсці зноў да берагу мора, на тое месца, дзе стаяў мой шост, ды ўжо адтуль вярнуўся дамоў ранейшай дарогай. Назад я ішоў, не спяшаючыся, з частымі перапынкамі, бо стаялі спякотныя дні, а на мне было шмат цяжкіх рэчаў—стрэльба, зарады, сякера—і мне было цяжка ісці.

Раздзел адзінаццаты

Рабінзон вяртаецца ў пячору.—Яго земляробчыя работы.

На поўдарозе ад дому мой сабака спалохаў казлёнка і схапіў яго, але загрызці не паспеў: я своечасова падбег і адняў яго. Мне хацелася ўзяць яго з сабой: я даўно ўжо марыў прыдбаць сабе пару казлянят, каб развесці статак, забяспечыць сябе мясной ежай к таму часу, калі ў мяне выйдзе ўвесь порах.

Я зрабіў казлёнку ашыйнік і павёў яго на вяроўцы (вяроўку я тут-жа скруціў з пянькі ад старых канатаў, якую заўсёды насіў у кішэні). Казлянё ўпіралася, але ўсё-такі ішло. Дайшоўшы да сваёй «дачы», я часова пакінуў казлянё ў агарожы; сам-ж пайшоў далей: мне вельмі хацелася дабрацца да дому, бо я вандраваў ужо больш за месяц.

З тыдзень я адпачываў ды ад'ядаўся. Вялікую частку гэтага часу я быў заняты важнай справай: майстраваў клетку для Попкі, які зрабіўся зусім ручным і вельмі са мной пасябраваў. Затым я ўспомніў пра беднае казлянё, якое сядзела ў палоне на дачы. «Напэўна,—думаў я,—яно ўжо з'ела там усю траву і выпіла ўсю ваду, якую я яму пакінуў, і цяпер галадае». Трэ' было схадзіць па яго. Прышоўшы на дачу, я ўбачыў яго там, дзе і пакінуў, ды ён і не мог нікуды пайсці. Але, як я і думаў, яно амаль паміралa ад голаду. Я нарэзаў галінак з бліжэйшых дрэў і перакінуў яму за агарожу. Калі яно паела, я хацеў было весці яго на вяроўцы, як раней, але ад голаду яно так прысмірэла, што пабегла за мной само, як сабака. Дарогай я карміў яго некалькі разоў, і з таго часу яно зрабілася такім-жа свойскім, як і астатнія мае хатнія жывёлы, і так да мяне прывыкла, што не адыходзіла ад мяне ні на крок.

Надышоў снежань, калі павінен быў паспець мой хлеб. Засеяны ўчастак быў невялікі, таму што, як я ўжо казаў, у мяне ад засухі загінуў увесь пасеў першага года, і заставалася не больш поўгарца кожнага гатунку зерня. На гэты раз ураджай чакаўся вельмі добры, але раптам я ўбачыў, што зноў рызыкую згубіць увесь пасеў, бо маё поле знішчаецца шматлікімі ворагамі, ад якіх цяжка аберагчыся. Гэтыя ворагі былі, па-першае, козы, па-другое, тыя звяркі, якіх я называў зайцамі. Магчыма, зеляніна рысу і ячменю была ім да смаку, яны днявалі ды начавалі

на полі і начыста пад'ядалі маладыя парасткі, перш чым яны паспявалі закаласіцца.

Супроць гэтага быў толькі адзіны сродак: абгарадзіць усё поле, што я і зрабіў. Але работа гэтая была вельмі цяжкай, галоўным чынам таму, што трэ' было спяшацца, бо звяр'ё, не шкадуючы, знішчала збожжа. Аднак маё поле было такое маленькае, што праз тры тыдні загарожа была гатова. Пакуль я яе скончыў, я ўдзень палохаў ворагаў стрэламі, а нанач прывязваў да загарожы сабаку, які брахаў усю ноч. Дзякуючы ўсім гэтым захадам, пражэрлівыя жывёлы пакінулі мяне, і мой хлеб хутка пачаў расці і наліваць.

Але як раней, пакуль збожжа было зялёнае, мяне руйнавалі чатырохногія, таксама цяпер пачалі мне шкодзіць птушкі, калі збожжа закаласілася. Неяк раз, абышоўшы сваё поле, я ўбачыў, што над ім кружаць цэлыя зграі ўсялякіх птушак. Уся гэтая процьма, відаць, чакала, калі я пайду, каб накінуцца на збожжа. Я зараз-жа выпусціў у яе зарад шроту (бо заўсёды насіў з сабой стрэльбу), і не паспеў я стрэліць, як з поля ўзнялася другая зграя птушак, якіх я не заўважыў.

Гэта не на жарты ўсхвалявала мяне. «Яшчэ некалькі дзён такога рабаўніцтва, і бывай усе мае надзеі,—казаў я сабе:—у мяне няма больш насення, і я застануся без хлеба». Я не мог прыдумаць, чым дапамагчы гору. Але трэба было, чаго-б гэта ні каштавала, абараніць свой хлеб, хаця-б давялося

пільнаваць яго дзень і ноч. Я пачаў з таго, што абышоў усё поле, каб упэўніцца сваімі вачамі, ці многа шкоды нарабілі мне птушкі. Высветлілася, што збожжа значна папсавана, але як ўраджай быў вялікі, то з гэтай стратай можна было яшчэ памірыцца, каб толькі ўдалося зберагчы астатняе.

Я зарадзіў стрэльбу і зрабіў выгляд, што ўходжу з поля (я бачыў, што птушкі стаіліся на бліжэйшых дрэвах і чакаюць, каб я пайшоў). Сапраўды, толькі я адышоў настолькі, каб гэтыя зладзеі не маглі мяне бачыць, як яны пачалі апускацца на поле адзін за адным. Гэта страшэнна мяне раззлавала. Спачатку я было хацеў пачакаць, каб спусцілася ўся зграя, але не мог сцярпець. «Ды гэта-ж з-за кожнага зерня, якое яны з'ядуць цяпер, я можа трачу ў будучым цэлы гарнец хлеба», пранеслася ў мяне ў галаве. Я падбег да агарожы і стрэліў: тры птушкі засталіся на месцы. Гэтага толькі мне і трэ' было: я падняў усіх трох і павесіў іх на страх іншым. Вы сабе ўявіць не можаце, які вялікі эфект зрабіла гэтая мера: не толькі ніводная птушка не села больш на поле, але ўсе паляцелі з гэтай часткі вострава: ва ўсякім разе, я не бачыў аніводнай за ўвесь час, пакуль тры мае пудалы віселі на шасту. Лёгка паверыць, як я быў гэтаму рады.

Да канца снежня збожжа выспела, і я зняў ураджай—другі раз у гэтым годзе. Перад жнівам у мяне былі вялікія цяжкасці, бо ў мяне не было ні касы, ні сярпа: але, добра памеркаваўшы, я падумаў выкарыстаць для

гэтай работы шырокі цясак, які я ўзяў з карабля разам з іншай зброяй. Аднак, хлеба было ў мяне так мала, што ўборка яго не патрабавала вялікай працы, ды і прыбіраў я яго асаблівым спосабам: зрэзваў толькі каласы. Яны змясціліся ў мяне ў двух вялікіх кошыках. Калі ўсё было сабрана, я перацёр калоссе рукамі, каб аддзяліць лушпайкі ад зерня, і ў выніку з поўгарца насення кожнага гатунку атрымаў каля двух мерак рысу, дзве з паловай меркі ячменю (вядома, прыблізна, бо ў мяне не было чым мераць).

Такая ўдача вельмі мяне падбадзёрыла: цяпер я мог спадзявацца, што з цягам часу ў мяне будзе сталы запас хлеба. Але перада мной узнікаў новы рад цяжкасцей. Як ператварыць зерне ў муку? Як прасеяць муку? Або,—нават калі дапусціць, што гэта ўсё зроблена,—то як вымесіць з мукі цеста? Як, урэшце, спячы хлеб? Нічога гэтага я не ўмеў. З прычыны гэтых цяжкасцей я рашыў не чапаць ураджаю і пакінуць усё зерне на насенне, а тымчасам, да наступнай сяўбы, пастарацца вырашыць галоўную задачу, гэта значыць, знайсці спосаб ператварыць зерне ў печаны хлеб.

Раздзел дванаццаты

Рабінзон выробляе посуду.

У тыя дні, калі ішоў дождж і я не мог выйсці з дому, я між справай вучыў свайго папугая гаварыць, і гэта вельмі забаўляла мяне. Пасля некаторых лекцый ён ужо ведаў

сваё імя, а потым, хаця і не хутка, навучыўся даволі выразна выгаварваць яго. «Попка» было першае слова, якое я пачуў на маім востраве, можна сказаць, з чужых вуснаў. Але размовы з Попкам, як ужо сказана, былі для мяне не работай, а дапамогай у рабоце. У той час у мяне была на руках вельмі важная справа. Даўно ўжо я ламаў галаву, як знайсці спосаб рабіць гліняную пасуду, але нічога не мог прыдумаць. Галоўная затрымка была за матэрыялам, бо я не сумняваўся, што ўдасца вылепіць нешта накшталт гаршка ці міскі, калі толькі знайду добрай гліны. Што тычыцца абпальвання, то я лічыў, што ў гарачым клімаце для гэтага дастаткова сонечнага цяпла. «Ва ўсякім разе,—думаў я,—мая пасуда, прасохнуўшы на сонцы, будзе настолькі моцная, каб можна было браць яе ў рукі і трымаць у ёй зерне, муку і наогул усе сухія прадукты для захавання іх ад вільгаці». І я рашыў, як толькі знайду адпаведную гліну, вылепіць некалькі вялікіх банак для зерня. Пра такую гліняную пасуду, у якой можна было-б варыць, я пакуль яшчэ не думаў.

Уяўляю, як вы пасмяяліся-б з мяне, добры чытач (а можа і пашкадавалі-б мяне), каб я вам расказаў, як няўмела я прыступаў да гэтай работы, якія недарэчныя, нязграбныя пакалечаныя творы выходзілі ў мяне з-пад пальцаў, колькі маіх вырабаў раскідваліся ад таго, што гліна была вельмі пухкай і не вытрымлівала ўласнай вагі, колькі іншых патрэскалася ад таго, што я спяшаўся вы-

ставіць іх на сонца, і колькі рассыпалася на дробныя кавалкі пры першым дотыку да іх як да прасушкі, так і пасля прасушкі. Даволі сказаць, што пасля двухмесячнай няўтомнай працы, калі я нарэшце знайшоў гліну, накапаў яе, прынёс дамоў і пачаў працаваць, у мяне вышла нарэшце дзве вялікія нязграбныя гліняныя пасудзіны, бо банкамі іх, строга кажучы, нельга было назваць.

Гэта ўсё-такі было здабыткам! Калі мае банкі добра зацвярдзелі на сонцы, я асцярожна ўзяў іх адну за другой і паставіў у два вялікія кошыкі, якія я сплёў выключна для іх. Усе пустыя мясціны між кожнай банкай і кошыкам я для большай аховы шчыльна заткнуў рысавай і ячменнай саломай. Абедзве гэтыя першыя банкі прызначаліся пакуль што для хавання зерня, каб яно не магло папсавацца ад вільгаці, а з цягам часу, калі я прыдумаю спосаб малоць зерне,—пад муку.

Буйныя вырабы з гліны вышлі ў мяне няўдалымі. Куды лепш выходзіла ў мяне дробная пасуда: маленькія круглыя гаршэчкі, пляскатыя гарлачы, блюды, кубкі, міскі і іншыя дробныя рэчы. Яно і зразумела: дробныя рэчы лягчэй ляпіць: акрамя таго, яны раўней абпальваліся на сонцы і таму менш біліся.

Але ўсё гэта было не тое, што мне было трэба: мне патрэбна была такая пасуда, каб можна было ў ёй варыць, каб яна вытрымлівала агонь і не прапускала вады, а гэтага я і не мог дамагчыся. Але вось неяк раз я разводзіў агонь, каб потым спячы на вуголлі

мяса. Калі мяса спяклося, я хацеў пагасіць вуголле і знайшоў у ім чарапок ад маёй разбітай гліняной банкі: чарапок распаліўся дачырвана і зацвярдзеў, як камень. Я быў прыемна здзіўлены гэтым адкрыццем. «Калі гліняны чарапок так зацвярдзеў ад агню, то, значыцца, з такім-жа поспехам можна абпальваць у агні і гліняную пасуду», сказаў я сабе.

Я думаю, ніводзін чалавек у свеце не адчуваў гэткай радасці ад такой нязначнай прычыны, якую адчуў я, калі зрабіў агнетрывалую пасуду. Я ледзьве дачакаўся, покуль мае гаршкі астынуць, каб можна было наліць у адзін з іх вады і зварыць у ім мяса. Гаршкі вышлі вельмі добрымі. Я зварыў сабе з казляціны добры бульён, хаця, безумоўна, каб палажыць у яго каранёў, ды заправіць соллю і аўсянай мукой, ён вышаў-бы яшчэ лепшым.

Наступным маім клопатам было прыдумаць, як зрабіць каменную ступку, каб размельваць, або, вярней, таўчы ў ёй зерне; аб такім складаным творы, як млын, не магло-ж быць і гутаркі: адной пары чалавечых рук было не пад сілу выканаць такую работу. Але зрабіць ступку было таксама не зусім ужо проста: у рамесніцтве каменацёса я нічога не разумеў, як і ва ўсіх іншых, і акрамя таго ў мяне не было інструментаў. Не адзін дзень патраціў я, каб знайсці адпаведны кавалак камня, г. зн. дастаткова цвёрды і такой велічыні, каб у ім можна было выдзяўбсці па-

глыбленне: але нічога не знайшоў. На маім востраве былі ўцёсы, але гэтыя ўцёсы былі з суцэльнага камня, ад якога пры ўсіх маіх намаганнях я не мог адкалоць адломку патрэбнай велічыні, бо для гэтага ў мяне не было аніякіх інструментаў. Ды і камень гэты для ступкі ўсёроўна не падыходзіў; гэта быў порысты камень з пароды пясчанікаў: пры таўчэнні цяжкім таўкачом ён пачаў-бы абавязкова крышыцца, і ў муку трапляў-бы пясок. Такім чынам, згубіўшы шмат часу на дарэмныя пошукі, я адмовіўся ад думкі пра каменную ступку і рашыў змайстраваць драўляную, для якой куды лягчэй было знайсці матэрыял. Сапраўды, я хутка вызначыў у лесе калоду вельмі цвёрдага дрэва і такую вялікую, што ледзь здолеў краиуць яе з месца. Я абцясаў яе зверху сякерай, каб прыдаць ёй па магчывасці правільную форму, а затым часткова выдзеўбаў, часткова выпаліў у ёй паглыбленне накшталт таго, як бразільскія чырвонаскурыя робяць лодкі. Няма чаго і казаць, што гэтая працэдура цягнулася страшэнна доўга і каштавала мне вялікай працы. Пакончыўшы са ступкай, я выцесаў вялікі важкі таўкач з так званага жалезнага дрэва. І ступку і таўкач я схаваў да наступнага жніва, калі, па маіх разліках, у мяне павінна была атрымацца дастатковая колькасць зерня, каб частку яго можна было аддзяліць для мукі.

Цяпер неабходна было падумаць аб тым, як я буду мясіць свой хлеб, калі падрыхтую

муку. Перш за ўсё ў мяне не было дражджэй; аднак, гэтаму гору ўсёроўна дапамагчы не было як, і таму аб дражджах я не турбаваўся. Але печка... як абыйсціся без печкі? Гэта было сапраўды галаваломнае пытанне. Тым не менш я ўсё-такі прыдумаў, чым яе замяніць. Я вылепіў з гліны некалькі вялікіх буйных пасудзін накшталт блюд, вельмі шырокіх, але мелкіх: усе гэтыя блюды я добра прапаліў на агні. Я падрыхтаваў іх задоўга да пачатку жніва і пакуль схаваў у кладоўцы. Трэба зазначыць, што яшчэ раней у мяне быў збудаваны на зямлі ачаг—роўная пляцоўка з квадратных (хоць сапраўды далёка не квадратных) цаглін, таксама ўласнага вырабу і таксама добра абпаленых. Калі надышла пара пячы хлеб, я развёў на гэтым ачагу вялікі агонь. Дачакаўшыся, каб дровы перагарэлі, я разгарнуў вуголле па ўсяму ачагу і даў ім паляжаць некаторы час, пакуль ачаг не распаліцца. Тады я адгарнуў увесь вугаль убок, пасадзіў на ачаг свой хлеб, накрыў яго адным з нарыхтаваных мною гліняных блюдаў, перакуліў яго ўверх дном, а блюда залажыў гарачым вуголлем. І што-ж? Мой хлеб спёкся, як у самай лепшай печцы.

Наогул я за кароткі час зрабіўся вельмі добрым пекарам: не кажучы ўжо аб простым хлебе, я навучыўся пячы пудзінгі і аладкі з рысу; толькі пірагоў я не рабіў, ды і то толькі таму, што акрамя казляціны ды птушынага мяса, іх не было чым начыняць.

Раздзел трынаццаты

Рабінзон будуе лодку і шые сабе новае адзенне.

Увесь гэты час я заўсёды ўспамінаў пра зямлю, якую бачыў з другога берагу майго востраў, і ў глыбіні душы не пакідаў шкадаваць аб тым, што пасяліўся не на тым беразе: мне ўсё здавалася, што, каб я жыў на віду матэрыка, ці наогул заселенай краіны, я як-небудзь знайшоў-бы магчымасць дабрацца туды, ці ва ўсякім выпадку вырвацца з маёй турмы.

Вось калі я не адзін раз успомніў свайго маленькага сябра Ксуры і мой парусны бот, на якім я прайшоў удоўж афрыканскіх берагоў больш як тысячу міль! Але што з гэтых успамінаў? Я рашыў пайсці зірнуць на карабельную шлюпку, якую яшчэ ў тую буру, калі мы пацярпелі крушэнне, выкінула на бераг за некалькі міль ад майго жылля. Шлюпка ляжала блізка ад таго месца, куды яе выкінула: яе перакуліў прыбой уверх дном і аднёс крыху вышэй, на пескавую водмель, куды ў звычайны час не дасягала вада.

Каб мне паправіць і спусціць на ваду гэтую шлюпку, я здолеў-бы без асаблівых цяжкасцей дабрацца да Бразіліі. Але для такой работы мала было адной пары рук. Я лёгка мог-бы сцяміць, што для мяне скрануць з месца гэтую шлюпку такая-ж задача, як скрануць з месца мой востраў. Але, не гледзячы ні на што, я захацеў паспрабаваць: пайшоў у лес, насек тоўстых жэрдак, якія

павінны былі служыць мне вагарамі, выцесаў з чурбакоў дзве качалкі і ўсё гэта перацягнуў да шлюпкі. «Абы толькі мне ўдалося перавярнуць яе на дно,—казаў я сабе,—а паправіць яе—справа няцяжкая. Выйдзе такая добрая лодка, што ў ёй смела можна будзе пусціцца ў мора».

І я не пашкадаваў сіл на гэтую бескарысную работу: я праваждаўся тыдні тры ці чатыры. Мала таго: калі я ўрэшце зразумеў, што не з маімі слабымі сіламі скрануць такую махіну, я прыдумаў новы план. Я ўзяўся адкідваць пясок ад аднаго борта шлюпкі, мяркуючы, што, страціўшы пункт апоры, яна сама павернецца і стане на дно; разам з тым я падкладываў пад яе кавалкі, каб накіраваць яе падзенне, куды мне было трэба.

Шлюпка сапраўды стала на дно, але гэта ніяк не пасоўвала мяне да маёй мэты: я ўсёроўна не здолеў спусціць яе на ваду і ўрэшце быў прымушаны адмовіцца ад маіх вымудраў. Але гэтая няўдача не адбіла ў мяне ахвоты да далейшых спроб дабрацца да матэрыка; наадварот, па меры таго, як мэта маіх імкненняў здавалася мне больш і больш недасягаемай, маё жаданне дасягнуць яе ўсё расло.

Нарэшце мне прышло ў галаву: ці не паспрабаваць мне самому зрабіць лодку або, яшчэ лепш, пірогу, якія я бачыў у чырвонаскурых? «Каб зрабіць пірогу,—разважаў я,—не трэба амаль ніякіх інструментаў, бо яна выдзёўбваецца з суцэльнага камля дрэва; з такой работай можа справіцца і адзін чала-

век». Словам, зрабіць пірогу здавалася мне не толькі магчымай, але самай лёгкай справай, і я з асалодай марыў аб тым часе, калі паплыву ў маёй пірозе. Мне нават здавалася, што мне будзе лягчэй выканаць гэтую задачу, чымся неграм або індзейцам.

Я не задаваў сабе пытання, як я спушчу сваю пірогу на ваду, калі яна будзе гатовая, а між тым гэтая перашкода была больш сур'ёзная, як нястача інструментаў.

Усе мае думкі былі да такой ступені паглынуты падарожжам, якое мелася быць, што я ні на секунду не спыніўся на гэтым пытанні, хаця было да смешнага відавочна, што непараўнаўча лягчэй правесці лодку сорак пяць міль па моры, чымсь працягнуць па зямлі на адлегласці сарака пяці крокаў, адлучаўшых яе ад вады.

Адным словам, у гісторыі з пірогай я паказаў сябе такім дурнем, якім толькі можа быць, калі захоча, чалавек са здаровым розумам.

Я пацяшаўся сваім мерапрыемствам, не клапоцячыся аб тым, ці магу я давесці яго да канца. Нельга сказаць, каб думка аб спуску на ваду зусім не прыходзіла мне ў галаву,—не, прыходзіла; але я не даваў ёй ходу, уціскаючы яе кожны раз дурнейшым довадам: «Перш зробім лодку, а там памяркуем ужо, як яе спусціць».

Глупства, недарэчнасць, што і сказаць! Але мая фантазія так разгулялася, што не давала мне супакою, і я ўзяўся за работу. Я высек велізарнейшы кедр, добры, выдатны

кедр, які меў пяць футаў дзесяць дзюймаў у папярочніку ўнізе, у пачатку ствала, а ўверсе, на вышыні дваццаці двух футаў,—чатыры футы адзінаццаць дзюймаў; затым ствол паступова рабіўся танейшым і ўрэшце разгаліноўваўся.

Можаце ўявіць, колькі працы мне каштавала паваліць гэтае дрэва. Дваццаць дзён я сек самы ствол, заходзячы то з аднаго, то з другога боку, ды яшчэ чатырнаццаць дзён мне спатрэбілася, каб абсячы бакавое сучча і аддзяліць велізарную, развесістую верхавіну. Цэлы месяц я апрацоўваў маю калоду знадворку, імкнучыся выцесаць хоць некаторае падабенства кіля, бо без кіля пірога не магла-б трымацца на вадзе проста. А там тры месяцы пайшло яшчэ на тое, каб выдзяўбсці яе ў сярэдзіне. На гэты раз я абышоўся без агню: усю гэтую егіпецкую работу я зрабіў стамескай ды малатком. У выніку ў мяне атрымалася адменная пірога, такая вялікая, што смела магла падняць дваццаць пяць чалавек, а значыцца і мяне з усім маім грузам.

Я быў у захапленні ад свайго твору: ніколі ў жыцці я не бачыў такой вялікай лодкі з цэльнага дрэва. Затое і дорага-ж яна мне абышлася!.. Як-бы там не было, палова справы была зроблена; засталося толькі спусціць лодку на ваду, і я не сумняваўся, што, каб гэта мне ўдалося, я пусціўся-б у самае вар'яцкае і самае безнадзейнае з усіх морскіх вандраванняў, якія толькі калі рабіліся на земным шары.

Але ўся мая праца, усе мае намаганні загінулі дарма: мая пірога засталася там, дзе была!

Ад лесу, дзе я яе пабудаваў, да вады, было не больш пяцідзесяці сажняў, але лес стаяў у лагчыне, і мясцовасць уздымалася к берагу ў гару, якая канчалася высокім абрывам ля самага мора. Гэта было першай перашкодай. Але я смела ўзяўся яе знішчыць, зняўшы ўсю лішнюю зямлю такім чынам, каб ад лесу да берагу ўтварыўся пакаты спуск. Страшна ўспомніць, колькі працы я патраціў на гэтую работу, але-ж ці шкадуеш працу, калі разлічваеш ёю купіць волю? Такім чынам, першая перашкода была знішчана: дарога для лодкі гатова. Але з гэтага нічога не вышла: колькі я ні намагаўся, я не мог скрануць з месца маю пірогу, як раней не мог скрануць карабельнай шлюпкі.

Тады я вымераў адлегласць, якая адлучала маю лодку ад мора, і рашыў выкапаць для яе канал: калі нельга было правесці лодку да вады, заставалася правесці ваду да лодкі. І я пачаў ужо было капаць; але калі добра абмеркаваў мінімальную глыбіню і шырыню будучага канала, калі падлічыў, колькі прыблізна часу патрэбна, каб такую работу зрабіў адзін чалавек, то высветлілася, што мне спатрэбіцца не менш дзесяці-дванаццаці гадоў, каб давесці яе да канца. Нічога не зробіш—прышлося, з болем у сэрцы, кінуць і гэтую выдумку.

Я быў засмучоны да глыбіні душы і тут

толькі прыгадаў — крыху позна! — мудрую прыказку: сем разоў адмер, адзін адрэж.

За гэтай недарэчнай работай застала мяне чацвертая гадавіна майго жыцця на востраве.

Я так даўно жыў на маім востраве, што шмат узятых з карабля рэчаў або зусім патрапаліся, або канчалі свой век, а карабельныя запасы рознастайных прадуктаў часткова зусім вышлі, часткова падыходзілі да канца.

Пасля чарніла ў мяне вышаў увесь запас хлеба, або вярней, не хлеба, а карабельных сухароў. Я эканоміў іх, як толькі мог (у апошнія паўтары гады я дазваляў сабе з'есці не больш аднаго сухара ў дзень), і ўсё-ткі да таго часу, пакуль я сабраў з свайго поля столькі збожжа, што можна было пачаць яго ўжываць, я сядзеў амаль год без кавалка хлеба.

З адзення я таксама сышоўся. У мяне былі толькі сарочкі ў клетку (каля трох тузінаў, якія я знайшоў у скрынях матросаў і бярог як уласнае вока, бо на маім востраве было часта так спякотна, што даводзілася хадзіць у адной сарочцы, ды і не ведаю, што я рабіў-бы без гэтага запасу.

Але была і іншая прычына, якая не дазваляла мне хадзіць голым: калі на мне было што-небудзь надзета, я лягчэй пераносіў сонечную спякоту. Гарачыя промні трапічнага сонца прапальвалі мне скуру да пузыроў, сарочка-ж ахоўвала яе ад сонца, і акрамя таго, мяне ахаладжаў рух паветра між са-

рочкай і целам. Ніколі не мог я таксама прызвычаіцца хадзіць на сонцы з непакрытай галавой; кожны раз, калі я выходзіў без шапкі, у мяне пачынала балець галава.

Маё адзенне адмаўлялася служыць. Трэба было прывесці ў парадак хоць тое рыззё, якое ў мяне яшчэ засталося і якое я называў сваім гарнітурам. Перш за ўсё мне патрэбна была жылетка (усе, што ў мяне былі, я знасіў); таму я і пачаў з жылетак. Я паспрабаваў перарабіць на жылеткі верхнія матроскія курткі, якія ў мяне ўсёроўна дарэмна ляжалі. І вось я пачаў шыць, або, вярней, крэмсаць і калупаць іголкай, бо, шчыра кажучы, я быў даволі-такі няўдалым краўцом. Як-бы там ні было, я з грахом папалам зрабіў дзве ці тры жылеткі, якіх, па майму разліку, павінна было хапіць надоўга. Пра першую маю спробу пашыць штаны лепш і не казаць, бо яна скончылася вельмі канфузнай няўдачай; але хутка пасля таго я знайшоў новы спосаб апранацца і з таго часу не меў нястачы ў адзенні.

Я ўжо казаў, што ў мяне захаваліся скуркі ўсіх забітых мною жывёл. Кожную скурку я прасушваў на сонцы, распяўшы на жэрдках. Толькі спачатку я па нявопытнасці вельмі доўга трымаў іх на сонцы, таму першыя скуркі былі такімі жорсткімі, што яны наўрад ці маглі для чаго спатрэбіцца, але затое астатнія былі добрыя. З іх я першым чынам і пашыў сабе вялікую шапку поўсцю зверху, каб яна не баялася дажджу. Футровая шапка так добра ўдалася, што я захацеў,

зрабіць сабе з такога-ж матэрыялу ўвесь гарнітур, гэта значыць куртку і штаны. Штаны пашыў я кароткія, да кален, і вельмі прасторныя; куртку таксама зрабіў шырэйшую, бо і тое, і другое было мне патрэбна больш для аховы ад сонца, чымся для цеплыні. Фасон і работа, трэба прызнацца, былі нікуды не вартымі; краўцом я быў вельмі дрэнным, а закройшчыкам і таго горш. Як-бы там ні было, мае кравецкія вырабы добра мне служылі, асабліва калі мне здаралася выйсці ў час дажджу: уся вада сцякала па даўгой поўсці, і я заставаўся сухім.

Пасля курткі і штаноў я задумаў змайстраваць сабе парасон. Я бачыў як іх робяць у Бразіліі: там ніхто не ходзіць без парасона з-за спякоты, а на маім востраве было ані трохі не халадней, нават гарачэй, бо ён бліжэй да экватара. Мне-ж неабходна было выходзіць ва ўсякае надвор'е, а іншы раз доўга бадзяцца і пад сонцам, і пад дажджом; словам, парасон быў мне абавязкова патрэбны. Шмат мне было клопату з гэтай работай, і шмат часу прайшло, перш чым мне ўдалося зрабіць нешта падобнае на парасон (разы два ці тры я выкідваў папсаваны матэрыял і пачынаў спачатку), але ў выніку я дамогся свайго і зрабіў досыць добры парасон. Справа ў тым, што я хацеў, каб ён расчыняўся і зачыняўся; у гэтым іменна і была галоўная цяжкасць. Вядома, зрабіць яго нерухомым было вельмі лёгка, але тады прышлося-б заўсёды насіць яго над галавой, а гэта было нязручна. Але, як ужо сказана, я пера-



мог гэтую цяжкасць, і мой парасон мог зачыняцца. Я абцягнуў яго казлінымі скурамі поўсцю ўверх: дажджавая вада сцякала па поўсці, як па нахіленай страсе, і самыя гарачыя сонечныя промні не прабівалі яго. З гэтым парасонам я не баяўся ніякага дажджу і не цярпеў ад гарачыні нават у самае спякотнае надвор'е; а калі ён быў мне не патрэбен, я зачыняў яго і нёс пад пахай.

Гэтак жыў я на маім востраве, спакойны і здаволены.

Раздзел чатырнаццаты

Рабінзон робіць другую лодку меншых памераў, і прабуе абʼехаць вакол вострава.

Наступныя пяць гадоў прайшлі, як гэта магу прыгадаць, без ніякіх асаблівых падзей. Жыццё маё ішло па-ранейшаму—ціха і мірна; я жыў на тым-жа месцы і па-ранейшаму падзяляў свой час на чытанне, працу і паляванне.

Галоўным маім заняткам,—вядома, апрача штогодніх работ па сяўбе і ўборцы збожжа і па збіранню вінаграду (збожжа я высяваў роўна столькі, каб хапала на год, і з такім-жа разлікам збіраў вінаград) і не лічачы штодзённых экскурсій са стрэльбай,—галоўным маім заняткам, кажу я, было будаванне новай лодкі. На гэты раз я не толькі зрабіў лодку, але і спусціў яе на ваду: я вывеў яе ў бухтачку па вузкаму каналу, які мне прышлося пракапаць без малага на поўмілі. Першую маю лодку, як ужо ведае чытач, я

зрабіў такіх вялізных памераў, што вымушан быў пакінуць яе на месцы пабудовы, як помнік майго глупства, каб ён заўсёды нагадваў мне аб тым, што ў далейшым трэба быць разумнейшым. У наступны раз я быў больш практычным. Праўда, я і цяпер пабудаваў лодку бадай за поўмілі ад вады, бо бліжэй не знайшоў падыходзячага дрэва, але затое цяпер я дапасаваў яе велічыню і вагу да сваіх сіл. Бачачы, што мае намеры на гэты раз могуць быць выкананы, я цвёрда рашыў давесці іх да канца. Амаль два гады я праваждаўся з пабудовай лодкі, але я не шкадаваў аб гэтым: упэўненасць, што я ўрэшце буду мець магчымасць плаваць па моры, поўнасцю ўзнагароджвала мяне за маю працу.

Трэба аднак зазначыць, што мая новая пірога зусім не адпавядала першапачатковай маёй задачы,—той задачы, якую я ставіў, калі будаваў першую лодку. Яна была такой малой, што не было чаго і думаць пераплысці на ёй тыя сорак міль ці болей, якія аддзялялі мой востраў ад матэрыка. Такім чынам мне прышлося развітацца з гэтай марай. Але ў мяне з'явіўся новы план—аб'ехаць вакол востраў. Я пабываў ужо аднойчы на супроцьлеглым беразе, і адкрыцці, якія я зрабіў у тую экскурсію, так зацікавілі мяне, што мне яшчэ тады вельмі захацелася агледзець усё ўзбярэжжа востраў. І вось цяпер, калі ў мяне была лодка, я захацеў, што-б там ні было, аб'ехаць морам увесь востраў.

Прыступаючы да гэтага падарожжа, я дзейнічаў не абыяк, а з разлікам. Я зрабіў

для сваёй лодачкі маленечкую мачту і пашыў такі-ж маленечкі ветразь з рэшткаў парусіны, якой у мяне быў досыць вялікі запас.

Калі такім чынам лодка была аснашчана, я паспрабаваў яе ход і ўпэўніўся, што ветразь дзейнічае вельмі добра. Тады я змайстраваў на карме і на носе невялікія шуфляды, каб прадукты, зарады і іншыя неабходныя рэчы, якія я буду браць у дарогу, не падмакалі ад дажджу і каб на іх не траплялі пырскі. Для стрэльбы я выдзеўбаў на дне лодкі вузкі жолаб. Затым я ўмацаваў на карме расчынены парасон, надаўшы яму такое палажэнне, каб ён быў над маёй галавой і абараняў мяне ад сонца.

6 лістапада, у шосты год майго царствавання ці знаходжання ў палоне,—называйце, як хочаце,—я адправіўся ў дарогу.

Праездзіў я куды больш, як разлічваў. Справа ў тым, што хаця мой востраў сам па сабе і невялікі, але, калі я завярнуў да той часткі яго ўзбярэжжа, якая накіравана на ўсход, перада мной выросла непераможная перашкода. У гэтым месцы ад берагу аддзяляюся вузкі рад скал, часткова падводных, часткова тырчэўшых над вадой, і выступаў міль на шэсць у адкрытае мора, а далей, за скаламі, яшчэ мілі на паўтары, цягнулася пясчаная водмель. Такім чынам, каб іх абагнуць, прыходзілася рабіць вялікі крук.

Спачатку я хацеў быў адмовіцца ад свайго плана і павярнуць назад: я не мог вызначыць дасканала, як далёка мне прыдзецца прайсці адкрытым морам, пакуль я абагну

рад падводных скал, і баяўся рызыкаваць. Таму я кінуў якар (перад адпраўкай у дарогу я змайстраваў сабе нешта накшталт якара з абломку жалезнага крука, знойдзенага мною на караблі), узяў стрэльбу і зышоў на бераг. Выгледзеўшы непадалёк даволі высокую горку, я ўзняўся на яе, змераў на вока даўжыню рыфаў і водмелі, якія адсюль былі бачны на ўсёй сваёй адлегласці, і рашыў паспрабаваць іх абагнуць.

Але не паспеў я адысці ад берагу на даўжыню маёй лодкі, як апынуўся на страшэннай глыбіні, і ўслед затым трапіў у магутны струмень морскага цячэння. Мяне закруціла, як на млынным шлюзе, падхапіла і панесла. Аб тым, каб павярнуць да берагу ці звярнуць убок, не было чаго і думаць. Усё, што я здолеў зрабіць,—гэта трымацца з краю цячэння і намагацца не трапіць у сярэдзіну. Між тым мяне занасіла ўсё далей і далей удоўж рыфаў. Каб быў хоць невялікі вецер, я мог-бы паспрабаваць паставіць ветразь, але на моры стаяў поўны штыль; я працаваў вёсламі з усіх сіл, але не мог справіцца з цячэннем. Я ўжо развітваўся з жыццём: я ведаў, што праз некалькі міль тое цячэнне, у якое я трапіў, і другое, якое абгінае другі бок вострава, зліюцца ў адно, і калі да таго часу мне не ўдасца звярнуць убок, я беззваротна загінуў. А між тым я не бачыў ніякай магчымасці звярнуць.

Выйсця не было: мяне чакала пэўная смерць—і не ў хвалях морскіх, бо мора было спакойнае, а страшная галодная смерць.

Праўда, на беразе я знайшоў чарапаху, такую вялікую, што ледзьве здолеў падняць яе, і ўзяў з сабой у лодку. Быў у мяне таксама добры запас прэснай вады (я ўзяў самы вялікі з маіх гліняных збаноў). Але што гэта значыла для няшчаснага падарожніка, які згубіўся ў пустыні бязбрэжнага акіяна, дзе можна прайсці тысячы міль, не ўбачыўшы і адзнак зямлі?

Аб сваім пустынным, нудным востраве я ўспамінаў цяпер, як аб зямным раі, і адзіным маім жаданнем было вярнуцца ў гэты рай. Нельга выказаць, у якой я быў роспачы, калі ўбачыў, што мяне заносіць прэч ад майго любага вострава—так, ён мне быў любы цяпер!—заносіць у бязмежную вадзяную далеч, і я павінен навекі развітацца з надзеяй зноў убачыць яго.

Але як я ні быў збянтэжаны, я гроб безупынна, да страты сіл, імкнучыся накіраваць лодку на поўнач з такім разлікам, каб перасячы плынь і абагнуць рыфы. Раптам каля палудня, калі сонца перайшло прама мне насустрач, падзьмуў ветрык. Гэта мяне ўзбадзёрыла. Але ўявіце маю радасць, калі ветрык шпарка пачаў свяжэць і праз поўгадзіны ператварыўся ў добры, моцны вецер. К гэтаму часу мяне загнала на далёкую адлегласць ад майго вострава. Каб узняўся ў тую пару туман, мне быў-бы канец: са мной не было компаса, і каб толькі я згубіў з віду мой востраў, я не ведаў-бы, куды кіраваць. Але на маё шчасце быў сонечны дзень і нішто не паказвала на туман. Я паставіў мачту,

падняў ветразь і пачаў кіраваць на поўнач, імкнучыся выбіцца з плыні.

Як толькі мая лодка павярнула па ветру і пайшла наперарэз плыні, я заўважыў перамену: вада зрабілася значна святлейшай. Я зразумеў, што цячэнне па нейкай прычыне слабне, бо раней, калі яно было шпаркім, вада была ўвесь час мутнай. І сапраўды, хутка я ўбачыў направа ад сябе, на ўсходзе, групу ўцёсаў (іх можна было ўбачыць здалёк па белай пене ад хваляў, якія бурлілі вакол іх). Гэтыя ўцёсы і затрымлівалі плынь, загароджваючы ёй шлях. Але хутка я ўпэўніўся, што яны не толькі рабілі павольнай плынь, а яшчэ разбівалі яе на два струмені, з якіх галоўны толькі злёгку адхіляўся да поўдня, пакідаючы ўцёсы злева, а другі крута зварочваў назад і накіроўваўся на паўночны захад.

Толькі тыя, хто ведае па вопыту, што значыць вызваліцца ад смерці, стоячы на эшафоце, ці выратавацца ад рабаўнікоў у апошні момант, калі нож прыстаўлены ўжо да горла, зразумеюць маю радасць пры гэтым адкрыцці. Сэрца маё білася ад радасці, калі я накіраваў сваю лодку ў адваротны струмень, падставіў ветразь папутнаму ветру, які яшчэ пасвяжэў, і весела паімчаўся назад.

Але спрыяльная плынь, што гнала мяне назад да майго востраву, праходзіла міль за шэсць на поўнач ад той плыні, якая мяне занесла ў мора, і таму, параўнаўшыся з востравам, я апынуўся супроць паўночнага яго берагу, гэта значыць, супроць леглага таму, ад яко-

га я адчаліў. Прайшоўшы па майму разліку крыху больш трох міль, я па раптоўна павольнаму ходу лодкі заўважыў, што плынь спынілася. Але цяпер ужо я быў па-за небяспекай, бо знаходзіўся між двума неспрыяльнымі плынямі—паўднёвай, якая мяне занесла ў мора, і паўночнай, што праходзіла па другім баку, але значна далей таго струменя, якім мяне прыгнала назад. Карыстаючыся папутным ветрам, я пасоўваўся да востраваа, хоць ужо і не так шпарка. Каля пятай гадзіны вечара я падышоў да берагу і, выбраўшы зручную мясціну, прычаліў.

К вечару я дабраўся да маёй лясной дачы, дзе было ўсё ў поўным парадку. Я пералез цераз агарожу, прылёг у цяньку і, адчуваючы страшэнную стомнасць, хутка заснуў.

Але ўявіце сабе, якое было маё здзіўленне, калі я прачнуўся, таму што нейчы голас крычаў мне: «Робін, Робін, Робін Крузо! Небарака Робін Крузо! Куды ты трапіў? Як цябе сюды занесла?»

Змучаны доўгім веславаннем, я спаў такім моцным сном, што не адразу мог прачнуцца, і мне доўга здавалася, што я чую гэты голас у сне. Але калі настойліва паўтарыўся крык: «Робін Крузо, Робін Крузо» я нарэшце прачнуўся і страшэнна парапалохаўся. Я ўскочыў, дзіка азіраючыся навакол, і раптам, падняўшы галаву, убачыў на плоце свайго Попку. Вядома, я зараз-жа здагадаўся, што гэта ён мяне гукаў: такім самым жаласлівым тонам я часта гаварыў яму гэтую фразу, і ён вельмі добра яе завучыў. Сядзе бывала, мне

на палец, прыціснецца галоўкай да майго твара і пачне: «Небарака Робін Крузо! Куды ты трапіў? Як цябе сюды занесла?» і гэтак далей.

Але нават упэўніўшыся, што гэта быў папугай, і разумеючы, што, акрамя папугая няма каму тут і быць, я яшчэ доўга не мог заспакоіцца. Я зусім не разумеў, па-першае, як ён трапіў на маю дачу, па-другое, чаму ён прыляцеў іменна сюды, а не ў іншае месца. Але як ў мяне не было аніякага сумнення ў тым, што гэта ён, мой верны Попка, то, не ламаючы галавы над гэтымі пытаннямі, я назваў яго па імені і працягнуў яму руку. Разумная птушка зараз-жа села мне на палец і завяла сваё: «Небарака Робін Крузо! Куды ты трапіў?» Яна нібы ўзрадавалася, што зноў бачыць мяне. Само сабой зразумела, што я ўзяў яе з сабой.

Непрыемныя прыгоды маёй морскай экспедыцыі надоўга адбілі ў мяне ахвоту плаваць па моры: я быў сыты аднымі ўспамінамі аб небяспеках, у якія я трапляў. Безумоўна, было-б добра, каб лодка была ў мяне на гэтым баку востраў, але я не ведаў, як яе прывесці. Аб усходнім узбярэжжы я не хацеў і думаць: я ні ў якім разе не рызыкнуў-бы абагнуць яго яшчэ раз: ад адной думкі пра гэта ў мяне сціскалася сэрца і стыгла кроў у жылах. Заходнія берагі востраў былі мне зусім незнаёмыя. Але што, калі плынь у тым баку была такая-ж моцная і быстрая, як і ў гэтым? І хіба я мог паручыцца, што мне ўдасца яе мінуць? Словам,



узяўшы ўсё пад увагу, я рашыў, што як ні дорага, у сэнсе часу і працы, каштавала мне мая лодка, але лепш застацца без лодкі, чымсьці рызыкаваць з-за яе галавой.

У той-жа год я ўдасканаліўся ва ўсіх ручных работах, якія вымагаліся ўмовамі майго жыцця. К канцу года мяне можна было-б палічыць зусім добрым цесляром, асабліва калі прыняць пад увагу як мала ў мяне было інструментаў. Я і ў ганчарнай справе зрабіў вялікі крок наперад: зрабіў станок з круціўшымся кругам, ад чаго мая работа шмат выйграла не толькі ў часе, але і ў якасці; цяпер замест нязграбных, грубых вырабаў, на якія было брыдка глядзець, у мяне атрымліваліся рэчы правільнай формы, якія мелі сапраўды прыгожы выгляд. Але ніколі я, здаецца, не быў так узрадаваны і не ганарыўся сваёй кемлівасцю, як у той дзень, калі мне ўдалося зрабіць люльку. Вядома, мая люлька была самага першабытнага тыпу—з простай абпаленай гліны, як і ўсе мае ганчарныя вырабы,—і вышла яна не надта прыгожай; але яна была дастаткова моцная і добра прапускала дым, а галоўнае—гэта была ўсё-такі люлька, аб якой я даўно марыў, бо прывык курыць амаль што з дзяцінства. На нашым караблі былі люлькі, але я не ведаў тады, што на востраве расце тытун, і рашыў, што не варта іх браць.

Мой запас пораху пачынаў прыкметна памяншацца. Гэта была такая страта, якую пры ўсім маім жаданні я не мог звярнуць, і

мяне сур'ёзна пачало непакоіць, што я буду рябіць, калі ў мяне выйдзе ўвесь порах, і як я буду тады хадзіць на паляванне на коз.

Раздзел пятнаццаты

Рабінзон прыручае дзікіх коз

На адзінаццаты год майго зняволення, калі запас пораху пачаў змяншацца, я стаў сур'ёзна меркаваць, як-бы знайсці спосаб лавіць коз жыўцом. Больш за ўсё мне хацелася злавіць матку з казлянятамі.

Я пачаў з пастак. Я паставіў іх некалькі штук у розных месцах, і козы траплялі ў іх, толькі мне было ад гэтага мала карысці: не маючы дроту, я рабіў пасткі з старых вяровак, і кожны раз яны абрываліся, а прынада з'ядалася.

Тады я надумаў паспрабаваць воўчыя ямы. Ведаючы месцы, дзе часцей пасвіліся козы, я выкапаў у тых месцах тры глыбокія ямы, палажыў у іх каласы рысу і ячменю і на некалькі дзён пакінуў незакрытымі, каб прывабіць коз. Хутка я ўпэўніўся, што козы наведваюць мае ямы: каласы былі з'едзены, а навакол відаць былі сляды казіных ног. Я закрыў усе тры ямы загадзя падрыхтаванымі пляцёнкамі з прутоў, палажыў на кожную пляцёнку з аднаго боку па цяжкому камню, і на другі-ж дзень знайшоў у адной яме вялікага старога казла, а ў другой трох казлянят—аднаго самца і двух самак.

Старога казла я выпусціў на волю, бо не ведаў што з ім рабіць. Ён быў такі дзікі і

злосны, што ўзяць яго жывым было нельга (я баяўся лезці да яго ў яму), а забіваць не варта было. Як толькі я прыузняў пляцёнку, ён выскачыў з ямы і пусціўся бегчы з усіх ног. Але я не ведаў у той час, што голад уціхамірвае нават львоў. Каб я тады прымусіў майго казла пагаладаваць дні тры-чатыры, а потым прынёс-бы яму паесці і папіць, ён зрабіўся-б ціхім і свойскім не горш за казлянят. Козы ўвогуле вельмі кемлівыя жывёлы, і, калі з імі добра абыходзіцца, іх вельмі лёгка прыручыць.

Але, паўтараю, у той час я гэтага не ведаў. Выпусціўшы казла, я падышоў да той ямы, дзе сядзелі казляняты, вынуў усіх трох па адным: звязаў іх разам вяроўкай і з цяжкасцю прывалок дамоў.

Даволі доўга я не мог прымусіць іх есці, але, згаладаўшыся, яны ўсё-такі ўзяліся за ячмень. Патрохі яны звыкліся са мной і зрабіліся зусім свойскімі. З таго часу я пачаў разводзіць коз у надзеі, што з цягам часу ў мяне будзе цэлы статак. Бясспрэчна, гэта быў для мяне адзіны спосаб забяспечыць сябе мясам к таму часу, калі ў мяне выйдзе порах і шрот.

Гады праз паўтары ў мяне было штук дванаццаць коз, лічачы і казлянят, а яшчэ праз два гады мой статак вырас да сарака трох галоў. З цягам часу я зрабіў пяць загароджаных выганаў; усе яны злучаліся між сабой варотцамі, каб можна было пераганяць коз з адной пашы на другую, а адзін выган меў яшчэ знадворную браму.

У мяне быў цяпер невычарпальны запас мяса, і не толькі мяса, але і малака. Апошняе для мяне было прыемным сюрпрызам, бо пачаўшы разводзіць коз, я не думаў пра малако, і толькі потым мне прышло ў галаву, што я магу іх даіць.

Самы сур'ёзны філасоф не стрымаў-бы ўхмылкі, каб убачыў мяне з маім сямействам за абедзеным сталом. Уласна кажучы, за сталом сядзеў толькі я, кароль і ўладар востраваў, у руках якога было жыццё ўсіх падданых: я мог караць і мілаваць, дарыць і адбіраць волю і ніколі не рабіў нездаволеных. Як сапраўдны кароль, я палуднаваў адзін, абкружаны штатам прыдворных. Толькі Попку, як каралеўскаму любімцу, дазвалялася гутарыць са мной. Сабака, які даўно ўжо састарыўся, сядзеў заўсёды з правай рукі на падлозе, і на падлозе-ж, толькі злева, сядзелі дзве кошкі, не спускаючы з мяне вачэй у чаканні падачкі, як знаку асаблівай каралеўскай ласкі.

Але гэта былі не тыя кошкі, якіх я прывёз з карабля: тыя даўно акалелі, і я ўласнай рукой пахаваў іх каля майго жылля. Адна з іх ужо на востраве акацілася: я пакінуў у сябе пару кацянят, і яны выраслі свойскімі, а астатнія збеглі ў лес і здзічэлі. Урэшце на востраве распладзілася такое мноства кошак, што не было ад іх ратунку: яны забіраліся да мяне ў кладоўку, цягалі прадукты і пакінулі мяне ў супакоі толькі тады, калі я застрэліў двух ці трох. Паўтараю, я жыў сапраўдным царком, маючы ўсё, што трэба; ка-

ля мяне заўсёды быў цэлы штат паслухмяных царадворцаў,—не было толькі людзей. Але хутка надышоў час, калі я пачаў баяцца, як-бы ў маіх уладаннях не з'явілася занадта многа людзей.

Хоць я цвёрда вырашыў ніколі больш не рабіць рызыкоўных марскіх падарожжаў, але ўсё-такі мне вельмі хацелася мець пад рукамі лодку для невялікіх экскурсій. Я часта думаў аб тым, як-бы мне перавесці яе на мой бок востраза, але, разумеючы, што зрабіць гэта цяжка, кожны раз супакойваў сябе тымі меркаваннямі, што мне добра і без лодкі.

Аднак, насуперак усім довадам розуму, мяне з кожным днём усё мацней і мацней цягнула схадзіць на тую горку, куды я ўзлазіў у апошнюю маю экскурсію, і яшчэ раз агледзець адтуль рыфы і морскае цячэнне. Аднойчы я не вытрымаў і пусціўся ў дарогу—на гэты раз пешшу, удоўж берагу.

Каб з'явілася ў нас у Англіі на вуліцах такое пудала, як я ў тагачасным маім убранні, уся публіка, я ўпэўнены, разбеглася-б ад спалоху ці пакацілася-б ад смеху: ды часта я і сам, гледзячы на сябе, мімаволі ўхмыляўся, уяўляючы сабе, як-бы я ў сваім адзенні вандраваў па Іоркшыру.

На галаве ў мяне была бясформенная шапка з казінай скуры з даўгім напатыльнікам, які боўтаўся на спіне, прыкрываючы маю шыю ад сонца, а ў час дажджу не даваў вадзе трапляць за каўнер.

У гарачым клімаце няма больш шкодна-

га, як хадзіць у мокрым адзенні, і я заўсёды баяўся тамашняга дажджу. Затым куртка з таго-ж матэрыялу, кароткая—толькі да бёдраў, і такія-ж кароткія, да кален, штаны, таксама футравыя, толькі са скуры вельмі старога казла з такой даўгой поўсцю, што яны закрывалі мне ногі да паловы ікраў. Панчох у мяне зусім не было, а заместа ботаў я зрабіў сабе... не ведаю, як і назваць... проста—сандаліі з зашпількамі па баках. На куртку я надзяваў шырокі пояс з казінай скуры, ачышчаны ад поўсці; пражку я замяніў двума раменнымі петлямі, на якія зацягваў пояс, а з бакоў прышыў да яго яшчэ па пятлі, але не для шпагі і кінжала, а для пілы і сякеры.

Акрамя таго, я насіў скураную перавязь цераз плячо, з такімі-ж зашпількамі, як на поясе, але крыху вузейшымі. Да гэтай перавязі я прырабіў дзве кішэні так, каб яны даводзіліся пад левай рукой: у адной порах, у другой быў шрот. На спіне ў мяне боўтаўся кошык, на плячы я трымаў стрэльбу, а над галавой—вялізны футравы парасон, вельмі нязграбны, але пасля стрэльбы, бадай, самы неабходны з майго дарожнага багажа.

Увогуле ў мяне быў самы варварскі выгляд. Але затое колерам твара я менш быў падобны на негра, як можна было чакаць беручы пад увагу, што я жыў пад тропікамі. Бараду я адзін час адпусціў на поўаршына. Потым пагаліў яе, пакінуўшы толькі вусы: але затое вусы я адрасціў цудоўныя—сапраўдныя турэцкія; даўжыні яны былі такой

незвычайнай, што ў Англіі пужалі-б народ. Але гэта між іншым: мала было на востраве гледачоў, каб любавацца маім тварам ды фігурай,—дык ці не ўсёроўна, які яны мелі выгляд? Я загаварыў аб сваім знадворным выглядзе проста таму, што гэта было дарэчы, і больш ужо не буду вяртацца да гэтай тэмы.

Раздзел шаснаццаты

Нечаканая трывога.— Рабінзон умацоўвае сваё жыллё.

Аднаго разу каля поўдня я ішоў берагам, накіроўваючыся да сваёй лодкі, і раптам убачыў след голай чалавечай нагі, які выразна быў адбіты на пяску.

Гэта, як гром, уразіла мяне. Я спыніўся, як укапаны, быццам ўбачыўшы якую здань. Я прыслухоўваўся, азіраючыся навакол, але не чуў і не бачыў нічога падазронага. Я ўзбег уверх па берагавому спаду, каб лепш агледзець мясцовасць; зноў спусціўся да мора; прайшоў крыху ўдоўж берагу—нідзе нічога: ніякіх адзнак нядаўняй прысутнасці людзей, акрамя гэтага адзінага адбітка нагі. Я пайшоў яшчэ раз зірнуць на яго, каб упэўніцца, ці сапраўды гэта чалавечы след і ці не здалося гэта мне. Але не, я не памыліўся! Гэта быў, бясспрэчна, след нагі чалавека: я выразна бачыў пятку, пальцы, падашву... Як я сюды трапіў? Я губляўся ў здагадках і не мог спыніцца ні на адной.

У страшэннай трывозе пайшоў я дамоў,

у сваю крэпасць. Я быў напалоханы да апошняй ступені.

Праз кожныя два-тры крокі я азіраўся, налохаўся кожнага куста, кожнага дрэва, і кожны пень, які паказваўся здалёк, я прымаў за чалавека. Вы не можаце сабе ўявіць, якія страшэнныя і нечаканыя формы прымалі ўсе прадметы ў маім узбуджаным выабражэнні, якія дзікія думкі праносіліся ў маёй галаве.

Дабраўшыся да майго замка (як я з таго дня пачаў называць сваё жыллё), я адразу апынуўся за агарожай. Я нават не помніў, ці пералез я цераз загарадку па прыстаўной лесніцы, як заўсёды, ці увайшоў праз дзверы, гэта значыць, праз знадворны ход, выкапаны ў гары; я і на другі дзень не мог гэтага прыгадаць.

Ніводзін заяц, ніводная ліса, ратуючыся ў вар'яцкім жаху ад сабак, не спяшаліся так схавацца ў сваім логаве, як я.

Усю ноч я не сплюшчыў вачэй; гэты жах быў яшчэ большым таму, што я не бачыў прадмета, які выклікаў яго. Якім чынам мог трапіць сюды чалавек?

Мусіць, гэта дзікуны з матэрыка, якія трапілі на востраў выпадкова: вышлі ў мора на сваёй пірозе, і іх прыгнала сюды цячэннем або ветрам; яны пабывалі на беразе, а потым зноў пайшлі ў мора, бо ў іх было такое-ж малае жаданне заставацца ў гэтай пустыні, як у мяне—мець іх сваімі суседзямі.

Бясспрэчна, яны не заўважылі маёй лодкі, інакш здагадаліся-б, што на востраве жы-

вуць людзі, і пачалі-б шукаць іх. Але тут мяне працяла жахлівая думка: «А што, калі яны б а ч ы л і маю лодку? Праўда, яны пайшлі зноў у мора, але гэта яшчэ нічога не даводзіць: яны вернуцца... абавязкова вернуцца з цэлай бандай сваіх супляменнікаў і тады знойдуць мяне і з'ядуць. А калі мяне не знойдуць, дык усёроўна ўбачаць мае палі і выганы, знішчуць увесь мой хлеб, пагоняць маіх коз, і я памру ад голаду».

Першыя трое сутак пасля той ліхой гадзіны, калі зрабіў сваё адкрыццё, я не высоўваў носа з сваёй крэпасці, аж пачаў нават галадаваць: я не трымаў у доме вялікіх запасаў прадуктаў, і на трэція суткі ў мяне засталіся толькі ячменныя коржыкі ды вада. Мяне мучыла таксама, што мае козы, якіх я звычайна даіў кожны вечар, застаюцца нядоенымі: я ведаў, што бедныя жывёлы ад гэтага пакутвалі, і акрамя таго баяўся, што ў іх можа страціцца малако. І тое, чаго я баяўся, збылося: шмат якія з коз захварэлі і амаль спынілі даваць малако.

Выходзячы з усіх гэтых меркаванняў, я на чацвертыя суткі набраўся храбрасці і вышаў. А тут хутка ў мяне з'явілася адна думка, якая канчаткова мяне ўзбадзёрыла. У самы разгар маіх страхаў, калі я вяртаўся ад здагадкі да здагадкі і ні на чым не мог спыніцца, мне раптам прышло на розум, ці не раздзьмуў я ўсю гэтую гісторыю з адбіткам чалавечай нагі і ці не мой гэта ўласны след, пакінуты, калі я ў перадапошні раз хадзіў глядзець сваю лодку і потым вяртаўся

дахаты? Праўда, вяртаўся я звычайна другой дарогай, але хіба не магло здарыцца, што я змяніў свой шлях на гэты раз? Гэта было даўно, і ці мог я з упэўненасцю сцвярджаць, што ішоў іменна той, а не гэтай дарогай. Вядома, я пастараўся пераканаць сябе, што так яно і было, што гэта мой уласны след і што ў гэтым здарэнні я разыграў дурня, які напалохаўся страшнай казкі, якую сам стварыў.

Калі я ў гэтым добра ўпэўніўся, то пачаў зноў кожны дзень хадзіць на дачу даіць коз. Але каб вы бачылі, як нясмела я ішоў, з якім страхам азіраўся, як быў заўсёды напагатове ў любы момант кінуць свой кошык і паказаць пяткі...

Але прайшло яшчэ два дні, і я зрабіўся смялейшым. Я сапраўды пачынаў прыходзіць да заключэння, што сам навыдумляў сабе страхаў; але, каб ужо не заставалася аніякіх сумненняў, я рашыў яшчэ раз пайсці на той бераг і зверыць таемны след з адбіткам маёй нагі: каб абодва сляды былі аднолькавыя, я мог-бы пераканацца, што напалохаўшы мяне след быў мой уласны.

З гэтай надзеяй я адправіўся ў дарогу. Але калі я прышоў на тое месца, дзе быў таемны след, то для мяне, па-першае, зрабілася відавочным, што, калі я таго разу вышаў з лодкі і вяртаўся дамоў, я ніякім чынам не мог апынуцца ў гэтым месцы берагу, а, па-другое, калі я для параўнання паставіў нагу на след, мая нага была значна меншай! І зноў мяне ахінуў панічны страх: я дрыжэў

як у трасцы; віхор новых здагадак закружыўся ў маёй галаве. Я пайшоў дамоў з поўнай упэўненасцю, што на маім востраве не так даўно пабывалі людзі або, прынамсі, адзін чалавек. Я нават гатоў быў дапусціць, што востраў населены, толькі да гэтага часу я таго не заўважаў, а цяпер можна чакаць, што мяне кожную хвіліну могуць захапіць знянацку. Усё пытанне было цяпер у тым, як абараніць сябе ад гэтай небяспекі.

«Калі дзікуны,—разважаў я,—знойдуць маіх коз і ўбачаць мае палі з збожжам, яны будуць заўсёды вяртацца на востраў за новай здабычай, а калі яны ўбачаць маё жыллё, то абавязкова возьмуцца адшукваць яго жыхароў і дабяруцца да мяне». Таму першай маёй думкай было пераламаць загарадкі ўсіх маіх выганаў і выпусціць увесь мой скот, затым перакапаць абодва палі і такім чынам знішчыць рунь рысу і ячменю, нарэшце разбурыць шалаш і палатку, каб вораг не мог выкрыць ніякіх адзнак прысутнасці на востраве чалавека.

Гэты план склаўся ў мяне ў першую ноч, калі я вярнуўся з маёй толькі што апісанай экспедыцыі на той бераг, пад яшчэ незастылымі ўражаннямі зробленых мною новых адкрыццяў. Адчуванне небяспекі заўсёды бывае страшнейшым, чымся падышоўшая небяспека, і чаканне зла ў дзесяць тысяч разоў горш самаго зла.

Усю ноч я не мог заснуць. Затое пад раніцу, калі я аслабеў ад бяссонніцы, я заснуў моцным сном і прачнуўся такім свежым і ба-

дзёрым, якім даўно ўжо не адчуваў сябе. Цяпер я пачаў разважаць больш спакойна і па спелых разважаннях вось да чаго прышоў. Мой востраў, багаты расліннасцю і лясачы непадалёк ад матэрыка, быў, вядома, не да такой ступені закінуты людзьмі, як я ўяўляў сабе дагэтуль, і хоць сталых жыхароў на ім не было, але здавалася пэўным, што дзікуны з матэрыка пад'язджалі да яго часамі ў сваіх пірогах. Мажліва было і тое, што іх прыганяла сюды плынню або ветрам. У кожным разе яны маглі тут бываць. А што за пятнаццаць год, якія я пражыў на востраве, я да апошняга часу не выкрыў і сляда прысутнасці на ёй людзей, то гэта таму, што дзікуны, прыязджаючы сюды, ніколі не заставаліся доўга. А калі яны дагэтуль не палічылі патрэбным ці зручным заставацца тут больш-менш доўга, то трэба думаць, што так яно будзе і надалей. Адсюль вынікае: адзіная небяспека, якая магла мне пагражаць, была небяспека напароцца на іх у адзін з гэтых рэдкіх наездаў. Але магчымасць нашай сустрэчы была вельмі малая, бо, па-першае, дзікунам няма чаго было рабіць на маім востраве, і, наязджаючы сюды, яны кожны раз, мусіць, спяшаліся дамоў, па-другое, можна было з упэўненасцю сказаць, што яны заўсёды прычальваюць да супроцьлеглага ад мяне берагу, як бліжэйшага ад матэрыка; я-ж вельмі рэдка хадзіў на той бераг.

Значыцца, у мяне не было прычыны асабліва баяцца дзікуноў, хоць, вядома, варта

ўсё-такі паклапаціцца пра надзейны прытулак на выпадак іх высадкі на востраве.

Мне прышлося цяпер пашкадаваць, што я пашырыў пячору за сваёй палаткай і вывеў з яе ход на знадворак. Трэба было так ці іначай выправіць гэтую памылку. І вось, памеркаваўшы, я рашыў пабудаваць вакол майго жылля яшчэ адну загарадку на такой адлегласці ад ранейшай сцяны, каб выйсце з пячоры было ў сярэдзіне ўмацавання. Ды мне нават і не трэба было будаваць новай сцяны: падвойны рад дрэў, якія я гадоў дванаццаць назад пасадзіў поўкругам удоўж старой загарадкі, быў ужо і сам надзейным аплотам,—так часта былі насаджаны дрэвы і так сільна яны разрасліся. Заставалася толькі пазабіваць коллем адлегласць паміж дрэвамі, каб ператварыць увесь гэты поўкруг у суцэльную, моцную сцяну. Гэтак я і зрабіў.

Цяпер мая крэпасць была абкружана двума сценамі. Але мая праца не скончылася на гэтым. Аграмадную плошчу за знадворнай сцяной я засадзіў тымі дрэўцамі, падобнымі на вярбу, якія так добра прымаліся і пра якія я ўжо казаў. Я лічу, што пасадзіў іх не менш дваццаці тысяч штук. Але паміж першымі дрэвамі і сцяной я пакінуў досыць значнае пустое месца, каб мне было лягчэй абараняцца ад ворага, які мог падкрасціся да яе пад прыкрыццем дрэў.

Праз два гады перад маім жыллём быў ужо малады гаёк, а яшчэ гадоў праз пяць-шэсць яго абступаў высокі лес, амаль непра-

ходны, так часта былі насаджаны ў ім дрэвы і так густа яны разрасліся. Ніводная істота ў свеце не магла-б цяпер падумаць, што за гэтым лесам схавана чалавечае жыллё. Каб уваходзіць у маю крэпасць і выходзіць з яе (бо я не пакінуў выйсця ў знадворнай сцяне), я карыстаўся двума лесніцамі, прыстаўляючы папераменна да гары, якая ў абодва бакі (гэта значыць да майго жылля і ў адваротны бок) спускалася высокімі стромкімі ўступамі, і таму, калі абедзве лесніцы былі ўзняты, ніводзін жывы чалавек не мог трапіць да мяне, не зламаўшы сабе шыі.

Раздзел семнаццаты

Рабінзон пераконваецца, што на яго востраве бываюць людаеды.

Панічны страх, які мяне не пакідаў з той хвіліны, як я знайшоў адбітак чалавечай нагі на пяску, быў адзінай прычынай, якая прымусіла мяне ўскласці сабе на плечы столькі работ, бо за час майго знаходжання на востраве да яго не набліжалася, паколькі мне было вядома, ніводная чалавечая істота. Ужо два гады прайшло з таго дня, калі я знайшоў на пяску след чалавечай нагі, але з гэтага дня я развітаўся са сваім ранейшым бестурботным жыццём, і гэтаму лёгка паверацъ усе тыя, хто паспытаў, што азначае жыць пад вечным прыгнётам страху.

Неяк раз дабраўся я да заходняга канца вострава, дзе ніколі раней не быў.. Не дайшоўшы да берагу, я ўзышоў на ўзгорак, і,

калі перада мной адкрылася мора, мне здалося, што здалёк відаць лодка. У мяне была дома падзорная труба, якая была ў адной з скрыняў, перавезеных з карабля; але я не здагадаўся ўзяць яе з сабой, а простым вокам не мог разгледзець, ці была гэта сапраўды лодка, хоць прагледзеў усе вочы, узіраючыся ўдалеч. Спускаючыся к берагу з узгорка, я ўжо нічога не бачыў; так і дагэтуль не ведаю, што гэта быў за прадмет, які я палічыў за лодку. Але з таго дня я даў сабе слова ніколі не выходзіць з дому без падзорнай трубы.

Дайшоўшы да берагу (гэта быў заходні бераг востраў, дзе, як ужо сказана, я раней не бываў), я хутка ўпэўніўся, што сляды чалавечых ног зусім не такая рэдкасць на маім востраве як я думаў! Так, я ўпэўніўся, што каб не трапіў на ўсходняе ўзбярэжжа, куды дзікуны не прыставалі, я-б даўно ўжо ведаў, што на маім востраве яны бываюць нярэдка і што заходнія яе берагі служаць ім не толькі сталай гаванню ў часе далёкіх морскіх экскурсій, але і месцам дзе яны балююць.

Тое, што я ўбачыў, калі спускаўся з узгорка і падышоў да берагу мора, ашаламіла мяне. Увесь бераг быў усеяны чалавечымі касцямі: чарапамі, шкілетамі, косткамі рук і ног. Не магу выказаць, які жах ахапіў мяне ад гэтай карціны.

Мне было вядома, што дзікія плямёны часта ваююць паміж сабой.

«Мабыць,—думаў я,—пасля кожнай су-

тычкі пераможцы прывозяць з матэрыка сваіх ваеннапалонных на гэтае ўзбярэжжа, дзе, па зверскаму звычаю ўсіх дзікуноў-людаедаў, забіваюць і з'ядаюць іх». У адным месцы я заўважыў круглую, выраўнаную пляцоўку, пасярод якой былі рэшткі кастра: тут, мусіць, і сядзелі бесчалавечныя варвары, спраўляючы свае жахлівыя баляванні...

Усё гэта так уразіла мяне, што я нават не адразу ўспомніў пра небяспеку, у якую я трапіў, застаючыся на гэтым беразе: жах перад абураючым скажэннем чалавечай прыроды, здольнай дайсці да такой зверскай жорсткасці, выціснуў з маёй душы ўвесь страх. Я не раз чуў пра падобныя праявы зверства, але ніколі да гэтага часу не выпадала бачыць іх самому. З нераможнай агідай адвярнуўся я ад жахлівага відовішча. Я ні хвіліны лішняй не заставаўся ў гэтым страшэнным месцы: я падняўся на ўзгорак і пабег назад, да жылля.

Калі заходні бераг застаўся ў мяне далёка адзаду, я спыніўся, каб ачуняць і набрацца думак. Варвары, як я ўпэўніўся, ніколі не прыязджалі на востраў за здабычай—ці таму, што ні ў чым не мелі патрэбы, ці можа таму, што не разлічвалі чым-небудь пажывіцца ў гэткім пустынным месцы.

Не магло быць аніякага сумнення, што яны не адзін раз пабылі ў лясістай частцы вострава, але, мусіць, не знайшлі там нічога такога, што магло-б ім спатрэбіцца. Бясспрэчна было адно: я пражыў на востраве без малога восемнаццаць год і да апошняга



часу ніводнага разу не знаходзіў слядоў чалавечых ног; з гэтага вынікала, што я мог пражыць тут яшчэ дваццаць год і не трапіць на вочы дзікунам, хіба толькі натыркнуўся-б на іх па ўласнай неасцярожнасці. Але такой выпадковасці не было чаго баяцца, бо адзіным маім клопатам было як мага лепш хаваць усе адзнакі прысутнасці маёй на востраве і як мага радзей выпаўзаць з сваёй нары, прынамсі да таго часу, пакуль лёс не прывядзе ў мае ўладанні цывілізаваных людзей, якім мне не страшна было-б паказацца.

Я мог-бы, каб хацеў, убачыць дзікуноў адкуль-небудзь з засады, але я не хацеў гэтага,—такія брыдкія былі для мяне гэтыя крыважэрныя звяры, якія жэрлі адзін аднаго. Адна думка аб магчывасці існавання ў людзей гэткіх бесчалавечных звычаяў наводзіла на мяне тугу. Каля двух год я праседзеў, нікуды не выходзячы, у той частцы вострава, дзе знаходзіліся мае ўладанні,—крэпасць пад гарой, лясная дача і тая палянка ў гушчы лесу, на якой я зрабіў абгароджаны выган для коз. За ўсе гэтыя два гады я ніводнага разу не хадзіў зірнуць на сваю пірогу; думаў нават аб тым, каб зрабіць новую лодку, бо канчаткова вырашыў, што не буду прабаваць прывесці з таго боку вострава маю ранейшую лодку. Я не меў ні малейшага жадання напароцца ў моры на дзікуноў, бо ведаў, якая доля чакае мяне, калі я траплюся ім у рукі.

Прайшло яшчэ каля года. Увесь гэты час

я быў так далёка ад усякіх спроб распра-віцца з дзікунамі, што зусім не бываў у тым баку востраў, дзе яны прычальвалі са сваі-мі пірогамі. Я нават ніводнага разу не пай-шоў зірнуць, ці не відаць іх на беразе. Ад-нага толькі разу я хадзіў на той бераг, ды і то толькі затым, каб узяць адтуль маю лодку. Я перавёў яе на ўсходні бок востра-ва, дзе для яе знайшлася вельмі зручная бух-тачка, схаваная з усіх бакоў стромкімі ска-ламі. Удоўж усходніх берагоў востра-ва праходзіла морская плынь, і я ведаў, што дзі-куны нізавошта не адважацца высадзіцца там.

Я думаю, чытачу не будзе здавацца дзіў-ным, калі я скажу яму, што адчуванне вечна-пагражаючай небяспекі, пад прыгнётам якой я жыў апошнія гады, заглушыла ў мяне ах-воту да вынаходніцтва для маіх хатніх вы-год. Не да таго мне было, каб клапаціцца аб паляпшэнні майго стала, калі я толькі і ду-маў, як-бы выратаваць сваё жыццё. Я баяў-ся ўбіваць цвік, шчапаць палена, каб дзіку-ны не пачулі грукату. Страляць я тым больш не адважваўся па той-жа прычыне. Але, га-лоўнае, мяне ахапляў невыказны страх кож-ны раз, калі мне трэба было раскладваць агонь, бо дым, які ўдзень відаць на вялікай адлегласці, заўсёды мог выдаць мяне. Таму я нават перанёс у новае памяшканне ўсе тыя выраблямыя рэчы (у тым ліку і ганчарныя), для якіх патрабаваўся агонь.

Я забыў сказаць, што неяк раз, працуючы ў лесе, я, на вялікую маю радасць, знайшоў

прыродную пячору ў скале, вельмі вялікую ў сярэдзіне, але з такім вузкім уваходам, што, я ўпэўнены, ніводзін дзікун не адважыўся-б лезці ў яе без крайняй патрэбы; ды і наогул толькі чалавеку, якому, як мне, трэба ратавацца, магла прысці фантазія пралезці ў гэтую шчыліну.

У адзін з тых дзён, калі я працаваў у лесе сякерай, мне давялося сячы лішняе галлё з аднаго вялікага куста, і пад ім я заўважыў нару шырынёю ў два футы. Мяне зацікавіла, куды можа весці гэты ход. Я пралез у яго, хоць і з вялікай цяжкасцю, і апынуўся ў пячоры, такой высокай, што мог ўстаць ва ўвесь рост. Але прызнаюся, што вылез я адтуль куды хутчэй, як улез. І не дзіва: узіраючыся ў цемру, я сустрэў два бліскучыя вокі, пазіраўшыя прама на мяне; яны блішчэлі, як зоркі, адбіваючы слабае дзённае святло, пранікаўшае знадворку і падаўшае на іх. Я не ведаў, каму належалі гэтыя вочы—д'яблу ці чалавеку, але перш чым я паспеў што-небудзь скеміць, мяне ўжо не было ў пячоры.

Крыху счакаўшы, я аднак апамятаўся і назваў сябе дурнем. «Хто пражыў дваццаць год адзін-адзінюткі сярод акіяна, таму не да твару баяцца чорта,—сказаў я сабе.—Напэўна ў гэтай пячоры ўжо-ж няма нікога страшнейшага за мяне». І, набраўшыся храбрасці, я захапіў палаючую галавешку і зноў палез у пячору. Але не паспеў я ступіць і тры крокі, асвятляючы сабе шлях галавешкай, як пасунуўся назад, перапалоханы не менш ранней-

шага; я пачуў гучны ўздых, як уздыхаюць ад болю, затым нейкія перарывістыя гукі накшталт мармытання і зноў цяжкі ўздых.

Я застыў ад жаху; халодны пот выступіў у мяне па ўсім целе, і валасы сталі дыбам. Тым не менш я не разгубіўся: зноў сунуўся ўперад і пры святле майго факела, які трымаў над галавой, убачыў аграмаднага старога казла! Ён ляжаў нерухома ды цяжка дыхаў у перадсмяротнай агоніі; ён здыхаў, відаць, ад старасці.

Я крануў яго нагой, каб прымусіць падняцца. Ён паспрабаваў быў устаць, але не здолеў. «Хай ён ляжыць, пакуль жывы,— падумаў я:—калі ён мяне напалохаў, дык напэўна не менш напалохае кожнага дзікуна, які ўздумае сунуцца сюды».

На другі дзень я ўзяў з сабой шэсць вялікіх свечак уласнага вырабу (к таму часу я навучыўся рабіць вельмі добрыя свечы з казінага тлушчу) і вярнуўся ў пячору. Я падышоў да вузкага ходу ў глыбіні пячоры, стаў на карачкі і папоўз уперад, што, паміж іншым, было даволі смелым учынкам з майго боку, калі ўзяць пад увагу, што я не ведаў, куды вядзе гэты ход і што чакае мяне наперадзе. Я прапоўз каля пяці сажняў і адчуў, што калідор робіцца усё шырэйшым і шырэйшым. Крыху пачакаўшы, я паспрабаваў устаць на ногі, і тады высветлілася, што я магу стаяць ва ўвесь рост. Тады я запаліў дзве свечкі і ўбачыў такую дзівосную карціну, якой я на маім востраве ніколі не бачыў. Я стаяў у прасторным гроце футаў

дваццаць у вышыню; святло маіх двух свечак адлюстроўвалася ад яго сцен і столі, і яны адсвечвалі тысячамі рознакаляровых агней. Ці былі гэта ўтыркнутыя ў камень пячоры дыяменты, ці іншыя каштоўныя каменні, ці золата,—я не ведаў і не ведаю, але думаю, што гэта золата.

Я ніяк не чакаў, што зямля можа захоўваць у сваіх нетрах гэткія цуды. Гэта быў дзівосны грот з сухой і роўнай падлогай, пакрытай дробным пяском. Нідзе ніякіх аднак цвілі або вільгаці, нідзе ніводнага сляда брыдкіх насякомых і атрутных гадаў. Адзіная нязручнасць—вузкі ўваход, але для мяне гэтая нязручнасць была каштоўней за ўсё, бо я-ж клапаціўся аб бяспечным прытулку, а бяспечней за гэта цяжка было знайсці. Я быў у захапленні ад сваёй вынаходкі і рашыў неадкладна перанесці ў мой грот усё тое з маёй маёмасці, чым я асабліва дарожыў, і перш за ўсё порах і ўсю запасную зброю, гэта значыць свае пяць стрэльбаў.

Перацягваючы ў новае памяшканне порах і запасную зброю, я заадно ўскрыў і той бачонак з порахам, які я падабраў у свой час з карабля. Я быў упэўнены, што ўвесь порах падмочаны, але выявілася, што вада трапіла ў бачонак толькі на тры, на чатыры дзюймы навакол; падмоклы порах зацвярдзеў і засох у моцную скарынку, у якой увесь астатні порах ляжаў, як ядро арэха ў лушпайцы. Такім чынам я нечакана разбагацеў яшчэ фунтаў на шэсцьдзесят вельмі добрага пораху. Гэта была вельмі прыемная не-

чаканасць. Увесь гэты порах я перанёс у свой грот, пакінуўшы ў сваёй крэпасці не больш трох фунтаў на выпадак нападу дзікуноў. Туды-ж, гэта значыць у грот, я перацягаў і ўвесь свой запас свінца, з якога рабіў кулі. «Няхай хоць пяцьсот дзікуноў бегаюць па востраву, шукаючы мяне: яны не знойдуць майго прытулку,—казаў я сабе,— а калі нават і знойдуць, то ўсёроўна не адважацца сунуцца да мяне!»

Ішоў ужо дваццаць трэці год майго жыцця на востраве, і я паспеў да такой ступені прызвычаіцца да гэтага жыцця, што, каб не баяўся дзікуноў, якія маглі кожную хвіліну патрывожыць маю адзіноту, я ахвотна згадзіўся-б правесці тут усю рэшту маіх дзён да апошняй гадзіны, калі я лёг-бы і памёр ад старасці, як казёл у пячоры. У апошнія гады я выдумаў сабе нават некаторыя забавы і дзякуючы гэтаму праводзіў час куды весялей, як раней. Па-першае, як ужо ведае чытач, я навучыў свайго Попку размаўляць, і ён так цікава балбатаў, вымаўляў словы так выразна, што было пацехай слухаць яго. Ён пражыў у мяне не менш дваццаці шасці гадоў. Як доўга жыў ён потым,—я не ведаю; я чуў у Бразіліі, што папугаі жывуць па сто гадоў.

Былі ў мяне яшчэ два папугаі, яны таксама ўмелі размаўляць і абодва вымаўлялі: «Робін Крузо», але далёка не так добра, як першы папугай. Праўда і тое, што на яго я патраціў куды больш часу і працы. Затым я лавіў на беразе і прыручаў морскіх птушак

усякіх невядомых мне пород. Усім ім я падразаў крыллі, каб яны не маглі паляцець.

Маладыя дрэўцы, якія я насадзіў перад сваёй крэпасцю, каб лепш схаваць яе ад дзікуноў, разрасліся ў густы гай, і ў гэтым гаі таксама пасялілася шмат птушак: яны вілі гнёзды на невысокіх дрэвах і выводзілі птушанят, а мяне гэта радавала і суцяшала.

Такім чынам, паўтараю, я адчуваў сябе спакойна і добра і быў-бы зусім задаволен сваім лёсам, каб не баяўся дзікуноў.

Раздзел восемнаццаты

Дзікуны зноў наведваюць востраў Рабінзона.—Крушэнне карабля.

Надышоў снежань месяц—час уборкі хлеба, якая патрабавала сталай работы на палях. І вось аднойчы, вышаўшы з дому перад досвіткам, я быў ашаломлены, убачыўшы агонь вялікага кастра на беразе, мілі на дзве ад майго жылля.

Я прытаіўся ў гайку, баючыся ступіць лішні крок, каб не натыркнуцца на дзікуноў. Але і ў гайку я не мог быць спакойным: я баяўся, што дзікуны пачнуць валэндацца па востраву, убачаць мае загарадкі і палі, зараз-жа здагадаюцца, што на востраве жывуць людзі, і не супакояцца, пакуль не знойдуць мяне. Падштурхнуты страхам, я жвава палез назад за агарожу, падняў за сабой лесніцу, каб схаваць свае сляды, і пачаў рыхтавацца да абароны.

Я зарадзіў усе свае стрэльбы, агледзеў і

зарадзіў абодва пісталеты і рашыў абараняцца да апошняга ўздыху. Я прабыў у сваёй крэпасці некаторы час, абмяркоўваючы, што-б такое яшчэ зрабіць, каб абараніць сябе ад ворагаў. Але нядоўга прасядзеў я на месцы: нельга было вытрымаць такую невядомасць. Я палез на гару і, дабраўшыся да самай вяршыні, вынуў з кішэні падзорную трубу, лёг на зямлю і накіраваў трубу на тое месца берагу, дзе відаць быў агонь. Там было дзевяць чалавек дзікуноў; усе яны сядзелі вакол кастра зусім голыя. Вядома, касцёр яны расклалі не для таго, каб пагрэцца, бо і так была вялікая спякота, а пэўна для таго, каб згатаваць свой варварскі абед з чалавечага мяса. Дзічына, напэўна, была ўжо падрыхтаваная, але жывая ці забітая—я не ведаў.

Дзікуны прыехалі на двух лодках, якія цяпер ляжалі на беразе: быў час адліву, і яны, відаць, чакалі прыліву, каб адправіцца назад.

Як я чакаў, так яно і вышла: як толькі пачаўся прыліў, дзікуны селі ў лодкі і адчалілі. Я забыў яшчэ сказаць, што за гадзіну ці за паўтары да ад'езду, яны скакалі на беразе. Я добра бачыў праз трубу іхнія дзікія рухі і скокі.

Як толькі яны адчалілі, я спусціўся з гары, ускінуў на плечы абедзве стрэльбы, заткнуў за пояс два пісталеты, цясак і, не трацячы часу, накіраваўся да таго ўзгорка, адкуль рабіў свае першыя назіранні, калі знайшоў на беразе чалавечы след. Дабраўшыся туды (гэта заняло не менш двух гадзін, бо я нёс

цяжкую зброю і не мог ісці хутка), я паглядзеў на мора і ўбачыў яшчэ тры лодкі з дзікунамі, якія накіроўваліся ад востраваа да матэрыка.

Гэтае адкрыццё засмуціла мяне, асабліва, калі, спусціўшыся к берагу, я ўбачыў рэшткі таго жахлівага балявання, якое толькі што там адбылося: кроў, косці і кавалкі чалавечага мяса, якое гэтыя зверы жэрлі з лёгкім сэрцам, скачучы і весяліўшыся. Мяне ахапіла такое абурэнне ад гэтай карціны, што я забыў свае разумныя намеры не чапаць дзікуноў, і ў галаве маёй пачалі складацца планы, як напасці на першую-ж партыю гэтых варвараў, якую я ўбачыў на беразе, якой-бы яна ні была шматлікай.

Увесь гэты час я быў у баявым настроі і ўсе свае вольныя гадзіны (якія, дарэчы, я мог-бы скарыстаць куды лепш) праводзіў у абмеркаванні планаў знішчэння дзікуноў.

Я канчаткова пастанавіў напасці на іх у наступны-ж раз, як убачу іх на беразе, асабліва калі яны зноў падзеляцца на дзве партыі, як гэта было ў апошні іх прыезд.

Але я не ўцяміў таго, што калі нават і пераб'ю ўсю партыю, прыкладна, у дзесяць або дванаццаць чалавек, то на другі дзень ці праз тыдзень, або месяц мне прыдзецца мець справу з новай бандай, а там зноў з новай, і гэтак бясконца, пакуль я сам не ператвараўся ў такога-ж, калі не горшага, забойцу, як гэтыя дзеці прыроды, што жэрлі сваіх блізкіх. Але прайшло больш года, пакуль я зноў убачыў дзікуноў.

Не магу выказаць, якім трывожным часам былі для мяне гэтыя пятнаццаць месяцаў. Я дрэнна спаў, кожную ноч бачыў страшныя сны і часта ўскокваў, прачнуўшыся ў сполаху. Часамі я сніў, што забіваю дзікуноў, і намагаўся ў сне апраўдаць сябе. Я і ўдзень не ведаў ні хвіліны спакою. Але аб гэтым, таксама як і аб маёй сустрэчы з дзікунамі, будзе гутарка далей. Цяпер-жа я хачу расказаць аб адной падзеі, якая парушыла на некаторы час аднастайнасць майго жыцця. Гэтая падзея здарылася на дваццаць чацвертым годзе майго жыцця на востраве, у сярэдзіне мая, а менавіта 16, калі верыць майму няшчаснаму драўлянаму календару, на якім даўно ўжо не засталося жывога месца ад зарубак.

Увесь дзень 16 мая была вялікая навальніца, і дзень змяніўся такой-жа бурнай ноччу. Позна вечарам я чытаў кнігу, імкнучыся адцягнуць свае думкі ад небяспек майго тагочаснага становішча. Раптам я пачуў гарматны стрэл—як мне здалося, з боку мора. Я ўздрыгануўся ад нечаканасці; гэта быў сюрпрыз зусім новага роду, які не меў нічога агульнага з тымі сюрпрызамі, якія лёс пасылаў мне дагэтуль. Баючыся страціць хаця-б секунду каштоўнага часу, я ірвануўся з месца, у адно імгненне прыставіў лесніцу да ўступу гары і пачаў узбірацца наверх. Якраз у тую хвіліну, калі я падняўся на вяршыню, перада мной бліснуў агеньчык, і сапраўды, праз поўсекунды я пачуў гук другога гарматнага стрэлу.

Я здагадаўся, што гэта нейкі пагібаючы карабль дае сігнал аб сваім безвыхадным становішчы. Не гледзячы на ўсё сваё хваляванне, я ўсё-ж такі паспеў падумаць, што хоць не магу выратаваць з бяды гэтых людзей, затое можа яны мяне вызваляць. Не трацячы часу, я сабраў ламачча, якое было паблізу, склаў яго ў кучу і падпаліў. Сухое дрэва адразу загарэлася, не гледзячы на моцны вецер, і так добра разгарэлася, што з карабля,—калі толькі гэта быў сапраўды карабль,—не маглі не заўважыць майго сігнала. І сігнал быў, відаць, заўважаны, бо як толькі запаліўся мой касцёр, я пачуў новы гарматны стрэл, потым яшчэ і яшчэ, усё з таго-ж боку.

Я падтрымліваў агонь усю ноч да досвітку, а калі зусім развіднела і прадранішні туман рассеяўся, убачыў на моры, з усходняга боку востраў, але вельмі далёка ад берагу, нейкі прадмет. Але ці быў гэта кузаў карабля ці парус, я не мог разабраць з-за далёкай адлегласці і з-за туману, які на моры яшчэ не зусім разышоўся.

Усю раніцу я назіраў за прадметам, што віднеўся на моры, і хутка ўпэўніўся, што ён нерухомы. Заставалася толькі здагадвацца, што гэта карабль стаіць на якары. Я не вытрымаў: схапіў стрэльбу, падзорную трубу і пабег на паўднёва-ўсходні бераг, да таго месца, дзе пачыналіся рыфы. Надвор'е між тым зусім прасвятлілася, і, узлезшы на бліжэйшы ўцёс, я мог, на мой вялікі жаль, выразна разгледзець кузаў разбітага карабля.

Відаць, ён ноччу наскочыў на падводныя рыфы і засеў у тым месцы, дзе яны загароджвалі шлях морскаму цячэнню і адкуль яно паварочвала назад.

Каб на караблі заўважылі востраў, дык напэўна спусцілі-б шлюпку, і, калі не ўвесь экіпаж, то хоць частка яго паспрабавала-б дабрацца да берагу. Імкнучыся ўявіць сабе далейшы лёс людзей, якія пацярпелі крушэнне, я рабіў розныя здагадкі. Але якая-б доля ні была ў няшчасных, я ў маім становішчы нічым не мог ім дапамагчы, я мог толькі шкадаваць іх ад усёй душы.

Я быў упэўнены, што з экіпажа разбітага карабля не засталося ў жывых аніводнага чалавека: цяжка было ўявіць, каб каму-небудзь з іх удалося выратавацца ў такую страшэнную буру, калі толькі іх не падабрала другое судна, якое магло быць разам з імі. Але наўрад каб гэта было: аніякіх слядоў другога карабля я не бачыў.

Дзе я знайду словы, каб перадаць тую самоту, тую ненасытную прагу быць разам з падобнымі да мяне істотамі, якая напоўніла маю душу, калі я ўбачыў карабль? З маіх вуснаў мімаволі бесперапынку зляталі словы: «Ах, каб хоць два або тры чалавекі... не, хоць-бы адзін з іх выратаваўся і прыплыў да мяне! Ён быў-бы маім сябрам, братам; ён гутарыў-бы са мной».

Ніводнага разу за ўсе доўгія гады майго адзінокага жыцця не адчуў я такой пільнай патрэбы ў людской грамадзе, ні разу не адчуваў так балюча сваёй адзіноты.

Раздзел дзевятнаццаты

Рабінзон зноў спрабуе пакінуць свой востраў.

Да канца майго жыцця на востраве я так і не даведаўся, ці выратаваўся хто з загінуўшага карабля. Я толькі знайшоў адно нешта жахлівае: праз некалькі дзён пасля крушэння карабля я ўбачыў на беразе, супроць таго месца, дзе разбіўся карабль, тапельца, зусім яшчэ маладога чалавека. На ім былі кароткія палатняныя штаны, сіняя палатняная сарочка і матроская куртка. Ні па якіх адзнаках нельга было вызначыць яго нацыянальнасці: у кішэні ў яго не было нічога, акрамя двух залатых манет ды люлькі, і апошняя рэч мяне абрадвала куды больш, як першая.

Пасля буры ўстанавіўся поўны штыль, і мне вельмі хацелася паспрабаваць дабрацца на лодцы да карабля. Я быў упэўнены, што знайду там нямала такога, што можа мне спатрэбіцца: але, уласна кажучы, не гэта спакушала мяне, а надзея, што можа на караблі засталася якая жывая істота, якую я магу выратаваць ад смерці і такім чынам парадаваць сваё невясёлае жыццё.

Гэтая думка аўладала мной цалкам: я адчуваў, што ні ўдзень, ні ўначы не буду мець спакою, пакуль не паспрабую яе выканаць. І я сказаў сабе: «Хай там што будзе, а я паспрабую дабрацца туды. Чаго-б мне гэта ні каштавала, я павінен ехаць, калі не хачу, каб мяне замучыла сумленне».

З гэтым рашэннем я паспяшаўся вярнуц-

ца ў свой замак і пачаў рыхтавацца да паездкі.

Я нарыхтаваў хлеба, вялікі збан прэснай вады, бутэльку рому (якога ў мяне застаўся досыць вялікі запас), кошык ізюму і компас. Навесіўшы на сябе ўсю гэтую паклажу, я адправіўся да таго берагу, дзе стаяла мая лодка. Я вычарпаў з яе ваду, палажыў у яе рэчы і вярнуўся дамоў за новым грузам. Новая партыя рэчаў складалася з вялікага мяшка рысу, другога збана з прэснай вадой, дзесяткаў двух невялікіх ячменных скібак або, лепш сказаць, перапечак, бутэлькі казінага малака, кавалка сыру і парасона. Усё гэта я з вялікай цяжкасцю—у поце, можна сказаць,—перацягаў у лодку і адчаліў. Рызыка была вялікая. «Ісці, ці не?..» Трэба было на што-небудзь адважыцца. Я зірнуў на шпаркі струмень морскай плыні, абгінаўшай востраў на некаторай адлегласці ад берагу, прыгадаў сваю першую экскурсію, прыгадаў, у якую небяспеку я тады трапіў, і адвага пачала мяне пакідаць. Я ведаў, што, калі я траплю ў струмень плыні, мяне занясе ў мора. «Я магу згубіць з віду мой востраў, і што мяне чакае тады?—думаў я.—Варта падзьмуць свежаму ветру, каб маю лодачку заліла вадой, і тады я беззваротна загінуў».

Пад уплывам гэтых меркаванняў я ўжо гатоў быў адмовіцца ад сваіх намераў. Я прычаліў да берагу ў маленькай бухтачцы, вышаў з лодкі і сеў на ўзгорак, не ведаючы, што рабіць. Надышла ноч. Я пераначаваў у лодцы, накрыўшыся матроскай курткай, а

раніцой вышаў у мора. Спачатку я ўзяў кірунак у адкрытае мора, пакуль не трапіў у струмень плыні, які накіроўваўся на ўсход. Мяне панесла вельмі шпарка, прама да карабля, і я дабраўся да яго менш як за дзве гадзіны. Сумнае відовішча прастаўляў гэты карабль (па тыпу—іспанскі). Ён ушчаміўся носам між двух рыфаў. Карма была знесена, мачты зрэзаны дашчэнту, але ўся насавая частка, якою карабль наскочыў на скалу, засталася цэлай. Калі я падышоў да борта, на палубе з'явіўся сабака. Убачыўшы мяне, ён пачаў выць і скавытаць, а калі я паклікаў яго, ускочыў у ваду і падплыў да мяне. Я ўзяў яго ў лодку. Бедная жывёліна літаральна паміралa ад голаду. Я даў яму хлеба, і ён накінуўся на яго, як згаладаўшы за зіму воўк. Калі ён наеўся, я паставіў перад ім ваду, і ён пачаў так прагна лізаць, што, мусіць, лопнуў-бы, каб даць яму ўдосыць.

Затым я падняўся на карабль. Першае, што я там убачыў, былі два трупы; яны ляжалі ля ўваходу ў рубку, моцна сашчапіўшыся рукамі. Відаць, калі карабль наскочыў на камень, яго ўвесь час залівала вадой, і гэтыя два чалавекі, баючыся, каб іх не змыла за борт, учапіліся адзін за аднаго, ды так і захлынуліся.

Акрамя сабакі, на караблі не засталося аніводнай жывой істоты. Большую частку рэчаў, відаць, таксама знесла ў мора, а тое, што засталося, падмокла. Я бачыў у труме нейкія бочкі, з віном ці з гарэлкай—не ведаю, але яны былі такія вялікія, што я іх не

прабаваў скрануць. Было там яшчэ некалькі скрыняў, якія, мусіць, належалі матросам; дзве скрыні я перацягнуў у лодку, не адчыняючы. Каб замест насавой часткі засталася цэлая карма, я-б, напэўна, вярнуўся з багатай здабычай.

Акрамя скрыняў, я ўзяў яшчэ бачонак з нейкім спіртным піццём. Бачонак быў невялікі—каля двух вядзёр умяшчальнасцю, але ўсётакі мне каштавала шмат працы перацягнуць яго ў лодку. У каюце я знайшоў некалькі стрэльбаў і фунты чатыры пораху ў парахоўніцы; стрэльбы я пакінуў, бо яны мне былі непатрэбныя, а порах узяў; узяў таксама лапатачку для вугалю і шчыпцы, у якіх меў вялікую патрэбу; затым два мядзяныя кацялкі і мядзяны кафейнік. З усім гэтым грузам і з сабакам я адчаліў ад карабля, бо пачынаўся ўжо прыліў, і ў той-жа дзень к гадзіне ночы вярнуўся на востраў, змораны да апошняй ступені.

Я рашыў перанесці сваю здабычу ў новы грот, бо туды было бліжэй. Ноч я зноў правёў у лодцы, а зранку, падмацаваўшыся ядой; выгрузіў на бераг прывезеныя рэчы і зрабіў ім падрабязны агляд. У бачонку аказаўся ром, які ўжываюць у Бразіліі; затое ў скрынях я знайшоў шмат карысных рэчаў.

У адной было некалькі зусім яшчэ моцных сарочак, якія былі для мяне вельмі прыемнай знаходкай; затым каля двух тузінаў белых палатняных насавых хустачак і столькі-ж каляровых шыйных; першыя мяне вельмі ўзрадвалі, калі я ўявіў сабе, як будзе пры-

емна ў спякоту выціраць успацелы твар тонкай палатнянай хустачкай. На дне скрыні я знайшоў тры вялікія мяшкі з грашыма і некалькі невялікіх зліткаў золата, вагой, я лічу, каля фунта.

У другой скрыні было некалькі пар адзежы, але даволі зношанай, з таннага матэрыялу. Увогуле, я набыў нямнога каштоўных рэчаў. Праўда я ўзбагацеў на досыць значную суму грошай, але-ж грошы былі для мяне непатрэбным смеццем, і ўсе, колькі іх было ў мяне, я ахвотна аддаў-бы за тры-чатыры пары англійскіх ботаў, якія я не насіў ужо некалькі год.

Пераправіўшы у мой грот усе прывезеныя рэчы, я вярнуўся ў лодку, адвёў яе на месца ранейшай стаянкі і выцягнуў на бераг, а сам накіраваўся простай дарогай на сваё старое пасялішча, дзе ўсё было ў поўным парадку. З гэтага часу я зажыў ранейшым мірным жыццём, спраўляючы пакрысе свае хатнія справы.

Так пражыў я амаль два гады, але ўсе гэтыя два гады ў маёй няшчаснай галаве варушыліся мары, як-бы мне выбрацца з майго вострава, і я ўпэўнены, каб быў у маім распараджэнні баркас, ну хоць-бы накшталт таго, на якім я ўцякаў ад маўраў, я рушыў-бы ў мора, нават не турбуючыся аб тым, куды мяне занясе.

Нарэшце я прышоў да перакананння, што мне ўдасца вырвацца з маёй турмы толькі ў тым выпадку, калі я захаплю каго з дзікуноў, наведваўшых мой востраў, лепш за ўсё

было-б захапіць аднаго з тых няшчасных, на долю якіх выпадала быць з'едзенымі, якіх прывозілі сюды ў якасці палонных. Але было адно важнае меркаванне, якое перашкаджала выканаць гэты план: для таго, каб захапіць патрэбнага мне дзікуна, я павінен быў напасці на ўсю зграю людаедаў і пазабіваць іх усіх да аднаго, а мая душа ўздрыгвалася пры думцы аб тым, што мне прыдзецца праліць столькі чалавечай крыві, хоць-бы і дзеля ўласнага збавення.

Доўга я змагаўся з сабой, але нарэшце прага да вызвалення перамагла ўсе довады сумлення і розуму. Я рашыў, чаго-б мне гэта ні каштавала, захапіць аднаго з дзікуноў у першы-ж раз, калі яны прыедуць на мой востраў.

Раздзел дваццаты

Рабінзон выратоўвае аднаго дзікуна і дае яму імя Пятніца.

Уявіце-ж сабе маю радасць, калі аднаго разу, гады праз паўтары, раніцой, я ўбачыў на беразе па меншай меры пяць індзейскіх пірог. Усе яны стаялі пустыя; прыехаўшыя ў іх дзікуны некуды зніклі. Я ведаў, што дзікуны звычайна сядаюць па чатыры, па шэсць чалавек, а то і больш, у кожную лодку, і прызнаюся, мяне крыху трывожыла шматлікасць прыбыўшых гасцей. Я не ведаў, як мне аднаму здужаць два-тры дзесяткі дзікуноў.

Збянтэжаны, не ведаючы што рабіць, я

засеў у сваёй крэпасці, але на кожны выпадак надзеў усю сваю зброю і быў гатоў дзейнічаць, каб надышла такая мажлівасць. Я доўга чакаў, прыслухоўваючыся, ці не набліжаецца вораг да маёй крэпасці, але нарэшце знудзіўся ад чакання, зняў з сябе абедзве стрэльбы, прыхінуў іх да падножжа скалы і палез наверх па сваіх прыстаўных лесніцах. Дабраўшыся да вяршыні, я стаў так, каб галава мая была не відаць з-за грэбня скалы, і пачаў назіраць у падзорную трубу. Дзікуны цяпер вярнуліся да сваіх лодак. Іх было не менш трыццаці чалавек. Яны расклалі на беразе касцёр і нешта варылі на агні. Я не мог разглядзець, што там такое смажылася ці варылася; бачыў толькі, што, скончыўшы яду, яны пусціліся ў скокі вакол кастра з недарэчнымі крыўляннямі і падскокамі, як звычайна скачуць дзікуны.

Раптам некалькі чалавек адлучыліся ад скачучых і пабеглі да сваіх лодак, а ўслед за тым я бачыў, што яны валакуць да кастра двух няшчасных, відаць, прызначаных для забойства. (Да гэтай хвіліны тыя, мусіць, ляжалі звязаныя ў лодках.) Аднаго з іх зараз-жа павалілі, ударыўшы яго па галаве нечым цяжкім (дубінай ці драўляным мячом, якія ўжываюць дзікуны), і цягнуўшыя яго людзі неадкладна ўзяліся за работу: распаролі яму жывот і пачалі яго патрашыць. Другі палонны стаяў тут-жа, чакаючы сваёй чаргі. Заняўшыся першай ахвярай, каты забыліся на яго. Няшчасны адчуў сябе на волі, і ў яго, відаць, мільганула надзея на выратуў-

нак: ён раптам ірвануўся і з незвычайнай шпаркасцю пусціўся бегчы. Ён бег удоўж берагу прама да мяне,—у той бок, дзе было маё жыллё.

Прызнаюся, я вельмі перапалохаўся, калі ўбачыў, што ён бяжыць да мяне, і асабліва, калі мне здалося, што ўся банда кінулася яго даганяць. Тым не менш я застаўся на сваім пасту і хутка ўпэўніўся, што за ўцекачом гоняцца толькі два ці тры чалавекі, а астатнія, прабегшы невялікую адлегласць, вярнуліся. Гэта мяне ўзбадзёрыла; але я зусім супакоіўся, калі ўбачыў, што ўцякач далёка выперадзіў сваіх ворагаў: было ясна, калі яму ўдасца пратрымацца яшчэ поўгадзіны, яны яго не зловяць.

Ад маёй крэпасці бегшыя былі аддзелены вузкай бухтачкай, пра якую я не раз гаварыў у пачатку апавядання, той самай, куды я прычальваў са сваімі плытамі, калі перавозіў рэчы з нашага карабля. «Што будзе рабіць гэты небарака—падумаў я,—калі дабяжыць да бухтачкі? Ён вымушан будзе пераплысці яе, іначай яму не ўцячы». Але я дарэмна баяўся: уцякач не задумваючыся, кінуўся ў ваду, шпарка пераплыў бухтачку, вылез на другі бераг і, не збаўляючы крокаў, пабег далей. З трох праследвальнікаў толькі двое кінуліся ў ваду, а трэці не адважыўся; ён пастаяў на тым беразе, паглядзеў услед іншым, потым павярнуўся і, не спяшаючыся, пайшоў назад да мора.

Я з радасцю заўважыў, што два дзікуны, якія гналіся за ўцекачом, плылі значна цішэй

за яго. І тут я ўсёй істотай сваёй адчуў, што надышоў час дзейнічаць. Не трацячы часу, я збег па лесніцы к падножжу гары, узяў пакінутыя мною там стрэльбы, затым з такойжа спрытнасцю ўлез зноў на гару, спусціўся з другога боку і пабег да мора напярэймы бегшым дзікунам. Але я крыху спазніўся: чалавек, які выратаваўся ад пагоні, паспеў прабегчы далей, такім чынам я апынуўся паміж ім і тымі, што гналіся за ім. Я гучна клікнуў яго. Ён азіраўся і ў першую хвіліну перапалохаўся мяне, здаецца, яшчэ больш, як сваіх ворагаў. Я зрабіў яму знак вяртацца, а сам пайшоў ціхім крокам насустрач двум бегшым дзікунам. Калі той, што быў наперадзе, параўняўся са мной, я нечакана кінуўся на яго і паваліў яго з ног ударам прыклада. Страляць я баяўся, каб не патрывожыць астатніх дзікуноў, хоць на такой вялікай адлегласці яны наўрад ці пачулі-б мой стрэл, а каб і пачулі, дык усёроўна не здагадаліся-б, што гэта азначае, бо не маглі-б убачыць дыму.

Калі пярэдні з бегшых упаў, яго таварыш спыніўся, відаць, перапалохаўшыся. Я тымчасам спакойна набліжаўся да яго. Але калі, падышоўшы бліжэй, я заўважыў, што ён трымае ў руках лук і стралу і цэліцца ў мяне, мне не засталося нічога больш, як стрэліць: я прыцэліўся, спусціў курок і палажыў яго адразу-ж. Няшчасны ўцякач, не гледзячы на тое, што я забіў абодвух яго ворагаў (у кожным разе так яму павінна было здавацца), быў так напалоханы агнём і грукатам стрэлу, што страціў здольнасць рухацца: ён стаяў,

як прыбіты цвікамі, не ведаючы, на што адважыцца, і, відаць, ахвотна ўцёк-бы, каб такая магчывасць была. Я пачаў зноў крычаць яму і рабіць знакі, каб ён падышоў бліжэй. Ён зразумеў: зрабіў крокі два і спыніўся, потым зрабіў яшчэ некалькі крокаў і зноў стаў, як укапаны.

Тут я заўважыў, што ён дрыжыць, як у трасцы: небарака, відаць, баяўся, што, калі ён трапіць мне ў рукі, я зраблю з ім тое самае, што з двума іншымі. Я зноў паклікаў яго да сябе і наогул намагаўся ўзбадзёрыць яго, як умеў. Ён падыходзіў усё бліжэй і бліжэй; праз кожныя дзесяць-дванаццаць крокаў ён падаў на калены, жадаючы, відаць, выказаць мне сваю ўдзячнасць за тое, што я выратаваў яму жыццё. Я ласкава яму ўхмыляўся і рабіў знакі рукой. Нарэшце, падышоўшы зусім блізка, ён зноў упаў на калены, пацалаваў зямлю, прыціснуўся да яе тварам і, падняўшы маю нагу, паставіў яе сабе на галаву. Апошняе павінна было, мусіць, азначаць, што ён клянецца быць маім рабом да самай смерці. Я падняў яго, папляскаў па плячы і ўсялякім спосабам стараўся паказаць, што яму няма чаго баяцца мяне.

Але пачатая мною справа яшчэ не была даведзена да канца: дзікун, якога я паваліў ударам прыклада, быў не забіты, а толькі аглушаны, і я заўважыў, што да яго вяртаецца прытомнасць. Я паказаў на яго выратаванаму мною чалавеку: «вось, вораг твой жывы!»

У адказ ён сказаў мне некалькі слоў на сваёй мове, і хоць я нічога не зразумеў, але самыя гукі яго гаворкі былі для мяне салодкай музыкай: я-ж за дваццаць пяць з лішкам гадоў першы раз пачуў чалавечы голас!

Аднак, у тую хвіліну мне было не да таго, каб аддавацца такім думкам: аглушаны мною дзікун ачуняў настолькі, што ўжо сядзеў на зямлі, і я заўважыў, што мой дзікун зноў пачынае баяцца. Жадаючы яго супакоіць, я прыцэліўся ў яго ворага з другой стрэльбы. Але тут ён пачаў паказваць мне знакамі, каб я даў яму шаблю, што вісела ў мяне за поясам. Я падаў яму шаблю. Ён схапіў яе, кінуўся да свайго ворага і адным махам адсек яму галаву. Такое ўмельства валодаць халоднай зброяй вельмі здзівіла мяне ў чалавеку, ніколі ў жыцці не бачыўшым ніякай зброі, акрамя драўляных мячоў. Пасля я аднак даведаўся, што тутэйшыя дзікуны выбіраюць для сваіх мячоў такое моцнае дрэва, што такім драўляным мячом можна адсячы галаву не горш, як жалезным. Зрабіўшы сваю справу, ён вярнуўся да мяне, трымаючы ў адной руцэ маю шаблю, а ў другой галаву забітага ворага і, выканаўшы перада мной цэлы шэраг нейкіх рухаў, урачыста палажыў галаву і зброю на зямлю каля мяне.

Ён бачыў, як я застрэліў другога індзейца, і гэта вельмі яго ўразіла: ён не мог зразумець, якім чынам можна было забіць чалавека на такой вялікай адлегласці. Ён паказаў на забітага і знакамі прасіў дазволу пайсці зірнуць на яго. Я дазволіў, і ён зараз-

жа пабег туды. Ён спыніўся над трупам у поўным недаўменні: пастаяў, паглядзеў, павярнуў яго на адзін бок, потым на другі, агледзеў рану. Куля трапіла проста ў сэрца, і крыві было мала; але напэўна адбыліся ўнутраныя крывавыя выцёкі, бо смерць надышла раптам. Зняўшы з мерцвяка яго лук і калчан са стрэламі, мой дзікун вярнуўся да мяне. Тады я павярнуўся і пайшоў, запрашаючы яго ісці за мной і стараючыся растлумачыць яму знакамі, што заставацца тут небяспечна, бо за ім можа быць новая пагоня.

Ён адказаў мне, таксама знакамі, што варта было-б раней закапаць мерцвякоў, каб дзікуны не знайшлі іх, калі прыдуць на гэтае месца. Я выказаў сваю згоду, і ён зараз-жа ўзяўся за справу. За некалькі хвілін ён голымі рукамі выкапаў у пяску такую глыбокую яму, што ў ёй лёгка мог змясціцца адзін чалавек; затым ён перацягнуў у гэтую яму аднаго з забітых і засыпаў яго зямлёй. Такжа спрытна пахаваў ён і другога мерцвяка; словам, уся працэдура пахавання заняла ў яго не больш поўгадзіны. Калі ён скончыў, я зноў зрабіў яму знак ісці за мной, і мы адправіліся ў дарогу. Але я павёў яго не ў крэпасць, а зусім у іншы бок—у дальнюю частку востраваа, да майго новага грота.

Калі мы прышлі, я даў яму хлеба, галінку ізюму і напаіў яго вадой, у якой ён меў вялікую патрэбу пасля шпаркага бегу. Калі ён падмацаваў свае сілы, я паказаў яму кут пячоры, дзе ў мяне ляжалі подсцілка з рысавай

саломы і коўдра, і даў зразумець яму знакамі, што ён можа легчы спаць. Небарака не прымушаў сябе доўга прасіць: ён лёг і адразу-ж заснуў.

Я выкарыстаў момант, каб лепш разгледзець яго знадворны выгляд. Гэта быў прыгожы малады чалавек, высокага росту і надзвычай добрага складу; на выгляд яму можна было даць гадоў дваццаць пяць, дваццаць шэсць. У яго твары не было нічога дзікага і жорсткага, гэта быў мужны, прыемны твар еўрапейца з выразам ласкі і дабрыні, асабліва калі ён ухмыляўся. Валасы ў яго былі чорныя даўгія і прамыя, не маючыя нічога агульнага з калматымі, як авечая поўсць, валасамі неграў; лоб высокі адкрыты; колер скуры не чорны, а цёмнакарычневы, але не таго брыдкага жоўтабурага адцення, як у бразільскіх тубыльцаў Амерыкі, а больш бронзавы, вельмі прыемны для вока. Авал твара яго круглы, нос невялікі, але зусім не прыплюшчаны. Да ўсяго гэтага ў яго былі быстрыя бліскучыя вочы, добры абрыс рота з тонкімі губамі і правільнай формы, белыя, як слановая косць, зубы.

Праспаўшы каля поўгадзіны — ніяк не больш, ён вышаў да мяне. Я ў гэты час даіў сваіх коз у загоне каля грота. Як толькі ён убачыў мяне, ён падбег да мяне і распластаўся перада мной, выказваючы ўсёй сваёй позай самую вялікую адданасць. Прыпаўшы тварам да зямлі, ён зноў паставіў сабе на галаву маю нагу, як ужо рабіў гэта раней, і ўвогуле ўсімі ўласцівымі яму спосабамі на-

магаўся давесці мне сваю бязмежную ўдзячнасць і даць мне зразумець, што з гэтага дня ён будзе мне служыць усё сваё жыццё.

Я зразумеў многа з таго, што ён хацеў мне сказаць, і ў сваю чаргу, пастараўся вытлумачыць яму, што я ім вельмі задаволен. З таго-ж дня я пачаў вучыць яго англійскім словам. Перш за ўсё я растлумачыў яму, што буду клікаць яго Пятніцай (я выбраў для яго гэтае імя ў адзнаку таго дня, калі выратаваў яму жыццё). Затым я навучыў яго вымаўляць маё імя: навучыў таксама адказваць «так» і «не» і растлумачыў значэнне гэтых слоў. Я прынёс яму малака ў гліняным збане і паказаў, як абмокваць у яго хлеб. Ён жвава пераняў і пачаў паказваць мне знакамі, што частаванне было яму да смаку.

Мы пераначавалі ў гроце, але, як толькі пачало світаць, я загадаў яму ісці за мной і павёў у сваю крэпасць. Я растлумачыў яму, што хачу яго апрануць, і гэтаму, відаць, ён быў вельмі рады. Калі мы праходзілі міма таго месца, дзе былі закапаны забітыя дзікуны, ён паказаў мне на адзнакі, якімі ён для памяці вызначыў магілы, і ўсяляк намагаўся мне вытлумачыць, што нам варта адкапаць абодва трупы, каб з'есці іх потым. У адказ на гэта я, з свайго боку, пастараўся, як можна выразней, паказаць яму, як мне брыдка нават слухаць такія рэчы. Я зрабіў выгляд, што ад адной думкі аб гэтым мне робіцца моташна і нарэшце сурова загадаў яму адысці ад магіл, што ён і выканаў з вялікай пакорлівасцю.

Пасля гэтага мы з ім узышлі на ўзгорак, бо мне хацелася зірнуць, ці тут яшчэ дзікуны. Я дастаў падзорную трубу і навёў яе на тое месца ўзбярэжжа, дзе бачыў іх напярэдадні. Але іх ужо не было: на беразе не было аніводнай лодкі. Не было ніякага сумнення, што яны паехалі, нават не патурбаваўшыся пашукаць сваіх згінуўшых землякоў.

Але я не здаволіўся гэтым: мне хацелася больш даведацца пра маіх някліканых гасцей. Прысутнасць Пятніцы надавала мне храбрасці, а разам з храбрасцю ў мяне з'явілася і цікавасць. Мой дзікун не пакідаў свайго лука і стрэлаў, якімі, як я паспеў ужо пераканацца, ён валодаў па-майстэрску. Акрамя таго я ўзброіў яго маёй шабляй, даў яму адну з маіх стрэльбаў, а сам узяў дзве іншыя, і мы з ім крануліся ў дарогу. Калі мы прышлі на тое месца, дзе напярэдадні балявалі дзікуны, нашы вочы ўбачылі такую страшэнную карціну, што ў мяне замерла сэрца і кроў застыла ў жылах ад жаху. Але Пятніца, як кажуць, і вокам не міргнуў: такія карціны былі яму не ўпершыню.

Увесь бераг быў усеяны чалавечымі касцямі; зямля ў шмат якіх месцах была насычана крывёю; вакол валяліся недаедзеныя кавалкі смажанага чалавечага мяса і іншыя рэшткі крывавага балявання, якім гэтыя крыважэры адсвяткавалі сваю перамогу над ворагам.

Я налічыў тры чалавечыя чарапы, пяць рук; знайшоў у розных месцах косці ад трох

або чатырох ног і мноства іншых частак шкілета.

Пятніца расказаў мне, як умеў, што дзікуны прывезлі з сабой чатырох палонных; трох яны з'елі, а ён быў чацвертым.

Як можна было зразумець ад яго тлумачэнняў, за некалькі дзён перад тым у дзікуноў адбылася крывавая бойка з суседнім племем, да якога належыў ён, Пятніца. Чужыя дзікуны перамаглі і забралі ў палон вельмі многа народу. Усіх палонных чакала з'ядзенне, пераможцы падзялілі іх паміж сабой і павезлі ў розныя месцы, дзе і пакончылі з імі, як пакончыла з трыма сваімі палоннымі тая партыя дзікуноў, якая выбрала месцам для балявання адзін з берагоў майго вострава.

Я загадаў Пятніцы раскласці вялікі касцёр, затым пазбіраць усе косці, усе кавалкі мяса, кінуць іх у гэты касцёр ды спаліць. Я заўважыў, што яму вельмі хацелася пакаштаваць чалавечага мяса (ды яно не дзіва: ён-жа быў людаед). Аднак ён не адважыўся выказаць свайго жадання, памятаючы, мусіць, з якім абурэннем я ставіўся да першай яго падобнай заявы. Здаецца, я нават пагражаў яму тады, што заб'ю яго, як сабаку, пры малейшай спробе з яго боку не паслухацца маёй забароны.

Знішчыўшы рэшткі крывавага балявання, мы з Пятніцай вярнуліся ў маю крэпасць, і я зараз-жа узяўся апранаць майго дзікуна.

Перш за ўсё я надзеў на яго штаны. У адной з скрыняў, узятых мною з загінуўшага карабля, знайшлася гатовая пара палатняных

штаноў; іх прышлося толькі крыху пакараціць. Затым я пашыў яму куртку з казінай скуры, прылажыўшы ўсе свае здольнасці, каб куртка вышла ляпейшай (я быў у той час ужо даволі спрытным краўцом), і нарэшце змайстраваў шапку з заячых скурак, вельмі зручную і не зусім пазбаўленую фасона.

Такім чынам мой дзікун быў на першы час зусім адзеты і застаўся, відаць, вельмі задаволены тым, што ён апрануты амаль таксама добра, як і я. Праўда, спачатку было яму ніякавата і няёмка ва ўсім гэтым адзенні, асабліва перашкаджалі яму штаны. Скардзіўся ён і на куртку: казаў, што рукавы ціснуць яму пад пахамі і націраюць плечы, так што рукавы прышлося крыху перарабіць. Але хутка ён абцярпеўся і прызвычаіўся.

На другі дзень я пачаў думаць, дзе-б мне яго змясціць. З аднаго боку, мне хацелася яго ўсталяваць пазручней, а з другога, я быў яшчэ не зусім у ім упэўнены і баяўся змясціць яго з-сабой.

Нарэшце я здагадаўся паставіць яму маленькую палатку між двума сценамі маёй крэпасці—між унутранай і знадворнай.

Але ўсе гэтыя перасцярогі былі зусім лішнімі: ніколі яшчэ ніводзін чалавек не меў такога любячага, такога вернага і адданага друга, якога я меў у асобе майго Пятніцы. Ні раздражальнасці, ні ўпартасці, ні сваволь-ства не дазваляў ён у дачыненні да мяне; заўсёды ласкавы і паслужлівы, ён ставіўся да мяне, як да роднага бацькі. Я ўпэўнены, што, каб спатрэбілася, ён з радасцю ахвя-

раваў-бы для мяне жыццё. Ён вельмі хутка паказаў на справе сваю адданасць, так што я не мог не прызнаць яго другам і зусім пакінуў сцерагчыся яго.

Прысутнасць Пятніцы рабіла мяне зусім шчаслівым. Я ўзяў на сябе абавязак навучыць яго ўсяму, што ўмеў рабіць сам, а галоўнае, размаўляць на мове маёй радзімы, каб мы маглі з ім разумець адзін аднаго. Ён быў такім здольным вучнем, што лепшага нельга было і жадаць. Але самае каштоўнае было ў ім тое, што ён вучыўся так старанна, з такой радаснай гатоўнасцю слухаў мяне, так быў задаволены, калі разумеў, чаго я ад яго хацеў, або калі яму ўдавалася вытлумачыць мне сваю думку, што для мяне было вялікай прыемнасцю займацца з ім. З таго часу, як ён быў са мной, мне жылося так лёгка і прыемна, што, каб толькі мне не пагражала небяспека ад іншых дзікуноў, я, здаецца, згадзіўся-б застацца на востраве да канца майго жыцця.

Раздзел дваццаць першы

Рабінзон гутарыць з Пятніцай і настаўляе яго.

Дні праз два або тры пасля таго, як мы з Пятніцай вярнуліся ў маю крэпасць, мне прышло ў галаву, што, калі я хачу адвучыць яго ад жахлівай звычкі есці чалавечае мяса, то неабходна адбіць у яго смак да гэтага роду мясной стравы, а для гэтага трэба

карміць яго мясам жывёл. І вось аднойчы раніцой, накіроўваючыся ў лес, я забраў яго з сабой. Уласна кажучы, ішоў я з намерам зарэзаць казлянё з майго статка, але па дарозе ўбачыў пад дрэвам дзікую казу з парай казлянятак.

— Чакай!—сказаў я Пятніцы, схапіўшы яго за руку, і зрабіў яму знак не варушыцца; потым прыцэліўся, стрэліў і забіў аднаго з казлянят.

Мой бедны дзікун, не разумеючы, як можна забіць жывую істоту, не набліжаючыся да яе (хоць ён і бачыў раней, як я забіў яго ворага), быў зусім уражаны: ён задрыжэў, захістаўся, я думаў—ён зараз страціць прытомнасць. Ён не заўважыў забітага мною казлёнка і падумаў, што я хацеў забіць яго, Пятніцу. Небарака пачаў абмацваць сябе, прыўзняў нават палу сваёй курткі, каб паглядзець, ці не ранены ён, потым упаў перада мной на калены, пачаў абнімаць мае ногі і доўга гаварыў мне нешта на сваёй мове. Слоў я, вядома, не разумеў, але было ясна, што ён просіць мяне не забіваць яго.

Мне хутка ўдалося пераканаць яго, што я не маю ні малейшага намеру ўчыніць яму шкоды. Я ўзяў яго за руку, засмяяўся і загадаў яму збегаць па забітае казлянё. Ён выканаў мой загад. Пакуль ён важдаўся з казлянём, я зноў зарадзіў стрэльбу.

Крыху пачакаўшы, я ўбачыў на дрэве, на адлегласці стрэлу ад мяне, вялікую птушку, якую палічыў за каршака. Жадаючы азнаёміць Пятніцу са страляннем, я паклікаў яго

да сябе, паказаў яму пальцам спачатку на птушку, потым на стрэльбу, потым на зямлю пад тым дрэвам, дзе сядзела птушка, нібыта кажучы: «Вось глядзі: зараз я зраблю так, што яна ўпадзе», і ўслед за тым стрэліў. Птушка ўпала, але была не каршаком, а вялікім папугаем. Пятніца і на гэты раз перапалохаўся, не гледзячы на ўсе мае тлумачэнні.

Тут толькі я зразумеў, што яго так дзівіла, калі я страляў: ён дагэтуль яшчэ ніводнага разу не бачыў, як я зараджаю стрэльбу, і, мабыць, думаў, што ў гэтай рэчы сядзіць нейкая цудадзейная руйнуючая сіла, якая прыносіць смерць на якой-бы ні было адлегласці чалавеку, зверу, птушцы, наогул усякай жывой істоце.

Яшчэ доўгі час пасля нашай сустрэчы яго дзівіў кожны мой стрэл. Мне здаецца, каб я толькі дазволіў яму, ён пачаў-бы пакланяцца, як богу, мне і маёй стрэльбе. Першы час ён не адважваўся дакрануцца да стрэльбы, але затое размаўляў з ёй, як з жывой істотай, калі думаў, што я не чую яго. Пасля я ад яго даведаўся, што гэта ён прасіў у стрэльбы не забіваць яго.

Калі Пятніца крыху апамятаўся ад спалоху, я загадаў яму прынесці мне забітую дзічыну. Ён адразу-ж пайшоў, але замарудзіўся, шукаючы птушку, бо, як потым высветлілася, я не забіў яе, а толькі раніў, і яна адляцела даволі далёка ад таго месца, дзе я яе падстрэліў. Урэшце ён усё-такі знайшоў яе і прынёс; я-ж скарыстаў яго адсутнасць, каб зноў зарадзіць стрэльбу, бо знайшоў патрэб-

ным да пэўнага часу лепш не паказваць яму, як гэта робіцца.

Я меркаваў, што мы натрапім яшчэ на якую-небудзь дзічыну, але больш нічога не траплялася, і мы вярнуліся дамоў. Я ў той-жа вечар зняў скуру з забітага казлёнка і выпатрашыў яго; потым, расклаўшы касцёр і адрэзаўшы добры кавалак свежай казляціны, згатаваў яе ў гліняным гаршку. Паеўшы спачатку сам, я даў Пятніцы пакаштаваць маёй стравы. Вараная страва яму вельмі спадабалася, толькі ён здзівіўся, навошта я яе пасаліў. Ён пачаў паказваць мне знакамі, што, па яго думцы, з соллю нясмачна. Узяўшы у рот крышку солі, ён пачаў адплёўвацца і зрабіў выгляд, нібы яму дрэнна ад яе, а потым папаласкаў рот вадой. Тады і я, у сваю чаргу, палажыў у рот кавалачак мяса без солі і пачаў пляваць, паказваючы, што мне брыдка есці без солі. Але гэта не зрабіла ніякага эфекта: я так і не мог прывучыць Пятніцу к солі. І толькі праз доўгі час ён пачаў прыпраўляць ёю яду, ды і то пакрысе.

Накарміўшы такім чынам майго дзікуна варанай казляцінай і бульёнам, я рашыў пачаставаць яго на другі дзень той-жа казляцінай, толькі смажанай. Засмажыў я яе асаблівым спосабам, над кастром, як гэта робіцца часам у нас у Англіі. Па баках кастра я ўтыркнуў у зямлю дзве жэрдкі, умацаваў між імі папярочную, павесіў на яе вялікі кавалак мяса і паварочваў яго да таго часу, пакуль яно не сасмажылася.

Пятніца дзіву даўся ад маёй выдумкі; але

задавальненню яго не было канца, калі ён пакаштаваў маю смажаніну; самымі красамоўнымі гэстамі ён даў мне зразумець, як яму падабаецца гэтая страва, і нарэшце абвясціў, што ніколі больш не будзе есці чалавечага мяса, і гэтаму я быў вельмі рады.

Наступным днём я пасадзіў яго за работу: прымусіў малаціць і веяць ячмень, паказаўшы спачатку, як я гэта раблю. Ён хутка зразумеў і пачаў працаваць вельмі старанна, асабліва калі даведаўся, для чаго гэта робіцца. А даведаўся ён аб гэтым у той-жа дзень. Калі зерне было абмалочана і адвеяна, я пры ім стоўк гэтае зерне ў муку, спёк хлеб і даў яму пакаштаваць. У хуткім часе ён навучыўся працаваць не горш за мяне і пачаў выконваць за мяне ўсе работы.

Як я цяпер павінен быў пракарміць двух чалавек, то павінен быў падумаць пра будучае. Перш за ўсё неабходна было павялічыць раллю, каб сеяць больш зерня. Я выбраў вялікі ўчастак зямлі і ўзяўся абгараджваць яго. Пятніца не толькі вельмі добрасумленна, але і з вялікай прыемнасцю дапамагаў мне ў гэтай рабоце. Я растлумачыў яму, як умеў, што гэта будзе новая поле для хлеба, бо нас цяпер удвух і хлеба трэба ўдвая больш. Яго вельмі кранула, што я гэтак клапачуся аб ім: ён усяляк намагаўся мне вытлумачыць, што ён разумее, як многа ў мяне павялічылася спраў цяпер, і прасіў, каб я дазволіў яму працаваць, бо ён не баіцца працы.

Гэта быў самы шчаслівы год майго жыцця на востраве. Пятніца навучыўся даволі

ніштавата размаўляць па-англійску: ён ведаў назвы амаль усіх найбольш звычайных прадметаў і ўсіх месц, якія мне даводзілася наведваць, таму я мог пасылаць яго, куды мне было патрэбна, і ён вельмі добра выконваў мае даручэнні. Ён вельмі любіў размаўляць, і я мог цяпер поўнасцю ўзнагародзіць сябе за доўгія гады вымушанага маўчання. Але, акрамя асалоды, якую я атрымліваў ад нашых гутарак, самая прысутнасць гэтага добрага юнака была для мяне заўсёдашняй крыніцай радасці, да такой ступені ён быў мне па душы. З кожным днём мяне ўсё больш і больш вабілі яго чэснасць, добрасумленнасць, прастадушша. Паступова я ўсім сэрцам прывязаўся да яго, ды і ён, з свайго боку, так мяне палюбіў, як, я думаю, не любіў ніколі нікога.

Неяк раз мне ўздумалася распытаць яго аб яго мінулым. Мне, галоўным чынам, хацелася ведаць, ці не сумуе ён па сваёй радзіме і аб чым ён наогул думае, калі застаецца адзін. У той час ён ужо так валодаў англійскай мовай, што мог адказаць амаль на ўсе мае пытанні. І вось я спытаў:

— А што, Пятніца, адважнае ваша племя? Ці здаралася, каб вы перамагалі ворагаў у бойках?

Ён ухмыльнуўся і адказаў:

— О, так, мы заўсёды лепш б'емся, заўсёды перамагаем у бойках.

— Дык вы заўсёды лепш б'яцеся, кажаш ты? А як-жа гэта сталася тады, што ты трапіў у палон?

— Дык што-ж? А нашыя ўсё-ткі пабілі тых, многа пабілі.

— Як-жа ты тады казаў, што яны пабілі вас? Яны-ж узялі ў палон цябе і тваіх таварышоў.

— У тым месцы, дзе я біўся, ворагаў было ў шмат разоў больш. Яны схапілі нас—адзін, два, тры і мяне. А нашы пабілі іх у другім месцы, дзе мяне не было; у тым месцы нашы схапілі іх—адзін, два, тры, многа тысяч.

— Чаму-ж вашы не прышлі вам на дапамогу? Не аднялі вас у ворагаў?

— Яны схапілі адзін, два, тры і мяне і пасадзілі ў лодкі, а ў нашых у той час не было лодкі.

— А скажы мне, Пятніца, што робяць вашы з тымі людзьмі, якія трапляюць да іх у палон? Таксама куды-небудзь увозяць на лодках і з'ядаюць потым, як тыя, чужыя?

— Але, нашы таксама ядуць людзей; усе ядуць.

— А куды яны іх увозяць, калі збіраюцца з'есці?

— Розныя месцы,—куды ўздумаюць.

— А сюды яны прыязджаюць?

— І сюды прыязджаюць. Розныя месцы.

— А ты тут быў з імі?

— Быў. Там быў,—і ён паказаў на паўночна-заходні канец вострава, які служыў, мусіць месцам зборышчаў для яго суплыменнікаў.

Такім чынам высветлілася, што Пятніца быў у ліку дзікуноў, наведваўшых дальнія

берагі майго востраў, і прымаў удзел у баляваннях людаедаў. Калі праз некаторы час я набраўся смеласці і павёў яго на бераг (туды, дзе я знайшоў след чалавечай нагі на пяску), ён адразу-ж пазнаў мясцовасць і расказаў мне, што аднойчы, калі ён прыязджаў на мой востраў са сваімі, яны на гэтым самым месцы забілі і з'елі дваццаць мужчын, двух жанчын і аднаго дзіця. Ён не ведаў, як сказаць па-англійску «дваццаць» і, каб растлумачыць мне колькі чалавек яны тады з'елі, палажыў дваццаць каменьчыкаў адзін каля аднаго.

Усё гэта я расказаў для таго, каб чытачу былі больш зразумелы наступныя гутаркі мае з Пятніцай і тое, да чаго яны прывялі. Пасля апісанай размовы я спытаў яго, ці далёка да матэрыка ад майго востраў і ці часта гінуць іхнія лодкі, пераплываючы гэтую адлегласць. Выявілася, ён не ведае выпадку, каб хто-небудзь патануў на гэтым шляху, плаваць тут зусім бяспечна, непадалёк ад нашага востраў праходзіць морскае цячэнне: па раніцах яно накіроўваецца ў адзін бок, і заўсёды пры папутным ветры, а к вечару і вецер і цячэнне паварочваюць у процілеглы бок.

Спачатку я думаў, што цячэнне, пра якое казаў Пятніца, знаходзіцца ў залежнасці ад прыліву і адліву, але потым даведаўся, што яно складае працяг цячэння магутнай ракі Орыноко, якая ўпадае ў мора непадалёк ад майго востраў, які такім чынам знаходзіцца супроць яе вусця. Паласа-ж

зямлі на паўночным захадзе ад майго востр-рава, якую я лічыў за матэрык, быў вялікі востраў Трынідад, які ляжаў у паўночнай частцы вусця той-жа ракі. Я засыпаў Пятніцу пытаннямі аб гэтай зямлі і яе жыхарах; пытаўся, ці небяспечныя тамашнія берагі, ці бурнае там мора, ці вельмі там дзікія і жорсткія людзі і хто іхнія суседзі. Ён з вялікай ахвотай расказаў усё, што ведаў.

Запытваў я таксама, як завуцца ўсялякія плямёны, якія жывуць у тых месцах, але вялікага толку не дамогся. Ён цвярдзіў толькі адно: «Карыб, карыб». Няцяжка было здагадацца, што ён гаворыць пра карыбаў, што жывуць іменна ў гэтай частцы Амерыкі, займаючы ўсю берагавую паласу ад вусця Арыноко да Гвіяны. Пятніца расказаў мне яшчэ, што далёка «за месяцам», гэта значыць у тым баку, дзе садзіцца месяц, ці, іншымі словамі, к захаду ад яго радзімы, жывуць такія-ж, як я, белыя барадатыя людзі (тут ён паказаў на маю даўгую бараду) і што гэтыя людзі «забілі многа людзі». Я зразумеў, што ён кажа аб іспанцах, якія праславіліся на ўвесь свет сваімі зверствамі ў Паўднёвай Амерыцы, дзе, мусіць, яшчэ доўга будуць пераходзіць ад бацькі да сына апавяданні аб іх зверскай жорсткасці.

На маё запытанне, ці не ведае ён, ці ёсць якая-небудзь магчымасць перапраўіцца да белых людзей з нашага востраў, ён адказаў.

— Так, так, гэта магчыма: трэба плыць на двух лодках.

Я доўга не разумеў, што ён хацеў сказаць

сваімі «двума лодкамі», але нарэшце, хоць з вялікай цяжкасцю, здагадаўся, што на яго мове гэта азначае вялікае судна,—прынамсі, удвая больш звычайнай пірогі дзікуноў.

Гэтая размова вельмі ўсцешыла мяне: з таго дня ў мяне з'явілася ўпэўненасць, што рана ці позна я знайду магчымасць выратавацца з майго зняволення і што вызваленнем я буду абавязан беднаму дзікуну.

Раздзел дваццаць другі

Рабінзон і Пятніца будуюць лодку.—Бойка з дзікунамі.

Хутка мы зусім пасябравалі з Пятніцай. Ён не толькі навучыўся разумець амаль усё, што я гаварыў яму, але і сам пачаў даволі хутка, хаця і ламанай мовай, размаўляць па-англійску. Я пазнаёміў яго з гісторыяй маіх прыгодніцтваў. Я расказаў яму, як я трапіў на мой востраў, колькі год пражыў на ім, і як правёў гэтыя гады. Яшчэ раней я адкрыў яму сакрэт ужывання стрэльбы (бо для яго гэта было вялікай таямніцай): паказаў яму кулі, растлумачыў дзейнасць пораху і навучыў страляць. Я аддаў у поўнае яго распараджэнне адну з сваіх стрэльбаў. Акрамя стрэльбы, я даў яму нож, ад якога ён быў у вялікім захапленні. Я ўбраў яго ў самаробную партупею [1]) накшталт тых, на якіх у нас у Англіі носяць корцікі; толькі замест корціка я ўзброіў яго сякерай, мяркуючы,

[1]) Партупея—рамень цераз плячо для нашэння шаблі.

што так яно будзе практычней, і сапраўды сякера не горш корціка як зброя, а разам з тым яна можа заўсёды спатрэбіцца, як рабочы інструмент.

Я многа расказваў Пятніцы аб еўрапейскіх краінах, асабліва пра Англію, растлумачыўшы, што я адтуль родам; апісаў наша жыццё, наш побыт, звычаі; расказаў, як мы гандлюем ва ўсіх частках свету і плаваем на вялікіх караблях. Я растлумачыў яму, як будуюцца вялікія ветразевыя судны, расказаў, дарэчы, пра сваю паездку на загінуўшы карабль і паказаў месца, дзе карабль наскочыў на камень; вядома, я мог паказаць яго толькі прыблізна, бо карабль даўно быў разбіты ў трэскі і ўсе абломкі знесла. Паказаў я яму таксама рэшткі лодкі з нашага карабля, у якой мы хацелі выратавацца і якую потым, як я ўжо казаў, выкінула на мой востраў. Я быў тады адзін, і ў мяне нехапіла сілы скрануць яе з месца, а за тыя гады, якія я пражыў на востраве, яна зусім раскідалася. Убачыўшы гэтую лодку, Пятніца задумаўся і доўга маўчаў. Я спытаў у яго, аб чым ён думае, і ён адказаў:

— Я бачыў лодку, як гэтую; яна плавала там, дзе жыве мой народ.

Я доўга не разумеў, што ён хацеў гэтым сказаць: ці тое, што ў іх месцах дзікуны плаваюць на такіх лодках, ці тое, што такая лодка прайшла міма іхніх берагоў.

Нарэшце пасля доўгіх выпытванняў высветлілася, што акурат такую лодку прыбіла да берагу ля той зямлі, дзе жыве яго племя.

Я падумаў: «Мабыць, нейкі еўрапейскі карабль пацярпеў крушэнне каля тых берагоў, і гэтую лодку з яго сарвала хвалямі». Але чамусьці мне не прышло на розум, што лодка магла быць з людзьмі, і, працягваючы свае роспыты, я гаварыў толькі пра лодку.

Пятніца апісаў мне яе вельмі падрабязна і нарэшце дадаў:

— Белыя людзі не патанулі, мы іх выратавалі!

— А хіба ў лодцы былі белыя людзі?— паспешна спытаў я.

— Але,—адказаў ён,—поўная лодка белых людзей!

— Колькі іх было?

Ён налічыў па пальцах семнаццаць.

— Дзе-ж яны? Што з імі сталася?

Ён адказаў:

— Яны жывыя. Жывуць у нашых.

Гэта навяло мяне на новую здагадку: ці не з таго самага карабля, што разбіўся на віду майго вострава, былі гэтыя семнаццаць белых людзей? Зусім магчыма, што калі карабль наскочыў на скалу і яны ўбачылі, што караблю пагражае немінучая пагібель, усе яны пакінулі яго і пераселі ў шлюпку, а потым іх прыбіла к зямлі дзікуноў, дзе яны і засталіся. Я пачаў дапытвацца ў Пятніцы, ці сапраўды ён ведае, што белыя людзі жывыя. Ён са жвавасцю адказаў:

— Сапраўды, сапраўды!

І ён дадаў, што хутка будзе чатыры гады, як яны жывуць у яго землякоў, і што тыя не толькі не крыўдзяць, але нават кормяць іх.

На маё пытанне, як магло здарыцца, што дзікуны не забілі і не з'елі белых людзей, ён адказаў:

— Белыя людзі сталі нам братамі. Нашы ядуць толькі палонных пасля боек...

Прайшло многа часу пасля гэтай размовы. Аднаго разу мы з Пятніцай зайшлі ва ўсходнюю частку вострава, і ён узышоў на вяршыню ўзгорка, адкуль, калі прыгадае чытач, я шмат гадоў назад убачыў паласу зямлі, якую палічыў за матэрык Паўднёвай Амерыкі.

Як і тады, дзень быў надзвычайна ясны. Пятніца доўга ўзіраўся ўдалеч па тым кірунку і раптам ускрыкнуў ад радасці, заскакаў і пачаў крычаць мне, каб я падышоў. Я падышоў і спытаў:

— У чым справа? Чаму ты гэтак рады?

— Але, але! Я рады, я шчаслівы!—адказаў ён.—Вунь там, глядзі... адсюль відаць... там мая зямля, мой народ.

Увесь твар яго змяніўся ад радасці: вочы блішчэлі; здавалася, ён так-бы і паляцеў туды, да сваіх. Гэтае назіранне навяло мяне на адну здагадку, вынікам якой было тое, што я пачаў ставіцца з меншай даверлівасцю да майго новага сябра. У мяне з'явілася ўпэўненасць, што, калі ў яго будзе хоць якая мажлівасць вярнуцца на радзіму, ён, не задумваючыся, пакіне мяне. «А апынуўшыся ў старых, звыклых умовах,—разважаў я,—ён забудзе ўсё тое, чым ён мне абавязаны, і—хто ведае? можа нават аддасць мяне сваім супляменнікам: прывядзе іх сотню або дзве

на мой востраў; яны заб'юць мяне і з'ядуць, і ён будзе баляваць разам з імі з такім лёгкім сэрцам, як раней, калі ўсе яны прыязджалі сюды святкаваць свае перамогі над дзікунамі варожых пляменняў».

Падазронасць мая з кожным днём узрастала, а зрабіўшыся асцярожнейшым, я, зразумела, пачаў цурацца майго таварыша і зрабіўся да яго халаднейшым.

Так працягвалася некалькі тыдняў.

Пакуль я падазрона ставіўся да яго, я вядома, пускаў у ход усю сваю дыпламатыю, каб выпытаць з яго тайныя думкі; але кожнае яго слова дыхала такой простадушнай шчырасцю, што мне зрабілася сорамна за маю падазронасць, я супакоіўся і вярнуў сваю даверлівасць майму другу. А ён нават не прыкмеціў майго часовага да яго ахаладжэння, і гэта было для мяне толькі лішнім доказам яго шчырасці.

Аднойчы, калі мы з Пятніцай зноў падняліся на ўзгорак (толькі на гэты раз на моры стаяў туман і берагоў матэрыка не было відаць), я спытаў яго:

— А што, Пятніца, ці хацелася-б табе вярнуцца на радзіму, да сваіх?

— Але,—адказаў ён,—я быў-бы вельмі рад вярнуцца да сваіх,

— Што-б ты там рабіў?—пытаў я далей.—Ператварыўся-б зноў у дзікуна і пачаў-бы, як раней, есці чалавечае мяса?

Твар яго зрабіўся сур'ёзным, ён паматаў галавой і адказаў:

— Не, не, Пятніца сказаў-бы там усім:

жывіце як трэба, ешце хлеб ад зерняў, малако, мяса жывёл, не ешце чалавека.

— Ну, калі ты ім так скажаш, яны цябе заб'юць.

Ён зірнуў на мяне ўсё так-жа сур'ёзна і сказаў:

— Не, не заб'юць. Яны будуць рады павучыцца добраму.

Затым ён дадаў:

— Яны шмат вучыліся ад барадатых людзей, што прыехалі на лодцы.

— Дык табе хочацца вярнуцца дамоў?— паўтарыў я сваё пытанне.

Ён ухмыльнуўся і сказаў:

— Я не магу плысці так далёка.

Калі-ж я абяцаў даць яму лодку, ён адказаў, што з радасцю паедзе, калі я паеду з ім.

— Як-жа мне ехаць?—адказаў я.—Ды яны мяне з'ядуць.

— Не, не, не з'ядуць,—сказаў ён з запалам.—Я зраблю так, што не з'ядуць; я зраблю, што яны будуць цябе многа любіць.

Мой простадушны Пятніца хацеў гэтым сказаць, што ён раскажа сваім землякам, як я забіў яго ворагаў і выратаваў яму жыццё, і што за гэта яны палюбяць мяне. Пасля таго ён расказаў мне, з якой дабратой ставіліся яны да семнаццаці белых барадатых людзей, якіх прыбіла к берагу іхняй зямлі.

З таго часу, прызнаюся, у мяне засела думка паспрабаваць пераправіцца на матэрык і знайсці там барадатых людзей, аб якіх казаў Пятніца. Не магло быць ніякага сум-

нення, што гэта іспанцы або партугальцы— наогул еўрапейцы, і я быў упэўнены, што, калі толькі мне ўдасца далучыцца да іх, мы разам абмяркуем спосаб дабрацца да якой-небудзь цывілізаванай краіны. «Ва ўсякім выпадку,—думаў я,—на гэта будзе большая надзея, калі нас будзе восемнаццаць чалавек. А што магу я зрабіць адзін на маім востраве, за сорак міль ад бліжэйшага матэрыка?»

І вось праз некалькі дзён я зноў пачаў з Пятніцай тую-ж размову. Я сказаў, што дам яму лодку, каб ён мог вярнуцца на радзіму, і ў той-жа дзень павёў яго на супроцьлеглы канец вострава, да той бухтачкі, дзе была мая лодка. Вычарпаўшы з яе ваду (для большай аховы я наліў яе вадою), я падвёў яе да берагу і паказаў яму. Мы абодва селі ў ёй, каб выпрабаваць ход. Пятніца быў надзвычайным грабцом, лодка ішла ў яго так-жа шпарка, як у мяне. Калі мы адплылі ад берагу, я сказаў яму:

— Ну, дык што, Пятніца, паедзем да тваіх зямлякоў?

Ён зірнуў на мяне сумным позіркам: відаць, лодка здалася яму вельмі маленькай для такога далёкага падарожжа. Тады я сказаў яму, што ў мяне ёсць другая, куды большая.

У наступны дзень мы з ім пайшлі ў лес на тое месца дзе, як, мабыць, памятае чытач, я пакінуў сваю першую лодку, якую не мог спусціць на ваду. Пятніца ўбачыў, што гэтая лодка даволі вялікая.

— Такая падыходзіць, падыходзіць,— цвярдзіў ён.—Тут можна многа класці хлеба вады і ўсяго.

Але таму, што з дня пабудовы гэтай лодкі прайшло дваццаць тры гады, і ўвесь гэты час яна заставалася пад адкрытым небам, дзе яе прапякала сонцам і мачыла дажджом, уся яна рассохлася, і дрэва напалову струхлела.

Тым не менш маё рашэнне зрабіць паездку на матэрык было канчаткова прынята, і я сказаў Пятніцы:

— Нічога, не маркоцься! Мы пабудуем акурат такую-ж лодку, і ты паедзеш дамоў.

Ён не адказаў ні слова, але зрабіўся нейкім дзіўным—ні то сумным, ні то незадаволеным. Калі я спытаў, што з ім, ён сказаў:

— Завошта Робін Крузо злуецца на Пятніцу? Што я зрабіў?

— З чаго ты бярэш, што я злуюся на цябе? Я ані трохі не злуюся,—сказаў я.

— Не злуюся, не злуюся!—паўтарыў ён злосна.—А навошта адсылаеш Пятніцу дамоў?

— Ды сам-жа ты казаў, што табе хочацца дамоў,—сказаў я.

— Так, хочацца,—адказаў ён,—але толькі каб абодвум. Робін не паедзе—Пятніца не паедзе: Пятніца не хоча без Робіна.

Адным словам, ён і слухаць не хацеў пра тое, каб пакінуць мяне.

— Але паслухай, Пятніца,—гаварыў я,— навошта я паеду туды? Што я там буду рабіць?

Ён жвава павярнуўся да мяне.

— Многа рабіць, добра рабіць: вучыць дзікіх людзей быць добрымі, разумнымі, рабіць ім новае жыццё.

— Дармо, мой друг!—уздыхнуў я.—Ты сам не ведаеш, што кажаш. Куды там гэткаму невуку, як я, вучыць дабру іншых!

— Няпраўда!—усклікнуў ён з запалам.—Мяне вучыў дабру, іх будзеш вучыць.

— Не, Пятніца,—сказаў я рашучым тонам,—едзь без мяне, а я застануся тут адзін і буду жыць, як жыў раней.

Ён зноў спахмурнеў; потым раптам падбег да ляжачай непадалёк сякеры, схапіў яе, прынёс і працягнуў мне.

— Навошта ты даеш мне сякеру?—спытаў я.

Ён адказаў:

— Забі Пятніцу!

— Навошта-ж мне цябе забіваць?—сказаў я.—Ты нічога мне не зрабіў.

— А навошта гоніш Пятніцу прэч?—накінуўся ён на мяне.—Забі Пятніцу, не гані яго прэч.

Ён быў сапраўды пакрыўджаны. Я заўважыў на вачах у яго слёзы. Словам, прывязанасць яго да мяне была такая пэўная, што мне, мусіць, не ўдалося-б пахіснуць яго рашэнне, каб я гэтага і сапраўды хацеў. Я тут-жа сказаў яму і часта паўтараў потым, што ніколі больш не буду гнаць яго прэч, пакуль ён хоча заставацца са мной.

Такім чынам я канчаткова ўпэўніўся, што Пятніца навекі адданы мне, як ўпэўніўся і ў

тым, што адзінай прычынай яго жадання вярнуцца на радзіму была гарачая любоў да сваіх супляменнікаў і надзея, што я паеду з ім і навучу іх дабру. Але, паколькі я не быў высокай думкі аб сваёй асобе, я не меў ні малейшага намеру браць за такую цяжкую справу, як асвета дзікуноў. Аднак, жаданне маё вырвацца з майго зняволення было ад гэтага ані трошкі не меншым. Нарэшце я рашыў, не адкладаючы далей, узяцца за пабудову вялікай лодкі, у якой можна было-б рызыкнуць выйсці ў адкрытае мора.

Перш за ўсё неабходна было выбраць падыходзячае дрэва з даволі тоўстым ствалом. За гэтым не магло быць затрымкі: на востраве расло столькі будаўнічага лесу, што з яго можна было пабудаваць цэлую флатылію вялікіх караблёў, а не толькі лодку. Але я баяўся, як-бы не паўтарыць той памылкі, якую я зрабіў пры пабудове першай лодкі, і таму лічыў, што нам варта выбіраць з тых дрэў, якія раслі блізка к берагу, каб можна было без асаблівых цяжкасцей спусціць лодку на ваду.

Пасля доўгіх пошукаў Пятніца знайшоў даволі падыходзячы для нас экземпляр: вышла, што ён больш за мяне разумее ў гэтай справе. Я і да гэтага дня не ведаю, якой пароды было дрэва, з якога мы тады пабудавалі лодку. Пятніца стаяў за тое, каб выпаліць сярэдзіну калоды, як гэта робяць пры пабудове сваіх пірог дзікуны; але я сказаў яму, што будзе прасцей выдзяўбсці яе дола-



там, і калі я паказаў яму, як гэта рабіць, ён згадзіўся, што мой спосаб больш практычны.

Мы жвава ўзяліся за справу, і праз месяц лодка была гатова. Мы абчасалі яе знадворку сякерамі (Пятніца адразу-ж навучыўся гэтай рабоце), і вышла вельмі прыгожа: гэта была сапраўдная морская лодка, з кілем і такой велічыні, што смела магла падняць дваццаць чалавек.

Але пасля таго мы патрацілі яшчэ каля двух тыдняў на тое, каб ссунуць нашу лодку ў ваду. Мы прыстасавалі для гэтага драўляныя колы, але лодка была такая цяжкая, а рабочых рук так мала, што і з гэтым прыстасаваннем работа пасоўвалася чарапашым крокам.

Калі лодка была спушчана на ваду, я здзівіўся, як спрытна кіруе ёю Пятніца, як шпарка ён прымушае яе паварочвацца і як добра грабе. Я спытаў, ці можна, па яго думцы, рушыць у мора ў такой лодцы.

— О, так,—адказаў ён,—такой лодцы не страшна плысці нават у самы вялікі вецер.

Але перш чым пускацца ў дарогу, я меў намер зрабіць яшчэ адну рэч, аб якой Пятніца пакуль не ведаў, а іменна: паставіць на лодцы мачту з ветразем і змайстраваць для яе якар. Зрабіць мачту было няцяжка: на востраве расло шмат кедраў, прамых, як страла. Я выбраў адно маленькае дрэўца, якое расло непадалёк ад бухтачкі, дзе ў нас стаяла лодка, і загадаў Пятніца ссячы яго. Затым ён пад маім кіраўніцтвам ачысціў

ствол ад вецця і абчасаў яго. Такім чынам мачта была гатова.

Над ветразем мне прышлося папрацаваць самому. У мяне заставаліся яшчэ старыя ветразі ці, лепш сказаць, кавалкі парусіны; але гэтая парусіна ляжала больш за дваццаць шэсць гадоў, і таму, што я не вельмі клапаціўся аб тым, каб захаваць яе ў цэласці, не думаючы, што яна можа калі спатрэбіцца на ветразі, то быў упэўнены, што яна напалову згніла. І сапраўды, вялікая частка яе была гнілою; усё-ткі тое-сёе магло спатрэбіцца. Я выбраў два кавалкі мацнейшых і ўзяўся за шыццё. Шмат працы патраціў я на гэтую работу (гэта было не шыццё а нейкая маруда; у мяне нават іголак не было патрэбных), але нарэшце нешта зрабіў, па-першае, даволі няўдалае падабенства вялікага трохкутнага ветразя, якія ўжываюцца ў Англіі, па-другое, маленькі ветразь—так званы блінд. Гэтым ветразем я ўмеў кіраваць лепш за ўсё, бо такі-ж самы ветразь быў на тым баркасе, на якім я ўцякаў ад піратаў.

Каля двух месяцаў я праваждаўся з аснашчэннем нашага судна, але затое работа была зроблена чыста. Акрамя двух памянёных ветразяў, я змайстраваў яшчэ трэці, які ўмацаваў на носе і які меў сваім прызначэннем дапамагаць паварочваць лодку пры змене кірунку. Але галоўнае, я зрабіў і прымайстраваў стырно, што павінна было значна палягчыць кіраванне лодкай.

Я быў няўдалым карабельным цесляром; але, разумеючы ўсю карыснасць такога пры-

стасавання, як стырно, не пашкадаваў працы для гэтай работы. На адно гэтае стырно я патраціў столькі-ж часу, колькі на пабудову і аснашчэнне ўсёй лодкі.

Калі ўсё было гатова, я пачаў вучыць Пятніцу кіраваць маёй лодкай, бо хоць ён быў вельмі добрым грабцом, але ні пра стырно, ні пра ветразі ён не меў ніякага разумення. Яго вельмі ўразіла, калі ён убачыў, як я дзейнічаю стырном і як ветразь надзьмухваецца то з аднаго, то з другога боку ў залежнасці ад змены кірунку.

Тым не менш ён вельмі хутка зразумеў гэтую мудрасць і зрабіўся спрытным мараком. Аднаму толькі ён ніяк не мог навучыцца—ужыванню компаса: гэта было вышэй яго разумення. Але таму, што ў тых шыротах, калі не бывае дажджоў, амаль ніколі не бывае ні туманаў, ні пахмурных дзён, у компасе для нашай паездкі не было асаблівай патрэбы. Удзень мы маглі кіраваць на бераг, які быў відаць здалёк, а ноччу трымаць кірунак па зорках. Іншая справа ў дажджлівы сезон; але тады ўсёроўна нельга было ездзіць ні па моры, ні па зямлі.

Надышоў дваццаць сёмы год майго знявольвання. Аднак, тры апошнія гады можна смела выкінуць з рахунку, бо з таго часу, як на востраве з'явіўся мой любы Пятніца, у маё жыллё ўвайшла радасць і асвятліла маё журботнае жыццё.

Між тым набліжаўся дажджлівы сезон, калі я звычайна большую частку дня сядзеў дома. Нашу паездку прышлося адкласці, а

пакуль неабходна было паклапаціцца аб новай лодцы. Мы прывялі яе ў тую бухтачку, куды я прычальваў са сваімі плытамі. Дачакаўшыся прыліву, я падцягнуў лодку да самага берагу. Такім чынам з надыходам адліву яна апынулася на сухім беразе. Тады па маёй прапанове Пятніца выкапаў на тым месцы, дзе стаяла лодка, даволі глыбокую яму такой даўжыні і шырыні, што лодка змясцілася ў ёй як у доку. Ад мора мы адгарадзілі яе моцнай дамбай, пакінуўшы толькі вузкі праход для вады. Калі з наступным прылівам наш маленькі док напоўніўся вадой, мы наглуха замацавалі дамбу, і лодка засталася на вадзе, разам з тым абароненая ад мора. Для таго, каб схаваць яе ад дажджоў, мы накрылі яе тоўстым пластом вецця, пад якімі яна стаяла, як пад страхой. Цяпер мы маглі спакойна перачакаць дажджлівы сезон з тым, каб у лістападзе ці ў снежні паспрабаваць выканаць наш план.

Як толькі спыніліся дажджы і надвор'е ўсталявалася, я пачаў дзейна рыхтавацца да далейшага плавання. Я загадзя разлічыў, які запас прадуктаў нам можа спатрэбіцца, і нарыхтаваў усё, што патрэбна. Тыдні праз два я меркаваў вывесці лодку з дока.

Але нашай паездцы не суджана было адбыцца. Неяк раніцой, калі я, як звычайна, збіраўся ў дарогу, мне прышло ў галаву, што дабра было-б, акрамя іншай яды, захапіць з сабой невялікі запас чарапашага мяса. Я гукнуў Пятніцу загадаў яму пайсці к мору і злавіць чарапаху. (Мы палявалі на іх кожны

тыдзень, бо абодва любілі іх мяса і яйкі). Пятніца пайшоў, але не прайшло і чвэрткі гадзіны, як ён прыбег назад.

Як вар'ят, не чуючы пад сабой зямлі, ён літаральна пераляцеў да мяне за загарадку і, перш чым я паспеў спытаць яго, у чым справа, закрычаў:

— Бяда! Нядобра!

— Што з табой, Пятніца? Што здарылася?—запытаў я ў трывозе.

— Там, каля берагу, адна, дзве, тры... адна, дзве, тры лодкі!

Ведаючы ягоную манеру лічыць, я падумаў, што ўсіх было шэсць лодак, але, як потым высветлілася, іх было толькі тры, а ён паўтарыў лік проста ад хвалявання.

— Ну што-ж такое, Пятніца? Чаму ты гэтак спалохаўся?—сказаў я, стараючыся яго падбадзёрыць.

Небарака быў страшэнна напалоханы. Мабыць ён уявіў сабе, што дзікуны прышлі за ім, што яны знойдуць яго і з'ядуць. Ён так дрыжэў, што я не ведаў, што з ім рабіць. Я заспакойваў яго, як ўмеў: казаў, што ў кожным выпадку, я падлягаю такой-жа небяспецы, як і ён, што калі з'ядуць яго, то і мяне разам з ім.

— Але мы абаронім сябе, мы не дамося ім у рукі жывымі,—дадаў я.—Ты-ж умееш страляць?

— Умею,—адказаў ён,—толькі іх шмат, вельмі многа.

— Нічога,—сказаў я,—адных мы заб'ем,

а астатнія спалохаюцца і ўцякуць. Я абяцаю табе, што не дам цябе ў крыўду, я буду смела абараняцца і абараняць цябе. Але ці абяцаеш ты, што не струсіш, а, галоўнае, будзеш рабіць усё, што я табе загадаю?

— Я памру, калі ты гэта загадаеш, Робін Крузо!

Пасля гэтага я прынёс са склепа рому і даў яму выпіць (я вельмі беражліва выдаткоўваў свой ром, таму ў мяне заставалася яшчэ даволі вялікі запас). Затым мы пазбіралі ўсю нашу агнястрэльную зброю, прывялі яе ў парадак і зарадзілі. Акрамя таго, я надзеў, як заўсёды, шпагу без футляра, а Пятніцу ўзброіў сякерай.

Падрыхтаваўшыся такім чынам да бою, я ўзяў падзорную трубу і падняўся на гару для выведкі.

Накіраваўшы трубу на бераг мора, я неўзабаве ўбачыў дзікуноў: іх было дваццаць адзін чалавек, ды акрамя таго на беразе ляжала двое звязаных людзей,—мабыць, прызначаных на з'ядзенне ваеннапалонных. Было зразумела, што ўвесь гэты натоўп дзікуноў з'явіўся на востраў з адзінай мэтай—адсвяткаваць сваю перамогу над ворагам. Я заўважыў таксама, што гэтым разам яны высадзіліся не там, дзе высаджваліся тры гады назад, у памятны дзень нашай першай сустрэчы з Пятніцай, а куды бліжэй да маёй бухтачкі. Тут берагі былі нізкія і амаль к самаму мору падступаў густы лес.

Спусціўшыся з гары, я абвясціў Пятніцы маё рашэнне напасці на гэтых звяроў і пера-

біць іх усіх да аднаго і яшчэ раз спытаў яго, ці будзе ён мне дапамагаць. Ён цяпер ужо зусім не пужаўся (можа таму, што яму часткова дапамог выпіты ім ром) і з бадзёрым выглядам паўтарыў, што гатоў памерці за мяне.

Не даўшы астынуць свайму гневу, я падзяліў паміж намі падрыхтаваную зброю, і мы пайшлі.

Пятніцы я даў адзін з пісталетаў, які ён засунуў сабе за пояс, і тры стрэльбы, а сам узяў усё астатняе. На кожны выпадак я захапіў у кішэню бутэльку рому, а Пятніцы я даў несці вялікі мяшок з запасным порахам і кулямі. Я загадаў яму ісці за мной, не адстаючы ні на крок, і сурова забараніў размаўляць са мной і страляць, пакуль я не загадаю. Нам прышлося зрабіць вялікі крук, каб абагнуць бухтачку і падысці да берагу з боку лесу, бо толькі з гэтага боку можна было непрыкметна падкрасціся да ворага на адлегласць стрэлу.

Падышоўшы да ўзлеску я таго краю, які быў бліжэй да берагу, так што толькі некалькі радоў дрэў аддзяляла нас ад дзікуноў, я спыніўся, ціханька паклікаў Пятніцу і, паказаўшы на тоўстае дрэва, загадаў стаць за ім і паглядзець, ці відаць адтуль дзікуны і што яны робяць. Ён выканаў мой загад, зараз-жа вярнуўся, каб апавясціць, што дзікуны сядзяць вакол кастра і ядуць мяса аднаго з прывезеных імі палонных, а другі ляжыць звязаны тут-жа, на пяску.

— Мусіць, потым яны з'ядуць і гэтага!— дадаў Пятніца зусім спакойна.

Уся мая душа запалала гневам пры гэтай вестцы.

Пятніца сказаў мне, што другі палонны не індзеец, а адзін з тых белых людзей, якія прыехалі ў яго зямлю на лодцы. «Трэба дзейнічаць», рашыў я. Я схаваўся за дрэвам, дастаў падзорную трубу і сапраўды ўбачыў на беразе белага чалавека. Ён ляжаў нерухома, бо яго рукі і ногі былі звязаны гнуткім пруцем. На ім была вопратка, але не толькі па ёй, а і па твары нельга было не пазнаць у ім еўрапейца.

Сажняў на дваццаць пяць бліжэй да берагу, на ўзгорку, на адлегласці прыблізна паловы стрэлу ад дзікуноў, расло другое дрэва, да якога можна было падысці непрыкметна, бо ўся адлегласць паміж ім і тым месцам, дзе мы стаялі, была амаль уся пакрыта густым зараснікам нейкага хмызняку. Стрымліваючы свой шалёны гнеў, я ціханька прабраўся да гэтага дрэва і адтуль, як на далоні, убачыў тое, што вытваралася на беразе.

Ля кастра, збіўшыся ў шчыльную кучку, сядзела дзевятнаццаць дзікуноў.

За некалькі крокаў ад гэтай групы, каля распасцёртага на зямлі еўрапейца, стаялі двое і, схіліўшыся над ім, развязвалі яму ногі: відаць, іх толькі што паслалі за ім. Яшчэ хвіліна, і яны зарэзалі-б яго, як барана. Мне давялося-б быць сведкай, як гэтыя звяры разарвалі-б яго на кавалкі і пачалі-б смажыць...

Часу траціць нельга было. Я павярнуўся да Пятніцы.

— Будзь напагатове,—сказаў я яму. Ён матнуў галавой.—Цяпер глядзі на мяне, і што я буду рабіць, тое рабі і ты.

З гэтымі словамі я палажыў на зямлю стрэльбы і нацэліўся ў дзікуноў. Пятніца таксама нацэліўся.

— Ці гатоў ты?—спытаў я яго.

— Так,—адказаў ён.

— Ну, дык страляй!—сказаў я і стрэліў.

Стрэл Пятніцы быў больш трапным за мой: ён забіў двух чалавек і раніў трох, я-ж толькі двух раніў і забіў аднаго. Лёгка сабе ўявіць, якога спалоху нарабілі нашы стрэлы ў натоўпе дзікуноў. Усе тыя, хто засталіся цэлымі, ускочылі на ногі і збянтэжаныя бегалі па беразе, не ведаючы куды кінуцца, у які бок бегчы. Небаракі разумелі, што ім пагражае смерць, але не бачылі, адкуль яна ідзе. Пятніца дасканальна выконваў мае загады і не зводзіў з мяне вачэй. Не даўшы дзікунам ачуняць пасля першых стрэлаў, я схапіў стрэльбу, навёў курок і зноў прыцэліўся. Пятніца акуратна паўтараў кожны мой рух.

— Ты гатоў?—запытаў я зноў.

— Гатоў.

— Дык страляй.

Двое стрэлаў грымнула амаль адначасова, але таму, што мы гэты раз стрэлілі са стрэльбаў, зараджаных шротам, то забітых было толькі двое (ва ўсякім разе двое ўпалі). Затое параненых было вельмі многа. Аблiваючыся крывёю, бегалі яны па беразе з дзі-

кімі крыкамі, як вар'яты. Тры чалавека былі, відаць, цяжка паранены, бо яны неўзабаве ўпалі.

Я ўзяў стрэльбу, якая была яшчэ зараджана, і крыкнуў: «Пятніца, за мной!» і выбег з лесу на адкрытае месца. Мой адважны дзікун не адставаў ні на крок. Заўважыўшы, што дзікуны ўбачылі мяне, я з гучным крыкам (якога Пятніца—маё вернае рэха—не забыў паўтарыць) кінуўся наперад з усёю шпаркасцю, з якой толькі здолелі несці мяне ногі (дарэчы, не асабліва шпарка, бо я быў нагружаны цяжкім узбраеннем).

Сэрца маё білася, калі я падбег да няшчаснага еўрапейца, які ляжаў, як ужо сказана, непадалёк ад кастра, крыху бліжэй да вады.

Абодва каты, ужо гатовыя расправіцца са сваёй ахвярай, пакінулі яе пры першых-жа гуках нашых стрэлаў.

У страшэнным спалоху яны кінуліся да мора, ускочылі ў лодку і пачалі адчальваць. У тую-ж лодку паспелі ўскочыць яшчэ трое дзікуноў.

Я павярнуўся да Пятніцы і паказаў яму вачыма на лодку. Ён адразу-ж зразумеў маю думку і, прабегшы сажняў дваццаць да лодкі, каб быць бліжэй да ўцекачоў, стрэліў па іх.

Усе пяцёра ўпалі ў кучу на дно лодкі, таму я лічыў, што ўсе яны забітыя але двое зараз-жа падняліся: відаць, яны ўпалі проста ад страху. З трох астатніх двое былі забі-

тымі напавал, а трэці быў так цяжка паранены, што ўжо не мог устаць.

Пакуль Пятніца распраўляўся з пяццю ўцекачамі, я дастаў свой ножык і перарэзаў путы, якімі былі звязаны рукі і ногі беднага палонніка. Я дапамог яму прыўзняцца і запытаў яго па-партугальску, хто ён такі. Ён адказаў:

— Эспан'ёле (іспанец).

Неўзабаве ён зусім ачуняў і пачаў самымі красамоўнымі гэстамі выказваць мне сваю падзяку за тое, што я выратаваў яму жыццё.

Паклікаўшы ў дапамогу ўсе мае веды ў іспанскай мове, я сказаў яму па-іспанску:

— Сён'ёр, размаўляць мы будзем потым, а цяпер неабходна дзейнічаць. Калі вы маеце сілу весці бойку, дык вось вам шабля і пісталет: бярыце і ўдарым па ворагу.

Іспанец з удзячнасцю ўзяў тое і другое і,—дзіўная справа!—адчуўшы ў руках зброю, ён нібыта зрабіўся іншым чалавекам. Адкуль і сілы ўзяліся! Як гураган, наляцеў ён на зладзеяў і ў адно імгненне рассек абодвух на кавалкі. Праўда, для такога ўчынку не патрабавалася асаблівай сілы: няшчасныя дзікуны, збянтэжаныя стрэламі і раптоўнасцю нападу, былі так перапалоханы, што не маглі ні бегчы, ні абараняцца. Шмат хто з іх пападалі проста ад страху, як тыя двое, што ўпалі на дно лодкі ад стрэлу Пятніцы, хоць нават не былі ранены.

Я трымаў зараджаную стрэльбу напагатове, але не страляў, захоўваючы зарад на выпадак крайняй патрэбы, таму што астат-

нюю сваю зброю я аддаў іспанцу. Успомніўшы, што нашы чатыры зараджаныя стрэльбы засталіся пад дрэвам на тым месцы, адкуль мы ў першы раз адкрылі агонь, я гукнуў Пятніцу і загадаў яму збегаць за імі.

Ён адразу-ж паляцеў туды. Я аддаў яму сваю стрэльбу, а сам пачаў зараджаць усе астатнія, сказаўшы абодвум сваім саюзнікам, каб яны, калі ім спатрэбіцца зброя, прыходзілі да мяне. Пакуль я даваў свае распараджэнні, іспанец напаў на аднаго з дзікуноў, і паміж імі разгарэлася заўзятая бойка.

Дзікун абараняўся вялізным драўляным мячом, акурат такім, якім яны забілі-б іспанца, каб я не падаспеў да яго на выратаванне. Я і не чакаў, што мой іспанец будзе такім харобрым чалавекам: не гледзячы на сваю слабасць, ён змагаўся, як леў, і нанёс ворагу сваёй шабляй два страшэнныя ўдары па галаве. Але раптам дзікун адкінуў свой меч, і яны схапіліся ў рукапашню. Дзікун быў высокі і дужы: ён хутка паваліў іспанца, наваліўся на яго і пачаў адбіраць шаблю. Тады іспанец выпусціў яе, выхапіў з-пад пояса пісталет і палажыў дзікуна на месцы, перш чым я паспеў на дапамогу.

Тымчасам Пятніца гнаўся за ўцекачамі.

Іспанец таксама не траціў часу дарма. Пакончыўшы з адным дзікуном, ён узяў у мяне стрэльбу і пусціўся за двума іншымі. Ён раніў абодвух, але таму што бегчы доўга нехапіла сіл, дык абодва дзікуны паспелі схавацца ў лес. Пятніца пабег іх шукаць. Не гледзячы на свае раны, адзін з дзікуноў кі-

нуўся ў мора і паплыў за лодкай з трыма яго землякамі, якія паспелі адчаліць ад берагу, і дагнаў яе.

Трое дзікуноў, якія знайшлі ратунак у лодцы, працавалі вёсламі ўсімі сіламі, намагаючыся хутчэй уцячы ад стрэлаў. Пятніца разы два ці тры стрэліў ім наўздагон, але, здаецца, не трапіў. Ён пачаў мяне угаварваць, каб пусціцца за імі наўздагон. Мяне і самога непакоіла, што яны ўцяклі: я баяўся, што калі яны раскажуць сваім землякам аб тым, што здарылася на востраве, тыя накінуцца на нас у непамернай колькасці, можа на двухстах ці трохстах лодках, і тады мы прападзем. Таму я не супярэчыў майму другу. Я пабег да лодак, загадаўшы яму бегчы за мной.

Але як я здзівіўся, калі, ўскочыўшы ў лодку, убачыў там чалавека. Гэта быў стары індзеец. Ён ляжаў на дне лодкі, звязаны па руках і нагах. Відаць, ён таксама быў прызначаны на з'ядзенне. Не разумеючы, што робіцца навакол (ён не мог нават глянуць з-за бартоў лодкі, так моцна скруцілі яго), небарака ледзь не памёр ад страху.

Я адразу-ж перарэзаў яго путы і хацеў дапамагчы яму ўстаць. Але ён не трымаўся на нагах; нават гаварыць не мог, а толькі жаласліва стагнаў: няшчасны, здаецца, думаў, што яго толькі для таго і развязалі, каб весці на забойства.

Калі Пятніца падышоў да нас, я сказаў яму, каб ён вытлумачыў гэтаму чалавеку, што ён вольны, і перадаў яму бутэльку з ромам.

Радасная вестка, у злучэнні з дзеяннем рому, падбадзёрыла старога небараку: ён сеў і загаварыў.

Але трэба было бачыць, што зрабілася з Пятніцай, калі ён пачуў яго голас і убачыў яго твар. Ён кінуўся яго абнімаць, заплакаў, засмяяўся; потым пачаў скакаць вакол яго, заспяваў, закруціўся, потым зноў заплакаў, замахаў рукамі, пачаў біць сябе па галаве і па твары,—словам, ён быў падобны на вар'ята. Я доўга не мог дамагчыся ад яго ніякіх тлумачэнняў, але калі ён нарэшце заспакоіўся, то сказаў мне, што стары—яго бацька.

Не магу выказаць, як я быў расчулены такой праявай любові сына!

Нельга было глядзець без слёз на гэту радасць грубага дзікуна, калі ён убачыў свайго любімага бацьку, выратаванага ад смерці.

Але ў той-жа час нельга было і не смяяцца з недарэчных выбрыкаў, якімі выяўлялася яго радасць і любоў. Разоў дваццаць ён ускочыў у лодку і зноў выскачыў з яе; то ён сядаў каля бацькі і, расхрыстаўшы сваю куртку, прыціскаў яго галаву да сваіх голых грудзей, то пачынаў церці яго застыўшыя рукі і ногі. Я параіў расцерці ромам, і гэта вельмі дапамагло.

Цяпер гнацца за тымі дзікунамі, што ўцяклі, не было чаго і думаць: яны амаль зніклі з вачэй. Такім чынам гнацца за імі нам не прышлося і, трэба зазначыць, на наша шчасце, бо праз гадзіны дзве задзьмуў моцны вецер, які бушаваў потым усю ноч. Ён дзьмуў з паўночнага захаду, акурат насу-

страч уцекачам, і, магчыма, шот яны больш не ўбачылі роднай зямлі...

Але вернемся да Пятніцы. Ён быў так паглынуты сыноўімі клопатамі, што ў мяне нехапіла духу адарваць яго ад бацькі. Я даў яму час пражыць радасць і тады толькі гукнуў яго. Ён падышоў да мяне з прыскокамі, з радасным смехам, задаволены і шчаслівы. Я яго запытаў, ці даваў ён бацьку хлеба. Ён паматаў галавой.

— Няма хлеба: брыдкі сабака нічога не пакінуў, усё сам з'еў.

І ён паказаў на сябе.

Тады я вынуў з сваёй торбачкі ўсё тое, што ў мяне было з прадуктаў—невялікі кавалак хлеба і дзве галінкі ізюму—і даў яму. Убачыўшы, што ён дрыжыць ад хвалявання, я параіў яму падмацаваць свае сілы рэшткамі рому, але і ром ён панёс старому.

Не паспеў ён увайсці зноў у лодку, як бачу—бяжыць кудысьці мой Пятніца, нібы за ім бягуць ваўкі. Пятніца быў надзвычайна лёгкі на ногі і, перш чым я паспеў апамятацца, знік з маіх вачэй. Я крычаў яму, каб ён спыніўся—але не дапамагло. Ён знік. Гляджу—праз чвэрць гадзіны вяртаецца, але ўжо не так шпарка. Калі ён падышоў бліжэй, я ўбачыў, што ён штосьці нясе. Высветлілася, гэта быў збан з прэснай вадой, якую ён прынёс для бацькі. Ён збегаў дзеля гэтага дамоў, у нашу крэпасць, і за адным заходам захапіў з сабой дзве лусты хлеба. Хлеб ён аддаў мне, а ваду панёс старому, дазволіўшы мне адпіць некалькі глыткоў, бо мне вельмі ха-

целася піць. Вада узбадзёрыла старога лепш за ўсякі ром: ён аж паміраў ад смагі.

Калі ён напіўся, я гукнуў Пятніцу і спытаў, ці не засталося ў кубку вады. Ён адказаў, што засталося, і я сказаў яму, каб ён даў напіцца іспанцу, які меў у гэтым патрэбу не менш ягонага бацькі. Я паслаў іспанцу таксама лусту хлеба—адну з двух прынесеных Пятніцай.

Пасля часовага прыліву энергіі бедны іспанец зноў паслабеў: ён сядзеў на мураўку пад дрэвам у поўнай знямозе. Людаеды яго так моцна звязалі, што цяпер у яго параспухалі рукі і ногі. Калі ён прагнаў смагу свежай вадой і паеў хлеба, я падышоў да яго і працягнуў яму галінку ізюму. Ён падняў галаву і зірнуў на мяне з бязмежнай удзячнасцю, потым хацеў было ўстаць, але не мог: разы два ці тры ён прабаваў падымацца, але кожны раз амаль падаў,—так балелі яго распухлыя ногі. Я параіў не прымушаць сябе дарэмна і загадаў Пятніцы расцерці яму ногі ромам.

Пакуль Пятніца выконваў мае загады, я ўвесь час назіраў за ім. Добры юнак штохвілінна паварочваўся, каб паглядзець, ці не патрэбна чаго бацьку і што ён робіць. Яму была відаць толькі галава старога, бо той сядзеў на дне лодкі. Раптам, азірнуўшыся, ён убачыў, што галава знікла; у той-жа момант ён быў на нагах і кінуўся да лодкі. Ён імчаўся як віхор; здавалася, ногі яго не краналі зямлі. Але калі, падбегшы, ён убачыў, што бацька яго спакойна ляжыць у лодцы, ён зараз-жа вярнуўся да



нас. Тады я сказаў іспанцу, што мой друг дапаможа яму падняцца і давядзе яго да лодкі, у якой мы давязем яго ў сваё жыллё, а там ужо паклапоцімся аб ім.

Але Пятніца, нядоўга думаючы, падняў яго, як пёрка, ускінуў сабе на спіну і панёс. Дайшоўшы да лодкі, ён асцярожна пасадзіў яго спачатку на борт, а потым на дно каля свайго бацькі. Потым вышаў на бераг, штурхнуў лодку ў ваду, зноў ускочыў у яе і ўзяўся за вёслы. Я пайшоў пешшу.

Пятніца гроб с такой сілай, лодка так шпарка неслася ўдоўж берагу, не гледзячы на моцны вецер, што я не мог за ёю паспець. Пятніца шчасліва прывёў яе ў нашу гавань і, пакінуўшы ў ёй абодвух гасцей, пабег за другой лодкай. Ён растлумачыў мне гэта набягу, сустрэўшы мяне на поўдарозе, і паімчаўся далей. Здавалася ніводзін конь не могбы дагнаць яго, так шпарка ён бег. І не паспеў я дайсці да бухтачкі, як ён ужо з'явіўся туды з другой лодкай. Выскачыўшы на бераг, ён пачаў дапамагаць старому і іспанцу выйсці з лодкі, але ні той, ні другі не мелі сілы ісці. Небарака Пятніца зусім збянтэжыўся, не ведаючы, што з імі рабіць.

Але я прыдумаў выхад з гэтага становішча. Сказаўшы Пятніцы, каб ён пасадзіў пакуль нашых гасцей на беразе, я пайшоў да ляска і сказаў яму ісці за мной. Мы высеклі некалькі добрых жардзін і на скорую руку зрабілі насілкі, на якіх і прынеслі хворых да знадворнай сцяны нашай крэпасці. Але тут мы спыніліся, не ведаючы, што нам

рабіць далей. Перацягнуць двух дарослых людзей цераз загарадку нам было немагчыма, а ламаць загарадку, я нізавошта не хацеў. Прышлося мне зноў пусціць у ход свае выдумкі, і нарэшце перашкоды былі знішчаны. Мы з Пятніцай узяліся за работу, і гадзіны праз дзве за знадворнай загарадкай, паміж ёю і ляском, у нас стаяла цудоўная парусінавая палатка, прыкрытая зверху галлём ад сонца і дажджу. У гэтай палатцы мы зрабілі дзве пасцелі з таго матэрыялу, які ў мяне быў, гэта значыць, з рысавай саломы і чатырох коўдраў.

Раздзел дваццаць трэці

Новыя жыхары вострава.—Прыбыццё англічан.

Калі мы ўсталявалі жыллё і пасялілі ў ім нашых гасцей, трэба было падумаць, чым іх накарміць.

Абед рабіў Пятніца. Ён засыпаў бульён ячменем і рысам, і атрымаўся надзвычай добры спажыўны суп. Гатавалі заўсёды каля гайку, за знадворнай загарадкай (я ніколі не распальваў агню ў сярэдзіне крэпасці); таму самым зручным месцам было абедаць у новай палатцы. Мы накрылі там стол і паабедалі ўчатырох. Я старшынстваваў за сталом і займаў нашых гасцей гутаркай. Пятніца быў у мяне перакладчыкам, не толькі калі я размаўляў з яго бацькам, але і з іспанцам, бо той хоць і не мог размаўляць па-індзейску, але ўсё разумеў.

Калі мы папалуднавалі, ці, лепш сказаць, павячэралі, я загадаў Пятніцы ўзяць лодку і паехаць за нашымі стрэльбамі, якія мы пакінулі на полі бойкі; а на другі дзень я паслаў яго закапаць трупы забітых, каб не было непрыемнага паху, бо ён вельмі хутка распаўсюдзіцца пры тамашняй спякоце.

Я загадаў яму таксама закапаць жахлівыя рэшткі крывавага балявання, якіх было вельмі многа. Я без агіды нават падумаць не мог аб тым, каб закапаць іх самому: мне зрабілася-б моташна ад аднаго іхняга выгляду. Пятніца акуратна выканаў усё, што я яму загадаў: ён старанна знішчыў усе сляды наведвання дзікуноў, і калі я пасля таго прышоў на месца бойкі, я не адразу мог яго пазнаць; толькі па дрэвах на ўскрайку лесу, які падыходзіў да самага берагу, я ўбачыў, што гэта тое самае месца.

Я часта гутарыў пры дапамозе Пятніцы з маімі новымі сябрамі, бо мне хацелася шмат аб чым іх распытаць. Перш за ўсё я спытаў у бацькі Пятніцы, ці не баіцца ён, што дзікуны, якія ўцяклі, могуць вярнуцца на востраў з цэлай зграяй сваіх супляменнікаў, якіх нам будзе ўжо цяжка перамагчы. Стары індзеец адказаў, што, па яго думцы, уцекачы ніякім чынам не маглі грабсці ў такую буру, якая бушавала ў тую ноч, што яны напэўна ўсе патанулі, а калі і засталіся жывымі нейкім цудам, дык іх занесла на поўдзень і прыбіла к зямлі варожага племя, дзе яны ўсёроўна павінны былі загінуць ад рук сваіх ворагаў.

— Але калі нават яны і шчасліва даехалі дамоў,—казаў стары,—дык і тады яны не вернуцца. Так я думаю хоць, зразумела, брацца за гэта не магу. Яны былі страшэнна напалоханы вашым нечаканым нападам: ды яны-ж ніколі дагэтуль не чулі стрэлаў, і мусіць, засталіся ў поўнай упэўненасці, што таварышы іх загінулі не ад чалавечых рук, а былі забіты громам і маланкай. Вас-жа двух—цябе і Пятніцу—яны палічылі за разгневаных духаў, якія зляцелі з неба, каб іх знішчыць. Я сам чуў, як яны казалі аб гэтым адзін аднаму. Яны не могуць уявіць сабе, каб просты смяротны мог выпушчаць полымя, гаварыць громам і забіваць на далёкай адлегласці, нават не замахнуўшы рукой.

Стары казаў правільна. Пасля я даведаўся, што доўгі час аніводзін дзікун не паказваўся на маім востраве. Відаць, тыя чацвёра ўцекачоў, якіх мы лічылі загінуўшымі вярнуліся на радзіму і сваімі расказамі напалохалі сваіх землякоў. Мажліва нават, што ў іхнім племені склалася паданне аб зачараваным востраве, які недаступны для смяротных, бо кожны, хто ступіць на бераг гэтага вострава, будзе спалены нябесным агнём.

Але ў той час я гэтага не ведаў і ўвесь час чакаў нападу дзікуноў. І я, і мая маленькая армія былі заўжды гатовы да бою: нас-жа цяпер было чацвёра, і хоць-бы з'явіліся да нас сотня такіх слабых ворагаў, мы не пабаяліся-б памерацца з імі сіламі нават у адкрытым полі.

Аднак, бачачы, што дзікуны не з'яўляюцца,

я патрохі пачаў забывацца на свае страхі, а разам з тым усё часцей і часцей вяртаўся да сваіх даўнейшых мараў аб падарожжы на матэрык, тым больш, што, як запэўняў мяне бацька Пятніцы, я мог разлічваць у якасці іхняга агульнага дабрадзея на добры прыём у яго землякоў.

Але пасля адной сур'ёзнай гутаркі з іспанцам я пачаў сумнявацца, ці варта прыводзіць у выкананне мой план. З гэтай гутаркі я даведаўся, што хоць дзікуны сапраўды прытулілі ў сябе семнаццаць чалавек іспанцаў і партугальцаў, якія выратаваліся ў лодцы з загінуўшага карабля, і не крыўдзяць іх, але ўсе гэтыя еўрапейцы церпяць крайнюю патрэбу ў самым неабходным, нярэдка нават галадаюць.

На мае роспыты аб падрабязнасцях нягшчасця, якое адбылося з іхнім караблём, мой госць паведаміў мне, што карабль іхні быў іспанскі і ішоў з Рыо-дэ-ла-Платы ў Гавану, дзе павінен быў пакінуць свой груз, які складаўся галоўным чынам з футраў і зліткаў срэбра, і нагрузіцца еўрапейскімі таварамі.

Ён расказаў яшчэ, што па шляху ў Гавану яны падабралі пяцерых матросаў-партугальцаў з іншага карабля, які разбіўся раней, што пяць чалавек з іхняй каманды патанула адразу-ж пасля крушэння, а астатнія прамучыліся некалькі дзён, на працягу каторых яны не раз глядзелі смерці ў вочы. Нарэшце яны прысталі да карыбскага берагу і, высадзіўшыся, з хвіліны на хвіліну чакалі, што іх

з'ядуць дзікуны. У іх была з сабой агнястрэльная зброя, але яны не маглі ёю карыстацца, бо нехапала пораху і куляў: той порах, які яны ўзялі з сабой у лодку, амаль увесь падмок у дарозе, а што засталося, яны даўно патраціліся, бо першы час здабывалі сабе ежу толькі паляваннем.

Я спытаў у яго, якая, па яго думцы, чакае доля іх на зямлі дзікуноў і няўжо яны ніколі не спрабавалі выбрацца адтуль. Ён адказаў, што ў іх было вельмі многа нарад наконт гэтага, але ўсё скончылася слязмі і адчаем.

— Вы самі памяркуйце,—дадаў ён,—які выхад з нашага становішча маглі мы прыдумаць, не маючы ні судна, на якім можна-б рушыць у адкрытае мора, ні матэрыялаў, ні інструментаў для пабудовы судна і ніякіх запасаў?

Тады я сказаў яму:

— Я буду гаварыць з вамі проста. Як вы думаеце, ці згодзяцца вашы таварышы, калі я ім прапаную пераехаць сюды, на мой востраў. Мне здаецца, што ўсе разам мы знайшлі-б спосаб дабрацца да якой-небудзь культурнай краіны. Адно толькі палохае мяне: запрашаючы іх сюды, я аддаю сябе ў іхнія рукі. Што, калі за маю гасціннасць яны мне адплоцяць здрадай? Удзячнасць, увогуле кажучы, не ўласціва людзям. А гэта было-б, згадзіцеся, надта ўжо крыўдна: выратаваць людзей з бяды толькі для таго, каб апынуцца іхнім палоннікам у Новай Іспаніі, дзе яшчэ не зносіў галавы ніводзін англічанін, якая-б няшчасная выпадковасць ні закінула яго туды.

Ужо лепш быць з'едзеным дзікунамі. Каб вашы таварышы прыехалі сюды, я ўпэўнен, што пры такой колькасці рабочых рук нам нічога не варта было-б пабудаваць вялікае судна, на якім мы маглі-б дабрацца да Бразіліі, да якіх-небудзь населеных еўрапейцамі астравоў ці да іспанскіх уладанняў. Але, бясспрэчна, калі за маё дабро,—калі я сам, можна сказаць, дам ім у рукі зброю,—яны накіруюць яе супроць мяне, калі, карыстаючыся большасцю сіл, яны пазбавяць мяне волі, тады я апынуся яшчэ ў горшым становішчы, як цяпер.

Іспанец адказаў з поўнай шчырасцю, што таварышы яго так страшэнна бядуюць і так добра ўсведамляюць усю безнадзейнасць свайго становішча, што ён не дапускае і думкі, каб яны маглі дрэннае зрабіць чалавеку, які працягаве ім руку дапамогі.

— Калі хочаце,—казаў ён,—я паеду да іх са старым індзейцам, перадам ім вашу прапанову і прывязу вам адказ. Калі яны згодзяцца на вашы ўмовы, я вазьму ў іх урачыстую клятву ў вернасці вам: я прымушу іх паклясціся, што яны пойдуць за вамі ў тую зямлю, якую вы ім самі пакажаце, і да прыбыцця на месца прызначэння будуць бесспрэчна падпарадкавацца вам, як свайму правадыру і начальніку. Мы складзем пісьмовую ўмову за нашымі подпісамі, і я яе вам прывязу.

Затым ён сказаў, што гатоў неадкладна паклясціся мне ў вернасці за сябе ў тым, што ён не пакіне мяне, пакуль жывы або пакуль

я сам не праганю яго, і што пры малейшай спробе з боку яго землякоў парушыць дадзеную мне клятву ён будзе біцца за мяне да апошняй кроплі крыві.

Упэўненасць, з якой мой госць ручаўся за сваіх землякоў, развеяла мае сумненні, і я рашыў паспрабаваць выратаваць гэтых людзей. Я сказаў іспанцу, што адпраўлю да іх яго і старога індзейца для папярэдніх перагавораў. Але, калі ўсё было ўжо гатова да іхняга адплыцця, сам іспанец загаварыў аб тым, што, на яго думку, трэба яшчэ пачакаць.

— Перш чым выпісваць гасцей, нам— сказаў ён,—трэба паклапаціцца аб тым, каб іх пракарміць.

Вось з чаго складаўся яго план. З майго дазволу, казаў ён, яны ўтрох пачнуць араць новы ўчастак зямлі і пасеюць усё зерне, якое я магу вылучыць для сяўбы; затым, дачакаўшыся ўраджаю, збяруць хлеб, і, калі яго будзе дастаткова для таго, каб пракарміць нас чацвярых і ўсіх яго таварышоў, тады ён і бацька Пятніцы паедуць за імі; іначай, перабраўшыся да часу на наш востраў, яны трапяць з агню ды ў полымя і наўрад ці падзякуюць нас за гэта.

Я не мог надзівіцца добрай прадбачлівасці майго госця і быў рады, што ён так адданы мне. Яго парада была такою добрай, што, паўтараю, я прыняў яе адразу.

Не адкладаючы надоўга сваіх спраў, мы ўчатырох ўзяліся араць новае поле. Работа ішла паспяхова (як паспяхова можа ісці такая работа пры драўляных прыладах), і праз

месяц, калі надышоў час сяўбы, у нас быў вялікі ўчастак добра ўскапанай, распульхненай зямлі, на якім мы пасеялі дваццаць мерак ячменю і шаснаццаць рысу, гэта значыць усё, што я мог вылучыць на сяўбу. Для яды мы пакінулі сабе зерня ледзь на шэсць месяцаў.

Цяпер нас было чацьвёра, дзікуны маглі быць для нас страшнымі толькі ў тым выпадку, калі-б іх накінулася на нас надта ўжо многа. Але мы не баяліся дзікуноў і вольна шпацыравалі па сваім востраве. І таму, што ўсе жылі толькі адной надзеяй—каб хутчэй вызваліцца—то кожны з нас, прынамсі магу сказаць гэта пра сябе, не мог не думаць аб сродках для таго, каб надзея магла зрабіцца сапраўднасцю. Таму ў часе сваіх бадзянняў па востраву я адзначаў дрэвы на пабудову карабля, Пятніца з бацькам секлі гэтыя дрэвы, а іспанца я паставіў кіраваць іхняй работай. Я паказаў ім дошкі майго вырабу, якія я з такой вялікай затратай сіл выцёсваў сякерай з тоўстых камлёў, і распарадзіўся, каб нарыхтаваны быў новы запас такіх дошак. Мы нацясалі іх каля тузіна. Гэта былі моцныя дубовыя дошкі ў трыццаць пяць футаў даўжыні, два футы шырыні і ад двух да чатырох дзюймаў таўшчыні. Можаце сабе ўявіць, якая нечуваная колькасць працы была пакладзена на гэтую работу.

У той-жа час я стараўся па магчывасці павялічыць свой статак. Дзеля гэтага двое з нас штодзённа хадзілі лавіць дзікіх казлянят; Пятніца хадзіў кожны дзень, а мы з іспанцам чаргаваліся. Такім чынам наш статак

павялічыўся на дваццаць галоў. Затым нам неабходна было зрабіць яшчэ адну важную справу: трэба было паклапаціцца аб нарыхтоўцы ізюму, бо вінаград ужо паспеў. Мы сабралі і насушылі яго ў велізарнай колькасці—я думаю, не менш шасцідзесяці скрынак. Хлеб ды ізюм складалі галоўны наш харч. Мы ўсе вельмі любілі ізюм. Я не ведаю больш смачнай, здаровай і спажыўнай стравы.

За ўсімі гэтымі справамі мы і не заўважылі, як надышоў час жніва.

Ураджай быў нядрэнны,—не з самых раскошных, але ўсё-ткі-настолькі вялікі, што мы маглі прыступіць да выканання задуманага плана. Мы атрымалі сам-дзесяць. Гэтай колькасці павінна было хапіць не толькі на пракармленне да наступнага жніва ўсёй нашай грамады (лічачы і чатырнаццаць новых членаў), але з такім запасам харчоў мы маглі смела пусціцца ў плаванне і дабрацца да любой з дзяржаў Паўднёвай Амерыкі.

Нарыхтаваўшы запас ізюму і хлеба, мы ўзяліся плесці кошыкі для іх захавання. Іспанец быў вялікім майстрам гэтай справы і зусім забракаваў кошыкі маёй работы.

Калі такім чынам харчы для гасцей, якіх мы чакалі, былі нарыхтаваны, я дазволіў іспанцу ехаць за імі, даўшы яму самыя дасканалыя інструкцыі наконт таго, як весці з імі перагаворы. Я сурова даў яму наказ не прывозіць аніводнага чалавека, не ўзяўшы ад яго ў прысутнасці старога індзейца клятвенага абяцання, што ён не толькі не зробіць мне ні-

якага зла, але будзе абараняць мяне супроць усялякіх падобных спроб і ва ўсім слухацца мяне. Усё гэта павінна было быць напісана на паперы і замацавана ўласнаручнымі подпісамі ўсіх, хто згодзіцца на мае ўмовы. Але, гаворачы аб пісьмовай умове, мы з маім госцем выпусцілі з-пад увагі толькі адно, а іменна, што ў яго таварышоў няма ні паперы, ні пёрак, ні чарніла.

З гэтымі інструкцыямі іспанец і стары індзеец адпраўляліся на той самай лодцы, на якой яны былі прывезены на мой востраў дзікунамі.

З якой радасцю я выпраўляў іх у дарогу! За дваццаць шэсць з лішкам гадоў майго зняволення гэта была з майго боку першая сур'ёзная спроба вярнуць сабе волю. Я даў сваім паслам хлеба, ізюму на шмат дзён, не лічачы васьмідзённага запасу на чатырнаццаць чалавек, які я ім даў для нашых будучых гасцей. Нарэшце, надышоў дзень адплыцця. Я ўмовіўся з ад'язджаючымі, што, вяртаючыся, яны паднімуць флаг, па якім я мог-бы здалёк пазнаць іхнюю лодку, пажадаў ім шчаслівай дарогі, і яны адчалілі.

Вышлі яны пры свежым ветры ў дзень поўнага месяца, у кастрычніку—па прыблізнаму майму разліку, бо, згубіўшы дасканалы лік дням і тыдням, я ўжо не мог яго аднавіць; я не быў нават упэўнен, ці правільна адзначаны гады на маім календары, хоць, праверыўшы яго пасля, пераканаўся, што я не памыліўся ў гадах.

Прайшло ўжо даволі многа часу пасля

ад'езду маіх падарожнікаў. Я чакаў іх з дня на дзень, калі здарылася непрадбачаная, беспрыкладная ў летапісах гісторыі падзея, пераблытаўшая ўсе мае планы.

Аднойчы раніцою, калі я яшчэ моцна спаў у сваім гамаку, да мяне прыбег Пятніца і гучна закрычаў:

— Едуць! Едуць!

Я мігам ускочыў, хутка апрануўся, пералез цераз загарадку і выбег у гаёк (які, дарэчы, так разросся, што цяпер яго можна было-б назваць ужо лесам). Гэтым разам я, супроць звычайнага, не ўзяў з сабой ніякай зброі. Я быў упэўнен, што гэта вяртаюцца нашы падарожнікі і не думаў, што мне можа пагражаць якая небяспека. Зірнуўшы на мора, я сапраўды ўбачыў мілі за дзве ад берагу лодку з трохкутным ветразем; яна трымала кірунак прама на востраў і, падганяемая ветрам, хутка набліжалася. Але ішла яна не з боку матэрыка, а ад паўднёвага канца вострава, і хутка я разгледзеў, што гэта не наша лодка. На кожны выпадак трэба было падрыхтавацца да абароны.

Перш за ўсё я загадаў Пятніцы схавацца ў ляску, а калі лодка прычаліць, уважліва прасачыць, што будуць рабіць яе пасажыры, і прысці да мяне з данясеннем. Затым вярнуўся дамоў, захапіў падзорную трубу, абедзве лесніцы і палез на гару для рэкагнасціроўкі мясцовасці, як я заўсёды гэта рабіў у тых выпадках, калі лічыў, што набліжаецца небяспека.

Падняўшыся наверх і накіраваўшы трубу

на мора, я ўбачыў карабль. Ён стаяў на якары ля паўднёва-ўсходняга канца вострава, мілях у двух з паловай ад майго жылля, а ад берагу было мілі паўтары, карабль быў бясспрэчна англійскі, ды і лодка, як я мог разгледзець, была англійскім баркасам.

Не магу выказаць, як я быў усхваляваны гэтым адкрыццем. Мая радасць, калі ўбачыў карабль, ды яшчэ англійскі, радасць блізкай сустрэчы з маімі землякамі была вышэй усякага апісання, а разам з тым нейкае патайнае прадчуванне, якога я нічым не мог растлумачыць, перасцерагала, стрымлівала мяне. Перш за ўсё мне здавалася дзіўным, што англійскі купецкі карабль зайшоў у гэтыя месцы, якія ляжалі, як было вядома, у баку ад усіх морскіх гандлёвых шляхоў англічан. Я ведаў, што яго не магло прыгнаць бурай, бо за апошні час не было бур. За якой-жа справай зайшоў ён сюды? Каб нават на ім былі сапраўды англічане, мне ўсё-ткі не варта да пэўнага часу паказвацца ім на вочы, бо магло быць, што яны з'явіліся сюды не з дабром, і адкуль я мог ведаць, што, даверыўшыся гэтым зусім невядомым мне людзям, я не траплю ў рукі зладзеяў і забойцаў?

Стоячы на гары, я пільна сачыў за лодкай. Яна шпарка набліжалася да вострава, але раптам, крыху не дайшоўшы, зрабіла круты паварот і пайшла ўздоўж берагу да бухтачкі, дзе я калісьці прычальваў з плытамі: відаць, сядзеўшыя ў лодцы выглядалі, дзе зручней прычаліць. Але, на маё шчасце, яны не дайшлі да маёй бухтачкі, а прычалілі ў другім

месцы, прыблізна за поўмілі ад яе; кажу—на шчасце, бо калі-б высадзіліся яны ў гэтай бухтачцы, яны апынуліся-б, можна сказаць, ля парога майго жылля, а ўбачыўшы жыллё, знайшлі-б, вядома, яго жыхара і каб нават пашкадавалі яго жыццё, то ўжо напэўна абабралі-б яго да ніткі.

Калі лодка прычаліла, і людзі вышлі на бераг, я мог добра іх разгледзець.

Гэта былі, бясспрэчна, англічане, у кожным разе большасць іх. Аднаго ці двух я, праўда, палічыў за галандцаў, але я памыліўся, як высветлілася потым. Усіх было адзінаццаць чалавек. Трое з іх былі, відаць, прывезены ў якасці палонных, бо ў іх не было аніякай зброі, і мне здалося, што ў іх звязаны ногі: я бачыў, як пяць чалавек, выскачыўшых на бераг першымі, выцягвалі іх з лодкі. Адзін з палонных вельмі непакоіўся, нібы прасіў літасці: ён, відаць, быў у страшэнным адчаі. Двое іншых таксама гаварылі нешта, уздымаючы рукі ўгару, але ўвогуле былі больш стрыманымі. Я не ведаў, што думаць, гледзячы на гэтую сцэну. Раптам Пятніца крыкнуў мне на сваёй няўдалай англійскай мове:

— О, Робін Крузо! Глядзі: белыя чалавекі таксама ядуць чалавека, як дзікія.

— Ты звар'яцеў, Пятніца!—сказаў я яму.— Няўжо ты лічыш, што яны іх з'ядуць?

— Вядома, з'ядуць!—адказаў ён з перакананнем.

— Не, не, ты памыляешся, — казаў я.— Баюся, праўда, што яны хочуць іх забіць, але

можаш быць упэўнены, што есці іх яны не будуць.

Я быў сапраўды ў страшэннай трывозе, пазіраючы на незразумелую драму, якая разыгрывалася перада мной, і кожны момант чакаючы, што на маіх вачах адбудзецца крывавая справа.

Я ўздрыгваў ад жаху пры адной думцы аб гэтым. Мне нават здалося, што над галавой адной з ахвяр бліснула нейкая зброя—кінжал ці нож. Уся кроў застыла ў мяне ў жылах: я быў упэўнены, што небарака зараз паваліцца мёртвым. Як я шкадаваў у гэтую мінуту, што са мной няма майго іспанца і старога індзейца, бацькі Пятніцы! Я заўважыў, што ні ў каго з разбойнікаў не было з сабой стрэльбы. «Вось добра было-б,—падумаў я,—падкрасціся да іх і стрэліць ва ўпор». Але гэта было немагчыма. Неўзабаве аднак у мяне знайшоўся іншы выхад з майго цяжкога становішча. Разбойнікі, відаць, не мелі намеру забіваць сваіх палонных, а толькі хацелі іх напалохаць, бо хутка яны пакінулі іх і разбегліся па востраве, жадаючы, мабыць, агледзець мясцовасць. Палонных яны пакінулі пад наглядам двух сваіх таварышоў; але, мусіць, тыя былі п'янымі, у кожным разе як толькі астатнія пайшлі, абодва яны забраліся ў лодку і адразу-ж паснулі. Такім чынам палонныя засталіся адны. Але замест таго, каб выкарыстаць дадзеную ім волю, яны сядзелі на пяску, азіраючыся па баках у адчаі.

Гэта нагадала мне першы дзень майго прабывання на востраве. Акурат таксама і я

сядзеў на беразе, дзіка азіраючыся навакол. Я таксама лічыў сябе загінуўшым. Якія жахі марыліся мне ў першую ноч, калі я ўзлез на дрэва, баючыся, каб не разарвалі драпежныя звяры! Так, я тады лічыў сябе загінуўшым. І як шчасліва пражыў я гэтыя гады!.. Але нічога гэтага я тады не прадбачыў. Таксама і гэтыя трое няшчасных прыходзілі ў адчай, не ведаючы, што збавенне блізка.

Пакуль разбойнікі вялі перагаворы з трыма палоннымі ды блукаліся па востраву, прайшло многа часу: пачаўся адліў, і лодка апынулася на мялі. У ёй, як ужо сказана, засталіся два чалавекі, якія хутка заснулі. Калі адзін з іх прачнуўся ды ўбачыў, што лодка стаіць на сухім беразе, ён паспрабаваў быў штурхнуць яе ў ваду, але не здолеў. Тады ён пачаў клікаць астатніх. Яны збегліся на яго крыкі і пачалі дапамагаць яму, але лодка была такая цяжкая, што ўсе іхнія намаганні спусціць яе на ваду ні да чаго не прывялі.

Тады яны, як сапраўдныя маракі,—а маракі, як вядома, самы лёгкадумны народ у свеце,—кінулі лодку і зноў разышліся па востраву. Я чуў, як адзін з іх, пайшоўшы, крыкнуў двум, што засталіся ў лодцы: «Джэк! Том! Ды кіньце вы яе! Чаго там важдацца! Усплыве з наступным прылівам». Гэта было сказана па-англійску, так што цяпер не засталося ўжо ніякіх сумненняў, што гэтыя людзі—мае землякі.

Увесь гэты час я або стаяў на сваім назіральным пасту, на вяршыні гары, або сядзеў, стаіўшыся, у сваім замку, радуючыся, што так



добра яго ўмацаваў. Да пачатку прыліву засталося не менш дзесяці гадзін, к таму часу павінна было сцямнець. Тады я мог непрыкметна падкрасціся да злодзеяў і сачыць за кожным іхнім рухам, а можа нават падслухаць, што яны будуць гаварыць.

Чакаючы вечара, я пачаў рыхтавацца да бою, толькі цяпер мая падрыхтоўка была складаней і дбайней, чымся тады, калі я збіраўся ваяваць з дзікунамі. Я ведаў, што цяпер буду мець справу з больш небяспечным ворагам. Пятніцы, які зрабіўся ў мяне надзвычайным стралком, я таксама загадаў узброіцца. Яму я аддаў тры стрэльбы, а сабе ўзяў дзве. У калматай куртцы і шапцы, з голай шабляй ля бядра і з двума стрэльбамі за спіной, я меў сапраўды грозны выгляд.

Як ужо сказана, я было рашыў нічога не рабіць, пакуль не сцямнее. Такі быў мой першапачатковы план, але потым абставіны склаліся так, што я павінен быў яго змяніць. Стоячы на гары, я заўважыў, што ўся банда прыехаўшых галаварэзаў знікла ў лесе. Гэта было каля двух гадзін дня. Прайшло даволі многа часу, а яны не паказваліся. «Мусіць, паляглі спаць, пакуль спадзе спякота», падумаў я. Палонныя між тым зноў засталіся адны. Яны не спалі,—ім было не да сну. Усе трое сядзелі пад дрэвам не больш як за чвэрць мілі ад майго жылля.

Вось тут я і прыняў новае рашэнне: я рашыў падысці да няшчасных і распытаць іх, што яны за людзі і што з імі здарылася.

Узброены з галавы да ног, як было апісана вышэй, я рушыў у паход. За мною на належнай адлегласці маршыраваў Пятніца. У яго таксама быў вельмі ваяўнічы выгляд, але прынамсі ён быў менш падобны на выхадца з таго свету.

Я падышоў да трох палонных зусім блізка (яны сядзелі да мяне спіной і не маглі мяне бачыць) і голасна спытаў іх па-іспанску:

— Хто вы такія?

Яны ўздрыгануліся ад нечаканасці і павярнуліся на голас, але, здаецца, яшчэ больш спалохаліся, убачыўшы, што да іх падыходзіць нейкая зверападобная істота. Ніводзін з іх не адказаў ні слова, і мне здалося, што яны збіраюцца ўцякаць. Тады я загаварыў з імі па-англійску.

— Сябры,—пачаў я,—не палохайцеся: быць можа, вы знойдзеце прыяцеля там, дзе менш за ўсё чакаеце сустрэць яго. Я—англічанін і хачу вам дапамагчы. Як бачыце, нас толькі двое: я і мой слуга; але ў нас ёсць стрэльбы і зарады. Кажыце-ж проста, чым мы можам вам служыць. Якая бяда здарылася з вамі?

— Вельмі доўга расказываць усё, што было,—адказаў адзін з іх,—нашы зладзеі блізка. Але вось вам уся наша гісторыя ў кароткіх словах. Я—капітан карабля; мой экіпаж узбунтаваўся. Я заўсёды любіў маіх матросаў, і яны любілі мяне. Пад маёй камандай ім жылося надзвычай добра. Але іх збіла з толку банда нягоднікаў, якая завялася ў мя-

не на судне ў апошні час. Гэтыя падлюгі падбухторваюць іх зрабіцца піратамі, каб рабаваць караблі. Таварышы мае, якіх вы бачыце тут (адзін—мой памочнік, другі—пасажыр), ледзьве ўпрасілі гэтых людзей не забіваць нас, і нарэшце яны згадзіліся з той умовай, што высадзяць на бераг усіх нас трох у якім-небудзь пустынным месцы. Так яны і зрабілі. Мы былі ўпэўнены, што нас чакае тут галодная смерць, бо лічылі гэтую зямлю нежылой. Цяпер-жа мы надзвычай здзіўленыя... мы не ведаем, што нам і думаць.

— Дзе гэтыя звяры—вашы ворагі?—спытаў я.—У якім баку яны зніклі?

— Вунь яны... пад тымі дрэвамі. Здаецца, спяць.—І ён паказаў у бок лесу.—У мяне сэрца замірае ад страху, што яны прачнуцца, убачаць вас і пачуюць нашу размову, бо тады аніводнаму з нас не выратавацца ад іхніх рук.

— Ёсць у іх стрэльбы?—спытаў я.

— Толькі дзве, адна з іх пакінута ў лодцы.

— Вельмі добра!—сказаў я.—Усё астатняе я бяру на сябе. Здаецца, яны моцна паснулі, нам было-б няцяжка ўсіх іх перабіць, але ці не лепш захапіць іх жывымі?

На гэта капітан мне сказаў, што паміж гэтымі людзьмі ёсць двое заядлых нягоднікаў, якіх было-б небяспечна шкадаваць; але калі мы пазбавім іх мажлівасці дзейнічаць, астатнія, ён упэўнены, уціхамірацца. Я папрасіў яго паказаць мне гэтых двух, але ён ска-

заў, што не можа пазнаць іх на такой вялікай адлегласці, а затым дадаў, што ён і яго таварышы аддаюць сябе ў поўнае маё распараджэнне і выканаюць усё, што-б я ім ні загадаў.

— У такім разе,—сказаў я,—перш за ўсё адыдзем далей, каб яны як-небудзь не ўбачылі нас і не падслухалі нашай размовы, а там вырашым разам, як нам дзейнічаць.

Усе трое з поўнай гатоўнасцю пайшлі за мной. Калі мы зайшлі ў глыб лесу, я спыніўся і сказаў:

— Слухайце, сэр: я паспрабую выратаваць вас, але спачатку я вам пастаўлю дзве ўмовы...

Ён не даў мне скончыць.

— Я ўвесь у вашай уладзе,—сказаў ён паспешна.—Распараджайцеся мною, як вам захочацца,—і мною, і маім караблём, калі нам удасца адабраць яго ў разбойнікаў; калі-ж не, то даю вам слова, што, пакуль буду жыць, я буду вашым паслухмяным рабом, пайду ўсюды, куды-б вы мяне ні паслалі, і, калі трэба будзе, памру за вас.

Абодва яго таварышы абяцалі тое самае.

— Калі так, дык вось маё ўмовы. Па-першае, пакуль вы ў мяне на востраве, вы не будзеце дамагацца ўлады; вы дасцё мне слова, што не будзеце зламысліць ні супроць мяне, ні супроць жыхароў майго дома, будзеце падпарадкавацца ўсім маім распараджэнням і па першаму майму патрабаванню вернеце мне зброю, якую я вам дам. Па-другое,

калі нам удасца авалодаць вашым караблём, вы дармова давязеце на ім у Англію мяне і майго друга.

Капітан запэўніў мяне ўсімі клятвамі, якія толькі можа прыдумаць чалавечае вынаходніцтва, што ён літаральна выканае мае патрабаванні.

— І не таму толькі,—дадаў ён,—што я прызнаю іх зусім падстаўнымі, але галоўнае, таму, што я абавязан вам жыццём і да самай смерці буду лічыць сябе вашым даўжніком.

— У такім выпадку не будзем марудзіць!— сказаў я.—Перш за ўсё вось вам тры стрэльбы, вось порах і кулі. А цяпер кажыце, што, па-вашаму, нам трэба рабіць.

Але капітан зноў пачаў выказваць сваю ўдзячнаць і абвясціў, што роля правадыра належыць па праву мне.

Тады я сказаў:

— На маю думку, нам трэба дзейнічаць рашуча. Падкрадземся да іх, пакуль яны спяць, і дамо па іх залп, даўшы лёсу вырашыць, каму быць забітым нашымі стрэламі. Калі-ж тыя што застануцца, здадуцца, іх можна будзе пашкадаваць.

На гэта ён з баязлівасцю адказаў, што яму не хацелася-б праліваць столькі крыві і што, калі можна, лепш-бы ад гэтага ўхіліцца.

— З гэтых людзей,—дадаў ён,—толькі двое невыправімыя нягоднікі, гэта яны і былі пачынальнікамі бунту. Калі яны ад нас уцякуць і вернуцца на карабль, мы прапалі, бо

яны рынуцца сюды з усім экіпажам і пераб'юць нас усіх.

— Значыцца, тым больш падстаў прыняць маю параду,—сказаў я.—Вы самі бачыце, што жорсткія захады выклікаюцца неабходнасцю: для нас гэта адзіны сродак выратавацца.

Заўважыўшы, аднак, што ён ўсё-ткі хістаецца, я сказаў яму, каб ён з таварышамі ішоў уперад і распараджаўся, як ведае.

Між тым, пакуль у нас ішлі гэтыя перагаворы, піраты пачалі прачынацца. Я ўбачыў, што двое з іх падняліся, і спытаў капітана, ці не гэта пачынальнікі бунту.

— Не,—адказаў ён.

— Дык хай сабе ідуць з мірам: не будзем ім перашкаджаць,—сказаў я.

Капітан і абодва яго таварышы схапілі стрэльбы, запхнулі за пояс пісталеты і пайшлі наперад. Адзін з двух прачнуўшыхся піратаў павярнуўся на шум іхніх крокаў і, убачыўшы ў іхніх руках зброю, узняў трывогу. Але было ўжо позна: у той самы момант, як ён закрычаў, грымнула два стрэлы—капітанскага памочніка і пасажыра; сам-жа капітан прадбачліва ўстрымаўся, прыберагаючы свой зарад. Страляўшыя не далі прамаху: адзін чалавек быў забіт напавал, другі цяжка паранены. Ён аднак ускочыў на ногі і пачаў клікаць на дапамогу. Але тут да яго падышоў капітан і сказаў:

— Позна ўсхапіўся: цяпер ніхто табе не дапаможа.

З гэтымі словамі ён падняў стрэльбу і так

моцна ўдарыў раненага прыкладам па галаве, што той замоўк навекі.

Цяпер, не лічачы трох чалавек, якія, мусіць, зайшлі ў другую частку лесу, у нас засталася толькі тры супраціўніка, з якіх адзін быў лёгка ранены. У гэты час прышлі і мы з Пятніцай. Нягоднікі зразумелі, што супраціўляцца бескарысна, і пачалі прасіць літасці. Капітан адказаў, што ён гатоў зміласцівіцца, калі яны дадуць якую-небудзь гарантыю, у тым, што шчыра каюцца ў сваім здрадніцтве, і паклянуцца дапамагчы яму авалодаць караблём і адвесці яго назад у Ямайку. Яны пачалі клятвамі запэўняць у сваім шчырым раскаянні і абяцалі, што будуць беспярэчліва падпарадкавацца яму.

Капітан поўнасцю задаволіўся іхнімі абяцаннямі і, з свайго боку, абяцаў пакінуць іх у жывых. Я нічога не меў супроць гэтага, але толькі заявіў, што ўвесь час, які гэтыя людзі прабудуць на маім востраве, я буду вымушан трымаць іх звязанымі па руках і нагах.

Як толькі скончыліся ўсе гэтыя перагаворы, я накіраваў Пятніцу і памочніка капітана да баркаса і загадаў адвесці яго ў нашу бухтачку і зняць з яго ветразі і вёслы.

Тымчасам тры матросы, якія адсутнічалі, пачулі нашы стрэлы і вярнуліся.

Калі яны ўбачылі, што іхні капітан з палоннага ператварыўся ў пераможцу, яны нават не спрабавалі супраціўляцца і пакорліва далі сябе звязаць.

Такім чынам перамога засталася за намі.

Раздзел дваццаць чацверты

Барацьба з піратамі.

Цяпер мне заставалася толькі шчыра пагутарыць з капітанам: расказаць яму пра сябе, распытаць аб яго справах, адным словам, узаемна высветліць наша становішча.

Я пачаў першым. Я расказаў яму ўсю гісторыю майго жыцця за апошнія дваццаць восем год. Ён слухаў з прагнай увагай і прыходзіў ў невыказанае здзіўленне перад цудоўным злучэннем выпадкаў, якія далі мне магчывасць назапасіць харч і зброю і такім чынам выратавацца ад немінучай смерці.

Пасля гэтага я запрасіў капітана і абодвух яго спадарожнікаў да сябе ў замак, куды мы ўвайшлі звычайным шляхам, гэта значыць па прыстаўной лесніцы. Я запрапанаваў маім гасцям падмацавацца ядой, а затым паказаў ім сваю хатнюю гаспадарку з усімі дасціпнымі прыстасаваннямі, якія былі зроблены мною за доўгія гады майго адзінокага жыцця.

Яны дзівіліся з усяго, што я ім паказваў, з усяго, што яны ад мяне даведаліся. Але капітана больш за ўсё ўразілі пабудаваныя мною ўмацаванні і тое, як дасканала было схавана маё жыллё у гушчы дрэў. Сапраўды, дзякуючы незвычайнай сіле расліннасці, мой гаёк за дваццаць гадоў ператварыўся ў такі густы лес, што скрозь яго можна было прабрацца толькі па вузенькай звілістай сцежцы, якую я пакінуў знарок для таго пры пасадцы дрэў. Я растлумачыў маім новым знаёмым,

што гэты замак— галоўная мая рэзідэнцыя, але як ва ўсіх уладарных асоб, у мяне ёсць і другая—загарадны палац, які я таксама часамі наведваю. Я абяцаў паказаць ім яго другім разам.

— Цяпер-жа, — сказаў я, — перад намі больш неадкладная справа: трэба падумаць, як выратаваць ваш карабль ад разбойнікаў.

Капітан зусім згадзіўся са мною, але дадаў, што ён зусім не разумее, як прыступіць да выканання гэтай задачы.

— На караблі, — сказаў ён, — засталося яшчэ дваццаць шэсць чалавек. Усё яны замешаны ў змове, гэта значыць у такім злачынстве, за якое па нашых законах належыць кара смерцю. Піратам добра вядома, што калі яны здадуцца, яны адразу-ж, як толькі вернуцца ў Англію, будуць павешаны або, у лепшым выпадку, іх пашлюць на катаргу ў якую-небудзь калонію; ведаючы гэта, яны бясспрэчна будуць абараняцца да апошняй крайнасці, бо ім ўсёроўна няма чаго губляць. А пры такіх умовах нам, з нашымі слабымі сіламі, няма як уступаць з імі ў бой.

Словы капітана прымусілі мяне прызадумацца. Яго думкі здаваліся мне зусім падстаўнымі. А між тым трэба было на нешта адважыцца: кожная затрымка магла быць пагібельнай для нас. З карабля магла прысці новая партыя бунтароў і перарэзаць нас усіх. Лепш за ўсё было-б хітрасцю заманіць іх у пастку і нечакана напасці на іх. Але як гэта зрабіць?.. Яны маглі прыехаць з хвіліны на хвіліну. «Напэўна,—думаў я,—калі на караблі

ўбачаць, што лодка не вяртаецца, там захочуць даведацца, што сталася з людзьмі, і адправяць на бераг другую лодку. Але ўжо, вядома, гэтым разам яны з'явяцца ўзброеныя, і тады мы не здужаем іх».

Капітан зусім згадзіўся са мной.

Тады я сказаў, што, на маю думку, нам перш за ўсё трэба паклапаціцца аб тым, каб разбойнікі не маглі ўвесці назад баркас, на якім прыехала першая партыя, а для гэтага трэба зрабіць яго нягодным для плавання, гэта значыць прабіць у ім дно. На тым мы і парашылі. У баркасе было шмат усякага дабра. Мы знайшлі там такую-сякую зброю, парахоўніцу, дзве бутэлькі—адну з гарэлкай, другую з ромам, мяшок з сухарамі, вялікі кавалак цукру (фунтаў пяць ці шэсць), загорнутага ў парусіну. Усё гэта было мне вельмі дарэчы, асабліва гарэлка ды цукар, ні таго, ні другога я не каштаваў ужо многа-многа год.

Выцягшы на бераг ўвесь гэты груз (вёслы, мачты, ветразі і стырно былі прыбраны раней, аб чым я ўжо казаў), мы прабілі ў дне баркаса вялікую дзірку. Такім чынам, каб нам і не ўдалося перамагчы ворага, ён прынамсі не мог-бы узяць ад нас сваёй шлюпкі. Сказаць па шчырасці, я не спадзяваўся, каб нам пашчасціла захапіць у свае рукі карабль, але што датычыцца баркаса, дык тут у мяне былі свае меркаванні. «Абы толькі яны пакінулі яго нам,—казаў я сабе:—паправіць яго нічога не варта, а на такім судне я лёгка дабяруся да Падветраных астравоў. Па дарозе

магу нават завярнуць да майго іспанца». Як бачыце, я не забыў свайго сябра.

Калі мы агульнымі сіламі выцягнулі баркас на сухое месца, куды не даходзіў прыліў, мы прыселі адпачыць ды параіцца, што нам рабіць далей. Але не паспелі мы распачаць нарады, як з карабля пачуўся гарматны стрэл, і ўслед за тым на мачце ўзняўся флаг. Гэта быў, відаць, прызыўны сігнал для баркаса. Але баркас не паказваўся...

Крыху пачакаўшы, грымнуў другі стрэл, потым яшчэ і яшчэ. Таксама энергічна сігналізавалі флагамі, але ўсе гэтыя сігналы заставаліся без адказу: баркас не крануўся з месца. Нарэшце з карабля спусцілі шлюпку (усё гэта я вельмі добра бачыў праз падзорную трубу). Шлюпка накіравалася да берагу, і, калі яна падышла бліжэй, мы ўбачылі, што ў ёй было не менш дзесяці чалавек, і ўсе са стрэльбамі.

Ад карабля да берагу было паўтары мілі, таму мы мелі час разгледзець сядзеўшых у шлюпцы людзей. Мы адрознівалі нават твары, бо плынню шлюпку аднесла крыху на ўсход ад таго месца, куды мы выцягнулі баркас, а грабцам, відаць, хацелася прычаліць акурат да гэтага месца, і таму некаторы час ім прышлося ісці ўдоўж берагу.

Такім чынам, паўтараю, мы бачылі ў твар кожнага чалавека. Капітан усіх іх пазнаў і тутжа ахарактарызаваў мне кожнага з іх. Па яго словах, між імі было тры добрых чалавекі; ён быў упэўнены, што іх уцягнулі ў злачынства супроць іхняй волі, напэўна, пагрозамі.

але затое боцман — галоўны пачынальнік бунту—і ўсе астатнія былі пэўныя нягоднікі.

— Я вельмі баюся,—дадаў капітан,—што яны будуць люта абараняцца і здужаюць нас.

Я ўхмыльнуўся і сказаў:

— У людзей, пастаўленых у такія ўмовы, як мы, не можа быць страху; што-б ні чакала нас у будучым, усё будзе лепшым за наша цяперашняе становішча, і, значыцца, кожны выхад з гэтага становішча—нават смерць—мы павінны лічыць збавеннем. Што вы думаеце, напрыклад, аб маім жыцці? Ці лёгка дваццаць сем гадоў быць адрэзаным ад свету? І няўжо вы не знаходзіце, што мне варта рызыкнуць жыццём дзеля свайго вызвалення. Што тычыцца мяне, то ў надыходзячай справе мяне блытае толькі адно.

— А што?—спытаў ён.

— Ды тое, што, як вы кажаце, у ліку гэтых злодзеяў ёсць тры або чатыры добрых чалавекі, якіх варта пашкадаваць. Каб яны былі ўсе піратамі, я-б ні на секунду не меў сумнення, што я маю права расправіцца з імі. А што мы з імі расправімся, я зусім ўпэўнены, бо кожны, уступіўшы на гэты востраў, будзе ў нашай уладзе, і ад нас будзе залежыць, ці забіць яго ці дараваць яму жыццё.

Я гаварыў бадзёрым, рашучым голасам, з вясёлым тварам. Мая ўпэўненасць перадалася капітану, і мы энергічна ўзяліся за справу. Яшчэ раней, калі на караблі пачалі спускаць шлюпку, мы паклапаціліся добранька схаваць нашых палонных, каб тыя, што павінны былі прыбыць, не маглі іх знайсці.

Двух, як самых ненадзейных (так, прынамсі, іх атэставаў капітан), я адправіў пад канвоем Пятніцы і капітанскага памочніка ў свой склеп. Гэта было дастаткова глухое месца, адкуль арыштантаў не маглі пачуць і адкуль было-б нялёгка ўцячы. Іх пасадзілі звязанымі, але пакінулі ім яды і сказалі, што калі яны будуць трымаць сябе ціха, то праз дзень або два іх вызваляць, але затое пры першай спробе ўцякаць заб'юць без ніякай літасці. Яны абяцалі цярпліва пераносіць сваё зняволенне і вельмі дзякавалі за тое, што іх не пакінулі без ежы і святла (я і забыў сказаць, што Пятніца даў ім некалькі штук нашых самародных свечак). Замкнуўшы за арыштантамі дзверы, Пятніца застаўся пільнаваць іх, чаго тыя, аднак, не ведалі.

З чатырма астатнімі палоннымі мы абышліся мякчэй. Праўда, двух мы пакінулі пакуль звязанымі, бо капітан за іх не ручаўся, але двух іншых я нават прыняў на службу па асабістай рэкамендацыі капітана. Абодва яны ўрачыста паклялiся мне ў вернасці. Такім чынам, лічачы гэтых двух і капітана з двума яго таварышамі, нас было цяпер сямёра добра ўзброеных людзей, і я не сумняваўся, што мы здолеем справіцца з тымі дзесяццю, якія павінны былі прыехаць, тым больш, што ў ліку іх, па словах капітана, было тры або чатыры добрых чалавекі, якіх мы маглі спадзявацца перацягнуць на свой бок.

Падышоўшы да вострава ў тым месцы, дзе мы пакінулі баркас, яны прычалілі, вышлі са шлюпкі, выцягнулі яе на бераг, чаму я быў

вельмі рады. Шчыра кажучы, я баяўся, што яны дзеля асцярогі стануць на якар, не дайшоўшы да берагу, і што частка людзей застанецца пільнаваць шлюпку: тады мы не маглі-б яе захапіць.

Вышаўшы на бераг, яны перш за ўсё кінуліся да баркаса. Можаце сабе ўявіць іхняе здзіўленне, калі яны ўбачылі, што з яго ўзяты ўсе снасці, што ўвесь груз знік, а дно прадзіраўлена наскрозь.

Пагутарыўшы між сабой аб гэтым непрыемным сюрпрызе, яны пачалі галосна крычаць з надзеяй, што іх пачуюць прыбыўшыя ў баркасе. Доўга яны дралі сабе горла, але без ніякага выніку. Тады яны сталі ў кружок і па камандзе далі залп з усіх стрэльбаў. Па лесе раскацілася гулкае рэха, але і ад гэтага іхняя справа не пасунулася наперад: сядзеўшыя ў склепе нічога не маглі чуць; тыя-ж, што былі пры нас, хоць і чулі, але адгукнуцца не адважваліся.

Тады новапрыбыўшыя, бачачы, што ніхто не адгукаецца на іхнія крыкі, страшэнна перапалохаліся і рашылі вяртацца на карабль з данясеннем, што ў баркасе прадзіраўлена дно, а людзі, прыбыўшыя на востраў, напэўна, усе перабіты, бо іх нельга дазвацца.

Капітан, які дагэтуль яшчэ спадзяваўся, што нам удасца захапіць карабль, цяпер зусім апусціў нос. Ён баяўся, што, калі на караблі даведаюцца аб знікненні каманды баркаса, новы капітан аддасць загад здымацца з якара,—і тады бывай усе яго надзеі.

Але хутка ў нас з'явіўся новы повад для

страху. Шлюпка з людзьмі не адышла ад берагу і дваццаці сажняў, як мы ўбачылі, што яна вяртаецца: мабыць, параіўшыся паміж сабой, яны прынялі якое-небудзь новае рашэнне. Мы з трывогай назіралі. Прыстаўшы да берагу, яны пакінулі ў шлюпцы трох чалавек, а астатнія сямёра вышлі і накіраваліся ў глыб востраваў, відаць, на пошукі прапаўшых.

Справа прымала невыгодны для нас абарот. Каб нават нам удалося захапіць семярых, што вышлі на бераг, гэта не прынесла-б нам ніякай карысці, паколькі мы ўпусцілі-б шлюпку з трыма астатнімі: вярнуўшыся на карабль, яны ўсёроўна расказалі-б аб тым, што здарылася, а тады карабль ужо напэўна зняўся-б з якара і зноў-жа быў-бы страчаны для нас.

Як-бы яно ні было, нам не заставалася нічога больш, як цярпліва чакаць, чым усё гэта скончыцца. Выпусціўшы семярых чалавек, шлюпка з трыма астатнімі адышла на даволі далёкую адлегласць ад берагу і стала на якар, адрэзаўшы нам такім чынам усю магчывасць дабрацца да яе.

Сямёра выведчыкаў, трымаючыся шчыльнай групкай, пачалі ўзбірацца на горку, пад якой было маё жыллё. Мы іх вельмі добра бачылі, але яны не маглі бачыць нас. Мы ўсё чакалі, ці не падыдуць яны бліжэй, каб мы маглі даць па іх залп, або ці не накіруюцца прынамсі да супроцьлеглага берагу востраваў, бо, пакуль яны заставаліся на гэтым яе баку, нам нельга было высунуць носа з крэпасці.

Але, дабраўшыся да грэбня ўзгорка, адкуль адкрываўся від на ўсю паўночна-ўсходнюю частку востраў, што спускалася да мора адхоннымі лясістымі тэрасамі, яны спыніліся і зноў пачалі крычаць. Доўга крычалі яны і паасобку, і ўсе разам, нарэшце, не дачакаўшыся адказу і, мабыць, баючыся далёка адысці ад берагу, селі пад дрэвам і пачалі раіцца. Заставалася толькі, каб яны паснулі, як тыя, што прыехалі ў першай партыі, тады перамога была-б за намі. Але страх не дае заснуць, а гэтыя людзі, відаць, баяліся, хоць і не ведалі, якая ім пагражае небяспека і адкуль яна можа прысці.

Тут капітану прышла ў галаву даволі дасціпная думка. Ён сказаў:

— Каб яны рашылі яшчэ раз падаць сігнал стрэламі сваім прапаўшым таварышам, мы маглі-б кінуцца на іх і акурат у тую хвіліну, калі яны стрэльнуць і калі, значыцца, іхнія стрэльбы будуць р а з р а д ж а н ы. Тады ім нічога больш не застанецца, як здацца, і справа абыдзецца без кровапраліцця.

План быў нядрэнны, але, каб выканаць яго, мы павінны быць на досыць блізкай адлегласці ад ворагаў у той момант, калі ён зробіць залп, і дабегчы да яго раней, чымся стрэльбы будуць зараджаны. Аднак, пытанне гэтае засталося адкрытым, бо вораг і не думаў страляць. Прайшло шмат часу. Мы ўсё сядзелі ў засадзе, не ведаючы, на што адважыцца. Нарэшце, я сказаў:

— На маю думку, нам няма чаго і думаць што-небудзь рабіць, пакуль не надыдзе ноч.



Калі да таго часу гэтыя сямёра не вернуцца ў лодку, тады мы ў цемнаце непрыкметна прабярэмся на бераг і можа нам удасца заманіць у засаду тых, якія засталіся ў лодцы.

Час цягнуўся страшна марудна. Нашы ворагі не краналіся з месца. Мы думалі, што нарадзе іхняй не будзе канца. Але можаце сабе ўявіць, як мы перапалохаліся, калі ўбачылі, што яны падняліся на ногі і рашучым крокам накіраваліся прама да мора. Мабыць, страх перад невядомай небяспекай быў мацней за таварыскія пачуцці: было ясна, што яны рашылі кінуць усе пошукі і вярнуцца на карабль.

Справа была дрэнная: відаць, нам прыходзілася назаўсёды развітацца з караблём. Калі я сказаў капітану пра гэтую небяспеку, ён ледзь не страціў прытомнасці ад роспачы. Але раптам у мяне мільгнула бліскучая думка: я прыдумаў, як прымусіць ворага вярнуцца. Хітрасць была не надта мудрая, але яна ўдалася як па пісанаму.

Паклікаўшы да сябе Пятніцу і памочніка капітана, я загадаў ім спусціцца да бухтачкі (той самай, праз якую калісьці пераплываў мой Пятніца і дзікуны, што гналіся за ім), затым, абагнуўшы яе, павярнуць к захаду мілі на паўтары, узысці на гару і крычаць з усіх сіл пакуль не пачуюць матросы, якія будуць вяртацца да лодкі; калі-ж тыя адгукнуцца, перабегчы на іншае месца і зноў крычаць, і такім чынам, няспынна мяняючы месцы, заманьваць ворагаў усё далей і далей у глыб вострава,

пакуль яны не заблытаюцца ў лесе, а тады вакольнымі шляхамі вярнуцца назад.

Матросы ўжо сядалі ў лодку, калі з боку бухтачкі пачулася такое галоснае «го-го», што яго нельга было не пачуць.

Яны адразу-ж адгукнуліся і з усіх ног пабеглі ўдоўж берагу на голас, але, дабегшы да бухтачкі, прымушаны былі спыніцца, бо акурат быў час прыліву, і вада ў бухтачцы стаяла вельмі высока. Параіўшыся між сабой, яны крыкнулі застаўшымся ў шлюпцы, каб тыя пад'ехалі і перавезлі іх на другі бераг. На гэта я і разлічваў.

Пераехаўшы цераз бухтачку, яны накіраваліся далей, узяўшы з сабой яшчэ аднаго чалавека. Такім чынам у шлюпцы засталося толькі двое. Я бачыў, як яны адвялі яе ў самы канец бухтачкі і прывязалі там да дрэва.

Усё складалася як найлепей для нас. Пакінуўшы Пятніцы і памочніку капітана рабіць сваю справу, я скамандаваў астатняму атраду ісці за мной.

Мы абагнулі бухтачку пад самым носам у ворага, які не мог нас бачыць за кустамі, і нечакана выраслі перад ім. Адзін матрос сядзеў у шлюпцы, другі ляжаў на беразе і драмаў. Убачыўшы нас за тры крокі ад сябе, ён зрабіў было рух, каб ускочыць, але капітан, які быў наперадзе, кінуўся на яго і раструшчыў яму галаву ўдарам прыклада. Затым, не даючы апамятацца другому матросу, ён крыкнуў яму:

— Здавайся, альбо смерць!

Не патрабуецца вялікай красамоўнасці,

каб пераканаць чалавека здацца, калі ён бачыць, што ён адзін супроць пяцярых і калі да таго адзіны яго саюзнік толькі што загінуў у яго на вачах.

Апрача таго гэты матрос быў адным з трох, пра якіх капітан казаў, што яны далучыліся да змовы не па свёй ахвоце, а пад нашскам большасці. Ён не толькі беспярэчліва палажыў зброю па першаму нашаму патрабаванню, але зараз-жа сам заявіў аб сваім жаданні,—відаць, зусім шчырым,—далучыцца да нашага атрада.

Тымчасам Пятніца з памочнікам капітана так чыста выканалі сваю справу, што лепш нельга было і жадаць. Аукаючы ды адклікаючыся на крыкі матросаў, яны вадзілі іх па ўсім востраве, ад узгорка да ўзгорка, ад гаю ў гай, пакуль не завялі ў такую непраглядную глуш, адкуль не было ніякай мажлівасці выбрацца на бераг да надыходу ночы. Аб тым, як яны вымучалі ворага можна было меркаваць па тым, што і самі яны вярнуліся дамоў, ледзьве цягнучы ногі.

Цяпер нам заставалася толькі падпільнаваць у змроку, калі выведчыкі будуць вяртацца і, ашаламіўшы іх нечаканым нападам, прымусіць здацца нам у палон.

Але прайшло некалькі гадзін з таго часу, як вярнуліся Пятніца і яго таварыш, а пра тых нічога не было чуваць. Нарэшце чуем: ідуць. Пярэдні крычыць заднім, каб паспяшаліся, а заднія адказваюць, што шпарчэй яны не могуць ісці, бо зусім збілі сабе ногі і па-

даюць ад знямогі. Апошняе было нам вельмі дарэчы.

Вось яны падышлі да бухтачкі. (Трэба адзначыць, што за гэтыя некалькі гадзін пачаўся адліў, і шлюпка, якая, як я ўжо казаў, была прывязана да дрэва, апынулася на беразе.) Немагчыма апісаць, што з імі сталася, калі яны ўбачылі, што шлюпка стаіць на мялі, а людзі зніклі. З крыкамі мітусіліся яны па беразе, праклінаючы свой лёс. Яны крычалі, што трапілі на зачараваны востраў, на якім жывуць або чэрці, або злыя чараўнікі, што з гэтага вострава аніводзін смяротны не выходзіць жывым. Некалькі разоў яны пачыналі гукаць сваіх таварышоў, называючы іх па імёнах, але, зразумела, не атрымлівалі адказу, у вячэрнім змроку нам было відаць, як яны то бегалі ламаючы рукі, то, змарыўшыся ад гэтай беганіны, кідаліся ў лодку ў безвыходнай роспачы, то зноў выскоквалі на бераг і зноў хадзілі ўзад і ўперад, і так без канца.

Мае людзі прасілі мяне дазволіць ім напасці на ворага, як толькі сцямнее. Але я лічыў патрэбным не праліваць крыві, калі толькі будзе хоць якая магчымасць гэтага ўнікнуць. Галоўнае-ж, ведаючы, як добра ўзброены нашы супраціўнікі, я не хацеў рызыкаваць жыццём нашых людзей. Я рашыў пачакаць, ці не падзеляцца сілы супраціўніка, а пакуль скамандаваў свайму войску быць напагатове. Пятніцу-ж і капітана я выслаў наперад з загадам як можна бліжэй падпаўзці да ворага.

Яны нядоўга прасядзелі ў засадзе. На іх амаль натыркнуліся, выпадкова адлучыўшыся ад астатніх, тры піраты і ў тым ліку боцман, які, як ужо сказана, быў галоўным пачынальнікам бунту, а цяпер трымаў сябе, як самы нікчэмны трус.

Як толькі капітан пачуў голас галоўнага вінавайцы сваіх няшчасцяў і зразумеў, што той у ягонай уладзе, ён прышоў у такі запал, што ўскочыў на ногі і стрэльнуў прама ў грудзі нягодніку. Тады, вядома, стрэліў і Пятніца.

Боцман быў забіты напавал, другі пірат быў ранены, трэці ўцёк.

Пачуўшы стрэлы, я зараз-жа рушыў наперад галоўны корпус сваёй арміі, колькасць якой, лічачы з авангардам, дасягала цяпер васьмі чалавек. Вось яе поўны склад: я—генералісімус, Пятніца—мой старшы ад'ютант, затым капітан з двума афіцэрамі і тры ваеннапалонныя, якім мы даверыліся, залічыўшы іх у лік радавых і выдаўшы кожнаму з іх па стрэльбе.

Калі мы падышлі да ворага, было ўжо зусім цёмна, таму ён не мог разабраць колькі нас. Я паклікаў да сябе аднаго з ваеннапалонных (таго матроса, які незадоўга перад тым добраахвотна далучыўся да нас) і загадаў яму аклікнуць па імёнах яго былых таварышоў. Перш чым страляць, я хацеў паспрабаваць з імі перагаварыцца і, калі ўдасца, пакончыць справу згодай. Мае меркаванні ўдаліся, ды яно і зразумела: іхняе становішча

было такое, што ім не заставалася іншага выхаду, як здацца.

Парламанцёр мой вышаў наперад і закрычаў на ўсё горла:

— Том Сміт! Том Сміт!

Том Сміт зараз-жа адгукнуўся.

— Хто мяне кліча? Ты, Джымі Рой?

Ён, мусіць, пазнаў парламанцёра па голасу.

Джымі Рой адказаў:

— Так, так, гэта я. Том Сміт, кідай стрэльбу ды здавайся, інакш вы прапалі.

— Ды каму-ж здавацца? Дзе яны там?— пракрычаў зноў Том Сміт.

— Тут!—адгукнуўся Джымі Рой.—Іх пяцьдзесят чалавек і з імі наш капітан. Вось ужо дзве гадзіны, як яны ганяюцца за вамі. Боцман забіт, Біл Фрэй ранены, а мяне ўзялі ў палон. Калі вы не здасцёся ў гэтую-ж хвіліну, развітайцеся з жыццём.

Тады Том Сміт заявіў:

— Калі над намі злітуюцца, мы здамося, так ім і скажы.

— Добра, я скажу,—адказаў Джымі Рой.

Але тут распачаў перагаворы ўжо сам капітан.

— Гэй, Сміт, і ўсе вы там!—закрычаў ён.— Пазнаецё мой голас?.. Дык слухайце: калі вы зараз-жа пакладзеце зброю і здасцёся, я абяцаю вам літасць,—усім, акрамя Біла Аткінса.

— Капітан, злітуйцеся нада мноїй!—пачаў прасіць Біл Аткінс.—Чым я горш за іншых? Усе мы аднолькава вінаватыя.

Гэта была чысцейшая мана, таму што Біл

Аткінс, закаранелы пірат, даўно падмаўляў матросаў заняцца морскім рабаўніцтвам, а калі пачаўся бунт, першы кінуўся на капітана і звязаў яму рукі, потым біў яго і абражаў лаянкай. Таму капітан сказаў яму, каб ён здаваўся без ніякіх умоў, а там хай ужо начальнік вострава вырашае, жыць яму ці памірaць. (Начальнік вострава—гэта я: так мяне цяпер усе называлі.) Білу Аткінсу прышлося згадзіцца.

Раздзел дваццаць пяты

Капітан зноў робіцца камандзірам карабля.—Рабінзон пакідае свой востраў.

Такім чынам піраты палажылі зброю, просячы літасці.

Наш парламанцёр і яшчэ два чалавекі, па майму загаду, звязалі іх ўсіх, пасля чаго мая грозная армія ў пяцьдзесят чалавек (чытай—восем, з трыма палоннымі ўключна) абкружыла іх і заўладала шлюпкай.

Сам я аднак не паказваўся палонным па некаторых вышэйшых меркаваннях.

Першай нашай справай было паправіць лодку і падумаць, як дабрацца да карабля.

Капітан, які мог цяпер бесперашкодна размаўляць з бунтарамі, прачытаў ім даўгую натацыю з поваду зробленага імі злачынства.

Ён намагаўся прымусіць іх адчуць нізкасць іхняга ўчынку, казаў, што шлях злачынства ніколі не прыводзіць да дабра, што яны зганбілі сябе на ўсё жыццё, самі выкапалі

сабе яму і павінны дзякаваць лёс, калі не трапяць на шыбельніцу.

Злачынцы каяліся, відаць, ад чыстага сэрца, і прасілі толькі аб адным,—каб іх не пакаралі смерцю.

На гэта капітан ім адказаў, што тут ён не мае ўлады, бо яны не яго палонныя, а ўладара вострава.

— Вы думалі,—сказаў ён у заключэнне,— што высадзілі нас на пустынны, бязлюдны бераг, але лёс накіраваў нас да населенага вострава, якім кіруе англічанін. Па свайму велікадушшу ён злітаваўся над вамі і, мусіць, адправіць вас у Англію, дзе з вамі абыдуцца па законах. Але Білу Аткінсу загадана рыхтавацца да смерці: заўтра раніцой ён будзе павешаны.

Усё гэта капітан, зразумела, выдумаў, але яго выдумка зрабіла жадаемае ўздзеянне. Аткінс упаў на калены, просячы капітана хадайнічаць за яго перад начальнікам вострава, астатнія таксама пачалі пакорліва прасіць, каб іх не адпраўлялі ў Англію.

Бачачы такую пакорлівасць гэтых людзей, прыціснутых страхам смерці, я сказаў сабе: «Вось калі прышоў час майго збавення. Гэтыя небаракі так напалоханы, што, напэўна, выканаюць кожнае наша патрабаванне: варта нам загадаць, і яны дапамогуць нам авалодаць караблём».

І, адышоўшы далей, пад дрэвы, каб яны не маглі разгледзець, які там начальнік, я крыкнуў:

— Паклікаць да мяне капітана!

Адзін з нашых людзей урачыста падышоў да капітана і сказаў:

— Капітан, вас кліча начальнік!

А капітан не менш урачыста адказаў:

— Перадайце начальніку, што я зараз з'яўлюся.

Гэта зрабіла велізарны эфект: усе засталіся ў поўнай упэўненасці, што начальнік вострава дзесьці блізка з усёй сваёй арміяй у пяцьдзесят чалавек.

Калі капітан падышоў да мяне, я паведаміў яму свой намер авалодаць караблём пры дапамозе ваеннапалонных. Капітан быў у захапленні. Мы вырашылі прывесці гэты план у выкананне на другі-ж дзень.

— Але каб дзейнічаць напэўна, не баючыся за поспех,—сказаў я капітану,—нам трэба раз'яднаць палонных. Аткінса з двума іншымі закаранелымі бандытамі мы засадзім ў мой склеп, дзе сядзяць двое. Хай Пятніца і ваш памочнік адвядуць іх туды. А для астатніх я знайду месца.

Так мы і зрабілі: трох пасадзілі ў склеп, які сапраўды быў падобны на даволі суровую турму, асабліва для людзей і без таго не памятаючых сябе ад страху, а астатніх я адправіў на сваю лясную дачу. Высокая агарожа рабіла яе таксама даволі надзейным месцам для зняволення, тым больш, што арыштаваныя былі звязаны і ведалі, што ад іхніх паводзін залежыць іхняя доля.

На другі дзень зранку я паслаў да іх капітана для перагавораў. Ён павінен быў дове-

дацца і паведаміць мяне, наколькі можна давяраць гэтым людзям і ці не рызыкоўна будзе браць іх з сабой на карабль. Ён павёў справу вельмі асцярожна: паказаўшы ім, у якім сумным становішчы яны апынуліся па ўласнай віне, ён сказаў, што хоць начальнік вострава цяпер і пашкадаваў іх сваёй уладай, але, калі карабль прыдзе ў Англію, іх абавязкова будуць судзіць, як здраднікаў, і напэўна павесяць.—А калі вы,—скончыў ён сваю дыпламатычную прамову,—дапаможаце мне выручыць ад разбойнікаў мой карабль, тады начальнік вострава, прымаючы пад увагу, што вы добраахвотна далучыліся да законнай справы, пастараецца вас выратаваць.

Няцяжка здагадацца, як павінны былі ставіцца да такой прапановы людзі, якія амаль пакінулі ўсе надзеі на выратаванне.

Яны кінуліся да ног капітана і кляліся ў сваёй вернасці, кажучы, што будуць біцца за яго да апошняй кроплі крыві, што, калі ён выхадайнічае ім дараванне, яны будуць лічыць сябе ўсё сваё жыццё неаплатнымі яго даўжнікамі, будуць паважаць яго як бацьку і пойдуць за ім хоць на край свету.

— Добра,—сказаў ім капітан,—усё гэта я перадам начальніку і, з свайго боку, буду хадзейнічаць за вас перад ім.—Затым ён аддаў мне справаздачу аб выкананым ім даручэнні, дадаўшы, што, па яго шчыраму перакананню, мы можам не сумнявацца ў вернасці гэтых людзей.

Але я быў той думкі, што асцярожнасць ніколі не пашкодзіць, і таму сказаў капітану:

— Вось што мы зробім: мы возьмем пакуль толькі пяцярых. Не трэба, каб яны думалі, што мы маем патрэбу ў людзях. Вы так ім і скажыце, што хоць у нас хапае людзей, але хай яно ўжо так, мы возьмем, пяцярых на іспыты: астатніх-жа двух, разам з тымі трыма, што сядзяць у замку (гэта значыць у маім склепе), начальнік вострава пакідае ў сябе ў якасці заложнікаў, і, калі іхнія таварышы, што прымуць удзел у нашай экспедыцыі здрадзяць свайму слову, усе пяцёра заложнікаў будуць павешаны.

Захады былі радыкальныя. Калі капітан перадаў палонным мой адказ, яны зразумелі, што з начальнікам вострава жарты дрэнныя. Як-бы там ні было, ім не засталося іншага выбару, як прыняць мае ўмовы. Цяпер гэта была ўжо справа тых, што засталіся заложнікамі, угаварыць астатніх пяцярых, каб яны апраўдалі аказаную ім даверлівасць. Мы мелі цяпер наступныя баявыя сілы: 1) капітан, яго памочнік і пасажыр; 2) ваеннапалонныя: трое з першай партыі, якім, па хадатайніцтву капітана, які ручаўся за іх, я вярнуў волю і зброю; затым яшчэ двое, што сядзелі раней на дачы, цяпер былі вызвалены па просьбе капітана; нарэшце пяцёра з другой партыі, якіх мы рашылі ўзяць з сабой на карабль: такім чынам дзесяць чалавек, апрача тых пяцярых, што засталіся заложнікамі.

Я спытаў капітана, ці знаходзіць ён магчымым атакаваць карабль з такім складам войска. Што тычыцца мяне і Пятніцы, то нам ніяк не выпадала адлучыцца: у нас на

руках заставалася сем чалавек, якіх трэба было вартаваць і карміць, і нам-бы толькі справіцца з гэтай справай.

Адносна пяцярых заложнікаў, пасаджаных у склеп, я пастанавіў не дапускаць ніякіх паслабленняў. Два разы на дзень Пятніца насіў ім яду і піццё і сам іх карміў, бо ім нават не развязалі рук. Астатнім-жа двум мы далі некаторую волю.

Гэтым апошнім я нарэшце рашыў паказацца. Для гэтай цырамоніі я ўзяў з сабой капітана. Ён сказаў ім, што я—давераная асоба начальніка вострава, які даручыў мне нагляд за ваеннапалоннымі, што таму без майго дазволу яны не маюць права нікуды адлучацца і што пры першай-жа спробе не паслухацца іх закуюць у кайданы і пасадзяць у губернатарскі замак. Трэба зазначыць, што за ўвесь час я ні разу не паказваўся нашым палонным у якасці начальніка вострава, а заўсёды як яго давераная асоба, прычым кожны раз стараўся сказануць славечка аб строгасці начальніка, аб ягоным замку, аб нашым войску,—увогуле не выпускаў выпадку пусціць ім пыл у вочы.

Цяпер заставалася толькі падрыхтавацца да экспедыцыі: паправіць баркас, наладзіць яго і шлюпку ў дарогу, вызначыць каманду, назапасіць харчу і гэтак далей. Усе гэтыя клопаты я ўскладаў на капітана. Ён прызначыў камандзірам шлюпкі свайго пасажыра і даў яму пад каманду чатырох чалавек; самжа ён, яго памочнік і з ім пяць матросаў складалі экіпаж баркаса. Капітан сцвярджаў

(і зусім правільна), што да карабля будзе больш зручна падысці ноччу, і ў бліжэйшую-ж ноч пусціўся ў дарогу. Калі на караблі пачулі плёск вёслаў і па морскаму звычаю, аклікнулі шлюпку, капітан загадаў Джымі Рою, каб той падаў голас, а ўсім астатнім прыказаў маўчаць. Джымі Рой сказаў, што ён прывёз піратаў і што спазніўся таму, што давялося доўга іх шукаць, а затым пачаў падрабязна расказваць, як гэта здарылася.

Пакуль ён балбатаў такім чынам, стараючыся адцягнуць увагу каманды, абедзве шлюпкі прычалілі да борта.

Капітан з памочнікам першыя выбеглі на палубу і збілі з ног ударамі прыкладаў двух, стаяўшых бліжэй; высветлілася, што гэта быў другі капітанскі памочнік, які перайшоў на бок піратаў і карабельны цясляр. Такім чынам капітанскі атрад перахапіў усіх, што былі на палубе, а затым пачаў замыкаць люкі, каб затрымаць унізе астатніх. Тымчасам падаспелі камандзір і матросы другой шлюпкі; яны хутка занялі ўваход у карабельную кухню і ўзялі ў палон трох чалавек, што былі на кухні.

Ачысціўшы ад ворага палубу, капітан загадаў свайму памочніку ўзяць з каманды трох матросаў і ўламіцца ў каюту, дзе, прыпершых-жа гуках трывогі, запёрся новы капітан, выбраны бунтарамі, а з імі два матросы і юнга. Яны паспелі захапіць з сабой зброю, і таму, калі капітанскі памочнік са сваімі людзьмі выламалі дзверы каюты, іх спаткалі стрэламі. Памочніку раструшчыла

куляй руку, двое матросаў таксама былі ранены, але ніхто не быў забіты.

Памочнік капітана крыкнуў: «На дапамогу!» і, не зважаючы на сваю рану, уварваўся ў каюту з пісталетам у руцэ. Ён палажыў тут-жа новага капітана, прастрэліўшы яму галаву. Тады экіпаж увесь здаўся, і такім чынам карабль быў узяты без далейшых страт.

Калі ўсё было скончана, капітан загадаў даць сем гарматных стрэлаў. Гэта быў умоўны сігнал, якім ён паведамляў мяне аб паспяховым сканчэнні справы. Я прадзяжурыў на беразе да ночы, чакаючы гэтага сігналу. Можаце меркаваць, як я ўзрадваўся, пачуўшы яго.

Адлічыўшы сем стрэлаў, я з заспакоеным сэрцам вярнуўся дамоў, лёг і, змораны ад хваляванняў гэтага дня, зараз-жа заснуў.

Мяне пабудзіў новы стрэл. Я прыўскочыў у сваім гамаку і пачуў, што нехта кліча, мяне:

— Начальнік вострава!

Я адразу-ж пазнаў голас капітана. Ён стаў над маёй крэпасцю, на гары. Я схапіў лесніцу і жвава ўзняўся да яго. Ён узяў мяне ў абдымкі і сказаў, паказваючы на мора:

— Мой дарагі друг! Мой збавіцель! Вось ваш карабль. Ён ваш і ўсё, што на ім ёсць, таксама ваша! І карабль, і ўвесь яго экіпаж, пачынаючы з капітана, належыць вам.

Я глянуў у той бок, куды ён паказваў: карабль стаяў ўжо на іншым месцы, менш за поўмілі ад берагу. Гэта быў сюрпрыз, зроблены для мяне маім другам; пакончыўшы з

піратамі, ён адразу-ж загадаў здымацца з якара і, карыстаючыся лёгкім папутным ветрыкам, падышоў да той бухтачкі, дзе я калісьці прычальваў са сваімі плытамі: затым, дачакаўшыся прыліву, ён на яліку ўвайшоў у бухтачку, высадзіўся і прыбег да мяне.

Убачыўшы карабль, можна сказаць, ля парога свайго дому, я ад такой нечаканай радасці ледзь не страціў прытомнасць.

Прышоў нарэшце час майго збавення. Я, калі можна так выказацца, ужо намацаў сваю волю. Усе перашкоды былі знішчаны. Для мяне было пададзена вялікае акіянскае судна, гатовае мяне завезці, куды я захачу. Ад хвалявання я не мог вымавіць ні слова.

Язык не слухаўся мяне. Каб капітан не падтрымаў мяне сваімі моцнымі рукамі, я ўпаў-бы на зямлю.

Капітан нагнуўся нада мной, выняў з кішэні бутэлечку з нейкім лякарствам, якое захапіў знарок для мяне, і даў мне выпіць глыток, затым асцярожна пасадзіў мяне на зямлю. Я крыху апрытомнеў, але доўга яшчэ не меў сілы гаварыць.

Небарака-капітан і сам не мог апамятацца ад радасці, хоць для яго яна ўжо не была такой нечаканай. Ён супакойваў мяне, як малое дзіцянё, выказваў сваю ўдзячнасць і нагаварыў тысячу самых пяшчотных і ласкавых слоў. Але я дрэнна разумеў, што ён казаў: мабыць, мой розум памутнеў ад шчасця. Нарэшце хваляванне выклікала слёзы, пасля чаго я ўжо мог гаварыць.

Я моцна абняў майго новага друга і ад усяго сэрца павіншаваў яго.

Калі мы з капітанам, выліўшы свае пачуцці, крыху заспакоіліся, ён сказаў мне, што прывёз для мяне такія-сякія рэчы, якіх, на шчасце, не паспелі ўкрасці зладзеі, што так доўга гаспадарылі на яго караблі.

— Мне здаецца, што гэтыя рэчы будуць не зусім бескарысныя для вас,—сказаў капітан.

Ён крыкнуў сваім матросам, якія засталіся ў лодцы:

— Гэй, цягніце сюды цюкі, што мы прывезлі для начальніка вострава.

Гэта быў сапраўды багаты падарунак: капітан прывёз мне так многа ўсялякага дабра, нібы я збіраўся заставацца на востраве да канца маіх дзён. У цюках было: дванаццаць вялізных кавалкаў саланіны, шэсць кавалкаў ветчыны, мяшок гароху, каля ста фунтаў сухароў, скрынка цукру, скрынка мукі, поўны мяшок лімонаў, дзве бутэлькі лімоннага соку і яшчэ шмат іншай яды і піцця. Але, галоўнае, мой друг паклапаціўся даставіць мне адзенне. Ён прывёз мне поўтузіны новых, зусім чыстых сарочак, шэсць вельмі добрых шыйных хустак, дзве пары пальчатак, капялюш, боты, панчохі і поўную пару зусім новага адзення са свайго пляча,—словам, апрануў мяне з галавы да ног.

Самым прыемным падарункам было для мяне, безумоўна, адзенне. Але вы не можаце сабе ўявіць, які нязграбны быў у мяне вы-



гляд, калі я надзеў мой новы гарнітур, і як мне было няёмка і нязручна ў ім першы час.

Як толькі скончыўся агляд падарункаў, я папрасіў аднесці іх у маю крэпасць і пачаў раіцца з капітанам адносна нашых палонных.

Пытанне было ў тым, ці не будзе рызыкоўна ўзяць іх з сабой у плаванне, асабліва двух, якіх капітан атэставаў, як невыправімых нягоднікаў. Паводле яго слоў, гэта былі такія разбойнікі, што каб ён адважыўся ўзяць іх на карабль, то няйначай, як у якасці арыштантаў, закаваных ў кайданы, і з тым разлікам, каб аддаць іх у рукі правасуддзя, у першай-жа англійскай калоніі, у якую давядзецца зайсці.

Словам, з усяго было відаць, што яму вельмі не хацелася браць іх з сабой.

Тады я сказаў яму, што, калі ён жадае, я магу так зрабіць, што гэтыя двое малайцоў пачнуць самі прасіцца ў нас, каб мы пакінулі іх на востраве.

— Калі ласка, зрабіце, я буду вельмі рады,—адказаў ён.

— Добра,—сказаў я.—Я зараз па іх пашлю і пагутару з імі па-свойску.

Затым, паклікаўшы да сябе Пятніцу і двух заложнікаў (якіх мы цяпер вызвалілі, бо таварышы іхнія стрымалі дадзенае слова), я загадаў ім перавесці пяць палонных са склепа на дачу (але ні ў якім разе не развязваючы ім рукі) і там чакаць мяне.

Пачакаўшы некаторы час для большай важнасці, мы з капітанам накіраваліся туды,—я ў сваім новым гарнітуры і на гэты

раз ужо ў якасці начальніка востраваа. Падышоўшы да маёй дачы, я патрабаваў да сябе арыштаваных і сказаў ім наступнае:

— Мне добра вядома ваша злачынства. Я ведаю, як бессумленна зарэзалі вы безабаронных пасажыраў. Ведаю і тое, што вы збіраліся зрабіцца піратамі і заняцца подлым рабаўніцтвам мірных, безабаронных караблёў. Але хай-жа будзе вам вядома, што па майму распараджэнню карабль звернут капітану і прыведзен на рэйд. Варта мне загадаць, і вас пакараюць як разбойнікаў, злоўленых на месцы злачынства. І таму, калі ў вас ёсць чаго сказаць для свайго апраўдання,—кажыце.

Адзін з іх адказаў за ўсіх, што ім няма чаго сказаць для свайго апраўдання, але што капітан абяцаў ім злітавацца над імі, і таму яны пакорліва просяць літасці—пакінуць жывымі.

— Не ведаю, якім чынам я магу злітавацца над вамі. Я рашыў пакінуць гэты востраў з усімі маімі людзьмі: мы едзем у Англію на вашым караблі. Што тычыцца вас, то, па словах капітана, ён абавязан закаваць вас у кайданы і па прыбыцці ў Англію перадаць суду за здраду і бунт. А вы самі ведаеце, чым вам гэта пагражае. Смерць на шыбеніцы—вось што чакае вас у Англіі. Такім чынам, наўрад ці будзеце вы рады, калі мы возьмем вас з сабой. Калі вы хочаце ведаць маю думку, то я параіў-бы вам застацца на востраве: толькі пры гэтай умове я магу выратаваць вас.

Яны з радасцю згадзіліся на гэта і вельмі дзякавалі мяне.—Вядома, лепш ужо жыць у пустыні, як быць павешаным на радзіме,— казалі яны.

Я загадаў развязаць іх і сказаў ім:

— Цяпер ідзіце ў лес—на тое самае месца, дзе мы вас перамаглі, і чакайце, пакуль за вамі прышлюць. Я загадаю пакінуць вам зброю, харчы і дам вам неабходныя ўказанні на першы час. Вы можаце вельмі нядрэнна пражыць тут, калі захочаце.

Вярнуўшыся дамоў пасля гэтых перагавораў, я пачаў збірацца ў дарогу. Я папярэдзіў капітана, што не магу быць гатовым раней наступнай раніцы, і папрасіў яго ехаць на карабль без мяне і рыхтавацца да адплыцця, а зранку прыслаць па мяне шлюпку.

Калі капітан паехаў, я сказаў паклікаць да мяне пяцярых палонных і пачаў з імі сур'ёзную размову аб іхнім становішчы. Паўтарыўшы, што па-мойму яны добра робяць, застаючыся на востраве, бо калі яны вернуцца на радзіму, іх абавязкова павесяць,—я расказаў ім падрабязна: як трапіў на востраў, як паступова палепшыў свой быт, як збіраў ўраджай, як пасеяў рыс і ячмень, як навучыўся пячы хлеб.

Я паказаў ім свае ўмацаванні, свае палі ды загоны,—словам, зрабіў усё, што ад мяне залежала для таго, каб яны маглі ўсталяваць, па магчымасці, лепей.

Я пакінуў ім усю сваю зброю, даў падрабязныя інструкцыі, як даглядаць коз, як іх даіць і карміць, як рабіць масла і сыр.

Карацей кажучы, я перадаў ім у нямногіх словах усю доўгую гісторыю майго цяжкога адзінотнага жыцця на працягу дваццаці васьмі год.

Я таксама абяцаў ім, што папрашу капітана пакінуць ім яшчэ два бачонкі пораху і насення гародніны, чаго мне так неставала ў першыя часы. Мяшок з гарохам, які капітан прывёз мне ў падарунак, я таксама аддаў ім і пры гэтым параіў ужыць увесь гарох на сяўбу.

Развітаўшыся з выгнаннікамі, я пакончыў за дзень з усімі маімі справамі і на другі дзень раніцой пераехаў на карабль.

Хоць мы вельмі спяшаліся ехаць, але ўсё-такі не паспелі зняцца з якара ў той дзень. У наступны дзень, на досвітку, мы ўбачылі, што да карабля плывуць два чалавекі. Высветлілася, што гэта былі двое з пяцярых людзей, пакінутых намі на востраве. Горка скардзячыся на трох сваіх таварышоў, яны вельмі прасілі нас узяць іх з сабой, хоць-бы іх потым і павесілі, «таму што,—казалі яны,— нас усёроўна заб'юць».

У адказ на іхнюю просьбу капітан сказаў, што ён не можа ўзяць іх без майго дазволу. Але нарэшце, прымусіўшы іх даць урачыстую клятву, што яны выправяцца і будуць трымаць сябе ціха, мы прынялі іх на карабль.

Дачакаўшыся прыліву, капітан адправіў на бераг шлюпку з рэчамі, якія мы абяцалі новым жыхарам вострава. Да гэтых рэчаў, па маёй просьбе, ён далучыў іхнія скрыні з адзеннем, за што яны былі вельмі ўдзячны.

Я запамятаваў сказаць, што, развітваючыся з выгнаннікамі, я, жадаючы іх узбадзёрыць, абяцаў ім, што не забуду аб іх і, калі толькі ў якім-небудзь порце мы спаткаем карабль, шлях якога будзе ляжаць міма майго востраваа, я папрашу капітана гэтага карабля зайсці за імі і ўзяць іх з сабой.

Развітаўшыся з востравам, я ўзяў з сабой на ўспамін зробленую мною вялікую шапку з казінай скуры, парасон і аднаго папугая. Не забыў я ўзяць і грошы, але яны так доўга ляжалі ў мяне без ужывання, што зусім пацямнелі і толькі пасля добрай чысткі зрабіліся зноў падобнымі на золата і срэбра; я захапіў таксама і манеты, знойдзеныя мною ў абломках іспанскага карабля.

Як потым высветлілася з карабельных запісаў, мой ад'езд адбыўся 9 снежня 1686 года. Такім чынам я пражыў на востраве дваццаць восем год, два месяцы і дзевятнаццаць дзён.

Па дарозе я заехаў за іспанцамі і ўзяў іх з сабой на карабль. Яны былі вельмі ўзрадваныя і са слязьмі дзякавалі мяне.

Але, здаецца, больш за ўсіх быў шчаслівы Пятніца, бо яго стары бацька адправіўся ў далёкую дарогу разам з ім.

———

ЗМЕСТ

РАЗДЗЕЛ I. Сям'я Рабінзона.—Яго пабег з бацькоўскага дома 3
„ II. Першыя прыгоды на моры.—Падарожжа ў Гвінею 5
„ III. Рабінзон у палоне.—Уцёкі.—Падарожжа ў Бразілію 9
„ IV. Рабінзон пасяляецца ў Бразіліі.—Ён зноў адпраўляецца ў мора і церпіць крушэнне 28
„ V. Рабінзон на нежылым востраве.—Ён здабывае рэчы з карабля і будуе сабе жыллё 38
„ VI. Рабінзон перацягвае ўсю сваю маёмасць да сябе ўдом.—Каза і казлянё. 50
„ VII. Каляндар Рабінзона. — Рабінзон усталёўвае сваё жыллё 53
„ VIII. Дзённік.—Землетрасенне 59
„ IX. Рабінзон дастае рэчы з карабля, пацярпеўшага крушэнне.—Хвароба і туга 73
„ X. Рабінзон даследуе свой востраў . 83
„ XI. Рабінзон вяртаецца ў пячору.—Яго земляробчыя работы 87
„ XII. Рабінзон вырабляе пасуду . . . 91
„ XIII. Рабінзон будуе лодку і шые сабе новае адзенне 97
„ XIV. Рабінзон робіць другую лодку меншых памераў, і прабуе аб'ехаць вакол вострава 105
„ XV. Рабінзон прыручае дзікіх коз . . 114
„ XVI. Нечаканая трывога. — Рабінзон умацоўвае сваё жыллё 119
„ XVII. Рабінзон пераконваецца, што на яго востраве бываюць людаеды . 126
„ XVIII. Дзікуны зноў наведваюць востраў Рабінзона.—Крушэнне карабля . 135
„ XIX. Рабінзон зноў спрабуе пакінуць свой востраў 141

РАЗДЗЕЛ XX. Рабінзон выратоўвае аднаго дзікуна і дае яму імя Пятніца . . 146
„ *XXI. Рабінзон гутарыць з Пятніцай і настаўляе яго* 158
„ *XXII. Рабінзон і Пятніца будуюць лодку.—Бойка з дзікунамі.* 167
„ *XXIII. Новыя жыхары вострава.—Прыбыццё англічан* 194
„ *XXIV. Барацьба з піратамі* 216
„ *XXV. Капітан зноў робіцца камандзірам карабля.—Рабінзон пакідае свой востраў* 231

6485

Рэдактар *Я. Маўр*
Карэктар *Нейфах*
Тэхрэдактар *Абрамава*

Здана ў друкарню 27/VIII—36 г. Падпісана да друку 4/XI—36 г. Аб'ём $15^1/_2$ друк. арк. Папера $82\times110/_{32}$. Знакаў у друк. арк. 24.000. Тыраж 10.185 экз. Зак. № 953. Уп. Галоўлітбела № Б 1287.

Друкарня імя Сталіна, Менск, Дом Друку.

В4-93=91.72
Д949

ЦАНА 3 р. 50 к.

518
533

НА БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКЕ

Даниель Дефо

РОБИНЗОН КРУЗО

Государственное
Издательство
Белоруссии

Минск—1937